# Беларуская мова 11



Мемары… знак «Залаты фаліянт» у… скульптуру ў выглядзе жан…, якая трымае над галавой разг…нутую кнігу, дзе дакладна відац… дзве старонкі. На першай — да…ладная копія першай старонкі … скарынаўскай Біблii, на другой — яшч… адзін малюнак самага першага …выдаўца Беларусі.

## СІНТАКСІЧНЫ РАЗБОР СЛОВАЗЛУЧЭННЯ

### Узор вуснага разбору

*Мне ногі змываюць крыштальныя росы* (Я. Колас).

У гэтым сказе тры словазлучэнні: *крыштальныя росы, змываюць ногі, змываюць мне.*

***Змываюць ногі*** — словазлучэнне. Галоўнае слова — *змываюць*, выражана дзеясловам. *Змываюць* (што?) *ногі*. Залежнае слова — *ногі*, выражана назоўнікам ж. р. у форме В. скл., мн. л. Від падпарадкавальнай сувязі — кіраванне. Граматычнае значэнне: дзеянне і прадмет, на які яно пераходзіць.

### Узор пісьмовага разбору

што?

*Змываюць ногі* (кіраванне; дзеянне і прадмет).

дзеясл. наз.

## СІНТАКСІЧНЫ РАЗБОР СКЛАДАНАЗАЛЕЖНАГА СКАЗА

### Узор вуснага разбору

*Я з дзяцінства запомніў, што край мой часінаю весняй шмат стагоддзяў адорвалі лебядзіныя шчырыя песні* (В. Лукша).

Складаназалежны сказ; складаецца з дзвюх граматычных частак: галоўная частка — *я з дзяцінства запомніў*; даданая частка — *што край мой часінаю весняй шмат стагоддзяў адорвалі лебядзіныя шчырыя песні.*

Даданая частка дапаўняе ў галоўнай дзеясloў-выказнік: *запомніў* (што?), *што край мой часінаю весняй шмат стагоддзяў адорвалі лебядзіныя шчырыя песні.*

Даданая частка — дапаўняльная.

Паміж галоўнай і даданай часткамі перад падпарадкавальным злучнікам ***што*** ставіцца коска.

*Я з дзяцінства запомніў* — галоўная частка пабудавана па схеме простага, апавядальнага, няклічнага, двухсастаўнага, развітага, поўнага, няўскладненага сказа. (Хто?) *я* — дзейнік, выражаны асабовым займеннікам у форме Н. скл., адз. л.; *я* (што зрабіў?) *запомніў* — просты дзеяслоўны выказнік, выражаны дзеясловам у форме абв. л., пр. ч., м. р., адз. л.; *запомніў* (калі? з якога часу?) *з дзяцінства* — акалічнасць часу, выражаная назоўнікам н. р. у форме Р. скл., адз. л. у спалучэнні з прыназоўнікам.

(Такім жа спосабам робіцца сінтаксічны разбор даданай часткі сказа.)

### Узор пісьмовага разбору

[1)]*Я з дзяцінства запомніў*, [2)]*што край мой часінаю весняй шмат стагоддзяў адорвалі лебядзіныя шчырыя песні.*

што?

[*запомніў*], (*што* ...).

## СІНТАКСІЧНЫ РАЗБОР ПРОСТАГА СКАЗА

### Узор вуснага разбору

*Закаханы ў жыццё і ў кожную мушку, я іду каля хат і родных садоў* (У. Караткевіч).

Граматычная аснова *я іду*. Сказ просты, апавядальны, няклічны, двухсастаўны, развіты, поўны, ускладнены адасобленым азначэннем, якое выражана дзеепрыметнікавым зваротам і аднароднымі акалічнасцямі.

(Х т о?) *я* — дзейнік, выражаны асабовым займеннікам у форме Н. скл., адз. л.; *я* (ш т о р а б л ю?) *іду* — просты дзеяслоўны выказнік, выражаны дзеясловам у форме абв. л., цяп. ч., 1-й ас., адз. л.; *я* (я к і?) *закаханы ў жыццё і ў кожную мушку* — дапасаванае азначэнне, выражанае дзеепрыметнікавым зваротам (дзеепрыметнікам у форме м. р., адз. л., Н. скл. з залежнымі словамі); *іду* (д з е?) *каля хат* — акалічнасць месца, выражаная назоўнікам ж. р. у форме Р. скл., мн. л. у спалучэнні з прыназоўнікам; *іду* (д з е?) *каля садоў* — акалічнасць месца, выражаная назоўнікам м. р. у форме Р. скл., мн. л. у спалучэнні з прыназоўнікам; *каля садоў* (я к і х?) *родных* — дапасаванае азначэнне, выражанае прыметнікам у форме мн. л., Р. скл.

Азначэнне *закаханы ў жыццё і ў кожную мушку* выражана дзеепрыметнікавым зваротам, паясняе дзейнік, выражаны асабовым займеннікам, аддзяляецца ад яго коскай.

### Узор пісьмовага разбору

*Закаханы ў жыццё і ў кожную мушку, я іду каля хат і родных садоў* (У. Караткевіч).

## СІНТАКСІЧНЫ РАЗБОР СКЛАДАНАЗЛУЧАНАГА СКАЗА

### Узор вуснага разбору

*Удзень прыпарвала, а ўночы ішоў дождж* (Я. Пархута).

Складаназлучаны сказ; складаецца з дзвюх граматычных частак: першая частка — *удзень прыпарвала*; другая частка — *уночы ішоў дождж*.

Галоўным сродкам сувязі частак з'яўляецца злучальны (супраціўны) злучнік ***а***.

Паміж часткамі выражаюцца супраціўныя сэнсавыя адносіны (з'явы, пра якія паведамляецца ў сказе, супрацьпастаўляюцца): *удзень прыпарвала, а ўночы ішоў дождж*.

Часткі адна ад адной аддзяляюцца коскай, якая ставіцца перад злучальным (супраціўным) злучнікам ***а***.

*Удзень прыпарвала* — частка пабудавана па схеме простага, апавядальнага, няклічнага, аднасастаўнага (безасабовага), развітага, поўнага, няўскладненага сказа. (Ш т о а д б ы в а л а с я?) *прыпарвала* — просты дзеяслоўны выказнік, выражаны дзеясловам у форме абв. л., пр. ч., н. р., адз. л. у значэнні безасабовага; *прыпарвала* (к а л і?) *удзень* — акалічнасць часу, выражаная прыслоўем.

(Такім жа спосабам робіцца сінтаксічны разбор другой часткі сказа.)

### Узор пісьмовага разбору

1) *Удзень прыпарвала*, *а* 2) *ўночы ішоў дождж*. [ ═══ ], *а* [ ═══ ─── ].

## СІНТАКСІЧНЫ РАЗБОР СКЛАДАНАЗАЛЕЖНАГА СКАЗА З НЕКАЛЬКІМІ ДАДАНЫМІ ЧАСТКАМІ

### Узор вуснага разбору

*Стаяў той асабліва прыгожы дзень, якія бываюць звычайна ў канцы жніўня месяца, калі даўно скончана жніво* (М. Лынькоў).

Складаназалежны сказ з некалькімі даданымі часткамі; складаецца з трох граматычных частак: *стаяў той асабліва прыгожы дзень* — галоўная частка; *якія бываюць звычайна ў канцы жніўня месяца* — даданая частка; *калі даўно скончана жніво* — даданая частка.

Даданая частка *якія бываюць звычайна ў канцы жніўня месяца* паясняе ў галоўнай частцы дзейнік *дзень* (я к і?). Даданая частка *калі даўно скончана жніво* паясняе ў папярэдняй даданай частцы акалічнасць часу *ў канцы жніўня месяца* (к а л і?).

Першая даданая частка — даданая азначальная; другая — даданая акалічнасная частка часу.

Від падпарадкавання даданых частак — паслядоўнае.

Паміж часткамі складаназалежнага сказа ставяцца коскі.

*Стаяў той асабліва прыгожы дзень* — галоўная частка пабудавана па схеме простага, апавядальнага, няклічнага, двухсастаўнага, развітага, поўнага, няўскладненага сказа. (Ш т о?) *дзень* — дзейнік, выражаны назоўнікам м. р. у форме Н. скл., адз. л.; *дзень* (ш т о р а б і ў?) *стаяў* — просты дзеяслоўны выказнік, выражаны дзеясловам у форме абв. л., пр. ч., м. р., адз. л.; *дзень* (я к і?) *той* — дапасаванае азначэнне, выражанае ўказальным займеннікам у форме м. р., адз. л., Н. скл.; *дзень* (я к і?) *прыгожы* — дапасаванае азначэнне, выражанае прыметнікам у форме м. р., Н. скл., адз. л.; *прыгожы* (у якой меры і ступені?) *асабліва* — акалічнасць меры і ступені, выражаная прыслоўем.

(Такім жа спосабам робіцца сінтаксічны разбор даданых частак сказа.)

### Узор пісьмовага разбору

1) *Стаяў той асабліва прыгожы дзень,* 2) *якія бываюць звычайна ў канцы жніўня месяца,* 3) *калі даўно скончана жніво.*

Гарызантальная схема




Вертыкальная схема




## СІНТАКСІЧНЫ РАЗБОР БЯЗЗЛУЧНІКАВАГА СКЛАДАНАГА СКАЗА

### Узор вуснага разбору

*Пасля дзённай спякоты паветра прыкметна пасвяжэла, над лужком паплыў золкі туман* (В. Гардзей).

Бяззлучнікавы складаны сказ; складаецца з дзвюх граматычных частак: першая частка — *пасля дзённай спякоты паветра прыкметна пасвяжэла;* другая частка — *над лужком паплыў золкі туман.*

Паміж часткамі выражаюцца адносіны адначасовасці (паведамляецца пра з’явы, якія адбываюцца адначасова).

Паміж часткамі ставіцца коска, паколькі часткі раўназначныя, аднатыпныя.

*Пасля дзённай спякоты паветра прыкметна пасвяжэла* — частка пабудавана па схеме простага, апавядальнага, няклічнага, двухсастаўнага, развітага, поўнага, няўскладненага сказа. (Ш т о?) *паветра* — дзейнік, выражаны назоўнікам н. р. у форме Н. скл., адз. л.; *паветра* (ш т о з р а б і л а?) *пасвяжэла* — просты дзеяслоўны выказнік, выражаны дзеясловам у форме абв. л., пр. ч., н. р., адз. л.; *пасвяжэла* (к а л і?) *пасля спякоты* — акалічнасць часу, выражаная назоўнікам ж. р. у форме Р. скл., адз. л. у спалучэнні з прыназоўнікам; *пасля спякоты* (я к о й?) *дзённай* — дапасаванае азначэнне, выражанае прыметнікам у форме ж. р., Р. скл., адз. л.; *пасвяжэла* (н а к о л ь к і?) *прыкметна* — акалічнасць меры і ступені, выражаная прыслоўем.

(Такім жа спосабам робіцца сінтаксічны разбор другой часткі сказа.)

### Узор пісьмовага разбору

1)*Пасля дзённай спякоты паветра прыкметна пасвяжэла*, 2)*над лужком паплыў золкі туман*. [____ ____], [____ ____].

## СІНТАКСІЧНЫ РАЗБОР СКЛАДАНАГА СКАЗА З РОЗНЫМІ ВІДАМІ СУВЯЗІ ЧАСТАК

### Узор вуснага разбору

*Нараджаецца новы дзень, і птушкі вітаюць яго сваімі спевамі: птушыныя галасы звіняць па лесе.*

Складаны сказ з рознымі відамі сувязі частак; складаецца з трох граматычных частак: першая частка — *нараджаецца новы дзень*; другая частка — *птушкі вітаюць яго сваімі спевамі*; трэцяя частка — *птушыныя галасы звіняць па лесе.*

Граматычныя часткі звязваюцца злучнікавай (злучальнай) і бяззлучнікавай сувяззю.

Сказ складаецца з дзвюх сэнсавых частак: першая — *нараджаецца новы дзень*; другая — *птушкі вітаюць яго сваімі спевамі: птушыныя галасы звіняць па лесе.*

Сэнсавыя часткі звязаны паміж сабой злучнікавай (злучальнай) сувяззю.

Першая сэнсавая частка пабудавана як просты сказ. Другая сэнсавая частка — як бяззлучнікавы складаны сказ. Сэнсавыя часткі адна ад адной аддзяляюцца коскай, якая ставіцца перад злучальным (спалучальным) злучнікам ***і***; паміж другой і трэцяй граматычнымі часткамі ставіцца двукроп'е, паколькі ў трэцяй граматычнай частцы раскрываецца змест таго, пра што гаворыцца ў другой.

*Нараджаецца новы дзень* — частка пабудавана па схеме простага, апавядальнага, няклічнага, двухсастаўнага, развітага, поўнага, няўскладненага сказа. (Ш т о?) *дзень* — дзейнік, выражаны назоўнікам м. р. у форме Н. скл., адз. л.; *дзень* (ш т о р о б і ц ь?) нараджаецца — просты дзеяслоўны выказнік, выражаны дзеясловам у форме абв. л., цяп. ч., 3-й ас., адз. л.; *дзень* (я к і?) *новы* — дапасаванае азначэнне, выражанае прыметнікам у форме м. р., Н. скл., адз. л.

(Такім жа спосабам робіцца сінтаксічны разбор кожнай часткі сказа.)

### Узор пісьмовага разбору

1)*Нараджаецца новы дзень*, *і* 2)*птушкі вітаюць яго сваімі спевамі*: 3)*птушыныя галасы звіняць па лесе*.

I [ ], *і* II [ ]: [ ].

# Беларуская мова

Вучэбны дапаможнік для 11 класа
ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі
з беларускай і рускай мовамі навучання
(з электронным дадаткам для павышанага ўзроўню)

*Дапушчана*
*Міністэрствам адукацыі*
*Рэспублікі Беларусь*

Мінск
Нацыянальны інстытут адукацыі
2021

Правообладатель Национальный институт образования

УДК 811.161.3(075.3=161.3=161.1)
ББК 81.2Беи-922
Б43

А ў т а р ы:
**Г. М. Валочка, Л. С. Васюковіч, В. У. Зелянко,**
**С. С. Міхнёнак, С. М. Якуба**

Р э ц э н з е н т ы:
кафедра агульнага і славянскага мовазнаўства ўстановы адукацыі «Магілёўскі дзяржаўны ўніверсітэт імя А. А. Куляшова» (кандыдат філалагічных навук, дацэнт *В. М. Шаршнёва*); настаўнік беларускай мовы і літаратуры вышэйшай кваліфікацыйнай катэгорыі ўстановы адукацыі «Мінскі дзяржаўны абласны ліцэй» *А. Б. Паўлава*

**Электронны дадатак для павышанага ўзроўню размешчаны на рэсурсе profil.adu.by**

**Умоўныя абазначэнні:**

— правіла;

— рубрыка «Успамінаем вывучанае»;

— рубрыка «Скарбы мовы»;

— заданні, накіраваныя на ўзбагачэнне слоўнікавага запасу вучняў;

• — дадатковыя пытанні і заданні, накіраваныя на замацаванне ведаў і уменняў па раней вывучаных тэмах;

— заданні творчага характару, накіраваныя на развіццё звязнага маўлення вучняў;

— дадатковы матэрыял, размешчаны на электронным адукацыйным рэсурсе «Беларуская мова. 11 клас» (нацыянальны адукацыйны партал http://e-vedy.adu.by);

— спасылкі на дадатковы матэрыял (QR-коды) для вывучэння і праверкі ведаў пры дапамозе смартфона або планшэта;

— матэрыял электроннага дадатку, які вывучаецца на павышаным узроўні, размешчаны на рэсурсе http://profil.adu.by;

*гоні*[*] — лексічнае значэнне слова тлумачыцца ў слоўніку;
*смяецца*[ф] — зрабіць фанетычны разбор слова;
*продкі*[л] — зрабіць лексічны разбор слова;
*перакліканіся*[с] — разабраць слова па саставе;
*саматканы*[сл] — зрабіць словаўтваральны разбор слова;
*прадметнасць*[м] — зрабіць марфалагічны разбор слова;
*Пачалася завіруха.*[сн] — зрабіць сінтаксічны разбор сказа.

ISBN 978-985-594-975-7
© Афармленне. НМУ «Нацыянальны інстытут адукацыі», 2021

Правообладатель Национальный институт образования

# Агульныя звесткі аб мове

## § 1. Мова і маўленне.<br>Веданне мовы і валоданне мовай

**Мова — найважнейшы сродак зносін (узаемаадносін) паміж людзьмі, бо менавіта праз мову (у параўнанні з іншымі сродкамі — мімікай, жэстамі, музыкай, жывапісам) чалавек найбольш поўна выяўляе сябе, свой унутраны свет. Асноўная функцыя мовы — камунікатыўная, або функцыя зносін.**

**Мова — гэта арганізаваная сістэма лінгвістычных сродкаў. Мова ёсць сістэма зна́кавая. Кожны моўны знак, як і любы іншы, нясе інфармацыю, ма́е форму і змест (напрыклад, *слова, сказ, тэкст*). Моўная сістэма складаецца з мноства адзінак (гукаў, марфем, слоў, словазлучэнняў, сказаў, тэкстаў) і правіл іх спалучэння. Усе гэтыя элементы моўнай сістэмы знаходзяцца ва ўзаемасувязі і ўтвараюць цэласнае адзінства, сукупнасць лагічных і граматычных сродкаў для выказвання думак і наладжвання ўзаемаадносін паміж людзьмі.**

**1.** Спішыце сказы, раскрываючы дужкі, устаўляючы прапушчаныя літары і ставячы неабходныя знакі прыпынку. Абгрунтуйце свой выбар.

1. Любіце і шануйце як св..тыню роднае слова з якім вас літасцівы Бог на свет пусціў *(Ф. Скарына)*. 2. Трэба любіць ведаць і шанаваць мову свайго народа і ўмець дасканала валодаць ..ю *(Я. Колас)*. 3. Толькі пра*(з/с)* родную мову чалавек можа стаць беларусам бо ў ёй хімія і фізіка *(г/?)*історыя і батаніка эканоміка і культура таго што называецца нац..яй народам *(Я. Сіпакоў)*. 4. Хто забыў сваіх продкаў[ф] — с..бе губля.. хто забыў сваю мову — усё згубіў *(У. Караткевіч)*. 5. Мова не можа быць дрэннай або добрай... Бо мова — гэта толькі люстэрка. Тое самае люстэрка на якое *(не)*льга



Правообладатель Национальный институт образования

наракаць *(С. Даўлатаў)*. 6. На..вялікшае багацце народа яго мова! Тысячагод..ямі назапашваюцца і вечна жывуць у слове *(не)*злічоныя скарбы чалавечай думкі і *(в/?)*опыту *(М. Шолахаў)*.

Растлумачце, як вы разумееце прыведзеныя выказванні пра мову.
● Падкрэсліце словы, у якіх адбываецца падаўжэнне зычных.

**2.** Прачытайце слоўнікавы артыкул з «Этымалагічнага слоўніка фразеалагізмаў».

**Вавілонскае стоўпатварэнне** — ‘поўная неразбярыха, беспарадак, гармі́дар’. Устойлівы выраз узнік на аснове біблейскага сюжэта (Быццё, 11, 1—9), як жыхары старажытнага горада Вавілона (на тэрыторыі сучаснага Ірака) задумалі зрабіць вялізную вежу — аж да самага неба.

Будаўніцтва вежы было спынена ўгневаным Богам: ён «змяшаў» мовы будаўнікоў, і яны загаварылі на розных мовах, не разумеючы адзін аднаго. Людзям стала не да вежы, бо падняўся страшэнны гвалт, вэрхал — тое, што мы цяпер называем вавілонскім стоўпатварэннем. Назоўнікавы кампанент фразеалагізма ўтварыўся сінтаксічным спосабам, зрашчэннем двух слоў (столпа + творенье) у адно *(Паводле І. Лепешава)*.

Як вы думаеце, добра або дрэнна, што на Зямлі жыве шмат народаў, кожны са сваёй мовай, сваёй культурай, сваімі звычаямі? Абгрунтуйце сваё меркаванне.

Якую інфармацыю мы можам атрымаць у слоўніку фразеалагізмаў, этымалагічным слоўніку фразеалагізмаў, руска-беларускім слоўніку фразеалагізмаў, беларуска-рускім слоўніку фразеалагізмаў?

Маўленне — выкарыстанне моўных адзінак у працэсе зносін. Маўленне — гэта маўленчая дзейнасць асобы, канкрэтнае выказванне (тэкст) у вуснай або пісьмовай форме. Маўленне — з’ява індывідуальная, якая залежыць ад мэты ўзаемаадносін, маўленчай сітуацыі і сферы зносін. Сапраўды, любое наша выказванне мае на мэце або паведаміць штосьці субяседніку, або абмяняцца думкамі, уражаннямі, або ўздзейнічаць на слухача (чытача), пераканаць яго, пабудзіць да пэўнага ўчынку.

Маўленне адбываецца ў канкрэтнай маўленчай сітуацыі. Любое наша выказванне залежыць ад таго, *дзе* мы гаворым (у афіцыйных або неафіцыйных абставінах), з *кім* (з адным чалавекам ці з многімі) і з *якой мэтай*. Маўленне можа рэалізоўвацца ў вус-



Правообладатель Национальный институт образования

най або пісьмовай форме, успрымацца на слых або зрокава. Вусней або пісьмовай формай маўлення карыстаюцца ў залежнасці ад задач маўленчых зносін.

Характар маўлення залежыць і ад сферы, у якой адбываюцца зносіны: навуковай, публіцыстычнай, афіцыйнай, мастацкай, бытавой. Адпаведна вылучаюцца функцыянальныя стылі, якія вызначаюцца не толькі сферай зносін, але і тыповай функцыяй маўлення. Так, гутарковы стыль найперш характарызуецца функцыяй зносін, навуковы і афіцыйны — функцыяй паведамлення, мастацкі і публіцыстычны звязаны з функцыяй уздзеяння.

**3.** Дапоўніце выказванні. Якія з прыведзеных азначэнняў суадносяцца са словам *мова*, а якія — са словам *маўленне*? Абгрунтуйце свой адказ.

а) ... — сістэма сродкаў, якія забяспечваюць зносіны;
б) ... — найважнейшы сродак зносін паміж людзьмі;
в) ... — працэс выкарыстання моўных адзінак для перадачы пэўнага зместу;
г) ... — з’ява сацыяльная (грамадская), ... — з’ява індывідуальная.

**4.** З прыведзеных слоў складзіце словазлучэнні са словамі *мова* і *маўленне*. Якія з прыведзеных слоў могуць па сэнсе спалучацца і са словам *мова*, і са словам *маўленне*? Словазлучэнні запішыце.

1. Вывучаць, ведаць, выкладаць, развіваць, чуць, разумець.
2. Цяжкі, пісьменны, правільны, родны.

**5.** Прачытайце выказванне французскага філосафа-асветніка XVIII ст. Як вы разумееце сэнс гэтага выказвання? Ці згодны вы з думкай аўтара?

Усе найбольш галоўныя замежныя мовы можна вывучыць за шэсць гадоў, але для вывучэння сваёй недастаткова і цэлага жыцця *(Вальтэр)*.

***Звярніце ўвагу!***

**Валоданне мовай** — гэта здольнасць чалавека разумець і сінтэзаваць выказванні, што звязана з наступнымі ўменнямі:

1) адрозніваць правільныя выказванні ад няправільных;

2) дыферэнцыраваць падобныя па форме, але розныя па сэнсе выказванні;



Правообладатель Национальный институт образования

3) умець перафразіраваць — выбіраць з некалькіх магчымых сродкаў выказвання найбольш адэкватныя канкрэтнай камунікатыўнай сітуацыі. Валоданне мовай прадугледжвае не толькі пасіўнае ўспрыманне, але і актыўнае выкарыстанне мовы *(Слоўнік-даведнік «Тэрміны і паняцці лінгвістыкі»).*

**6.** Прачытайце пераклад тэксту, выкананы Google-перакладчыкам. Знайдзіце і выправіце памылкі. Растлумачце сваю думку. Запішыце выпраўленыя сказы.

Компьютерные технологии — это обобщенное название технологий, отвечающих за хранение, передачу, обработку, защиту и воспроизведение информации с использованием компьютеров. Невозможно представить себе современные области производства, науки, культуры, спорта и экономики, где не применялись бы компьютеры. Компьютеры помогают человеку в работе, развлечении, образовании и научных исследованиях. Компьютерные технологии — это передний край науки XXI в.

Как научная дисциплина компьютерные науки возникли в середине 30-х годов XX в. в результате слияния теории алгоритмов и математической логики, а также изобретения электронных вычислительных машин (компьютеров).

*Э. М. Кравченя*

Камп’ютэрныя тэхналогіі — гэта абагульненае назву тэхналогій, якія адказваюць за захоўванне, перадачу, апрацоўку, абарону і прайграванне інфармацыі з выкарыстаннем кампутараў. Немагчыма ўявіць сабе сучасныя галіне вытворчасці, навукі, культуры, спорту і эканомікі, дзе не ўжываліся б кампутары. Кампутары дапамагаюць чалавеку ў працы, забаўцы, адукацыі і навуковых даследаваннях. Камп’ютэрныя тэхналогіі — гэта пярэдні край навукі XXI ст.

Як навуковая дысцыпліна кампутарныя навукі паўсталі ў сярэдзіне 30-х гадоў XX ст. у выніку зліцця тэорыі алгарытмаў і матэматычнай логікі, а таксама вынаходніцтвы электронных вылічальных машын (кампутараў).

Правообладатель Национальный институт образования

# Стылістыка

## § 2. Функцыянальныя стылі маўлення. Стылеўтваральныя моўныя сродкі

§ 2–1

§ 2–2

§ 2–3

§ 2–4

§ 2–5

**Стыль** (ад грэч. *stylos* — ‘завостраная палачка для пісьма’) — разнавіднасць маўлення, якая характарызуецца асаблівасцямі адбору, арганізацыі моўных сродкаў у залежнасці ад задач камунікацыі.

**Стылістыка** — лінгвістычная дысцыпліна, якая вывучае заканамернасці выкарыстання моўных сродкаў у залежнасці ад зместу, мэты і сітуацыі выказвання, ад ужывання ў розных сферах чалавечай дзейнасці (навуцы, мастацтве, палітыцы, афіцыйных і штодзённых (бытавых) зносінах).

З улікам функцый мовы і сферы зносін адрозніваюць функцыянальныя стылі.

**Функцыянальны стыль** — разнавіднасць літаратурнай мовы, замацаваная за пэўнай сферай грамадска-маўленчай практыкі. Функцыянальныя стылі характарызуюцца ўжываннем моўных сродкаў у залежнасці ад знешніх, нямоўных фактараў: *формы зносін* (пісьмовая/вусная, маналагічная/дыялагічная), *мэты зносін* (волевыяўленне, паведамленне інфармацыі, эмацыянальнае і эстэтычнае ўздзеянне, камунікацыя), *характару ўзаемаадносін* (афіцыйны, неафіцыйны).

Выдзяляюць наступныя функцыянальныя стылі: навуковы, афіцыйны, публіцыстычны, мастацкі (стыль мастацкай літаратуры) і гутарковы.

Кожны функцыянальны стыль вылучаецца асаблівасцямі на ўзроўні лексікі, марфалогіі, сінтаксісу.

Усе моўныя стылі, акрамя гутарковага, — *кніжныя*. Гутарковы з’яўляецца стылем *вуснага маўлення*.



Правообладатель Национальный институт образования

**7.** Дапоўніце схему класіфікацыі функцыянальных стыляў.




З апорай на схему раскажыце пра класіфікацыю функцыянальных стыляў.

**8.** Прачытайце тэкст. Як вы думаеце, чаму жанчына па-рознаму расказала сваю гісторыю ў першым і ў другім выпадку? Ахарактарызуйце, чым абумоўлены асаблівасці яе маўлення.

Там (у шумным кафэ пры абласной гасцініцы), перада мной адным, яна ні на хвілінку не бянтэжылася, нават калі расказвала пра самыя інтымныя свае пачуцці і перажыванні. Гаварыла проста, натуральна, дзе з болем, дзе з абурэннем, а дзе і з гумарам, хоць смешнага ва ўсёй гэтай гісторыі было мала.

А тут (у кабінеце сакратара абкама) ніяк не магла пачаць сваю споведзь... Нарэшце Пятро Гаўрылавіч не вытрымаў, сказаў амаль афіцыйна:

— Слухаю вас, Міхаліна Казіміраўна.

І тады яна пачала расказваць. І ўжо ў першыя хвіліны я здзівіўся: гэта быў зусім іншы расказ, больш таго — іншага чалавека. Не, яна расказвала тое ж самае, нават, калі хочаце, больш лагічна, паслядоўна і спакойна, толькі карацей — менш падрабязнасцей і менш здагадак пра думкі і намеры людзей, якія мелі дачыненне да яе лёсу. І менш даверлівасці, больш стрыманасці. Увогуле гэта натуральна: адна справа — расказваць пісьменніку, другая — сакратару абкама, у кабінеце, дзе сама абстаноўка прымушала да стрыманасці і нават да некаторай афіцыйнасці *(І. Шамякін)*.

Практ. 8–1

**9.** Прачытайце матэрыял, у якім даецца апісанне стыляў паводле асноўных прымет, па якіх характарызуецца любы́ стыль.

Вызначце, прыметы якіх стыляў маўлення прыведзены ў табліцы. Раскажыце з апорай на табліцу пра гэтыя стылі.



Правообладатель Национальный институт образования

| Сфера выкарыстання | Задачы маўлення | Стылёвыя рысы | Асноўныя жанры | Характэрныя моўныя сродкі |
|---|---|---|---|---|
| Асвета, навука: у падручніках, навуковых працах, выступленнях і паведамленнях на розныя навуковыя тэмы | Паведаміць дакладныя звесткі і факты, якія маюць тэарэтычнае значэнне, растлумачыць іх | Дакладнасць, доказнасць, лагічнасць, сціслаcць. Мае форму маналогу. Адносіны да з'яў і падзей не выражаны | Навуковы артыкул, рэферат, энцыклапедыя, манаграфія, навукова-тэхнічная літаратура, даклады і выступленні на навуковую тэму | Навуковыя тэрміны. Словы з абагульненым і адцягненым значэннем. Дзеясловы ў форме 3-й асобы цяперашняга часу са значэннем пастаяннага дзеяння. Простыя развітыя і складаныя сказы |
| Афіцыйныя зносіны, справаводства, заканадаўства | Паведаміць звесткі, якія маюць практычнае значэнне, даць дакладныя парады, указанні | Прадпісальны характар маўлення, афіцыйнасць, дакладнасць, высокая ступень стандартызацыі зместу. Мае форму маналогу. Адносіны да з'яў і падзей не выражаны | Законы, пастановы, указы, афіцыйныя паведамленні, дагаворы і пагадненні, а таксама аб'явы, заявы, даверанасці, распіскі, справаздачы, аўтабіяграфіі | Афіцыйныя словы і выразы. Назоўнікі, утвораныя ад дзеясловаў і прыметнікаў з суфіксамі ***-анн-, -енн-, -асць-, -ств-***. Дзеясловы ў форме 3-й асобы са значэннем «так прынята рабіць». Сказы развітыя, аднасастаўныя |
| Грамадска-палітычная дзейнасць: газеты, часопісы, выступленні | Паведаміць інфармацыю, якая мае грамадска-палітычнае значэнне; уздзейнічаць на думкі і пачуцці людзей | Эмацыянальнасць, доказнасць, пабуджальнасць, даходлівасць, надзённасць | Выступленне, артыкул, нататка, інфармацыя, рэпартаж, фельетон, інтэрв'ю і інш. | Грамадска-палітычная лексіка і фразеалогія. Ацэначныя і эмацыянальна-экспрэсіўныя словы. Трапныя метафары і параўнанні. Развітыя звароткі. Рытарычныя пытанні, воклічы, паўторы |



Правообладатель Национальный институт образования

**10.** Прачытайце тэкст. Вызначце яго стыль. Абгрунтуйце сваё меркаванне. Выпішыце азначэнні выдзеленых лінгвістычных тэрмінаў.

### Лексічнае значэнне слова

**Слова** — найменшая сэнсавая адзінка мовы. У працэсе маўленчых зносін яно ўзнаўляецца свабодна — гэта значыць не патрабуе спалучэння з іншымі моўнымі адзінкамі, як, напрыклад, марфема. Слова ўспрымаецца ў гарманічным адзінстве формы і зместу.[сн] У нашай свядомасці адлюстроўваецца фізічнае, матэрыяльнае аблічча слова — гукавы комплекс, у якім яно ўвасабляецца. Змест слова складае яго лексічнае значэнне. Змест і форма ўзаемазвязаны. Як не можа існаваць слова, пазбаўленае гукавой абалонкі, так не можа існаваць слова, пазбаўленае сэнсу.

Словы выконваюць у мове намінатыўную функцыю (функцыю называння) і служаць для абазначэння прадметаў, іх якасцей, стану, прымет дзеяння, колькасці. Гэтыя абагульненыя значэнні прадметнасці[м], прыметы, працэсуальнасці, колькасці не лагічныя, а граматычныя, яны даюць падставу для вылучэння назоўнікаў, прыметнікаў, дзеясловаў, лічэбнікаў і іншых граматычных класаў слоў.

Для граматыкі лексічная індывідуальнасць такіх слоў, як, напрыклад, *жыта* і *мора*, не істотная, таму што фармальныя прыметы прадметнасці гэтых семантычна розных слоў супадаюць. З пункту погляду лексікі ў гэтых словах самае важнае тое, што яны маюць розныя лексічныя значэнні і тым самым адмежаваны адно ад аднаго ў сістэме мовы.

**Лексічнае значэнне** — гэта суаднесенасць слова з адпаведным паняццем, з’явай рэчаіснасці *(І. Шкраба)*.

**11.** Прачытайце прыведзены аналіз тэксту. Ахарактарызуйце будову тэксту паводле тыпу маўлення.

Разгледзім асаблівасці навуковага стылю, адлюстраваныя ў тэксце. Тэкст уяўляе сабой дэталёвае апісанне лінгвістычных паняццяў *слова*, *лексічнае значэнне* слова.

Лексіка тэксту характарызуецца актыўным выкарыстаннем лінгвістычнай тэрміналогіі: *моўная адзінка, гукавы комплекс, намінатыўная функцыя, граматычнае значэнне, лексічнае значэнне* і г. д. Пераважае абстрактная лексіка: *форма, змест, сэнс, функцыя, дзеянне, працэсуальнасць, прадметнасць* і г. д. Ужыванне тэрмінаў,



Правообладатель Национальный институт образования

слоў у прамым намінатыўным значэнні забяспечвае такія рысы навуковага стылю, як адназначнасць, аб’ектыўнасць, лагічнасць. У тэксце паўтараюцца ключавыя адзінкі *слова*, *лексічнае значэнне*, што не з’яўляецца таўталогіяй, недахопам, паколькі падкрэслівае актыўнасць ужывання тэрмінаў, немажлівасць замяніць іх сінонімамі.

На марфалагічным узроўні тэкст характарызуецца пераважным ужываннем назоўнікаў, паколькі задача аўтара — раскрыць змест лінгвістычных паняццяў. На сінтаксічным узроўні тэксту ўласцівы прамы парадак слоў у сказе (за выключэннем двух выпадкаў). Шырока ўжываюцца сказы, ускладненыя аднароднымі членамі сказа, што падкрэслівае аднатыпнасць, аднапарадкавасць моўных адзінак.

Тэкст завяршаецца дакладным, лагічным азначэннем паняцця «лексічнае значэнне», якое падсумоўвае назіранні даследчыка за зместавымі і граматычнымі прыметамі слова. Такім чынам, з улікам агульных уласцівасцей (інфармацыйнасць, лагічнасць, доказнасць), лексічных, марфалагічных і сінтаксічных прымет можна сцвярджаць, што тэкст належыць да навуковага стылю.

Раскрыйце значэнне слова *таўталогія*.

Пацвердзіце прыкладамі з тэксту шырокае ўжыванне сказаў, ускладненых аднароднымі членамі.

Прывядзіце прыклады ўжывання ў тэксце адваротнага парадку слоў у сказе.

Раскажыце на аснове тэксту аб стылеўтваральных магчымасцях моўных адзінак у тэксце навуковага стылю.

Практ. 11–1, 11–2

**12.** Прачытайце тэкст. На яго аснове раскажыце пра асаблівасці публіцыстычнага стылю.

Прызначэнне публіцыстыкі — паведамляць навіны штодзённага жыцця, культуры, навукі, растлумачваць грамадска-палітычныя пытанні. Гэтым выклікана, з аднаго боку, выкарыстанне грамадска-палітычнай тэрміналогіі, з другога боку — моўных сродкаў для выказвання настрою, пачуццяў, у прыватнасці эмацыянальна-экспрэсіўнай лексікі. У публіцыстычным творы арганічна спалучаюцца лагічна-абстрактная, або навуковая, і эмацыянальна-вобразная, або мастацкая, формы адлюстравання рэчаіснасці. Разгледзім некаторыя стылёва-моўныя рысы наступнага тэксту:

*Кніга — гэта вечны, незгасальны агонь людскога сэрца і розуму. На працягу вякоў яна была адным з самых поўных сродкаў перадачы вопыту з пакалення ў пакаленне. Яна адзіны жывы сведка чалавечага*



Правообладатель Национальный институт образования

*прагрэсу. Не зважаючы на новыя тэхнічныя сродкі фіксацыі і перадачы гэтага вопыту ў нашу эпоху, кніга і цяпер служыць і надалей будзе нязменна служыць чалавеку* («Помнікі гісторыі і культуры Беларусі»).

Тэкст вызначаецца актуальнасцю тэмы (значэнне кнігі, ведаў). Яму ўласцівы пафаснасць, узнёсласць; наяўнасць словазлучэнняў, характэрных для публіцыстычнага стылю*: незгасальны агонь, жывы сведка, наша эпоха, нязменна служыць* і г. д. З дапамогай гэтых моўных сродкаў перадаецца адкрытая ацэначнасць, эмацыянальнасць маўлення. Аўтарская[м] пазіцыя адлюстроўвае пашыраны ў грамадстве пункт погляду *(А. Каўрус)*.

Практ. 12–1, 12–2

**13.** Прачытайце размову з вядомым скульптарам, прафесарам, загадчыкам кафедры скульптуры Беларускай дзяржаўнай акадэміі мастацтваў Уладзімірам Іванавічам Слабодчыкавым, аўтарам мемарыяльнага знака «Залаты фаліянт», які быў урачыста адкрыты ў верасні 2008 года ў парку культуры і адпачынку імя Горкага ў Барысаве (Мінская вобласць) да 15-годдзя святкавання Дня беларускага пісьменства.




— *Уладзімір Іванавіч, патлумачце, у чым арыгінальнасць задумкі «Залатога фаліянта».*

— Мемарыяльны знак уяўляе сабой скульптуру ў выглядзе жанчыны, якая трымае над галавой кнігу. Такі ж самы выгляд мела аднайменная бронзавая статуэтка, якая ўручалася пераможцам 46-га рэспубліканскага конкурсу «Мастацтва кнігі».

Жаночы вобраз — гэта сімвал жаночага пачатку і пачатку ўсяго ў прынцыпе. Але гэта жаночая постаць вельмі стылізавана. Гэта, хутчэй, проста сілуэт, які не павінен адцягваць ад галоўнага — ад фаліянта. Сам фаліянт уяўляе сабой аб'ёмны малюнак кнігі, дзе дакладна відаць дзве старонкі. На першай я зрабіў дакладную копію першай старонкі скарынаўскай Бібліі, вядомай усім, на другой — яшчэ адзін малюнак самага першага кнігавыдаўца Беларусі.

— *Такім чынам, пры стварэнні і бронзавай статуэткі, і памятнага знака вы адштурхоўваліся ад вытокаў беларускага кнігадрукавання.*



Правообладатель Национальный институт образования

— Сапраўды так. Мы вярнуліся да самай першай кнігі, выпушчанай на старабеларускай мове нашым суайчыннікам Ф. Скарынам. І тут усё становіцца вельмі сімвалічным: проста кніга, самая першая кніга і кніга за найлепшую кнігу (маецца на ўвазе ўзнагарода ў конкурсе). Мне гэта ідэя здаецца ўдалай, бо яна праверана часам і на працягу гадоў будзе актуальнай, хоць я дапускаю, што магчымы сякія-такія змены ці дапаўненні. У гэтай традыцыйнасці закладзена ўсё тое, што я хацеў выказаць...

Вызначце стыль і жанр маўлення. Назавіце характэрныя прыметы гэтага стылю, пацвердзіце свой адказ прыкладамі з тэксту. У чым асаблівасць будовы тэксту, створанага ў гэтым жанры?

Якое пытанне вы маглі б задаць аўтару бронзавай статуэткі і памятнага знака? Сфармулюйце і запішыце гэта пытанне.

Разгледзьце малюнак бронзавай статуэткі і памятнага знака (на вокладцы вучэбнага дапаможніка). Апішыце скульптуру з апорай на тэкст.

**14.** Запішыце тэкст па-беларуску.

Служебные документы обладают следующими обязательными качествами:

достоверность и объективность,

точность, исключающая двоякое понимание текста,

максимальная краткость, лаконичность формулировок,

безупречность в юридическом отношении,

стандартность языка при изложении типовых ситуаций делового общения,

нейтральный тон изложения,

соответствие нормам официального этикета, которое проявляется в выборе устойчивых форм обращения и соответствующих жанру слов и словосочетаний, в построении фразы и всего текста *(Г. Солганик)*.

## Слоўнік

*обладать* — валодаць, мець
*достоверность* — дакладнасць
*двоякий* — дваякі
*безупречность* — бездакорнасць
*изложение* — выклад
*краткость (сжатость)* — кароткасць (сцісласць)



Правообладатель Национальный институт образования

**15.** Як вядома, *заява* — гэта пісьмовая просьба, напісаная паводле ўстаноўленай формы. Прааналізуйце ўзор заявы.

Заява
22.09.2020

Рэктару Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта
прафесару Каралю А. Д.
выкладчыка кафедры гісторыі Беларусі новага і навейшага часу
Акуневіча В. У.

Прашу дазволіць выкарыстанне архіўных матэрыялаў бібліятэкі для афармлення выстаўкі, прысвечанай юбілею ўніверсітэта.

В. У. Акуневіч (подпіс)

Якая мэта напісанай заявы?
Назавіце часткі, на якія можна падзяліць тэкст заявы.
Вызначце асаблівасці дакумента, якія сведчаць пра яго прыналежнасць да афіцыйнага стылю.

Практ. 15–1–15–3

**16.** Прачытайце табліцу. Раскажыце на яе аснове пра мастацкі і гутарковы стылі ў параўнальным плане.

| Сфера выкарыстання | Задачы маўлення | Стылёвыя рысы | Асноўныя жанры | Характэрныя моўныя сродкі |
|---|---|---|---|---|
| Творы мастацкай літаратуры і вуснай народнай творчасці | Вобразна, маляўніча апісаць словамі які-небудзь прадмет ці з'яву, выказаць свае адносіны | Канкрэтнасць, вобразнасць, маляўнічасць. Мае форму дыялогу і маналогу. Адносіны да падзей і з'яў выражаны | Верш, паэма, апавяданне, аповесць, раман, камедыя, загадка, байка, балада і інш. | Словы з канкрэтным значэннем. Словы з пераносным значэннем. Эмацыянальна-ацэначныя словы. Сказы апавядальныя, пытальныя і клічныя. Сказы з аднароднымі членамі |
| Бытавая | Абмен думкамі, пачуццямі | Жывасць, непасрэднасць. Мае форму дыялогу. Адносіны да падзей і з'яў выражаны | Бытавая гутарка, размова | Гутарковыя словы і выразы. Эмацыянальна-ацэначныя словы. Словы з пераносным значэннем. Розныя па мэце выказвання сказы. Сказы са звароткамі, з простай мовай |

Практ. 16–1–16–4



Правообладатель Национальный институт образования

**17.** Прачытайце тэкст. Назавіце лексічныя, марфалагічныя і сінтаксічныя рысы гутарковага стылю.

...Дзядзька Хрол спакойна, разважліва гаворыць:

— От ты глядзі сюды. Усё нам купіць трэба. А вось зямля, лес, поле — усё як быццам нехта так аддае: тамацька ягадзіну возьмеш, тутацька грыб паднімеш, а то арэхаў натрасеш — бачыш, ужо і наеўся. З дрэва дошак напіліш, а з дошкі і на чым есці, і на чым сядзець, і на чым спаць змайструеш. А вазьмі паветра. Вось што, мусіць, самае смачнае з усіх страў, якія ведаюць людзі. Гэта табе не цукеркі, якія, скажам, заманулася раз у год. А паветра кожную[м] мінуту трэба. А вось вы, мальцы, не ведаеце, што такое *маладня, гром*. А гэта ж хмара аб хмару цярнецца — вось вам і іскры, і маладня. Якраз як крэсівам аб крэмень. Ці, скажам, паспрабуй жалезам аб жалеза з разгону цярнуць. Во вам шуму будзе, во грому! А вы не глядзіце, што хмары здаюцца мяккімі, як кудзеля*, у іх вунацькі якая сіла *(Паводле Я. Сіпакова)*.

Практ. 17–1, 17–2

**18.** Прачытайце дыялогі, перадаючы інтанацыяй адпаведны сэнс.

Чым адрозніваецца дыялог у мастацкім тэксце ад дыялогу ва ўласна гутарковым маўленні? Як «прысутнасць» аўтара адбіваецца на характары дыялогу ў мастацкім творы?

Адзін аўцюковец вельмі бедаваў: сыну пяты год, а ён не гаворыць. Аднойчы сядзяць у хаце, а ў печы бульба варыцца. Раптам сын, які не ўмеў гаварыць, крычыць:

— Бульба згарэла!

Бацькі кінуліся да печы і бачаць: агонь выпарыў з чыгуна ўсю ваду, паліць клубні. Падбягаюць да дзіцяці:

— Сыночак, родненькі, а чаму ж ты так доўга маўчаў?

— Дагэтуль бульба ніколі не падгарала...

Ці не так і ў дарослым жыцці? Толькі тады пазнаём бяду, калі яна пераступае парог. Толькі тады пачынаем разумець чалавека, калі ён у адчаі крычыць...

Гудзе сход у Аўцюках: абмяркоўваюць ход пасяўной. Старшыня нечакана падымае трактарыста і просіць выступіць:

— Іван, скажы, што думаеш.

Маўчыць Іван. А сход пачынае шумець. Старшыня нервуецца:

— Давай, не цягні ката за хвост.

Урэшце Іван азваўся:

— Міхайлавіч, думкі пруць, а слоў няма, — сказаў і прысеў.

Сход хіхікнуў, і чамусьці ўсе запляскалі ў ладкі *(У. Ліпскі)*.



Правообладатель Национальный институт образования

**19.** Дапоўніце выказванні. Устаўце на месцы пропускаў назву адпаведнага стылю.

1. … стыль — гэта стыль дзяржаўных дакументаў, указаў, законаў і кодэксаў.
2. … стыль характарызуецца аб’ектыўнасцю, лаканічнасцю выкладу, інфармацыйнай насычанасцю, ужываннем слоў-тэрмінаў.
3. Галоўнае адрозненне … стылю ад іншых у тым, што яго моўныя сродкі разлічаны не толькі на паведамленне, перадачу пэўнай інфармацыі, але і на эмацыянальнае ўздзеянне.
4. Асноўная асаблівасць … стылю — гэта адзінства камунікатыўнай і эстэтычнай функцый.
5. У … стылі вялікую ролю адыгрываюць жэсты, міміка, поза як сродак зносін, інтанацыя.

**20.** Устанавіце адпаведнасць паміж стылямі і прыведзенымі прыметамі.

| | |
|---|---|
| 1. Навуковы | А. Спалучэнне дакладнай інфармацыі і эмацыянальнага ўздзеяння на слухача (чытача). |
| 2. Афіцыйны | Б. Інфармацыйнасць, аб’ектыўнасць, лагічнасць, аргументаванасць. |
| 3. Публіцыстычны | В. Адназначнасць, недвухсэнсоўнасць фармулёвак, устойлівасць, стандартызаванасць формы. |
| 4. Мастацкі | Г. Неафіцыйнасць, нязмушанасць зносін, непадрыхтаванасць маўлення. |
| 5. Гутарковы | Д. Эстэтычная значнасць выкарыстаных сродкаў, індывідуальнасць, самабытнасць, вобразнасць слова. |

§ 2–6

§ 2–7

§ 2–8

§ 2–9

**21.** Вызначце, для якіх стыляў маўлення характэрна выкарыстанне наступных слоў і выразаў.

1. Безадкладна, ніжэйназваны, наяўнасць, паведамленне, абанент, адказчык, выпіска з загада, ажыццяўляць кіраўніцтва.
2. Аналіз, сінтэз, эксперымент, пошук, вывады, абагульненне фактаў, прыйсці да высновы, факты пацвярджаюць.
3. Грамадства, сацыяльны заказ, прагрэсіўнае чалавецтва, агульначалавечыя каштоўнасці, мараль.
4. Браток, суседачка, гразюка, лухта́, вушы вянуць, капрызуля, зубы загаворваць, залікоўка.
5. Ветразь, анёл, аснежыць, веснавей, пясняр, ба́рва.



Правообладатель Национальный институт образования

# Сінтаксічныя і пунктуацыйныя нормы

**Сінтаксічныя нормы** беларускай мовы выяўляюць правілы пабудовы словазлучэнняў і сказаў. Сінтаксічныя нормы грунтуюцца на асаблівасцях ужывання слоў у словазлучэнні і сказе, правілах сувязі дзейніка і выказніка.

**Пунктуацыйныя нормы** — гэта правілы ўжывання знакаў прыпынку для афармлення пэўных сінтаксічных адзінак. Нарматыўнае пунктуацыйнае афармленне пісьмовага тэксту азначае адпаведнасць ужытых пунктуацыйных знакаў сінтаксічнаму і сэнсаваму характару тэксту. Парушэнні пунктуацыйных норм кваліфікуюцца як пунктуацыйныя памылкі.

***Звярніце ўвагу!***

Ад пунктуацыйных памылак неабходна адрозніваць нарматыўныя пунктуацыйныя варыянты, якія выбіраюцца ў залежнасці ад канкрэтных задач выказвання і з'яўляюцца вынікам рознага асэнсавання сказаў. Прыкладам пунктуацыйных варыянтаў могуць быць знакі прыпынку, якія служаць для афармлення бяззлучнікавых складаных сказаў.

§ 0–3

§ 1–3

§ 2–3

## § 3. Нормы дапасавання і кіравання ў беларускай мове

**Правілы дапасавання** ў беларускай мове заключаюцца ў наступным:

1. Лічэбнікі ***два, дзве, тры, чатыры, абодва, абедзве*** дапасуюцца ў форме назоўнага склону множнага ліку (*дзве вёскі, абодва браты*). Азначэнні пры такіх назоўніках таксама ўжываюцца ў назоўным склоне множнага ліку: *дзве перспектыўныя вёскі, абодва старэйшыя браты.*



Правообладатель Национальный институт образования

Асобныя назоўнікі жаночага роду пры **простых лічэбніках** *дзве, тры, чатыры*, а таксама ў **складаных лічэбніках**, якія заканчваюцца на *дзве, тры, чатыры*, ужываюцца ў форме роднага склону адзіночнага ліку (з націскам на канчатку): *дзве нагі, тры сястры, (у) чатыры рукі, дваццаць дзве сасны*. У такіх словазлучэннях тып сінтаксічнай сувязі — кіраванне.

2. **Колькасныя састаўныя лічэбнікі,** якія заканчваюцца на **адзін, два,** дапасуюцца да назоўнікаў у склоне і родзе: *на сямідзесяці дзвюх плошчах, у сямідзесяці двух парках*. Лічэбнікі, якія заканчваюцца на **тры, чатыры,** дапасуюцца да назоўнікаў у склоне: *дваццаці трох старонак*.

3. Усе **парадкавыя лічэбнікі** дапасуюцца да назоўнікаў у родзе, ліку, склоне: *трэцяга сябра, з трэцім сябрам*.

**Правілы кіравання** выяўляюць спецыфіку сінтаксісу беларускай мовы ў параўнанні з рускамоўнымі канструкцыямі:

1. **Дзеясловы ветлівасці** *дзякаваць, выбачаць, дараваць* утвараюць словазлучэнні з давальным склонам назоўніка ці займенніка: *дзякаваць настаўніку, выбачаць суседцы* (у рускай мове ў падобных словазлучэннях ужываецца форма вінавальнага склону: *благодарить учителя, простить соседку*).

2. **Дзеясловы руху** (*пайсці, паехаць, накіравацца*) і **волевыяўлення** (*паслаць, выправіць*) пры абазначэнні мэты дзеяння ўтвараюць сінтаксічныя канструкцыі з прыназоўнікам ***па*** і вінавальным склонам назоўніка ці займенніка: *пайсці па білеты, накіравацца па кветкі* (у рускай мове — прыназоўнік ***за*** і творны склон: *пойти за билетами, направиться за цветами*).

3. Дзеясловы ***жартаваць, смяяцца, кпіць, цешыцца, дзівіцца, здзекавацца*** і г. д. утвараюць словазлучэнні з прыназоўнікам ***з*** і родным склонам назоўніка ці займенніка: *жартаваць з сяброўкі, смяяцца з сястры, здзекавацца з іншых* (у рускай мове — прыназоўнік ***над*** і творны склон: *шутить над подругой, смеяться над сестрой, издеваться над другими*).

4. Дзеясловы ***жаніцца, ажаніцца*** ўтвараюць сінтаксічныя канструкцыі з прыназоўнікам ***з*** і творным склонам назоўніка ці займенніка: *жаніцца з Алесяй, ажаніцца з аднакурсніцай* (у рускай мове — прыназоўнік ***на*** і месны склон): *жениться на Алесе, жениться на однокурснице*).

5. Дзеяслоў ***хварэць*** і прыметнік ***хворы*** ўтвараюць словазлучэнні з прыназоўнікам ***на*** і вінавальным склонам назоўніка:



Правообладатель Национальный институт образования

*хварэць на сухоты, хворы на грып* (у рускай мове — форма творнага склону назоўніка без прыназоўніка: *болеть туберкулёзом, больной гриппом*).

6. Пры форме **вышэйшай ступені параўнання прыметніка** або **прыслоўя** абавязковая сінтаксічная канструкцыя з прыназоўнікам ***за*** і злучнікамі ***як, чым***: *брат старэйшы за мяне (як я, чым я), бацька прыйшоў хутчэй за цябе* (у рускай мове нарматыўная беспрыназоўнікавая канструкцыя: *брат старше меня, отец пришёл быстрее тебя*).

7. **Пры абазначэнні адлегласці** ўжываецца сінтаксічная канструкцыя з прыназоўнікам ***за*** і вінавальным склонам лічэбніка ў колькасна-іменным словазлучэнні: *за пяць крокаў ад прыпынку, за дваццаць метраў ад дома, за дзвесце кіламетраў ад сталіцы* (у рускай мове нарматыўны прыназоўнік ***в*** у згаданых словазлучэннях: *в двух шагах от остановки, в двадцати метрах от дома, в двухстах километрах от столицы*).

**22.** Разгледзьце табліцу. З дапамогай правіла і матэрыялу табліцы падрыхтуйце паведамленне на тэму «Асаблівасці кіравання і дапасавання ў беларускай мове (у параўнанні з рускай мовай)».

| **Беларуская мова** | | | **Руская мова** | | |
|---|---|---|---|---|---|
| Багаты | + | **на што** | Богат | + | **чем** |
| Думаць, ведаць, гаварыць, клапаціцца | + | **пра каго / што** | Думать, говорить, заботиться | + | **о ком / чём** |
| Выбраць | + | **на** (свой густ) | Выбрать | + | **по** (своему вкусу) |
| Загадчык | + | **чаго** | Заведующий | + | **чем** |
| Заляцацца | + | **да каго** | Ухаживать | + | **за кем / чем** |
| Падобны | + | **да каго / чаго** | Похожий | + | **на кого / что** |
| Пазбаўляцца, выракацца | + | **каго / чаго** | Избавляться, отрекаться | + | **от кого / чего** |
| Плакаць, тужыць, сумаваць | + | **па кім / чым** | Плакать, скучать, тосковать | + | **по кому / чему** |



Правообладатель Национальный институт образования

| Беларуская мова | | | Руская мова | | |
|---|---|---|---|---|---|
| Выпраўленне | + | **чаго** (памылак) | Работа | + | **над** (ошибками) |
| Дом | + | **на** (пяць паверхаў) | Дом | + | **в** (пять этажей) |
| Хадзіць, ездзіць, плаваць, лётаць | + | **па чым** | Ходить, ездить, плавать, летать | + | **по чему** |
| Жыць | + | **каля** (мора) | Жить | + | **у** (моря) |
| Змяніцца | + | **на** (лепшае) | Измениться | + | **к** (лучшему) |
| Дзівіцца | + | **з каго / чаго** | Удивляться | + | **кому / чему** |
| Забыцца | + | **на каго / што** | Забыть | + | **о ком / чём, кого / что** |

Складзіце і запішыце 5-6 сказаў з беларускамоўнымі канструкцыямі (на выбар).

**23.** Запішыце спецыфічныя беларускамоўныя канструкцыі да прыведзеных рускамоўных. Пры неабходнасці карыстайцеся даведкай.

Пойти за (ягодами, грибами, орехами), по случаю праздника, раз в неделю, создать по образцу, своими (собственными) глазами видеть, жить по соседству, в другой раз, прошлым летом, быть при деньгах, к праздничному столу, по сообщению, по собственному желанию, из-за лени, сказать по секрету, согласно закону, по выходным дням, читать про себя, день ото дня, приобрести вне очереди.

Для даведкі: *штодзень, набыць без чаргі, чытаць самому сабе, у выхадныя дні, у адпаведнасці з законам, з нагоды свята, стварыць на ўзор, сказаць пад сакрэтам, іншым разам, летась, мець грошы, раз на тыдзень, праз ляноту, па ўласным жаданні, паводле паведамлення, на святочны стол, жыць у суседстве, пайсці ў (ягады, грыбы, арэхі), на свае (уласныя) вочы бачыць.*

Са словазлучэннямі, якія выклікалі цяжкасці пры падборы адпаведнікаў, складзіце і запішыце сказы на беларускай мове.

**24.** Запішыце правільна словазлучэнні, у якіх дапушчаны памылкі ў дапасаванні і кіраванні. Растлумачце прычыны парушэння сінтаксічных норм.

Тры стала, дзве высокіх сасны, чатыры дзявочых постаці, дзякуем вас, пайсці за вадой, падобны маці, загадчык кафедрай, вышэй бацькі,



Правообладатель Национальный институт образования

жаніцца на прыгажуні, пісаць па адрасе, прабачце мяне, гуляць па гарадскім вуліцам, чатыры халодных зімы, паехаў за новай мэбляй, мацней усіх удзельнікаў, гэта нам па сілам, па ўсім накірункам, тры цікавых падручніка, два раза ў месяц.

**25.** Прачытайце.Чаму прыказкі (прымаўкі) называюць залацінкамі народнай мудрасці? Выпішыце адметныя беларускія сінтаксічныя канструкцыі.

1. Хто з каго смяецца[ф], той таму і застаецца. 2. Хто ўсім піддакуе*, таму ніхто не дзякуе. 3. Праз аднаго Іванку ўсім заганка*. 4. Пайшоў Апанас па квас, дык ні Апанаса, ні кваса. 5. Як шкоды наробяць, на госці не ходзяць. 6. Не цешся[ф] з чужой бяды: свая за гоні* ад барады. 7. Лес па сякеры не плача.

Складзіце і запішыце сказы з выпісанымі сінтаксічнымі канструкцыямі.

**26.** Прачытайце тэкст. Падбярыце яму назву. Да кожнага абзаца складзіце і запішыце пытанні, адказы на якія задзейнічалі б найбольш значную інфармацыю. Выпішыце словазлучэнні, што ілюструюць спецыфіку дапасавання і кіравання ў беларускай мове.




**Індустрыяльны** парк «Вялікі камень» — самы **маштабны** сумесны праект Беларусі і Кітая, разлічаны на **дзесяцігоддзі**. У стратэгічна-ўнікальным месцы — **геаграфічным** цэнтры Еўропы, на стыку буйных інтэграцый і на новым Шаўковым **шляху** — ствараецца пляцоўка для дзейнасці **высокатэхналагічных** кампаній з усяго свету.

Парк «Вялікі камень», падобны да сучаснага асілка, знаходзіцца на адлегласці за 25 кіламетраў ад беларускай сталіцы. Побач з цэнтрам — міжнародны аэрапорт «Мінск», чыгунка і **транснацыянальная** магістраль Берлін — Масква.

Па задуме стваральнікаў, з якой ужо ніхто не дзівіцца, «Вялікі камень» павінен стаць сапраўдным экагорадам, дзе сканцэнтраваны інавацыйная вытворчасць і высокі экспартны **патэнцыял**, дзейнічае асаблівы прававы рэжым і забяспечаны аптымальныя ўмовы для вядзення **бізнесу**.



Правообладатель Национальный институт образования

**Тэрыторыя** плошчай больш за 80 км$^2$ аб'ядноўвае прамысловыя і жылыя зоны з адпаведнай інфраструктурай, фінансавы і **навукова-даследчы** цэнтры, офісныя і гандлёва-забаўляльны комплексы.

Ідэя стварэння кітайска-беларускага тэхнапарка ўзнікла ў 2010 годзе. Урачыстая **цырымонія** закладкі першага каменя адбылася 19 чэрвеня 2014 года. Сёння парк, які з'яўляецца самым вялікім праектам у гісторыі двухбаковых адносін Беларусі і Кітая, набывае ўсё большае значэнне *(К. Фурсевіч)*.

- Растлумачце правапіс выдзеленых у тэксце слоў.
- Пракаменціруйце пастаноўку працяжніка ў першым абзацы.
- Выпішыце з тэксту простыя ўскладнены і складаназалежны сказы, зрабіце іх сінтаксічны разбор.

Што вы ведаеце пра тэхнапарк «Вялікі камень»? Падрыхтуйце паведамленне.

**27.** Раскажыце пра сутнасць дапасавання, кіравання і прымыкання. Вызначце від падпарадкавальнай сувязі ў словазлучэннях. Успомніце, якія спалучэнні слоў не з'яўляюцца словазлучэннямі. Прывядзіце прыклады.

Апрануць сукенку, смешнае здарэнне, убачыць яго, з'ехаць з гары, гаварыць услых, глядзець на неба, пяты ўрок, дрэнныя паводзіны, стаяць побач, дом з цэглы, ажаніцца ўвосень, учарашні дзень, сумна пазіраць, надзвычай проста, наступны тыдзень.

Складзіце і запішыце па два сказы са словазлучэннямі з рознымі відамі падпарадкавальнай сувязі.

**28.** Прачытайце разважанні моваведа А. Багамолавай. Запішыце словазлучэнні, якія ілюстравалі б дарэчнае ўжыванне прыназоўнікаў ***пра*** і ***аб***. Складзіце сказы з імі.

Дзеясловы маўлення, думкі, пачуцця *гаварыць, казаць, распытваць, думаць, разважаць, клапаціцца* патрабуюць ад назоўнікаў ці займеннікаў формы **вінавальнага склону** з прыназоўнікам ***пра***: *гаварыць пра адносіны, распытваць пра пачуцці, думаць пра яе*. У рускай мове слова ўжываецца ў форме меснага склону з прыназоўнікам ***о (об)***: *говорить об отношениях, расспрашивать о чувствах, думать о ней*.

Маўленчая практыка паказвае: часта замест канструкцый з прыназоўнікам ***пра*** выкарыстоўваецца словазлучэнне з прыназоўнікам ***аб*** і месным склонам назоўніка (займенніка): *гаварыць аб адносінах*,



Правообладатель Национальный институт образования

*распытваць аб пачуццях, думаць аб ёй*. Абедзве канструкцыі сінанімічныя, аднак трэба ўлічваць, што яны — з розных сфер ужывання. Першая (з прыназоўнікам ***пра***) уласціва мастацкай літаратуры і гутарковаму стылю маўлення. Прыназоўнік ***пра*** ўжываецца пры выражэнні аб'ектных адносін з назоўнікамі ў форме вінавальнага склону: *гаварыць пра мову, думаць пра каханага, разважаць пра эканоміку*.

Канструкцыя з прыназоўнікам ***аб*** уласціва афіцыйнаму, публіцыстычнаму і навуковаму стылям пры выражэнні аб'ектных адносін з назоўнікамі ў форме меснага склону: *Закон аб мове, загад аб залічэнні, паняцце аб дзеяслове*.

Ужыванне прыназоўніка ***аб*** з'яўляецца нарматыўным у наступных выпадках:

- у выразах, у якіх ужыванне прыназоўніка ***пра*** вядзе да немілагучнасці, паўтарэння аднолькавых або падобных складоў: *пра праблемы, пра прыклады*;
- у канструкцыях з вінавальным склонам пры абазначэнні сутыкнення з аб'ектам у выніку руху: *разбіць аб камень, кроплі дажджу стукаюць аб шыбы*[л];
- ва ўстойлівых народных выразах: *аб малаку ног не паваляку́; аб адной вадзе сыт не будзеш*.

- Выпішыце складаны сказ з рознымі відамі сувязі, пабудуйце яго схему.
- Выпішыце назоўнікі, ужытыя ў форме роднага склону адзіночнага ліку. Растлумачце іх правапіс. Запішыце ўласныя прыклады на гэта правіла.

**29.** Прачытайце. Вусна перадайце змест тэксту па-беларуску. Прыведзеныя ў тэксце прыклады запішыце на беларускай мове.

Под *управлением* понимается такая связь слов в предложении, при которой для выражения определённых смысловых отношений то или иное слово требует постановки другого (зависимого) слова в строго определённой позиции. Это может быть имя существительное в определённом падеже с предлогом или без предлога *(служба безопасности, зависеть от обстоятельств)*; неопределённая форма глагола *(начать исследование)*; придаточное предложение *(заявить, что расследование закончено)*. Управление свойственно любой части речи: имени существительному (*план* ч е г о? — *проверки*; *закон* о ч ё м? — *о языке*); прилагательному (*достойный* ч е г о? — *награды, звания, благодарности*; *готовый* к ч е м у? — *к выступлению*; *готовый*



Правообладатель Национальный институт образования

н а ч т о? — *на подвиг*; *заинтересован* в ч ё м? — *в обсуждении*; *дежурный* п о ч е м у? — *по классу*); наречию (*недалеко* о т к о г о/ч е г о — *от нас*, *от дома*); глаголу (*дорожить* ч е м? — *мнением коллег; компенсировать* ч т о? — *убытки*) и т. д. *(Г. Скляревская).*

**30.** Як вядома, беларуская, руская і ўкраінская мовы належаць да ўсходнеславянскай падгрупы славянскай групы індаеўрапейскай моўнай сям'і. Гэты факт сведчыць як пра блізкасць, так і пра адметнасць кожнай з усходнеславянскіх моў.




Прачытайце тэкст на ўкраінскай мове. Паспрабуйце здагадацца, што могуць абазначаць незнаёмыя словы. Пра якія віды падпарадкавальнай сувязі слоў у словазлучэнні ідзе размова?

*Узгодження* — це такий спосіб підрядного зв'язку, при якому залежне слово уподібнюється до головного слова у формах спільних для них граматичних категорій. *Керування* — це такий спосіб підрядного зв'язку, за яким залежне слово ставиться в певній відмінковій формі. *Прилягання* — це такий спосіб підрядного зв'язку, при якому залежне слово має незмінну форму й поєднується з головним тільки за змістом *(І. Арібжанова).*

Запішыце адпаведнікі да наступных беларускамоўных лінгвістычных тэрмінаў на рускай і ўкраінскай мовах: *дапасаванне — ..., кіраванне — ..., прымыканне — ... .*

Растлумачце структуру, паводле якой будуецца азначэнне паняцця.

Раскажыце, якую замежную мову вывучаеце. Якія лінгвістычныя тэрміны — назвы відаў падпарадкавальнай сувязі слоў у словазлучэнні — ужываюцца ў ёй? Якую славянскую мову вам хацелася б вывучаць дадаткова? Чаму?

**31.** Прачытайце тэкст. Які з варыянтаў словазлучэння са словам *характарыстыка* вам падае́цца найбольш пераканаўчым? Чаму? Прывядзіце аргументы да свайго выбару.

### Сінтаксічныя варыянты і літаратурная мова

Слова *характарыстыка*, як вядома, мае два значэнні: 1) апісанне адметных, адрознівальных уласцівасцей і рыс каго- ці чаго-небудзь *(характарыстыка эпохі, характарыстыка літаратурнага твора)*; 2) афіцыйны дакумент з водзывам аб вучэбнай, службовай, грамадскай і іншай дзейнасці чалавека *(характарыстыка з месца вучобы, абмеркаваць характарыстыку, падпісаць характарыстыку).*



Правообладатель Национальный институт образования

Нарматыўным у літаратурнай мове традыцыйна лічылася кіраванне слова *характарыстыка* (у абодвух значэннях) родным склонам залежнага кампанента: *характарыстыка работы ўстановы, характарыстыка старшага навуковага супрацоўніка.* Здольнасць назоўніка *характарыстыка* кіраваць родным беспрыназоўнікавым склонам можна растлумачыць яго семантычнай суадноснасцю з дзеясловам *характарызаваць,* звычайнае ўжыванне якога — у словазлучэннях з вінавальным прамога аб'екта *(характарызаваць пэўны перыяд, характарызаваць студэнта).*

У афіцыйным стылі беларускай літаратурнай мовы, якому ўласцівы дакладнасць, аднаназначнасць, слова *характарыстыка* ў другім значэнні (як загаловак дакумента) кіруе прыназоўнікава-склонавай формай «на + вінавальны склон»: *характарыстыка на лабаранта Ермакова, характарыстыка на інжынера Андруховіча.* На развіццё мадэлі «характарыстыка + *на* + вінавальны» аказалі ўплыў такія канструкцыі, як *справа на каго-небудзь, дакументацыя на каго-небудзь.*

Такім чынам, загаловак дакумента *Характарыстыка на выпускніка ўстановы адукацыі* нельга лічыць памылкай. Гэта мадэль правамерная ў мове і шырокаўжывальная ў ёй. Разам з тым такі варыянт, на нашу думку, не адмяняе і не выцясняе традыцыйнага *Характарыстыка выпускніка ўстановы адукацыі* (Паводле Т. Бандарэнка).

Прывядзіце доказы (суадносныя з лексічным, марфалагічным, сінтаксічным узроўнямі) таго, што тэкст належыць да навуковага стылю.

Ацаніце зместавую і стылістычную адпаведнасць наступных варыянтаў загалоўкаў да тэксту: *Характарыстыка характарыстыкі, Развагі пра характарыстыку, Характарыстыка ... характарызуе.* Чаму яны пярэчаць аўтарскай назве тэксту?

Прааналізуйце сказы з апошняга абзаца тэксту. Чым яны падобныя і чым адрозныя ў сінтаксічных адносінах?

• Выпішыце з тэксту зборны лічэбнік, праскланяйце яго. Раскажыце пра асаблівасці дапасавання і кіравання лічэбнікаў у беларускай мове. Прывядзіце прыклады.

Па заканчэнні ўстановы адукацыі вы атрымаеце дакумент — афіцыйную характарыстыку, якая будзе ўтрымліваць інфармацыю пра вашы дасягненні ў засваенні вучэбных прадметаў, набытку ў даследчай і праектнай дзейнасці, чалавечыя якасці, уменне працаваць у калектыве.

Напішыце характарыстыку на сябе, пастарайцеся захаваць прынцып аб'ектыўнасці пры ацэнцы ўласных заслуг.



Правообладатель Национальный институт образования

**32.** Прачытайце тэкст. Сфармулюйце сваімі словамі асноўную думку тэксту і запішыце яе. Што вы ведаеце пра мастацкі праект «Спадчына Беларусі»? Растлумачце знакі прыпынку ў назве тэксту. Як вы думаеце, чаму маладыя людзі маюць жаданне «адкрываць Беларусь» для сусветнай супольнасці?

### «Спадчына Беларусі»: працяг будзе...

У свой час з'яўленне першай кнігі-альбома «Спадчына Беларусі» *выклікала* сапраўдны **фурор**. Пра гэту падзею шмат гаварылі, і не толькі ў культурным **асяроддзі**. Здзіўленне *выклікаў* той факт, што маладыя аўтары (абодва — тэлевізіёншчыкі) абышлі ў майстэрстве падачы ілюстраванага матэрыялу і знешняга афармлення




**прадукту** слынных прафесіяналаў-паліграфістаў. Сапраўдным адкрыццём стала тэматычная **канцэпцыя** кнігі-альбома, якая мяняе ўяўленне пра нібы сціплую гістарычную і культурную спадчыну[ф] нашых продкаў. Было захапленне ад убачанага на старонках **фаліянта**. Неўзабаве «Спадчына Беларусі» стала галоўным прэзентацыйным прадметам: альбом дарылі самым *высокапастаўленым* гасцям. Для гэтых мэт беларускія дыпламаты за мяжой заўсёды трымалі ў прадстаўніцтве па некалькі яго **асобнікаў**.

Без перабольшвання, мастацкі праект «Спадчына Беларусі» — адзін з самых значных у галіне **візуальнага** прадстаўлення гістарычных і культурных здабыткаў. Аляксандр Аляксееў і Алег Лукашэвіч стварылі ўласную канцэпцыю бачання беларускай гісторыі і культуры. Аўтары арганічна здолелі аб'яднаць выпуск мастацкіх альбомаў, тэлевізійных фільмаў і правядзенне фотавыставак для дасягнення адной мэты — папулярызацыі нацыянальнага духоўнага багацця.

У межах праекта створана больш за сто серый тэлевізійнага цыкла «Наша спадчына» пра архітэктурна-гістарычныя набыткі Беларусі, больш за 50 серый цыкла «Эпоха» пра вядомых гістарычных асоб, якія нарадзіліся на беларускай зямлі *(З часопіса «Беларусь»)*.

Растлумачце значэнне выдзеленых слоў.

Назавіце словазлучэнні, якія выяўляюць асаблівасці кіравання ў беларускай мове.

Выпішыце апорныя словазлучэнні, пабудуйце іх схемы. З дапамогай ключавых адзінак сцісла перакажыце змест тэксту.

● Выпішыце словы, напісанне якіх адпавядае правілу «Правапіс спалучэнняў галосных у запазычаных словах». Дапоўніце выпісанае прыкладамі на правапіс спалучэнняў ***іо, іа, іе, ео, еа***.



Правообладатель Национальный институт образования

● Якія зычныя гукі могуць вымаўляцца падоўжана? Назавіце словы, напісанне якіх адпавядае правілу «Правапіс падоўжаных зычных».

Выпішыце з тэксту дзеепрыметнік, зрабіце яго марфемны, марфалагічны разбор. Раскажыце пра асаблівасці ўтварэння дзеепрыметнікаў.

Раскажыце пра асаблівасці пастаноўкі націску ў словах, выдзеленых курсівам.

З апорай на інтэрнэт-матэрыялы раскажыце, якімі прэстыжнымі ўзнагародамі быў адзначаны высокі мастацкі ўзровень выдання «Спадчына Беларусі».

● Стварыце «біяграфію» слова *спадчына:* акрэсліце значэнне, падбярыце аднакаранёвыя і сінанімічныя адзінкі, прааналізуйце яго паходжанне і вымаўленне. У назвах якіх твораў беларускай літаратуры ўжываецца слова *спадчына*?

§ 3–1

§ 3–2

§ 3–3

§ 0–4

§ 1–4

§ 2–4

**33.** Запішыце па-беларуску наступныя словазлучэнні. Вусна складзіце з імі сказы.

Две деревни, два больших здания, большое спасибо, оба брата, обе сестры, полтора столетия, полторы тонны, дом с тремя комнатами, двадцать две ученицы, четвёртым понедельником, сильнее всех обстоятельств, из-за тебя, по закону, по моему мнению, создать по образцу, ставить целью, по случаю праздника, сказать по секрету, два раза в неделю, работать по вторникам.

## § 4. Правілы сувязі выказніка і дзейніка, выражанага спалучэннем слоў

Форма выказніка ў двухсастаўным сказе залежыць ад асаблівасцей выражэння дзейніка, структуры сказа і парадку размяшчэння членаў сказа.

**Выказнік мае форму множнага ліку**, калі ў састаў дзейніка ўваходзяць:

- колькасныя лічэбнікі ў спалучэнні з **адушаўлёнымі назоўнікамі** (пры гэтым у сказе **прамы парадак слоў**): ***Дзве дзяўчынкі*** *ў нацыянальных строях* ***сустракалі*** *дэлегацыю*;
- колькасна-іменнае словазлучэнне, у саставе якога ёсць **азначэнні** або словы **ўсе, гэтыя**: *На сходзе прысутнічалі* ***ўсе чацвёра. Гэтыя два пакойчыкі*** *былі застаўлены новай мэбляй*;
- спалучэнне назоўніка (займенніка) у форме назоўнага склону і назоўніка ў форме творнага склону з прыназоўнікам **з**: ***Шэпчуцца явар з калінаю*** *ў сумнай даліне над ярам* (Я. Купала).



Правообладатель Национальный институт образования

**Выказнік ужываецца ў адзіночным ліку**, калі дзейнік выражаны:

- **колькасным лічэбнікам** у спалучэнні з адушаўлёным назоўнікам (пры гэтым у сказе **адваротны парадак слоў**). Як правіла, звяртаецца ўвага на агульную, прыблізную колькасць, сукупнасць: ***Сабралася*** *чалавек* ***каля дзесяці***;
- спалучэннем **зборнага лічэбніка** з назоўнікам: *Прыехала* ***трое братоў***;
- спалучэннем неадушаўлёнага назоўніка **са словам, што мае няпэўна-колькаснае значэнне** (большасць, меншасць, рад, шэраг, безліч, група, мноства, большая (меншая) частка): *У нашым садзе расце* ***мноства кветак***;
- спалучэннем назоўніка (займенніка) у назоўным склоне з назоўнікам у творным склоне пры неабходнасці падкрэсліць другараднасць дзеянняў другой асобы: ***Брат з сястрой падрыхтаваў*** *прэзентацыю*. Калі падкрэсліваецца роўнасць абедзвюх асоб, то выказнік ужываецца ў множным ліку: ***Брат з сястрой падрыхтавалі*** *прэзентацыю*;
- колькасна-іменным словазлучэннем са словамі **хвілін, гадзін, дзён, тыдняў**: *Андрэю* ***споўнілася дзесяць гадоў***. ***Мінула два тыдні***;
- спалучэннем **адмоўнага** або **няпэўнага займенніка** з назоўнікам (займеннікам) ускоснага склону з прыназоўнікам ***з***: ***Ніхто з карэспандэнтаў*** *не адзначыў*. ***Нехта з даследчыкаў*** *заўважыў*.

***Заўвага***. Выказнікі могуць мець форму **множнага ліку** пры дзейніках са значэннем асобы або пры неабходнасці падкрэсліць актыўнасць дзеяння: ***Пяцёра пасажыраў выглядалі*** *разгублена*. ***Некалькі студэнтаў здалі*** *сесію датэрмінова*.

**34.** Выпішыце сказы-прыклады да пунктаў правіла, раскажыце, не заглядваючы ў вучэбны дапаможнік, пра сувязь форм дзейніка і выказніка.

● Выпішыце з тэксту правіла адзін зборны лічэбнік і праскланяйце яго. Абазначце канчаткі.

**35.** Прааналізуйце табліцу «Сувязь паміж дзейнікам і выказнікам». Раскажыце, якая інфармацыя ў правіле і табліцы супадае. Якія новыя выпадкі сувязі паміж дзейнікам і выказнікам прыведзены ў табліцы?



Правообладатель Национальный институт образования

| ДЗЕЙНІК | ВЫКАЗНІК |
|---|---|
| **Нескланяльная абрэвіятура**<br>*ВНУ (вышэйшая навучальная ўстанова)* ***атрымала*** *падзяку міністра адукацыі.* | дапасуецца да апорнага слова |
| **Назоўнік мужчынскага роду са значэннем ‘прафесія, пасада, званне’**<br>*Прафесар Іваноў* ***прачытаў*** *лекцыю.*<br>*Прафесар Іванова* ***прачытала*** *лекцыю.* | форма дзеяслова-выказніка залежыць ад роду дзейніка-назоўніка |
| **Колькасны лічэбнік + адушаўлёны назоўнік**<br>***Сто чалавек*** *з нашай школы* ***паступілі*** *ў ВНУ.* | у форме множнага ліку |
| **Колькасны лічэбнік + неадушаўлёны назоўнік**<br>***Пяць кніг ляжала*** *на стале.* | у форме адзіночнага ліку |
| ***Усяго, толькі*** **+ колькасна-іменнае словазлучэнне**<br>*У вагоне* ***было ўсяго пяць пасажыраў.***<br>***Толькі*** *восем чалавек* ***прыйшло*** *на сустрэчу.* | у форме адзіночнага ліку |
| ***Усе, гэтыя*** **+ колькасна-іменнае словазлучэнне**<br>***Усе тры залікі адбудуцца*** *на гэтым тыдні.* | у форме множнага ліку |
| **Колькасна-іменнае словазлучэнне з ча́савым значэннем**<br>***Столькі гадоў прайшло*** *з часу нашай апошняй сустрэчы!* | у форме адзіночнага ліку |
| ***Шмат, многа, мала, некалькі, столькі*** **+ назоўнік роднага склону множнага ліку**<br>***Шмат падзей адбылося*** *за гэты час.*<br>***Некалькі сшыткаў спісана.*** | у форме адзіночнага ліку |
| **Назоўнік са значэннем ‘пэўная або няпэўная колькасць’** ***(па́ра, дзясятак, безліч, мноства)*** **+ назоўнік роднага склону**<br>Пра Івана ў вёсцы ***хадзіла безліч анекдотаў.*** | у форме адзіночнага ліку |
| **Адмоўны, няпэўны, пытальны займеннікі**<br>***Хто жыве*** *ў нашым доме на пятым паверсе?* | у форме адзіночнага ліку |



Правообладатель Национальный институт образования

**36.** Спішыце, выбіраючы адпаведную форму выказніка. Патлумачце свой выбар.

1. ЮНЕСКА *(быць) (утварыць)* у лістападзе 1945 года ў Лондане. 2. Нямала іх *(хадзіць)* па свеце *(П. Глебка)*. 3. У вялікім пакоі *(сабрацца)* шмат людзей. 4. Большасць людзей *(ісці)* ***нехаця*** і панура *(С. Грахоўскі)*. 5. Група партызан *(ехаць)* у вёску памагчы заараць зямлю пад жыта *(П. Пестрак)*. 6. *(Прайсці)* некалькі тыдняў. 7. Абодва *(прасіцца)* у атрад і *(расказваць)* пра сябе — як на духу *(Ф. Янкоўскі)*. 8. Чатыры лодкі *(прыйсці)* да берага амаль праз гадзі́ну *(Я. Брыль)*. 9. *(Сабрацца)* багата людзей. 10. БДУ *(аб'явіць)* конкурс на лепшага чытальніка вершаў беларускіх паэтаў.

Пастаўце націск у выдзеленым слове.
Да ўжытага ў сказе ўстойлівага выразу запішыце фразеалагізмы-сінонімы.

**37.** Прачытайце сказы, выберыце патрэбную форму выказніка. Растлумачце правілы сувязі выказніка і дзейніка.

1. У школьнай зале[м] вучняў был.. дзясяткі два. 2. У возера Байкал упада.. трыста трыццаць шэсць рэчак. 3. Пераезд сціх. За лініяй чыгункі ў траншэі стаіл..ся яго чацвёра абаронцаў *(В. Быкаў)*. 4. Каля дзвярэй звычайна стаял.. некалькі маладзіц з дзецьмі на руках *(Я. Колас)*. 5. Колькі гадоў мінул.. з таго часу, як ён бачыў аднакласніка апошні раз? 6. Дзядзька ішоў не адзін, ішл.. чалавек з пятнаццаць *(Я. Брыль)*. 7. Два снегіры, дзве кропелькі зары, на мокрую галінку вольхі ўпал.. *(Н. Мацяш)*. 8. Некалькі тыдняў за працай прайшл.. *(П. Броўка)*. 9. Міхал з Антосем сваю душу дарогай цешы.. нямала *(Я. Колас)*. 10. Больш за пяцьдзясят буслоў цэлы дзень кружыл..ся над высокім берагам *(К. Чорны)*.

- Выпішыце складаныя сказы, зрабіце іх сінтаксічны разбор.
- Выпішыце назоўнікі, ужытыя ў форме меснага склону. Растлумачце іх канчаткі. Падбярыце прыклады, якія ілюструюць правапіс назоўнікаў 1-га і 2-га скланення ў форме меснага склону.

**38.** Складзіце сказы з наступнымі словазлучэннямі, каб яны выступалі ў ролі дзейніка, а дзеяслоў у форме прошлага часу — у ролі выказніка. Растлумачце выбар формы ліку выказніка.

Пяць месяцаў, тры гады, дзвесце мінчан, пяцёра студэнтаў, безліч дзівосаў, процьма ягад, тройка коней, усе дзяўчынкі, усяго сем



Правообладатель Национальный институт образования

выпускнікоў, шмат дзяўчат, багата чарніц, каля дзесяці кніг, звыш ста супрацоўнікаў, некалькі вучняў, многа радасці, каля палавіны з іх, чалавек восем.

**39.** Ці можна, на вашу думку, лічыць Вікіпедыю адзінай крыніцай інфармацыі? Прывядзіце доказы ў абарону сваёй пазіцыі. Як часта вы карыстаецеся энцыклапедычнымі выданнямі? Якімі — найчасцей? Прачытайце фрагмент артыкула «Дзяржаўная мова» з энцыклапедыі «Беларуская мова». Вызначце стыль тэксту. Растлумачце напісанне слоў з прапушчанымі літарамі. Спішыце апошні абзац тэксту, устаўляючы прапушчаныя літары.



Кожная мова ўжываецца ў розных сферах жыц..я грама..тва. Гэтыя сферы найперш падз..ляюцца на д..ве буйныя часткі — афіцыйную і побытавую. Афіцыйнай (ад лац. *officialis* — ‘звязаны з урадам, з пасадай’) называюць мову, на якой працуюць дз..ржаўныя і адміністрацыйна-гаспадарчыя органы, грама..кія арганізацыі, ..становы навукі, культуры, службы быт.., гандл.. . На афіцыйнай мове в..дзецца навучан..е і выхаван..е ў сістэм.. адукацыі. Калі статус афіцыйнай мовы замацоўваецца і адлюстроўваецца ў сп..цыяльных зак..надаўчых актах, яна становіцца мовай дз..ржаўнай. Дз..ржаўнасць мовы — гэта юр..дычна замацава..ы і р..гламентаваны парадак яе выкарыстання ў афіцыйнай сферы грама..кіх зносін. Што да прыватных* моўных узаемадачыненн..ў людзей, у пэўнай ступені выбар імі мовы зносін з дз..ржаўнымі органамі і ўстановамі, з рознымі грама..кімі арганізацыямі, то гэта было, ёсць і застаецца асабістай справай грамадзян.

Такім чынам, паняцце «дз..ржаўная мова» звязана з мэтанакіраванай палітыкай дз..ржавы, а паняц..е «афіцыйная мова» — з практыкай, з традыцы..мі выкарыстан..я моў у пэўным грама..тве і з р..альным размеркаван..ем паміж імі асобных сацы..льных функцый. Нада́нне пэўнай мове статусу дз..ржаўнай — акт нацы..нальна-гістарычнай і нацы..нальна-культурнай значнасці. Варта ад..начыць, што афіцыйная мова не абавязкова набывае статус дз..ржаўнай, але дз..ржаўная мова не можа не пра..сці этап.. афіцыйнага ўжыван..я *(Я. Цумарaў)*.

Раскажыце, як суадносяцца тэрміны *дзяржаўная мова* і *афіцыйная мова*.

Выпішыце прыклады словазлучэнняў на розныя выпадкі выражэння галоўнага слова.

Запішыце сінанімічны рад да слова *фрагмент*. Растлумачце адценне ў значэнні кожнага сіноніма. Якія слоўнікі сінонімаў беларускай мовы вы ведаеце?



Правообладатель Национальный институт образования

**40.** Прачытайце, знайдзіце памылкі, выкліканыя незахаваннем правіл сувязі выказніка і дзейніка. Растлумачце прычыны парушэння сінтаксічных норм. Запішыце выпраўленыя сказы.

1. Было ў бацькі тры сына. 2. Трое хлопцаў увайшло ў хату. 3. Большасць вучняў справіліся з кантрольным тэстам. 4. Шмат дамоў будаваліся за апошні час. 5. Увайшлі група рабочых. 6. Здавалася, што тысяча дзён прайшлі з часу іх развітання. 7. БелТА аб'явілі дату правядзення суботніка. 8. Прафесар Ірына Марозава прачытаў лекцыю пра дасягненні айчынных лінгвістаў.

**41.** Прачытайце. Падбярыце назву тэксту. Выпішыце граматычныя асновы сказаў (частак сказаў), вусна ахарактарызуйце выражэнне галоўных членаў сказа, вызначце тыпы выказнікаў (карыстайцеся табліцай, змешчанай пасля практыкавання). З апорай на граматычныя асновы сказаў сцісла перакажыце тэкст, дапоўніўшы яго інфармацыяй пра разнавіднасці турызму, характэрныя для гасцей Беларусі (гл. дыяграму). Якія культурныя, духоўныя скарбы беларускага народа, на вашу думку, могуць выступаць у якасці нацыянальных брэндаў?

Беларусь, якая характарызуецца выгадным геаграфічным становішчам, сёння мае не толькі статус важнай транзітнай дзяржавы. Краіна набывае ўсё большую турыстычную прывабнасць. Брэнды* краіны — Белавежская пушча і Мірскі замак, ледавіковыя азёры Браслаўскага краю і Брэсцкая крэпасць. Аўгустоўскі канал — цуд інжынернай думкі XIX стагоддзя. Сафійскі сабор у Полацку — самая старажытная святыня Беларусі.

Наш гонар таксама старадаўнія сядзібы, палацы, першабытныя лясы з багатым жывёльным і раслінным светам, добраўпарадкаваныя

**Разнавіднасці турызму, характэрныя для гасцей Беларусі**






Правообладатель Национальный институт образования

гарады і пасёлкі, самабытныя фестывалі. Мы актыўна адкрываем сваю прыгажосць свету. У 2019 годзе Беларусь наведалі 405,5 тысячы арганізаваных турыстаў — амаль у пяць разоў болей, чым 15 гадоў таму. Яркія ўражанні пра ўнікальную прыроду, гістарычныя і культурныя славутасці нашага краю надоўга застаюцца ў памяці замежных гасцей, як і *спагадлівасць, шчодрасць, гасціннасць* яго жыхароў. Менавіта гасціннасць стала адметнай асаблівасцю, нацыянальным брэндам краіны *(Л. Хлыстун)*.

Раскажыце пра тэматычнае, марфалагічнае, марфемнае, словаўтваральнае падабенства выдзеленых слоў.

Зрабіце поўны марфалагічны разбор аднаго лічэбніка з тэксту. Якімі членамі сказа з'яўляюцца ўжытыя лічэбнікі?

| Тыпы выказнікаў у двухсастаўным сказе | |
|---|---|
| **Спосаб выражэння** | **Прыклады** |
| **Просты дзеяслоўны выказнік** | |
| Асабовая форма дзеяслова | *Я* ***веру*** *вам.*<br>*Я* ***буду верыць*** *вам.*<br>*Я так* ***верыў*** *вам.* |
| Інфінітыў | ***Не супакоіць*** *вам мяне.* |
| Фразеалагізм або сінтаксічна непадзельнае словазлучэнне | *Валянціна —* ***добрай душы чалавек.***<br>*Сон* ***прынёс супакаенне*** (= супакоіў). |
| **Састаўны дзеяслоўны выказнік** | |
| Дзеясловы ***магу, хачу, жадаю*** + + інфінітыў | *Я* ***хачу працаваць*** *урачом.* |
| Дзеясловы ***пачаў, стаў, закончыў*** + + інфінітыў | *Маці* ***пачала ўспамінаць*** *пра сваё дзяцінства.* |
| Прыметнік (дзеепрыметнік) + + інфінітыў | *Я* ***рад пазнаёміцца.*** |
| **Састаўны іменны выказнік** | |
| Дзеясловы ***быў, ёсць, буду*** + іменная часціна мовы | *Я* ***буду ўрачом.*** |
| Дзеясловы ***здаваўся, лічыўся, стаў, называўся, выглядаў*** + іменная часціна мовы | *Маці* ***выглядала каралевай.*** |
| Дзеяслоў + звязка + іменная часціна мовы | *Ён* ***прыйшоў стомлены.***<br>*Дачка* ***вярнулася першай.*** |



Правообладатель Национальный институт образования

**42.** Прачытайце тэкст, растлумачце яго назву. Выпішыце прыклады на розныя тыпы выказнікаў у двухсастаўных сказах. Пры неабходнасці (калі адпаведных прыкладаў няма ў тэксце) сказы падбярыце самастойна.

## Май — асаблівы месяц

Ёсць падзеі, якія не абясцэньвае час. Да такіх, без сумнення, належыць Дзень Перамогі. Што б ні адбывалася ў сучасным свеце, значнасць гэтай даты не падлягае ніякай дэвальвацыі. Памяць пра подзвіг савецкага салдата па-ранейшаму ўстойлівая і моцная.




Цяжкім горам прайшла Вялікая Айчынная па беларускай зямлі. Загінула каля трох мільёнаў чалавек, было разбурана больш за дзвесце гарадоў, гарадскіх пасёлкаў і райцэнтраў, каля дзесяці тысяч сёл і вёсак.

Народныя мсціўцы не давалі ворагу спакою ні днём, ні ноччу. Больш за паўтара мільёна ўраджэнцаў Беларусі ваявалі на франтах Вялікай Айчыннай. За праяўлены гераізм і доблесць пры абароне Айчыны 448 беларусаў уганараваны высокага звання Героя Савецкага Саюза, чацвёра з іх — двойчы.

Так, май — асаблівы месяц. Гэта месяц перамогі над нацызмам у Другой сусветнай вайне. У Беларусі подзвіг народа высока шануецца. Ветэраны па-ранейшаму акружаны ўвагай і клопатам дзяржавы. Для нас свята Перамогі — свяшчэннае, таму што ў кожнай сям'і Вялікая Айчынная вайна пакінула свой след *(В. Харкоў)*.

§ 4–1

§ 4–2

- Растлумачце напісанне слоў з вялікай літары ў тэксце.

Раскажыце, як адзначаецца Дзень Перамогі ў вашай сям'і, школе. Каму канкрэтна вы можаце сказаць «Дзякую за Перамогу»? Хто з вашых сваякоў удзельнічаў у Вялікай Айчыннай вайне? Хто вызваляў ваш горад, раён, вёску ад фашысцкіх захопнікаў? Якія помнікі як знакі ўдзячнасці салдатам Перамогі ёсць у вашых родных мясцінах? Хто даглядае іх, займаецца добраўпарадкаваннем?

- Выпішыце складаназалежны сказ, зрабіце яго поўны сінтаксічны разбор.
- Праскланяйце адзін з лічэбнікаў, ужытых у тэксце.



Правообладатель Национальный институт образования

## § 5. Правілы пабудовы сказаў з аднароднымі членамі, знакі прыпынку

§ 0–5

**43.** Адкажыце на пытанні:

1. Якія члены сказа называюцца аднароднымі?
2. Як звязваюцца аднародныя члены сказа ў вуснай мове і на пісьме?
3. Прывядзіце прыклады сказаў з аднароднымі членамі, якія выражаюць *спалучальныя* (злучнікі *і, ды* (у значэнні '*і*'), *ні — ні*), *супраціўныя* (злучнікі *але, а, аднак, затое, ды* (у значэнні '*але*'), *размеркавальныя* (*ці, ці — ці, або, або — або, то — то, ці то — ці то, ні то — ні то*), *супастаўляльныя* (злучнікі *як — так і, не толькі — і, не столькі — колькі*) адносіны.

Як вядома, аднародныя члены сказа паводле характару лагічных сувязей павінны адпавядаць асноўным правілам класіфікацыі прадметаў, з'яў, прымет:

1) характарызаваць прадмет, з'яву паводле пэўнай прыметы (колер, паходжанне, род заняткаў, узрост, рысы характару і г. д.), мець агульную лагічную аснову: *Андрэй расказваў правіла зразумела, пераканаўча, з аргументаванымі прыкладамі* (аднародныя члены выражаны рознымі часцінамі мовы, аднак раскрываюць асобу па агульнай прымеце — станоўчая ацэнка адказу). Сказ *П'ю чай з лімонам і радасцю* мае гумарыстычны эфект, паколькі ўтрымлівае словы, якія толькі знешне нагадваюць аднародныя члены сказа, аб'ядноўваюць зместава несумяшчальныя словы *лімон* і *радасць*, паміж якімі цяжка знайсці агульную прымету;

2) аднародныя члены сказа не павінны аб'ядноўваць родавыя (шырокія) і відавыя (больш вузкія) паняцці: *У парку звонка, па-вясенняму спявалі салавей і птушкі.* У сказе слова *птушкі* абазначае *родавае*, слова *салавей* — *відавое* паняцце. Спалучэнне рода-відавых паняццяў у якасці аднародных членаў сказа выклікае сінтаксічна няправільную канструкцыю;

3) захоўваць нормы сінтаксічнай спалучальнасці слоў. У сказе *Мастак захапляецца і любіць багатую прыроду Прыдзвіння* ўзнікае парушэнне правіл кіравання праз словазлучэнне *захапляецца ... багатую прыроду*. Як вядома, аднародныя члены сказа павінны ўлічваць правілы пабудовы словазлучэнняў: *Мастак захапляецца краявідамі і любіць багатую прыроду Прыдзвіння*;

4) пазбягаць празмернага «нарошчвання» аднародных членаў, якія могуць сэнсава абцяжарваць сказ: *Герой твора мужны, працавіты, сціплы, цярплівы, стрыманы і памяркоўны.*



Правообладатель Национальный институт образования

**44.** Прачытайце. Запішыце тэзісы да тэксту. На аснове тэзісаў падрыхтуйце вуснае выказванне на тэму «Асаблівасці пабудовы сказаў з аднароднымі членамі».

**Пры пабудове сказаў з аднароднымі членамі павінны захоўвацца наступныя патрабаванні:**

1. Нельга спалучаць як аднародныя члены ўскосны склон назоўніка і даданы сказ: *Гледачы былі ўражаны ігрой акцёраў і якія дэкарацыі знаходзіліся на сцэне.* **Правільна:** *Гледачы былі ўражаны ігрой акцёраў і дэкарацыямі, якія знаходзіліся на сцэне.*

2. Нельга злучаць як аднародныя дзеепрыслоўныя, дзеепрыметнікавыя словазлучэнні і даданыя часткі складаных сказаў: *Гаспадыня, рыхтуючыся да свята і калі чакала гасцей, была вельмі ўсхвалявана.* **Правільна:** *Гаспадыня была вельмі ўсхвалявана, калі рыхтавалася да свята і чакала гасцей.*

Не спалучаюцца ў якасці аднародных членаў інфінітыў і назоўнік: *Алесь любіў рыбалку і збіраць грыбы.*

3. Словы, ужытыя як аднародныя члены, павінны сэнсава спалучацца са словам (словамі), ад якога (якіх) яны залежаць: *Многа клопату і ўвагі ўдзяляюць члены бацькоўскага камітэта арганізацыі дзіцячых свят*. Нельга сказаць: *удзяляць клопат,* таму **правільны варыянт** наступны: *Многа ўвагі ўдзяляюць члены бацькоўскага камітэта арганізацыі дзіцячых свят.*

4. Распаўсюджаная памылка — замена другой часткі парнага злучніка: *Для новай школы закуплены не толькі шафы, парты і дошкі, а таксама канцылярскія прылады*. **Правільна:** *Для новай школы закуплены не толькі шафы, парты і дошкі, але і канцылярскія прылады.*

5. Злучнік ***ды***, сінанімічны ***і***, мае размоўную афарбоўку, таму непажаданы ў тэкстах афіцыйнага стылю: *Пры прыёме на працу прад'яўляюцца пашпарт ды ваенны білет*. **Правільна:** *Пры прыёме на працу прад'яўляюцца пашпарт і ваенны білет* (Паводле В. Кузьміч).

**45.** Прачытайце сказы з вучнёўскіх сачыненняў. Растлумачце, якія парушэнні правіл пабудовы сказаў з аднароднымі членамі прывялі да ўтварэння сінтаксічна і стылістычна няправільных канструкцый. Запішыце выпраўленыя сказы.

1. Анюта — смелая, вясёлая і любіць дэтэктывы. 2. Людзі, дзеці і жывёлы радаваліся вясенняму сонейку. 3. Для поўнага шчасця мне не хапае добрай вучобы, дысцыпліны, брацікa і сястрычкі. 4. У маёй сяброўкі стройная, прыгожая фігура і бадзёры настрой. 5. Сястра



Правообладатель Национальный институт образования

любіць чысціню і чытаць кнігі. 6. Пісьменнік падкрэслівае не толькі знешнюю прыгажосць дзяўчыны, а і ўнутраную. 7. Я не люблю бананы, памідоры і калі атрымліваю дрэнныя адзнакі. 8. Былі задзейнічаны тэлебачанне і іншыя сацыяльныя сеткі. 9. Патрэбна не толькі звяртаць увагу на тэарэтычную падрыхтоўку абітурыентаў, але і на іх маўленчае развіццё. 10. У якасці матэрыялу для рамана пісьменнік выкарыстоўваў сямейныя архівы, мемуары, літаратурныя крыніцы і розныя іншыя афіцыйныя дакументы. 11. Ён любіў паляванне і пасядзець з вудай. 12. Беларуская і дыялектная мова мае вялікі патэнцыял.

**46.** Разгледзьце табліцу. Раскажыце пра пастаноўку знакаў прыпынку ў сказах з аднароднымі членамі.

<table>
<tr><th colspan="2">Коска ставіцца</th><th colspan="2">Коска не ставіцца</th></tr>
<tr><td colspan="4">АДНАРОДНЫЯ ЧЛЕНЫ СКАЗА БЕЗ АБАГУЛЬНЯЛЬНАГА СЛОВА</td></tr>
<tr><td colspan="2">Звязаны толькі інтанацыяй (без злучнікаў)<br>○, ○</td><td colspan="2" rowspan="3">Звязаны пры дапамозе:<br>• адзіночных спалучальных злучнікаў<br>○ і ○;<br>• адзіночных размеркавальных злучнікаў<br>○ ці ○;<br>• паўторных злучнікаў у складзе ўстойлівых выразаў (і смех і грэх, ні роду ні плоду);<br>• неаднолькавых злучнікаў<br>○ ды ○ і ○</td></tr>
<tr><td colspan="2">Звязаны пры дапамозе:<br>• супраціўных злучнікаў<br>○, а ○<br>○, але ○;<br>• парных злучнікаў<br>не толькі ○, але і ○;<br>• паўторных злучнікаў<br>і ○, і ○<br>ці ○, ці ○<br>○, і ○, і ○</td></tr>
<tr><td colspan="2">Паміж парамі аднародных членаў сказа<br>○ і ○, ○ і ○</td></tr>
<tr><td colspan="4">АДНАРОДНЫЯ ЧЛЕНЫ СКАЗА З АБАГУЛЬНЯЛЬНЫМ СЛОВАМ</td></tr>
<tr><td>⊙: ○, ○, ○</td><td colspan="2">○, ○, ○ — ⊙</td><td>⊙: ○, ○, ○ — ...</td></tr>
</table>



Правообладатель Национальный институт образования

Аднародныя члены сказа **раздзяляюцца коскай**, калі яны:

- звязаны адзін з адным бяззлучнікавай сувяззю і інтанацыяй пералічэння: *Юнакі, дзяўчаты, дзеці летняю парой **весяліліся, гудзелі**, бы пчаліны рой* (П. Прруднікаў);
- звязаны пры дапамозе адзіночных супраціўных злучнікаў ***а, але, ды*** (у значэнні ***'але'***), ***аднак, толькі***; парных злучнікаў ***як — так і***; ***не толькі — але (а) і***; ***калі не — то (дык)***; ***хоць — але (а)***; ***хоць і не — затое (аднак)***; ***не то што — але і***; паўторных злучнікаў ***і — і, ды — ды, то — то, ні — ні, не то — не то, ці — ці, ці то — ці то, або (альбо) — або (альбо)*** і інш.: *Музыка сціхла, **а** пасля зноў з'явілася* (К. Чорны); *Запасы прэснай вады ў Беларусі даволі вялікія, іх хопіць **не толькі** для спажывання, **але і** для продажу* (З часопіса «Беларусь»); *Яна* [*ночка*] *не гайдала **ні** галінкі, **ні** кусточка, **ні** былінкі, **ні** лісточка, **ні** на ніве каласочка* (Я. Колас);
- звязаны паўторным злучнікам ***і — і***, перад якім ужо ёсць адзін з аднародных членаў сказа (коска ставіцца і перад першай часткай паўторнага злучніка ***і — і***): *Ціхі шэпат бяроз і дубоў, вечна юных ялінак і сосен, што ўтойваюць боль, **і** любоў, **і** пакуты ў сцюдзёную восень* (П. Пруднікаў).

***Заўвага 1.*** Аднароднымі членамі сказа не з'яўляюцца і **коскай не раздзяляюцца** азначэнні, якія характарызуюць прадмет з розных бакоў і звязаны толькі бяззлучнікавай сувяззю, без інтанацыі пералічэння: *Адвячорак на дварэ пах цеплынёю, **сухім духмяным вераснёўскім** сенам* (А. Жук).

***Заўвага 2.*** **Коска не ставіцца** паміж часткамі паўторных злучнікаў ***і — і, ні — ні, то — то*** ў складзе ўстойлівых выразаў, якія не з'яўляюцца аднароднымі членамі: ***і скокам і бокам, ні сёе ні тое, то так то сяк*** і інш.

**Коскай не раздзяляюцца** два аднародныя члены сказа, калі яны звязаны пры дапамозе адзіночных спалучальных злучнікаў ***і, ды*** (у значэнні ***'і'***), а таксама адзіночных размеркавальных злучнікаў ***ці, або***: *Усё жывое любіць догляд **і** ласку* (І. Навуменка); *Дабро **ці** зло — залежыць ад цябе — у гэтым свеце будзе гаспадарыць* (П. Макаль).



Правообладатель Национальный институт образования

К о с к а  н е  с т а в і ц ц а паміж аднароднымі членамі сказа, якія звязаны неаднолькавымі злучнікамі: *Вішні **ды** яблыні **і** грушы раслі даўно ў нашым садзе.*

Калі злучнікам ***і*** звязваюцца пары аднародных членаў сказа, то коска ставіцца паміж парамі аднародных членаў: *А цягнікі бягуць зімой **і** летам, увосень **і** ўвясну* (М. Лынькоў).

К р о п к а й  з  к о с к а й  р а з д з я л я ю ц ц а развітыя аднародныя члены сказа, калі пры адным з іх ёсць коскі: *Яны ішлі хутка; мінулі скора і вёску, і вялікае поле, засеянае пшаніцай* (К. Чорны); *Неяк па-свойму хораша было тут **і** ранняй вясной, як трымцела першая вада ў тонкіх ручаінках; **і** крыху пазней, калі зацвіталі сады; **і** цёплым летнім надвячоркам, калі так дурманіста, густа пахла з гародчыкаў кропам.*

Д в у к р о п' е  с т а в і ц ц а пасля абагульняльнага слова, якое знаходзіцца перад аднароднымі членамі сказа: *Вясна, кажуць, прыгожая **ўсюды:** і ў полі, і ў лесе, і ў горадзе* (Я. Брыль); *Восень дорыць нам свае **багацці:** садавіну, зярнят умалот* (Л. Галубовіч).

Перад абагульняльным словам, якое знаходзіцца пасля аднародных членаў сказа, с т а в і ц ц а  п р а ц я ж н і к: *Чыстая **вада,** жоўценькі **пясочак** на дне, прыгожы **беражок** — **усё** гэта вабіла такой спакусаю, што маладыя настаўнікі змушаны былі спыніцца* (Я. Колас).

Калі аднародныя члены сказа стаяць пасля абагульняльнага слова, але пасля іх пераліку сказ працягваецца, то перад аднароднымі членамі  с т а в і ц ц а  д в у к р о п' е, а пасля іх — п р а ц я ж н і к: *Неўзабаве зналі **ўсе** ў майстэрні: **слесары, манцёры, кавалі** — аб раптоўным новым прызначэнні, аб машынным новым «каралі́»* (П. Пруднікаў).

**47.** Прачытайце. Якія значэнні мае слова *мова* ў тэксце? Падбярыце і запішыце два загалоўкі да тэксту, каб адзін з іх адлюстроўваў тэму, другі — асноўную думку.

Выпішыце сказы з аднароднымі членамі. Растлумачце напісанне прапушчаных літар, пастаноўку знакаў прыпынку.

Мова, з'яўляючыся найважнейшым[м] сродкам зносін паміж людзьмі[м], аказваецца разам з тым прыметай якая адрознівае адзін народ ад усіх іншых. Адначасова яна заб..спечвае адзінства народа ўнутра..ую



Правообладатель Национальный институт образования

еднасць яго прадстаўнікоў. Функцыю ..днан..я інтэграцыі пасп..хова выконвае толькі літаратурная мова якая мае распрацава..ую вусную і пісьмовую форму. Яна ствараецца і распаўсю..ваецца ў дз..ржаве моўнай элітай у якую звычайна ўваходз..ць палітычныя асобы выдатныя нацы..нальныя пісьмен..ікі і паэты дзе..чы навукі і культуры *(Паводле А. Падлужнага)*.

**48.** Ахарактарызуйце стылістычныя асаблівасці сказаў з аднароднымі членамі. Выпішыце спачатку сказы з аднароднымі, потым — з неаднароднымі азначэннямі. Графічна абазначце азначэнні і растлумачце ўмовы іх аднароднасці. Пастаўце, дзе трэба, знакі прыпынку.

1. На лясы апускаўся ранні зімовы змрок. Сыпаўся лёгкі пушысты густы і спорны снег *(А. Чарнышэвіч)*. 2. Настаўнік з цікавасцю назіраў за палешуком. Яму падабалася паляшуцкая вопратка дзядзькі[ф] чорная выцвілая суконная світка пашытая да стану шырокі ў чырвоныя палоскі саматканы[сл] пояс *(Я. Колас)*. 3. І заціхла ў полі на шырокім прыволлі праца дружных вясёлых брыгад *(А. Русак)*. 4. Высокія тонкія бярозы мяшаліся з шэрымі стваламі хвоі і прыдавалі характар маркоты і засмучэння ўсяму малюнку *(Я. Колас)*. 5. На бляклым небасхіле ўдалечыні ўжо запалілася і ціха гарэла адзінокая самотная зорка *(В. Быкаў)*. 6. Сонца хавалася за дрэвамі. Яно прабівалася праз галлё сосен кідаючы негарачыя чырванаватыя як звычайна перад вечарам прамяні на гонкія бронзавыя ствалы на траву *(І. Мележ)*. 7. Дробныя белыя хмаркі высцілалі яму́ [месяцу] дарожку сваімі лёгкімі празрыстымі тканямі і расступаліся[с] перад ім скупануўшы ў яго бляску свае танкарунныя[сл] кудры[сн] *(Я. Колас)*. 8. Цяжкія алавяныя хмары закрылі далягляд і сеюць-сеюць як на частае сіта дробны асенні дождж *(Р. Сабаленка)*. 9. У шэрай начной цемені мільгаючы сыпаў рэдкі дробненькі сняжок *(В. Быкаў)*. 10. На душы ў Ганны ўсе гэтыя дні было самотна трывожна не адыходзіў ціхі цягучы жаль *(І. Мележ)*.

- Выпішыце словы, якія ілюструюць правіла «Правапіс складаных слоў».

**49.** Прачытайце. Ці перадае назва тэксту духоўную сутнасць свята? Абгрунтуйце свой адказ. Сфармулюйце і запішыце пытанні, адказы на якія перадавалі б асноўны змест тэксту.

Растлумачце, з якой мэтай ужываюцца ў тэксце сказы з аднароднымі членамі. Выпішыце сказ з аднароднымі членамі, зрабіце яго сінтаксічны разбор.



Правообладатель Национальный институт образования




**Гонар — роднаму слову, павага — кнізе**

Дзень беларускага пісьменства, які адзначаецца штогод у першую нядзелю верасня, з'яўляецца нацыянальным святам Рэспублікі Беларусь. Канцэпцыя свята заключаецца ў адзінстве беларускага друкаванага слова з гісторыяй і культурай народа, у адлюстраванні гістарычнага шляху пісьменнасці ў Беларусі.

Традыцыйна Дзень беларускага пісьменства ладзіцца ў гарадах з глыбіннай гісторыяй, авеянай легендамі ды паданнямі, адзначаецца дзеля папулярызацыі[c] набыткаў айчыннай пісьмовай культуры, захавання пераемнасці духоўных традыцый Беларусі. Прысвечана гэта свята жывому слову, удзельнікам працэсу стварэння кніг, газет і часопісаў, усім тым, хто шануе родную мову і ўзбагачае нацыянальную культуру. Лічыцца, што інтэлектуальную эліту нацыі фарміруюць адукацыя, інфармацыя і культура. Таму невыпадкова, што свята супадае[c] з пачаткам новага навучальнага года. Традыцыйна і тое, што Дзень беларускага пісьменства штогод мяняе сваю сталіцу.

*Упершыню святочныя мерапрыемствы адбыліся ў 1994 годзе ў … .*

*Затым сталіцамі свята станавіліся … .*

*У 2020 годзе інтэлектуальную эліту краіны прымалі … .*

*У тых мясцінах, дзе праходзіла свята, заставаліся помнікі і памятныя знакі. Так, у 1996 годзе ўрачыста адкрыты помнік … .*



Правообладатель Национальный институт образования

*У 2001 годзе ў Мсціславе быў пастаўлены помнік* … .
*У 2003 годзе* — … .
*У 2004 годзе* — … .
*У 2006 годзе* — … .
*У 2009 годзе* — … .
*У 2020 годзе аднойлены будынак* … (Паводле Г. Мезенкі).

З дапамогай малюнка і інтэрнэт-матэрыялаў закончыце сказы, выдзеленыя курсівам.

З мэтай падагульнення інфармацыі дапішыце сказ *Дзень беларускага пісьменства — гэта свята тых* … .

Прапануйце і абгрунтуйце свой выбар месца правядзення Дня беларускага пісьменства ў будучыя гады. Якімі культурна-гістарычнымі набыткамі славіцца горад (мястэчка, вёска), які вы абралі? Якія культурныя мерапрыемствы ў межах свята вы прапануеце? Каго з айчынных дзеячаў культуры, навукі, мастацтва вы запросіце на Дзень беларускага пісьменства? Якія беларускія сувеніры вы падрыхтуеце да свята? Якія беларускамоўныя песні будуць гучаць у гэты дзень?

**50.** Прачытайце. Спішыце, пастаўце, дзе трэба, знакі прыпынку. Абгрунтуйце неабходнасць іх пастаноўкі. Якую ролю ў фарміраванні галоўнай думкі твора выконваюць сказы з аднароднымі членамі?

### Наша энцыклапедыя

Не, такога яшчэ мы не ведалі!
Гэта свята без *пышных* прамоў
Беларуская энцыклапедыя
Радасць першых вішнёвых тамоў.

Тут усё наша праца гісторыя
Геральдычныя знакі вякоў
І Сафія і замак Баторыя
І бяссмерце бальшавікоў.

Тут *уборы* і песні і рэкі
Краявіды і цені зуброў.
Абеліскі якія навекі
Здабылі нам мільёны сяброў.

Мы далёкія ад *убоства*:
Знойдзе кожны ў *нядробных* радках
Партызанскую маці і бой свой
Ці героя свайго земляка.


Правообладатель Национальный институт образования

<...>
А калі што-небудзь прапушчана
Мала песень азёр навальніц
Прыязджайце да нашых пушчаў
І напіцеся з першакрыніц.
*П. Панчанка.*

Запішыце сінонімы да выдзеленых слоў.

● Выпішыце словы, напісанне якіх адпавядае правілу «Правапіс галосных ***е, ё, я***».

**51.** Напішыце невялікую пейзажную замалёўку пра любімую пару года, скарыстоўваючы адпаведныя эпітэты да апорных назоўнікаў. Растлумачце аднароднасць/неаднароднасць азначэнняў у сказах.

*Восень* — ясная, пагодлівая, залатая, позняя, задумлівая, ціхая, шчодрая, непаўторная, журботная, сумная, агністая, барвовая, залацістая, крамяная*.

*Зіма* — беласнежная, светлая, серабрыстая, завейная, завірушная, марозлівая, сцюжная, бясконцая, суровая, сярдзітая, летуценная, лагодная.

*Вясна* — звонкая, пявучая, зялёная, рамантычная, халодная, маладая, светлая, чароўная, прыветная, заплаканая, чаканая, вятрыстая, дружная, гулкая.

*Лета* — гарачае, грымлівае, маланкавае, спякотнае, цёплае, жыццядайнае, дажджыстае, светлае, мройнае, чырванашчокае, пшанічнае, шчодрае, спелае.

**52.** Прачытайце тэкст. Назавіце сімвалы дзяржаўнасці любой краіны. Якую функцыю выконваюць памятныя манеты?

Вызначце аднародныя члены, іх сінтаксічную ролю і сродкі сувязі. Растлумачце пастаноўку знакаў прыпынку пры аднародных членах сказа.

## Падарунак на добры ўспамін

Калі больш за дваццаць гадоў таму Беларусь атрымала незалежнасць, разам з новымі дзяржаўнымі сцягам, гербам і гімнам паўстала патрэба ўвядзення ўласных грошай.

Сімвалы дзяржаўнасці краіны — памятныя манеты — маюць больш сімвалічнае, чым практычнае значэнне. Пра гэта сведчыць[ф] і тэматыка «жалезных» рублёў. *Асноўныя тэмы: прырода, гісторыя, традыцыі краіны, значныя юбілеі.*



Правообладатель Национальный институт образования

У метале ўжо былі адзначаны двухтысячагоддзе хрысціянства, пятнаццацігоддзе дыпламатычных адносін з Кітаем, шасцідзесяцігоддзе Вялікай Перамогі і вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў, юбілеі Адама Міцкевіча, Янкі Купалы, Якуба Коласа, Вінцэнта Дуніна-Марцінкевіча, Ігната Дамейкі, Ефрасінні Полацкай.[сн]

Беларусь мела сваю дзяржаўнасць і ў мінулым — у гэтым пераконвае серыя манет «Умацаванне і абарона дзяржавы» з выявамі князёў, якія кіравалі Мінскам, Полацкам, Гроднам за многа вякоў да нашых дзён.

Спецыяльныя выпускі манет прысвечаны ўсім абласным цэнтрам і сталіцы, шэдэўры дойлідства іншых гарадоў адзначаны ў серыі «Помнікі архітэктуры Беларусі».

Асобнай серыяй выдадзены манеты, якія адлюстроўваюць святы і абрады беларусаў.

Беларусь захавала вялікія масівы першабытнай прыроды. У гонар нацыянальных паркаў, запаведнікаў, заказнікаў і асобных відаў жывёл таксама былі выпушчаны манеты.

*Многія манеты даўно сталі рарытэтамі, лічацца на вагу золата не толькі за каштоўны метал, але і за статус, прызнаны на міжнародным узроўні.*

Беларускія манеты разлічаны як на прапаганду здабыткаў нацыянальнай культуры, так і на папулярызацыю міжнароднай спадчыны. Выйшлі серыі манет «Знакі задыяка», «Казкі народаў свету». Сувязь беларускіх звычаяў з абрадамі суседніх краін сімвалізуе серыя «Сямейныя традыцыі славян».

Для госця з-за мяжы такія сувеніры, несумненна, могуць стаць найлепшым падарункам на ўспамін пра Беларусь (*Паводле В. Корбута*).

Складзіце схемы выдзеленых сказаў, абазначаючы аднародныя члены знакам ○, а абагульняльнае слова — ⊙.

**53.** Прачытайце тэкст. Вызначце яго тэму і асноўную думку.

## Што ні манета — каштоўнасць

Нумізматычная* калекцыя Нацыянальнага гістарычнага музея папоўнілася камплектам памятных манет серыі «Шлях Скарыны». Яны прысвечаны 500-годдзю беларускага кнігадрукавання.

На манетах прадстаўлены шэсць гарадоў Полацк Кракаў Падуя Венецыя Прага Вільня. Гэтыя гарады адыгрывалі вялікую ролю ў жыцці і дзейнасці Скарыны звязанай з яго перакладам і друкаван-



Правообладатель Национальный институт образования

нем Біблii. Там адлюстраваны не толькі старадаўнія малюнкі гэтых населеных пунктаў але і знакі сімвалы якія ўвасабляюць сувязь з асветнікам. Напрыклад, на манеце з пражскай тэматыкай як сімвал Прагі і знак найвышэйшага ўздыму творчых сіл Скарыны змешчана выява знакамітага ратушнага гадзінніка «Арлой». Для таго каб сканструяваць на манеце цыферблатныя дыскі з зададзенай гадзінай астранамічнага часу, становішчам Сонца і фазай Месяца на дзень 6 жніўня 1517 года стваральнікі манеты звярнуліся да прафесійных астраномаў.

Акрамя гэтага на манетах прадстаўлена і сама Біблія ў мастацкай і тэкставай інтэрпрэтацыі Скарыны. Паказаны прыгажосць шрыфтоў разнастайнасць гравюр вытанчанасць дэкору. І ўсё гэта на невялікай па памеры манеце. Сапраўды ювелірная работа! *(З часопіса «Беларусь»)*.

Чаму на адной з манет адлюстраваны цыферблатныя дыскі з зададзенай гадзінай астранамічнага часу, становішчам Сонца і фазай Месяца на дзень 6 жніўня 1517 года?

Запішыце другі і трэці абзацы тэксту, расстаўляючы, дзе патрэбна, знакі прыпынку.

- Растлумачце напісанне слоў з вялікай літары.

Раскрыйце значэнні слоў *нумізматычны, калекцыя, гравюра, ювелірны*.

**54.** Прачытайце тэкст. Якую параду дае Я. Скрыган літаратарам? Чаму і літаратараў, і тых, хто не займаецца літаратурнай творчасцю, ён заклікае звяртацца да фальклору?

Спішыце, расстаўляючы знакі прыпынку адпаведна пунктуацыйным нормам і ўстаўляючы патрэбныя літары на месцы пропускаў. Патлумачце пастаноўку знакаў прыпынку.

Мы ж зарана адрываемся ад народнага творчага асярод..я і, не паспеўшы прычас..іцца яго народнаму багац..ю, адразу пападаем на работу ў кабінет. Праз с..ены кабінета да нас ужо з цяжкасцю дахо..іць і бляск народнай думкі і гнуткасць фразы і стройная прастата мовы і трапнасць прыказкі і мудрасць наглядан..я.[сн] Усё гэта мы ўжо чэрпаем толькі з газет ды з чужых кні.. . Ад гэтага часам і наша сухасць і беднасць і канцылярыт і аднастайнасць.

Немалая бяда і ў тым, што мы рэ..ка калі звяртаемся да фальклору. Кні.. Сержпутоўскага Раманава Шэйна багата хто з нас нават не трымаў у руках. Мы не ведаем, якія былі абрады на ра..інах хрэсьбінах* шлюбе ды пахаван..і не ведаем загавораў казак прыказак песень. А гэта ж духоўная гісторыя народа яго побыту ўкладу жыц..я культуры і не ведаць яе літара́тару проста грэшна. Тым больш што



Правообладатель Национальный институт образования

в..лікія пісьмен..ікі ніколі не пераставалі настаўляць, каб на фальклоры мы вучыліся мове — самай простай дасціпнай невычэрпна багатай і вобразнай *(Я. Скрыган)*.

Карыстаючыся дадатковай літаратурай або інтэрнэт-рэсурсамі, падрыхтуйце паведамленне пра аднаго з беларускіх фалькларыстаў (этнографаў).

**55.** Прачытайце сказы. Спішыце, раскрываючы дужкі. Пастаўце, дзе трэба, знакі прыпынку і абгрунтуйце іх неабходнасць.

1. І дома і на людзях я не крывіў душой *(І. Капыловіч)*. 2. На прыёме сядзела сарака*(гадовая)* светла*(валосая)* жанчына *(В. Гігевіч)*. 3. Шум дажджу раскаты грому бліскаўкі маланак скрыгат і трэск усё змяшалася *(Г. Пярун)*. 4. Але дажджавыя хмары ці то засердавалі ці то недзе заблудзілі *(А. Камароўскі)*. 5. Юрый прынёс свежую па ўсіх правілах завараную гарбату пачаў разліваць па кубках *(Г. Васілеўская)*. 6. Час не мяняе людзей але ў паводзінах іх заўсёды нешта зыначвае[с] дадае ці выкрэслівае *(К. Камейша)*. 7. Ты не падманеш і не здрадзіш і не схітрыш ні ў чым ніколі *(А. Зэкаў)*. 8. Пра сваё здароўе трэба клапаціцца што*(міг)* што*(дня)* ў любое надвор'е *(У. Ліпскі)*. 9. У акварыуме ў дзівосна*(загадкавым)* ззянні сярод раслін плавалі не менш дзівосныя рыбы і трох*(кутнічкі)* з чорнымі доўгімі плаўнікамі і блакітнавата*(рубінавыя)* рыбкі*(агеньчыкі)* і лянівыя аксамітна*(чорныя)* таўстуны і залаціста*(ружовыя)* з вялікімі нібы марлевымі хвастамі *(П. Місько)*.

**56.** Спішыце сказы, афармляючы іх у адпаведнасці з пунктуацыйнымі нормамі. Раскрыйце дужкі і ўстаўце прапушчаныя літары. Патлумачце пунктуацыйнае афармленне сказаў.

1. Ра..пусціць сонца вогне..ыя косы ды кіне *(н..)*спадзеўкі ў ваду *(М. Ждановіч)*. 2. Лес карміў і паіў грэў і лячыў *(А. Камароўскі)*. 3. Сонца вецер л..сы прасторы ўся прыгажосць з..млі з яе раніцамі і вечарамі росамі і дажджамі скрозь на тваім воку *(Я. Скрыган)*. 4. Віктар паказваў на тонкую жоўтую расліну *(Я. Коней)*. 5. Да Яўгеніі яна [маці] наведвалася то зранку то *(пад)*вечар *(М. Даніленка)*. 6. На крылах вясны вярталіся ў родныя з..млі гракі шпакі буслы журавы жаўрукі *(У. Ліпскі)*. 7. Любяць сваю пару сонца і дождж[ф] і вецер *(М. Кандратаў)*. 8. Антось сядзеў *(н..)*жывы *(н..)*мёртвы і *(н..)*зводзіў вачэй з Антаніны *(А. Козел)*. 9. *(Н..)*шырокая асфальтавая дарога вілася каля самага берага *(А. Вольскі)*. 10. Я мілейшых *(н..)*знаю *(н..)*песень *(н..)*мовы *(н..)*кветак *(А. Клемянок)*.



Правообладатель Национальный институт образования

**57.** Спішыце прыказкі, расстаўляючы, дзе патрэбна, знакі прыпынку.

1. За запытанне не страціш ні абеду ні снядання. 2. Жаба квокча сваё балота хваліць. 3. Балі ды гулі ў лапці абулі. 4. Кастрычнік не любіць ні калёс ні палоз. 5. Ліпень косіць і жне доўга спаць не дае. 6. Узімку сонца свеціць ды не грэе.

**58.** Запішыце сказы, устаўляючы замест кропак аднародныя члены.

1. Школа знаходзілася каля невялікага сквера, які быў засаджаны ліпамі, ..., ... і ... . 2. У скверы заўсёды бавілі час як ..., так і ... . 3. У гэты дзень свяціла ..., але ... майскае сонца, а ў яго промнях дрэвы іскрыліся рознымі колерамі: і ..., і ..., і ... . 4. Пахла маладой лістотай; пералівіста і ... пелі птушкі: ..., ..., ... — песні на розныя галасы. 5. Ні ..., ні ... не маглі парушыць мелодыі вясновага дня. 6. Са школы высыпалі вясёлыя, ... і ... вучні. 7. Яны не ..., а ... у сквер, каб хутчэй апынуцца ў яго казачнай прыгажосці.

- Вызначце тып запісанага тэксту.

**59.** Прачытайце тэкст, вызначце яго стыль. Чаму пунктуацыя тэкстаў розных функцыянальных стыляў мае сваю спецыфіку? Якія асаблівасці пунктуацыі характэрны для навуковага, публіцыстычнага, афіцыйнага, мастацкага стыляў? У тэкстах якіх стыляў могуць ужывацца пунктуацыйныя варыянты? Чаму?

Зрабіце пісьмовы пераклад часткі тэксту на беларускую мову.

Основные правила пунктуации имеют нормативный характер, относительно устойчивы в практике печати и одинаковы для разного вида письменной речи. Однако сама письменная речь неоднородна.

В синтаксическом отношении каждая из разновидностей письменной речи обладает более или менее ярко выраженными особенностями. А поскольку пунктуация прежде всего фиксирует синтаксическое членение речи, то она различается в разных по функционально-стилевой принадлежности текстах.

Синтаксис научной литературы отличается последовательной связностью отдельных предложений, их завершённостью и полнотой. Пунктуация этого вида литературы стандартизована и лишена индивидуальной осмысленности.

В публицистических произведениях, в соответствии со своеобразием синтаксического строя, пунктуация менее стандартна, допускает некоторые вольности, идущие от разговорной интонации и художественных средств выразительности.



Правообладатель Национальный институт образования

В официальных документах (приказах, протоколах, инструкциях, заявлениях и т. п.) синтаксическая структура более стандартна, чем в научных текстах. Общепринятые формы изложения и расположения материала приводят к сравнительной лёгкости пользования знаками препинания, их однообразию: знаки здесь ставятся в соответствии с грамматическим членением речи.

В художественной литературе широко используются такие знаки препинания, которые выражают эмоционально-экспрессивные качества письменной речи и разнообразные оттенки смысла. Вся пунктуационная система служит в художественном тексте одним из существенных и ярких средств передачи не только логического, но и эмоционального содержания *(По Н. Валгиной)*.

### Слоўнік

*идущие* — якія ідуць
*общепринятые* — агульнапрынятыя

**60.** Прачытайце тэкст. Што вывучае анамастыка? Патлумачце пастаноўку знакаў прыпынку пры аднародных членах сказа.

За апошні час у беларускім мовазнаўстве з'явілася нямала арыгінальных прац, прысвечаных даследаванню спецыфікі ўласных імёнаў, тапанімічных* назваў, выдзелілася нават новая галіна мовазнаўства — анамастыка (ад грэчаскага *onomastike* — майстэрства даваць імёны), якая вывучае функцыянальныя і моўныя своеасаблівасці ўласных імёнаў[м].

Колькасць анамастычных назваў не паддаецца ўліку. Толькі на Беларусі больш за трыццаць тысяч афіцыйных назваў населеных пунктаў. Многа неафіцыйных. Гэта назвы праспектаў, вуліц і завулкаў, паркаў, стадыёнаў, а таксама незлічонага мноства рэчак, ручаёў, вадасховішчаў, каналаў, крыніц, гаёў, пушчаў, бароў, балот, астравоў на лугах, сярод рэчак і азёраў, палёў, пералескаў. А колькі ўласных імёнаў, іх варыянтаў, прозвішчаў, імёнаў па бацьку, разнастайных мянушак людзей! Свае ўласныя імёны маюць і міфалагічныя істоты, планеты, сузор'і, існуюць[м] клічкі жывёл і г. д. *(Паводле В. Шура)*.

**61.** Складзіце паводле схем сказы з аднароднымі членамі, ужываючы анамастычныя назвы. Запішыце сказы.

1. ○, ○; ○ і ○.
2. ⊙: і ○, і ○, і ○.
3. ○ і ○, ○ і ○.
4. ○, *ды* (*'але'*) ○.



Правообладатель Национальный институт образования

Напішыце сачыненне-мініяцюру пра гісторыю паходжання назвы свайго горада, вёскі, мясцовасці і г. д., ужываючы сказы з аднароднымі членамі. Тэкст якога тыпу павінен атрымацца?

**62.** Выканайце інтэрактыўнае заданне «Знакі прыпынку ў сказах з аднароднымі членамі».

§ 0–6

## § 6. Правілы ўжывання дзеепрыслоўных і дзеепрыметнікавых зваротаў

**63.** Замест кропак устаўце адпаведныя тэрміны.

а) ... — нязменная форма дзеяслова, якая абазначае дадатковае і паясняе асноўнае дзеянне, выражанае дзеясловам-выказнікам;

б) ... — форма дзеяслова, якая абазначае дзеянне як прымету або ўласцівасць прадмета, што праяўляецца ў часе;

в) ... — пачатковая форма дзеяслова, якая называе дзеянне або стан, не суадносныя з асобай і часам.

**64.** Прачытайце табліцу, сфармулюйце правілы ўтварэння дзеепрыслоўяў, падбярыце і запішыце аналагічныя прыклады, абазначце суфіксы ў іх.

| **Утварэнне дзеепрыслоўяў** | |
|---|---|
| **незакончанага трывання**<br>Суфіксы -***учы*** ***(-ючы)***, ***-ачы*** ***(-ячы)***<br>ад асновы **цяперашняга часу:**<br>*(яны) ід-уць — ід-**учы**;*<br>*(яны) пол-юць — пол-**ючы**;*<br>*(яны) малю[й-у]ць — малю[й-**у**]**чы**;*<br>*(яны) гавор-аць — гавор**ачы**;*<br>*(яны) сядз-яць — седз**ячы*** | **закончанага трывання**<br>Суфіксы -***ўшы***, -***шы***<br>ад асновы **прошлага часу:**<br>*(ён) перагледзе(ў) — перагледзе-**ўшы**;*<br>*(ён) разгубі(ся) — разгубі-**ўшы**-(ся);*<br>*(ён) перанёс — перанёс-**шы**;*<br>*(ён) адвёз — адвёз-**шы*** |

***Звярніце ўвагу!***

Утвараючы дзеепрыслоўі **закончанага** трывання, суфіксы -***ўшы***, -***шы*** нельга далучаць да асноў дзеясловаў **незакончанага** трывання: формы будуць няправільныя, памылковыя: *смяя**ўшы**ся*, *выконва**ўшы***, *вёз**шы***. Як выправіць памылку?



Правообладатель Национальный институт образования

1. Ад дзеясловаў незакончанага трывання ўтварыць формы з адпаведнымі трыванню суфіксамі: *смяяцца* (незаконч. трыванне) — *смеючыся*, *пісаць* (незаконч. трыванне) — *пішучы*, *везці* (незаконч. трыванне) — *везучы*;

2. Далучыць прыстаўку, памяняўшы трыванне дзеяслова на закончанае: *насмяяцца* — *насмяяўшыся*, *выканаць* — *выканаўшы*, *прывезці* — *прывёзшы*.

**65.** Утварыце дзеепрыслоўі ад наступных дзеясловаў, улічваючы іх трыванне. Запішыце дзеепрыслоўі з залежнымі словамі.

Узор: *склікáць* (незаконч. трыванне) — *склікаючы гасцей*.

Занатавáць, занатоўваць, канспектаваць, выціраць, адведаць, пераправерыць, правяраць, слухаць, праслухаць, ажаніцца, апранацца, саромецца, хваляваццa, расхваляваццa, апомніцца, спазняцца, спазніцца, вывучыцца, снедаць, павячэраць, захапіцца, закахацца.

**66.** Спішыце, расстаўляючы знакі прыпынку. Падкрэсліце граматычныя асновы сказаў. Абгрунтуйце мэтазгоднасць ужывання дзеяслоўных форм. Зрабіце сінтаксічны разбор аднаго простага ўскладненага сказа.

Сонца сонейка за бор коціцца[с].
Ой не хочацца ў дом варочацца[с]...
Не спяшы раса лугі росячы.
Дай стаміцца мне копы* носячы!
Не бяжы да зор ясны месячык.
Дай стаміцца мне стагі вершачы[сл]!..

*А. Лойка.*

**67.** Прачытайце. На аснове тэксту сфармулюйце і запішыце правілы ўжывання дзеепрыслоўных словазлучэнняў.

Няўмелае выкарыстанне дзеепрыслоўя прыводзіць да памылак: *Гледзячы на залацістае поле пшаніцы, сэрца напаўняецца радасцю.* Каб пазбегнуць такіх памылак, трэба кіравацца наступным. Дзеепрыслоўе, абазначаючы дадатковае дзеянне, адносіцца не толькі да выказніка, але і да дзейніка. Адпаведна і асноўнае дзеянне, выражанае дзеясловам-выказнікам, і дадатковае, выражанае дзеепрыслоўем, павінна выконвацца той самай асобай або прадметам.



Правообладатель Национальный институт образования

Сказы, у якіх дзеянні, абазначаныя дзеясловам і дзеепрыслоўем, належаць розным дзейнікам, **сэнсава і граматычна няправільныя**, у іх парушаецца і лагічнасць, і правільнасць маўлення: 1) *У мяне, згадаўшы радкі з пісьма, міжволі выкаціліся слёзы.* 2) *Яму балюча зашчаміла сэрца, уявіўшы разгублены, заплаканы твар сябра.* 3) *Цяпер, перачытваючы ліст ад Уладзіміра, часта прыгадваецца дзяцінства.*

**Як праверыць, ці правільна ўжыта дзеепрыслоўе?**

***Першы прыём*** — трансфармацыйны: перабудоўваем сказ. Замяняем дзеепрыслоўе дзеясловам і злучаем аднародныя выказнікі злучнікам ***і***: *Дрэвы скрыпелі, пагойдваючыся ад ветру — Дрэвы пагойдваліся ад ветру і скрыпелі.*

***Другі прыём*** — перастаноўка дзеепрыслоўнага словазлучэння бліжэй да дзейніка: *Дрэвы, пагойдваючыся ад ветру, скрыпелі.*

У ***безасабовых сказах*** дзеепрыслоўе ўжываецца ***толькі тады***, калі яно адносіцца да ***неазначальнай формы дзеяслова*** (пры гэтым **выказнік** выражаны **спалучэннем** безасабовага дзеяслова або прэдыкатыўных прыслоўяў *трэба, неабходна, нельга, можна, варта* **з інфінітывам**): *На чужы лоб сягаючы, трэба і свой падставіць* (Прыказка).

Калі ж у безасабовым сказе інфінітыва няма або яго ролю выконваюць словы *відаць, чуваць*, то дзеепрыслоўе ўжываць нельга: 1) *Адчувалася, слухаючы выступоўцу: тое, што яна гаварыла, ніколі не забудзе.* 2) *Там, у кіно, гледзячы на яе, мне падумалася, што Таня прыгажэйшая за Аню.*

Адпаведна **няправільным** будзе сказ *Прыгледзеўшыся, мне была відаць знаёмая фігура.* **Правільным** будзе сказ, у якім выказнік выражаны спалучэннем прэдыкатыўнага прыслоўя *можна* з інфінітывам *убачыць*: *Прыгледзеўшыся, можна было ўбачыць знаёмую фігуру* (Паводле І. Лепешава).

Няправільна пабудаваныя сказы-прыклады запішыце, выправіўшы памылкі.

**68.** Вызначце сінтаксічныя памылкі ў сказах. Які практычны прыём вы скарыстаеце, каб праверыць правільнасць ужывання дзеепрыслоўных словазлучэнняў? Адрэдагаваныя сказы запішыце.

1. Імкнучыся стаць пераможцамі, у класе палепшылася сітуацыя з дысцыплінай. 2. Выходзячы са школы, у вочы дырэктара кінулася аб’ява. 3. Займаючыся ў секцыі, у хлопца заставалася мала вольнага часу. 4. Я думаю, што, закончыўшы ўніверсітэт, мая мара збудзецца.



Правообладатель Национальный институт образования

5. Так, рыхтуючыся да экскурсіі, праходзілі дні. 6. Выкарыстоўваючы назоўнікі ў розных склонах, змяняецца сэнс сказа. 7. Здаючы экзамен, трэба перад гэтым добра выспацца. 8. Чытаючы другую частку рамана, адразу раскрываецца сэнс эпіграфа. 9. Слухаючы лекцыю, перада мной узніклі гераічныя вобразы абаронцаў Радзімы *(З вучнёўскіх работ)*.

**69.** Праверце якасць выканання папярэдняга практыкавання з дапамогай наступных парад.

**Прыёмы выпраўлення памылак пры ўжыванні дзеепрыслоўяў**

1. Дзеепрыслоўны зварот можна перабудаваць у дададую частку складаназалежнага сказа, замяніўшы дзеепрыслоўе на дзеяслоў.

2. Можна пакінуць нязменным дзеепрыслоўны зварот, а другую частку сказа змяніць так, каб быў адзін утваральнік дзеяння. Напрыклад:

| **Няправільнае ўжыванне дзеепрыслоўяў** | **Прыёмы выпраўлення памылак** |
| --- | --- |
| *Пад'язджаючы да вёскі, нам траплялісся клёны і дубы.*<br>Памылка звязана з тым, што ў сказе два ўтваральнікі дзеяння: ***мы** пад'язджалі, а **клёны і дубы** траплялісся.* | 1-ы прыём:<br>*Калі пад'язджалі да вёскі, нам траплялісся клёны і дубы.*<br>2-і прыём:<br>*Пад'язджаючы да вёскі, мы бачылі клёны і дубы* (адзін утваральнік дзеяння). |
| *Лежачы на траве, лёгка дыхаецца і марыцца пра будучае.*<br>У безасабовых сказах дадатковае дзеянне выконваецца адной асобай, а галоўнае дзеянне адбываецца само па сабе (без асобы). **Выключэнне** складаюць сказы, у якіх ёсць **інфінітыў**. | 1-ы прыём:<br>*Калі ляжыш на траве, лёгка дыхаецца і марыцца пра будучае.*<br>2-і прыём:<br>*Лежачы на траве, лёгка дыхаць і марыць пра будучае.* |

***Звярніце ўвагу!***

Распаўсюджаная лагічная памылка — ужыванне дзеепрыслоўя закончанага трывання з суфіксам ***-ўшы (-шы)*** замест незакончанага або наадварот: *Добра адпачываючы (трэба: **адпачыўшы**) на летніх канікулах, дзеці ў верасні з радасцю ўзяліся за вучобу* (Я. Марозава).



Правообладатель Национальный институт образования

**70.** Прачытайце табліцу і раскажыце правіла пра ўтварэнне і ўжыванне дзеепрыметнікаў.

| **Утварэнне і ўжыванне дзеепрыметнікаў** | |
|---|---|
| **Дзеепрыметнікі незалежнага стану** | |
| • **цяперашняга часу**<br>Дзеепрыметнікі з суфіксамі -***уч-, -юч, -ач-, -яч-***<br>**не характэрныя** для беларускай мовы: *пішучы чалавек, заходзячае сонца* | • **прошлага часу**<br>Дзеепрыметнікі з суфіксам -***л-*** шырокаўжывальныя ў беларускай мове: *пераспелы яблык, анямелая рука.*<br>Дзеепрыметнікі з суфіксамі -***ўш-, -ш-***<br>**не характэрныя** для беларускай мовы: *разамлеўшая зямля, успыхнуўшае каханне* |
| У беларускай літаратурнай мове **неўжывальныя** дзеепрыметнікі з **постфіксам** -***ся***: *спазніўшаяся электрычка* | |
| **Дзеепрыметнікі залежнага стану** | |
| • **цяперашняга часу**<br>Дзеепрыметнікі з суфіксамі -***ем-, -ім-***<br>**не характэрныя** для беларускай мовы. Абмежавана ўжываюцца ў навуковым і афіцыйным стылях: *прыводзімыя факты* (**лепш**: *прыведзеныя факты*) | • **прошлага часу**<br>Дзеепрыметнікі з суфіксамі -***ан-, -ен-, -н-, -т-*** шырокаўжывальныя ў беларускай мове: *запрошаны госць, прывезены падарунак, прыбраны пакой, зжатае жыта* |

**71.** Прачытайце, выпішыце словазлучэнні *дзеепрыметнік + назоўнік*, графічна пакажыце ўтварэнне дзеепрыметнікаў. Якая роля дзеепрыметнікавых словазлучэнняў у перадачы пачуцця «чалавечай» адзіноты і роспачы птушкі? Як словы *журавок, быццам шкандыбаў, дарэмныя* (гукі) дапаўняюць створаную пісьменнікам карціну самоты?

У з о р: *нестрыва́ны сум*: *не* ***стрыва****(ць)* + ***н*** → *нестрываны.*

## Жураўліны крык

Наўздагон за зніклай чарадой, з апошніх сіл перабіраючы крыламі, не дужа высока ляцеў, быццам шкандыбаў* у паветраным абшары, адсталы, падбіты журавок. Ад яго роспачы аж здрыгануўся здзіўлены Глечык, нешта суладнае сваім затоеным пакутам пачуў ён у тым жалобным голасе, і грымаса болю і жалю скрывіла яго круглявы хлапечы твар. А журавель крычаў, кідаў у паветраны прастор



Правообладатель Национальный институт образования

дарэмныя гукі трывогі, махаў і махаў аслабелымі крыламі, пяўся наперад сваёй доўгай выцягнутай шыяй, але дагнаць чародку не мог *(В. Быкаў)*.

Ці выпішаце вы з тэксту адпаведна ўмове словазлучэнні *ў паветраным абшары, дарэмныя гукі?* Чаму?

● Выберыце словы на правіла «Правапіс канчаткаў назоўнікаў мужчынскага роду другога скланення ў родным склоне». Дапоўніце ўласнымі прыкладамі. Успомніце іншыя выпадкі правапісу адпаведных назоўнікаў.

**72.** Выправіце памылкі і запішыце дзеепрыметнікавыя словазлучэнні ў адпаведнасці з нормамі літаратурнай мовы.

Засеяная поле, затаптанная сцежка, затоіная радасць, стаяшчы хлопчык, працягваемая размова, зарошшая дарога, заінетая дрэва, закрэсліны абзац, пасвяжэты выгляд, зазялянеўшая трава, усміхаючыеся родныя, абмылыя дажджом, прыкручыная шыльда, заслужынная перамога, выматая падлога, прыклеіная марка, абветрыны твар, стомліная маці.

**73.** Прачытайце тэкст. Як ушаноўваецца памяць пра Льва Сапегу? Дзе ўстаноўлены помнік, адлюстраваны на фотаздымку?

Расстаўце знакі прыпынку і растлумачце іх пастаноўку. Назавіце сказы, у якіх акалічнасці выражаны дзеепрыслоўямі і дзеепрыслоўнымі зваротамі.

Леў Сапега зорка першай велічыні на небасхіле палітычнай гісторыі Беларусі. Ён нарадзіўся ў маёнтку Астроўна на Віцебшчыне ў шляхецкай сям'і атрымаў бліскучую адукацыю скончыўшы **Нясвіжскую пратэстанцкую** школу і **Лейпцыгскі ўніверсітэт** свабодна валодаў **пяццю** мовамі.



Першарадная заслуга Льва Сапегі ў тым што ён падрыхтаваў **Статут** 1588 года і дамогся яго зацвярджэння. Статут гарантаваў эканамічную палітычную і культурную незалежнасць Вялікага **Княства** Літоўскага. Дзякуючы асабістай мужнасці і палітычнаму таленту Льва Сапегі беларускае гаспадарства прыкметна пашырыла свае межы вярнуўшы назад нашы старадаўнія землі.



Правообладатель Национальный институт образования

Пра незвычайнасць асобы Льва Сапегі яго глыбокі **патрыятызм** сведчыць той факт што ў час вайны Вялікага Княства Літоўскага **са Швецыяй** у 1625—1629 гадах ён ахвяраваў амаль усю сваю маёмасць на ўтрыманне войска зрабіўшы ўсё магчымае дзеля ўратавання **Бацькаўшчыны.**

Дзякуючы чыннасці* Льва Сапегі наша старадаўняе гаспадарства не толькі **здолела** захаваць сваю незалежнасць у складаны гістарычны момант але і перажыло новы перыяд эканамічнага і культурнага росквіту *(Паводле І. Саверчанкі).*

- Зрабіце сінтаксічны разбор складаназалежнага сказа з дададзенай азначальнай часткай.
- Растлумачце правапіс выдзеленых слоў.
- Знайдзіце ў тэксце якасныя прыметнікі і ўтварыце ад іх усе магчымыя формы ступеней параўнання.
- Праскланяйце ўласнае імя *Леў Сапега*.

Падрыхтуйце паведамленне, выкарыстаўшы інтэрнэт-рэсурсы, пра помнікі наступным гістарычным асобам: М. Клеафасу Агінскаму, Ф. Багушэвічу, У. Чарадзею, Рагнедзе і Ізяславу, А. Міцкевічу, Я. Драздовічу, С. Буднаму.

**74.** Прачытайце тэкст, растлумачце яго назву. Вусна перакладзіце тэкст на беларускую мову. Запішыце перакладзеныя на беларускую мову сказы, у якіх адасобленыя члены выражаны дзеепрыслоўнымі і дзеепрыметнікавымі зваротамі. Пракаменціруйце іх адасабленне. Памятайце, што пры перакладзе не ўласцівыя беларускай мове дзеепрыметнікі можна замяніць **даданым сказам** *(делящийся — які дзеліцца)*, **назоўнікам** *(управляющий — кіраўнік)*, **прыметнікам** *(предшествующий — папярэдні)*.

## Лён в стиле хай-тек

В современной экономике наиболее конкурентными являются отрасли, производящие уникальный товар из местного сырья. Поэтому центр тяжести белорусской экономики переносится на секторы, позволяющие использовать местное сырьё и национальные традиции производства. Одним из таких направлений может стать льняное производство.

*Древние мудрецы говорили, что то, что не разделяется во времени, никогда не распадётся и в пространстве.* Беларусь — единственная страна в мире, на гербе которой изображён цветущий лён. Лён за его несравненные качества, которые не смогут заменить другие растения, объявлен материалом XXI века. Износоустойчивость, сохранение тепла и прохлады летом — это известные достоинства льна.



Правообладатель Национальный институт образования

Одежду, сшитую изо льна, носили и цари, и крестьяне. И сегодня более 70 процентов одежды создаётся с применением льняных волокон. Льняным маслом излечивают многие болезни. **Лён — это и стратегическое сырьё, используемое для производства многокомпонентных материалов нового поколения.** Беларусь по объёму производства льноволокна входит в пятёрку мировых лидеров, занимая четвёртое место после Китая, Франции и России *(В. Семенчуков)*.

Запішыце па-беларуску выдзелены сказ як сказ з простай мовай у трох структурных варыянтах: простая мова разрываецца словамі аўтара, знаходзіцца пасля слоў аўтара і перад імі.

**75.** Запішыце сказы, устаўляючы ўтвораныя ад дзеясловаў дзеепрыметнікі, характэрныя для беларускай мовы. Абазначце суфіксы дзеепрыметнікаў. Раскажыце пра ўтварэнне і правапіс дзеепрыметнікаў. Растлумачце пастаноўку знакаў прыпынку.

1. Спецыялісты, *(падрыхтаваць)* для сферы робататэхнікі, найбольш *(запатрабаваць)* у спісе прафесій. 2. У Гомельскім дзяржаўным універсітэце імя Ф. Скарыны з’явілася IT-спецыяльнасць «*(праграмаваць)* мабільныя сістэмы» *(фактычна — інжынеры-робататэхнікі)*. 3. Інжынеры-робататэхнікі — прафесіяналы з *(забяспечыць)* будучыняй. 4. Аналітыкі прыходзяць да *(прагназаваць)* меркаванняў: у хуткім часе будуць *(перабудаваць)* многія галіны эканомікі. 5. Перабудову распачалі вядучыя вытворцы смартфонаў — Apple і Huawei, якія выпусцілі мадэлі з *(убудаваць)* сістэмамі падтрымкі нейрасетак. 6. Пачынаецца сапраўдны бум *(агучыць)* памочнікаў, *(інтэграваць)* для ўваходжання чалавека ў «разумную» тэхнасферу. 7. Ужо *(абнародаваць)* прагноз па сусветным рынку робататэхнікі і беспілотных лятальных апаратаў на бліжэйшыя гады. 8. Айчынная сістэма адукацыі ма́е належную базу для падрыхтоўкі студэнтаў, якія будуць ствараць *(робатызаваць)* сістэмы. 9. Мы жывём у свеце новых тэхнічных магчымасцей, што дазваляе ствараць *(праграмаваць)* сістэмы. 10. Сёння патрэбны веды, *(заснаваць)* на гуманітарных і фізіка-матэматычных дысцыплінах *(З часопіса «Беларусь»)*.

Паразважайце пра перспектывы замены настаўнікаў робатамі. Якія плюсы і мінусы магчымага развіцця гэтага працэсу вы бачыце?



Правообладатель Национальный институт образования

# § 7. Правілы пабудовы сказаў з адасобленымі членамі, знакі прыпынку

### Знакі прыпынку пры адасобленых азначэннях

Адасабленне — сэнсавае выдзяленне дадзеных членаў сказа, якое ў вусным маўленні перадаецца інтанацыяй (павышэннем або паніжэннем голасу і паўзамі), а на пісьме — знакамі прыпынку (коскамі або працяжнікамі).

**76.** Сярод прапанаваных азначэнняў выберыце азначэнне адасобленых членаў сказа.

*Адасобленыя члены сказа* — гэта:

а) члены сказа, якія выконваюць аднолькавую сінтаксічную функцыю, адносяцца да аднаго і таго ж слова, характарызуюцца інтанацыяй пералічэння;

б) члены сказа, якія ўтвараюць яго граматычную аснову;

в) члены сказа, якія інтанацыйна і сэнсава выдзяляюцца з мэтай падкрэсліць іх значэнне ў маўленні;

г) словы, словазлучэнні і сказы, якія не з'яўляюцца членамі сказа, граматычна не звязаны з імі, а ўключаюцца ў сказ з мэтай паказаць адносіны таго, хто гаворыць, да вы́казанай думкі;

д) словы, словазлучэнні і сказы, якія ўключаюцца ў структуру сказа з мэтай падаць дадатковыя звесткі, тлумачэнні, заўвагі, пры гэтым вызначаюцца сэнсавай адасобленасцю ад зместу асноўнага сказа.

З якімі тэрмінамі суадносяцца астатнія прапанаваныя азначэнні? Прывядзіце адпаведныя прыклады сказаў.

**77.** Прачытайце. Запішыце пытанні да тэксту, адказы на якія тлумачылі б сутнасць адасаблення і правілы пастаноўкі знакаў прыпынку пры дапасаваных азначэннях.

Стылістычныя функцыі сказаў з адасобленымі членамі акрэсліваюцца іх прызначэннем — канкрэтызаваць, удакладняць, інтанацыйна і сэнсава вылучаць асобныя кампаненты выказвання.

З дапамогай адасаблення падкрэсліваюцца істотныя для разумення тэксту дэталі, напрыклад: *Нават самыя грубыя, недалікатныя людзі — на некалькі хвілін — становяцца паэтамі, рамантыкамі.* Зразумела, што нявыхаванасць і рамантыка — рэчы несумяшчальныя,



Правообладатель Национальный институт образования

аднак роля паэтычнага, узвышанага слова настолькі значымая, што нават грубы чалавек у пэўныя моманты свайго жыцця адчувае сілу, прыгажосць лірычных радкоў. Нязвыкласць сітуацыі падкрэсліваецца праз адасобленую канструкцыю *на некалькі хвілін*. Без адасаблення — інтанацыйнага, сэнсавага — сказ мае сцвярджальны, адназначны характар: *Нават самыя грубыя, недалікатныя людзі на некалькі хвілін становяцца паэтамі, рамантыкамі.*

Адасабленне трэба разглядаць як спецыфічны сродак сінтаксічнай сувязі слоў у сказе, пры дапамозе якога выдзяляецца сэнсавая функцыя спалучэння слоў (асобнага слова) у кантэксце. Частотна адасабляюцца дапасаваныя/недапасаваныя азначэнні і акалічнасці, выражаныя дзеепрыслоўным зваротам. У сказах з адасобленым азначэннем з дапамогай інтанацыі, парадку слоў пэўная прымета лагічна і эмацыянальна выдзяляецца, акцэнтуецца: *Дождж усё шамацеў над самай галавою, спорны, роўны* (У. Караткевіч). Адасобленыя прыдаткі падкрэсліваюць прымету, вылучаюць яе на першы план: *Ефрасіння Полацкая — будучая святая — нарадзілася ў сям'і малодшага сына Усяслава Чарадзея* (Паводле А. Багамолавай).

К о с к а м і  в ы д з я л я ю ц ц а дапасаваныя азначэнні, калі яны:

- выражаны дзеепрыметнікавымі або прыметнікавымі зваротамі і стаяць пасля назоўніка, які паясняюць: *Над спаленай* ***вёскай, адзетай жалобным гранітам,*** *званы абзываюцца рэхам вайны незабытым* (А. Куляшоў); *Мне шчасце — жыць і піць жыцця* ***напой, настоены на шчырасці сардэчнай*** (В. Максімовіч); *Веснавая цёплая ноч толькі што апранула зямлю і раскідала свае таемныя* ***чары, поўныя крыху смутнага хараства*** (Я. Колас);
- выражаны адзіночнымі прыметнікамі або дзеепрыметнікамі, стаяць непасрэдна пасля назоўніка, які паясняюць, і маюць асаблівую сэнсавую нагрузку: *А ў жытнёвае лета вісіць над зямлёю* ***яблык, пераспелы*** *і* ***светлы****, як даўняя журба...* (М. Стральцоў);
- выражаны адзіночнымі прыметнікамі і дзеепрыметнікамі або прыметнікавымі і дзеепрыметнікавымі зваротамі, стаяць перад назоўнікам, які паясняюць, і маюць дадатковае акалічнаснае адценне прычыны або ўступкі: ***Сівабароды, дзед*** *нагадваў гусляра з паэмы Я. Купалы «Курган»*; ***Узрадаваны апошнімі промнямі чырванаватага сонца, дуб*** *спакойна сустрэў зорную веснавую ноч* (А. Пальчэўскі);



Правообладатель Национальный институт образования

- выражаны прыметнікамі і дзеепрыметнікамі з паясняльнымі словамі і без іх, адносяцца да назоўніка (пераважна да дзейніка) і стаяць перад ім, радзей — пасля яго, але аддзелены ад гэтага назоўніка дзеясловам-выказнікам або іншымі членамі сказа: ***Ад заняткаў вольныя,*** *лета дні цяклі* (А. Куляшоў); ***Чатыры вярбы*** *раслі на аселіцы,* ***вялікія,*** *што толькі ўдваіх, узяўшыся за рукі, і абхваціш* (А. Жук); *Італьянскія* ***аркады**** *белага палаца,* ***перакрэсленыя чорнымі факеламі таполяў,*** *адкрыліся ў канцы алеі* (У. Караткевіч);
- выражаны прыметнікамі і дзеепрыметнікамі або прыметнікавымі і дзеепрыметнікавымі зваротамі і адносяцца да асабовых займеннікаў (незалежна ад пазіцыі азначэнняў): ***Ты*** *ў лёс зайшоў мой на палескай станцыі,* ***бунтоўны і трывожна-малады*** (В. Аколава); *Чаго,* ***неспакойнае, ты*** *захацела, чаго,* ***непакорнае, ты*** *затрымцела, сэрца маё?* (П. Панчанка); ***Павесялелы ад слоў маці, ён*** *ляцеў як на крылах.*

***Заўвага.*** Калі адасобленыя дапасаваныя азначэнні, з'яўляючыся па сэнсе неаднароднымі, стаяць пасля слова, якое паясняюць, то яны набываюць значэнне аднароднасці і раздзяляюцца коскамі, як аднародныя члены сказа: *На небе ляжалі пашматаныя* ***воблакі, нізкія, высокія, перыстыя*** *і* ***дажджавыя*** (І. Шамякін).

Не выдзяляюцца коскамі дапасаваныя азначэнні, калі яны выражаны адзіночнымі прыметнікамі або дзеепрыметнікамі і стаяць пасля назоўніка, які паясняюць, утвараючы з ім адно сэнсавае цэлае: *Чым больш жыву, тым больш карціць спазнаць мне* ***шчасце таямнічае...*** (В. Максімовіч); *З крыніцы выбягаюць ручайкі, іх кліча* ***свет заманлівы*** *і* ***звонкі...*** (П. Макаль); *З сумам гляджу я на* ***сад апусцелы.***

**78.** Растлумачце пастаноўку знакаў прыпынку ў сказах з адасобленымі членамі, улічваючы ўмовы адасаблення: інтанацыю, парадак слоў у сказе (адасобленыя члены стаяць перад словам, якое паясняюць, або пасля яго), марфалагічнае выражэнне паяснёнага слова (займеннік, агульны або ўласны назоўнік).

Вусна перабудуйце сказы так, каб адасобленыя члены сталі неадасобленымі. Растлумачце інтанацыйную і сэнсавую розніцу паміж варыянтамі сказаў.

1. Па расе, ад сонца яркай, мы вяртаемся дамоў *(П. Панчанка)*. 2. Успыхнуў жаваранак над праспектам, затрымцеў, утрапёны і **горды** *(Г. Бураўкін)*. 3. Спяваюць жаваранкі. Нябачныя, яны трымцяць у засмужаным[сл] злёгку **блакіце** *(Я. Брыль)*. 4. Твар восені, пабляклы, невясёлы, вачам маім адкрыўся пакрысе* *(Г. Каржанеўская)*.



Правообладатель Национальный институт образования

5. **Бліскавіцай** асляпіўшы ўсіх, россыпны, зялёны, **хлынуў** лівень *(Д. Кавалёў)*. 6. Выйдзеш за вёску — жытнёвыя далі коцяцца, цёплыя, **плы́няць** наўсцяж *(К. Кірэенка)*.

Да выдзеленых слоў падбярыце сінанімічныя рады.

● Выпішыце дзеясловы, ужытыя ў форме 2-й асобы адзіночнага і 3-й асобы множнага ліку. Растлумачце правапіс іх канчаткаў.

**79.** Спішыце сказы, выбраныя з вершаў У. Караткевіча, расстаўце знакі прыпынку, растлумачце іх неабходнасць/адсутнасць. Акрэсліце ўдакладняльны, паясняльны характар адасобленых членаў сказа ў кантэксце.

1. Шчасце былое ўяўляю дзяўчынкаю па вясне. Загарэлая кемная* злая дражніла яна мяне. 2. Явар сумны і адзінокі пахіліў задумёны стан. 3. Глянь на зямлю залатую пяшчотную сумную чыстую нехта па ёй вандруе ў паветра ўзнімаючы лісце. 4. Шчасце гуляла ў садзе апранутае ў паркаль сабе і птушкам на радасць а мне на смутак і жаль. 5. Кветка ў нетрах лясных распускалася залатая агністая сіняя. 6. І знік той дзень загублены ў цішы́. 7. Былі ў яе нябачаныя вочы падобныя на просінь у нябёс і сарамлівасць мілая дзявочая і светлая была як светлы лёс. 8. Мудры моцны і працавіты цвёрда ведае родны народ — сонца светлым устане над жытам як прывыклі за многа год. 9. У вачах тваіх шэрых мілых больш было да мяне цеплыні.




Якія вершы У. Караткевіча вы ведаеце і любіце? Паразважайце, ці можна па некалькіх радках пазнаць паэта.
Растлумачце сэнс назвы зборніка паэта.

**80.** Раскажыце правілы адасаблення азначэнняў. Дапоўніце табліцу.

| Умовы адасаблення | Чым выражаны азначэнні | Прыклады |
|---|---|---|
| Заўсёды адасабляюцца:<br>● калі стаяць пасля слова, якое паясняюць;<br>● аддзелены ад слова, якое паясняюць, іншымі словамі;<br>● маюць значэнне прычыны, умовы, уступкі | | |



Правообладатель Национальный институт образования

**81.** Прачытайце разважанні айчыннага моваведа Міхася Яўневіча. Карыстаючыся прыведзеным каментарыем як узорам, назавіце ўмовы адасаблення/неадасаблення (пры адпаведных зменах) у наступных сказах. Якія ўмовы — граматычныя або сэнсавыя — з'яўляюцца, на вашу думку, вырашальнымі пры адасабленні членаў сказа?

Пры разглядзе сказаў з адасобленымі членамі часта на першы план ставяцца граматычныя ўмовы адасаблення. Фактычна ж асноўнай умовай адасаблення з'яўляецца дадатковая сэнсавая нагрузка, якую выконвае той ці іншы даданы член сказа. Таму пры аднолькавых граматычных умовах тое самае спалучэнне слоў можа адасабляцца і не адасабляцца ў залежнасці ад яго сэнсавай нагрузкі. Так, у сказе *Адагрэтая за вясну зямля набрала сіл* (Я. Колас) спалучэнне *адагрэтая за вясну* выступае толькі ў сваім асноўным значэнні і таму не адасабляецца. Калі ж мы інтанацыйна выдзелім гэтыя словы, то ўзмоцніцца іх сувязь з выказнікам *набрала сіл*, гэта спалучэнне набудзе адценне прычыннага значэння і, вядома, адасобіцца: *Адагрэтая за вясну, зямля набрала сіл*.

1. Месяц, яркі і круглы, абліў наваколле халодным святлом *(З. Бядуля)*. 2. На палях нерухома ляжала восень, шэрая, аднастайная *(І. Шамякін)*. 3. Услед за крыгамі плыве ў Волзе вымытае сонца *(С. Грахоўскі)*. 4. Працяты марозам снег хрустка скрыпеў пад нагамі дзеда Талаша *(Я. Колас)*. 5. Васіль углядаўся ў вышытае зорамі неба *(І. Мележ)*.

**82.** Прачытайце сказы. Растлумачце пастаноўку знакаў прыпынку пры недапасаваных азначэннях.

1. Да Аляксандра падышла прыгожая дзяўчына, з блакітнымі вачамі, з доўгай русай касой, і запыталася пра білеты. 2. З кветкамі і шарыкамі, у святочным адзенні, мы ішлі на апошнюю ў сваім жыцці школьную лінейку. 3. На каток, дзе збіраліся аднакласнікі, завітаў і Косця, без лішніх рэчаў, з канькамі і клюшкай. 4. Вунь які штабель дроў пад хлявом — на ўсю шырыню сцяны ад зямлі да самага даху *(І. Капыловіч)*. 5. Усіх нас непакоіла адна думка — выстаяць *(М. Лынькоў)*.

**83.** Прачытайце. Спішыце сказы, афармляючы іх паводле пунктуацыйных норм і раскрываючы дужкі. Растлумачце пастаноўку знакаў прыпынку.

1. Яловы лес і яліны раслі і ра*(с/з)*кашавалі вакол нашай вёскі. Ахута*(н/нн)*ыя лапнікам яны як усё роўна былі зашнурава*(н/нн)*ы



Правообладатель Национальный институт образования

і зашпіле*(н/нн)*ы на ўсе гузікі і хавалі за пазухай нейкую таямніцу *(В. Макарэвіч)*. 2. Алёна асветле*(н/нн)*ая вечаровым сонцам сядзіць з яблыкам у руках пад яблыняй *(У. Сцяпан)*. 3. Над ім ра*(с/з)*пасціралася блакітнае бя*(с/з)*до*(н/нн)*ае неба светлае і чыстае без адзінай хмаркі *(Г. Пярун)*. 4. Дзядзька[ф] Мікола худы жылісты насаты з кучомкай пасівелых валасоў хітравата з прыжмурам утаропіўся ў таўсматага брыгадзіра *(А. Камароўскі)*. 5. Падора*(н/нн)*ыя нябёсамі жнівен*(ь/?)*скія дзянькі тояць у сабе шмат асалоды *(Н. Навіцкая)*. 6. Голас маці лагодны і клапатлівы даляцеў аднекуль здалёк *(І. Клімянкоў)*. 7. Яна ўвайшла порстка паружавелая свежая *(Я. Скрыган)*. 8. Мала хто з іх тады маладых вясёлых застаўся жыць у гэтым доме *(Г. Васілеўская)*. 9. Валасы яе колеру саломы былі мокрыя *(Ю. Станкевіч)*.

### Знакі прыпынку пры адасобленых прыдатках

**84.** Прачытайце сказы, звярніце ўвагу на выдзеленыя словы. Якім пунктуацыйным нормам адпавядае афармленне сказаў?

1. **Рамантык закаханы** і **паэт, я** кветкі акрыляў, падняўшы ўгору, дарыў табе, здаецца, толькі ўчора *(М. Маляўка)*. 2. І **мядзведзь, даўні ўладар пушчаў,** таксама прабівае сабе сцежку, прыходзячы з далёкіх нязведаных сховаў *(П. Пестрак)*. 3. **Флексія, або канчатак,** утварае пэўную граматычную форму слова і служыць для граматычнай сувязі паміж словамі ў словазлучэнні і сказе. 4. Да бярозавага балота Рэйдзіху павёў суседскі **хлопчык, дзесяцігадовы Аўласаў Міцька** *(І. Чыгрынаў)*. 5. Над **Бароўкай, двароў на сорак вёскай,** якая падступалася паўкругам да возера (па адзін бок яго стаялі хаты, а па другі — лес), неўзаметку асядаў вечар *(І. Чыгрынаў)*. 6. Якраз была адлётная **пара — выпрабаванне на любоў і вернасць** *(Л. Галубовіч)*. 7. На **Белай Русі — зямлі маіх продкаў** — непадалёку ад гарадка Мір на захадзе серабрыцца Уша, трохі далей — Сервеч *(А. Наўроцкі)*.

Сфармулюйце правілы адасаблення прыдаткаў на пісьме.

Адасобленыя прыдаткі ў вусным маўленні выдзяляюцца паўзамі, на пісьме — коскамі.

З а ў с ё д ы  а д а с а б л я ю ц ц а:

- развітыя і адзіночныя прыдаткі, якія адносяцца да асабовага займенніка (незалежна ад месца ў сказе): ***Удачлівы паляўнічы,*** *ён часта прыносіў з лесу то зайца, то лісу* (А. Федарэнка); *Яна,* ***вядомая ў горадзе жанчына,*** *дапамагала адбудоўваць бальніцу;*



Правообладатель Национальный институт образования

- развітыя і адзіночныя прыдаткі, якія адносяцца да агульнага ці ўласнага назоўніка і стаяць пасля яго: *Валянцін Міхайлавіч, **мужчына гадоў сарака**, збавіў хуткасць, уважліва паглядзеў на Паўла* (А. Дзялендзік); *Зубр, **волат Белавежскай пушчы**, узгадваецца ў многіх паэтычных творах.*

***Заўвага 1.*** Перад назоўнікам (агульным ці ўласным) прыдатак адасабляецца, калі ён мае дадатковае акалічнаснае значэнне ўступкі ці прычыны: ***Майстар на ўсе рукі,** Святаслаў Іванавіч быў сціплым чалавекам.*

Адасабляецца прыдатак, калі ён звязаны з назоўнікам, які паясняе, словамі ***па мянушцы, па клічцы, па прозвішчы***: *Сабака, **па клічцы Гор**, хутка ўзяў след.*

Адасабляюцца прыдаткі са злучнікам ***як***, калі яны маюць дадатковае прычыннае значэнне: ***Як выдатнаму спецыялісту,*** Сяргею Пятровічу заўсёды даручалі складаныя справы.

***Заўвага 2.*** Калі злучнік ***як*** мае значэнне 'ў якасці', то прыдатак коскамі не выдзяляецца: *Гліна здаўна выкарыстоўваецца **як будаўнічы матэрыял.***

Адасабляюцца прыдаткі са злучнікамі ***ці, або***, калі яны маюць удакладняльнае значэнне: *У беларускіх лясах гнездзіцца жаўна, **або чорны дзяцел*** (В. Вольскі).

Адасобленыя прыдаткі могуць выдзяляцца працяжнікамі, калі ім надаецца асаблівае значэнне і пры вымаўленні яны аддзяляюцца ад слова, якое паясняюць, больш доўгай паўзай: *Вось яна — **дзявочая пекната*** (І. Шамякін).

**85.** Прачытайце. Спішыце сказы, афармляючы іх у адпаведнасці з пунктуацыйнымі нормамі і ўстаўляючы прапушчаныя літары. Растлумачце пастаноўку знакаў прыпынку і напісанне ўстаўленых літар.

1. Ал..ксей Савіч з зачараван..ем слухаў в..дучую маладую дзяўчыну зага..чыцу клуба *(У. Гаўрыловіч)*. 2. Ажыло[с] маё св..тое гаючае дрэва ліпа *(У. Ліпскі)*. 3. Прыйшлі суседзі баба Мар'я з сынам Віктарам і н..весткай Кацярынай *(Н. Касцючэнка)*. 4. Спраўны му..чына майстар на ўсе рукі ён часта дапамагаў знаёмым у розных справах *(А. Козел)*. 5. Алёна глянула на музыкантаў двух маладых гара..кіх хлопцаў *(В. Саковіч)*. 6. Пакуль Іван Данілавіч паіў каня, на двор хуткаю хадою ўвайшла Кацярына чарнявая жанчына з прывабнымі рысамі твару ў жоўтай майцы з кароткімі рукавамі светлай доўгай спадніцы і з хусткай у руках *(Д. Пятровіч)*. 7. Вайна часта кранала іх в..сковых хлапчукоў і дзяўчынак сваім крылом *(Л. Валасюк)*.



Правообладатель Национальный институт образования

**86.** Прачытайце тэкст, пашыраючы сказы словамі з дужак. Запішыце ўтвораныя сказы, пракаменціруйце іх пунктуацыйнае афармленне. Вызначце ролю адасобленых членаў сказа ў тэксце.

На грыбы трэба цёплае, нават гарачае, але з частымі дажджамі лета. Тады яшчэ ў чэрвені — ліпені, у ягадную пару, шаўковымі пражылкамі белай цвілі ўкрываюцца чорныя лапікі лясной зямлі. **Цвільгрыбніца** паказваецца і на сцежках[ф], і па езджанай дарозе (першая адмеціна грыбнога лета).

Урачыстасць, сапраўдную вагу грыбному сезону надае баравік, але і да яго, і пасля яго растуць у лесе грыбы.[сн]

Прадвеснікам баравіка з'яўляецца чырвонагаловы падасінавік (грыб змешанага лесу). Ён сапраўды любіць, каб паблізу лапатала асіна, а калі няма яе, дык хоць бяроза ці якая-небудзь вярба.

Баравік, падасінавік[сл] ды яшчэ рыжык часцей трапляюць у кошык спрактыкаваных грыбнікоў. Іншых грыбоў можа набраць кожны, хто заявіцца ў лес, няхай сабе нават першы раз.

У кожнай[м] мясцовасці ёсць свае забабоны наконт таго, які грыб прыгодны, а які — не. У нас не бяруць ваўнянак, таўстух, сінюх (грыбоў вельмі смачных і карысных). Не бяруць і пахучага **грыба-караняплода** труфеля, які вырастае, не бачачы святла, у лясных шэразёмах...

У сухое лета першы баравік пракідаецца ў бярэзніках з травяным долам, на мясцінах ніжэйшых, макрэйшых. Калі лета, наадварот, мокрае, баравіка шукай па сасняках, па пясчаных[ф] узгорках *(Паводле І. Навуменкі)*.

- Растлумачце напісанне выдзеленых слоў.

**87.** Прачытайце тэкст, вызначце яго асноўную думку. Як возера Свіцязь паўплывала на творчасць Я. Чачота і А. Міцкевіча?

Спішыце, раскрываючы дужкі. Пастаўце, дзе трэба, знакі прыпынку і патлумачце іх.

*(Не)*надта вялікае і *(не)*надта глыбокае яно [возера Свіцязь] даўно быццам *(не)*адольны магніт прыцягвае да сябе падарожнікаў з усяго свету.[сн] Дзвесце гадоў таму на берагах Свіцязі часта бывалі два школьныя сябры Ян Чачот і Адам Міцкевіч. Абодва — нашы землякі выдатныя польскія паэты. Да таго*(ж)* Ян Чачот руплівы збіральнік беларускага фальклору сам пісаў *(па)*беларуску вершы. Зачараваныя харазтвом Свіцязі і пачутымі на яго берагах народнымі легендамі аб прыгажунях*(свіцязянках)* паэты стварылі *(не)*калькі балад сапраўдных шэдэўраў *(Паводле У. Ягоўдзіка)*.



Правообладатель Национальный институт образования

## Знакі прыпынку пры адасобленых акалічнасцях

**88.** Разгледзьце схему.

- Акалічнасць выражана **дзеепрыслоўем**
  - **адасабляецца,** калі
    - мае значэнне дадатковага выказніка: *Паснедаўшы, я адчуў сябе лепш.*
  - **не адасабляецца,** калі
    - мае значэнне спосабу дзеяння (звычайна размешчана ў канцы сказа): *Не варта чытаць лежачы.*
    - знаходзіцца ў аднародным радзе з неадасобленай акалічнасцю: *Я прачытаў верш выразна і не спяшаючыся.*
- Акалічнасць выражана **дзеепрыслоўным зваротам**
  - **адасабляецца**
    - заўсёды, незалежна ад месца ў сказе: *Цеплыня адплывае, крылом узмахнуўшы, аслаблым летам бабіным* (В. Зуёнак).
  - **не адасабляецца,** калі
    - з'яўляецца фразеалагізмам: *Я не буду сядзець склаўшы рукі.*
    - ёсць у складзе адносны займеннік ***які***: *Дзе тая кніга, прачытаўшы якую знойдзеш адказы на ўсе пытанні?*
- Акалічнасць выражана **назоўнікам**
  - **адасабляецца**
    - акалічнасць з прыназоўнікам ***нягледзячы на***: *Нягледзячы на шматлікія перашкоды, ён працаваў адказна і старанна;*
    - акалічнасць з удакладняльным значэннем: *Тут, у Альбуцi, загарэлася ў сэрцы Коласа паэтычная іскра* (С. Александровіч).

Спішыце сказы, расстаўляючы, дзе трэба, коскі. Растлумачце адасабленне або неадасабленне акалічнасцей з апорай на схему.

1. Курлыкаючы раздумна ўзмахваючы крыламі ў далёкую дарогу плывуць жураветы *(Я. Скрыган)*. 2. Звішнюк стаяў апёршыся на вароты і задумаўшыся глядзеў на вуліцу *(І. Пташнікаў)*. 3. Свайго ***не меўшы*** ляжаш спаць ***не еўшы*** *(Прыказка)*. 4. Сядзяць грыбы, як капыты,



Правообладатель Национальный институт образования

і разгарнуўшы парасоны глядзяць, бы нейкія персоны *(Я. Колас)*. 5. Нягледзячы на камяністую глебу ногі падарожнікаў мякка ступалі па імху, які пакрываў не толькі горную пароду, але і ўсе вялікія дрэвы навокал *(Я. Маўр)*. 6. Вучань адказваў ціха і не пазіраючы на аднакласнікаў. 7. Залатой мякінай лістападу адшумяць сумуючы гаі *(Т. Кляшторны)*.

- Зрабіце фанетычны запіс выдзеленых адзінак.

Коскай выдзяляюцца акалічнасці, калі яны выражаны адзіночнымі дзеепрыслоўямі і дзеепрыслоўнымі зваротамі (незалежна ад іх месца ў сказе): ***Выканаўшы заданне,*** *я вярнуўся ў ліцэй* (А. Карпюк); *Кожны раз,* ***адзначаючы Дзень Перамогі,*** *мы ўшаноўваем памяць загінуўшых, кладзём да іх магіл і абеліскаў жывыя кветкі. Гэта наш святы абавязак памяці* (А. Бачыла).

***Заўвага 1.*** Не выдзяляюцца коскамі акалічнасці, выражаныя:

- дзеепрыслоўнымі зваротамі, якія з'яўляюцца ўстойлівымі выразамі: *Аповед сяброўкі пра вандроўку ў далёкія краіны мы слухалі* ***развесіўшы вушы***;
- адзіночнымі дзеепрыслоўямі, калі яны стаяць пасля дзеяслова-выказніка, сваім значэннем набліжаючыся да прыслоўя спосабу дзеяння: *Старшыня чытаў* ***стоячы*** (А. Жук); *Дадому Алесь ішоў* ***не спяшаючыся.***

***Заўвага 2.*** Коска не ставіцца перад злучнікам ***і***, які звязвае дзве акалічнасці, выражаныя адзіночнымі дзеепрыслоўямі, дзеепрыслоўнымі зваротамі або прыслоўем з дзеепрыслоўем. Пры бяззлучнікавай сувязі паміж такімі акалічнасцямі коска ставіцца: ***Пагаварыўшы з вучнямі і крыху разагнаўшы іх страх,*** *Лабановіч прынёс журнал і пачаў рабіць запіс* (Я. Колас). Параўн.: ***Пагаварыўшы з вучнямі, крыху разагнаўшы іх страх,*** *Лабановіч прынёс журнал і пачаў рабіць запіс.*

Акалічнасць, выражаная адзіночным дзеепрыслоўем або дзеепрыслоўным зваротам, пры якім стаяць часціцы ***толькі, нават***, разам з імі аддзяляецца коскай: *Што хлеб — гэта хлеб, па-сапраўднаму можна даведацца,* ***толькі адчуўшы голад*** (Я. Брыль); ***Нават проста наведаўшы Нацыянальную бібліятэку Беларусі,*** *разумееш веліч чалавечага духу.*



Правообладатель Национальный институт образования

Калі адасобленая акалічнасць, выражаная адзіночным дзеепрыслоўем або дзеепрыслоўным зваротам, звязана з астатняй часткай сказа злучнікамі ***ніб***, ***як бы***, ***быццам*** і іншымі, то коска ставіцца перад адпаведным злучнікам: *Часам нейкіх карасікаў і падчэпліваў, але найбольш мой паплавок весела гайдаўся,* ***нібы пасміхаючыся з майго рыбалоўства*** (В. Шніп); *Лес пад пухкімі камякамі снегу хутка станавіўся серабрыста-белым,* ***быццам ператвараючыся ў зачараванае царства.***

Выдзяляюцца коскамі акалічнасці, выражаныя назоўнікамі ва ўскосных склонах з прыназоўнікамі ***нягледзячы на***, ***насуперак***, ***у адпаведнасці***, ***са згоды*** і іншымі са значэннем прычыны, умовы, уступкі, спосабу дзеяння: ***Нягледзячы на неадкладныя справы,*** *пісьменнік змог даць інтэрв'ю любімай газеце.* ***Насуперак усім прагнозам,*** *наша каманда ўдала выступіла на чарговых спаборніцтвах. На сходзе,* ***са згоды ўсіх прысутных,*** *было прынята рашэнне аб аказанні матэрыяльнай дапамогі некаторым членам калектыву.*

**89.** Прачытайце тэкст. Дайце яму назву. Якія фарбы вы скарысталі б, каб малявалі ілюстрацыю да тэксту? Назавіце сказы з адасобленымі членамі, растлумачце пастаноўку знакаў прыпынку пры адасобленых членах.

Першая яшчэ з сярэдзіны лета скідала ліст бяроза. Тое, што яна тут, паблізу[м], можна было заўважыць, нават не ўзнімаючы галавы, па залатой замеці лісця паміж верасу і травы. Па такой прыкмеце пазнаваўся і дуб, толькі па леташнім лісці, яно, нягледзячы на дажджы, слоту, доўга ляжала. Асіна, апрануўшыся ў вогненныя барвы, пад восень рабілася прыгажэйшай ад усіх дрэў.

Гаспадары восеньскага лесу — дзяцел і наіўна-вясёлыя, бесклапотныя сініцы. Астатняе шэрае птаства, збіраючыся ў вырай, змаўкае. У ядлоўцавых зарасніках можна падняць соннага днём цецерука, і ён гучна залапоча крыллем, віруючы між соснаў, ніколі не падымаючыся над купамі дрэў.

Цікаўная вавёрка, не баючыся грыбнікоў, спусціцца на ніжні сук, падзівіцца вокам-шрацінкай і шугане рыжай маланкай між зялёнай навісі. Збіраючы грыбы, я некалькі разоў бачыў вогненна-чырвоных[сл] ліс, яны заўсёды перабягалі дарогу... *(Паводле І. Навуменкі).*



Правообладатель Национальный институт образования

**90.** Прачытайце сказы. Спішыце, раскрываючы дужкі і ўстаўляючы прапушчаныя літары. Расстаўце знакі прыпынку паводле пунктуацыйных норм і растлумачце іх пастаноўку.

1. Адвеку ты жывеш па праўдзе *(н..)*наракаючы на долю *(А. Зэкаў)*. 2. Стома заклапочанасць *(н..)*гледзячы н.. на што *(н..)*сцерліся з яго твару (*У. Шыцік*). 3. Дажджавое покрыва ахінула ўвесь небасхіл *(н..)*пакінуўшы *(н..)*воднага светлага краёчка *(Г. Пярун)*. 4. Гледзячы *(н..)*куды перад сабой высока трымаючы галаву Кацярына журботна пела на роднай мове *(Н. Касцючэнка)*. 5. Камандзір нашага ўзвода быў *(н..)*стомны і *(н..)*гледзячы на свой *(н..)*вялікі рост бегаў як заведзены *(Э. Луканскі)*. 6. Яна [Галіна Пятроўна] заўсёды вельмі хвалявалася чакаючы першага верасня *(У. Гаўрыловіч)*. 7. Абдымаюць Радзіму буслы прад расстаннем ахінуўшыся наміткай смутку-тугі *(Г. Бабарыка)*. 8. *(Н..)*гледзячы на страшэнную стому я гарэў *(н..)*цярпеннем высветліць што здарылася *(Э. Луканскі)*.

**91.** Спішыце сказы, расстаўляючы знакі прыпынку. Пракаменціруйце іх пастаноўку.

1. На супрацьлеглым баку гайдаліся паблісквaючы срэбрам лісця густыя і разлапістыя кусты вербалозу[сл] *(У. Гніламедаў)*. 2. Падняўшыся на свой паверх і паставіўшы сумку на падлогу Дзяніс апусціўся ў крэсла і разам з тым нецярпліва пачаў разрываць канверт *(Д. Пятровіч)*. 3. Маладзіца збіраючы ягады спявала напаўголаса *(П. Пестрак)*. 4. Расчасаўшы густыя валасы і сплёўшы іх у доўгую касу дзяўчына адкінула яе за плечы *(Я. Сіпакоў)*. 5. Вольга Міхайлаўна ціха пастукала ў дзверы[м] і крыху счакаўшы паволі штурханула іх *(Т. Пяшко)*. 6. Пастаяўшы крыху Клара Іванаўна схамянулася і ўздыхнуўшы села за стол *(А. Федарэнка)*. 7. Нельга чытаць лежачы. 8. Хлопец працаваў спусціўшы рукавы. 9. Таццяна нібы наважваючыся пазнаць мужчыну яшчэ здалёк пільна ўглядалася ў яго твар. Нават убачыўшы мужчыну зблізку дзяўчына не змагла яго прызнаць.

**92.** Спішыце прыказкі, раскрываючы дужкі і расстаўляючы, дзе патрэбна, знакі прыпынку. Растлумачце сэнс прыказак.

1. Лета прагуляўшы восенню *(н..)*збярэш. 2. *(Н..)*шануючы малога *(н..)*будзеш мець і вялікага. 3. Растуць дзеткі на лес гледзячы. 4. *(Н..)*запрогшы *(н..)*паедзеш. 5. *(Н..)*пастаяўшы ў парозе *(н..)*сунься



Правообладатель Национальный институт образования

на кут. 6. Сядзець склаўшы рукі ды разявіўшы рот — толькі можна мух налавіць. 7. *(Н..)*помніць карова зімы дачакаўшы лета. 8. Даганяючы *(н..)*нацалуешся. 9. Пазычаючы грошай *(н..)*разбагацееш.

**93.** Прачытайце верш Уладзіміра Караткевіча «Эмігранты». Сфармулюйце і запішыце асноўную думку твора. Ці пагаджаецеся вы з наступнай думкай славутага філолага Д. Ліхачова: «Вершы наогул нельга прачытаць з першага разу. Спачатку трэба адчуць, зразумець музыку верша, потым ужо чытаць з гэтай музыкай — самому сабе або ўслых».

Спішыце тэкст, расстаўляючы знакі прыпынку. Растлумачце іх пастаноўку.

Двух зуброў ад нетраў Белавежы
На Каўказ завезлі аддалі[сн].
Там лугі зялёныя бязмежныя
Там багата сонца і зямлі...
Хмары над лясамі залатымі
Соль трава вадзіцы смачнай жмут
Лёгка дыхаць так як на радзіме
Але ў кожнага ёсць[ф] родны кут.
Дзеці гэтага не разумеюць
Нарадзіўшыся ў чужым бары
І на тое як яны дурэюць
Непахвальна дзівяцца зубры.
На празрыстых светла-сініх водах
Сняцца ім айчыны берагі
Па́параць імшаныя калоды
Сінія пад месяцам лугі
Сінія пралескі на сугрэве
Мухамор чырвоны ля азёр
І калоны манументаў-дрэваў
Што вярхамі дастаюць да зор.

Паразважайце, што дазваляе паэту аб'яднаць у адзін рад лагічна неаднародныя паняцці *соль, трава, хмары, жмут вадзіцы; берагі, папараць, калоды, лугі*? Што звязвае іх у адзін сэнсавы і эстэтычны рад? Якія сродкі ствараюць эмацыянальнасць верша?

Назавіце сказы з аднароднымі і адасобленымі членамі, вызначце іх стылістычную ролю.

Зрабіце марфалагічны разбор прыслоўя (на выбар).

Акрэсліце сінтаксічную ролю слова *што* ў апошнім радку. Калі *што* з'яўляецца злучнікам, калі — адносным займеннікам? Як размежаваць падобныя выпадкі? Запішыце адпаведныя прыклады сказаў.



Правообладатель Национальный институт образования

## Знакі прыпынку пры адасобленых дапаўненнях

В ы д з я л я ю ц ц а к о с к а м і дапаўненні, выражаныя назоўнікамі або займеннікамі ва ўскосных склонах з прыназоўнікамі ***акрамя, апрача (апроч), амаль, замест, за выключэннем***, якія маюць удакладняльнае значэнне, паказваючы на ўключэнне ў лік ці выключэнне прадмета (з'явы) з ліку іншых або на яго замяшчэнне: *Нічога воблака не прадвяшчала,* ***апроч таго,*** *што яно плыло і дажджавыя кроплі змяшчала* (А. Вярцінскі); *Усе,* ***за выключэннем Марыны,*** *былі ўжо ў тэатры.*

***Заўвага.*** Калі прыназоўнік ***замест*** мае значэнне *'за'*, то дапаўненне з гэтым прыназоўнікам н е а д а с а б л я е ц ц а: *Дзяўчына* ***замест*** *бацькі сустракала сваякоў.*

Калі спалучэнні слоў з ***апрача, акрамя*** і іншымі маюць пры сабе ўзмацняльную часціцу ***і***, то яны коскамі н е в ы д з я л я ю ц ц а: *Нехта* ***і акрамя нас*** *пабываў на гэтай паляне.*

**94.** Прачытайце сказы. Запішыце, захоўваючы пунктуацыйныя і арфаграфічныя нормы. Патлумачце пастаноўку знакаў прыпынку і напісанне ўстаўленых літар.

1. З таго часу як перастаў ён есці скаромнае лес акрамя агарода стаў яго надзейным кармільцам *(А. Камароўскі)*. 2. І апрача гэтага ў іх застаўся ад мінулых часоў з в..лікага багац..я вось адзін толькі гэты дом *(К. Чорны)*. 3. Усе акрамя яго развітаўшыся да заўтра в..шлі *(Д. Пятровіч)*. 4. Акрамя ма..і больш дарагога чалавека ў мяне няма *(І. Шамякін)*. 5. Начаваў я не ставячы палаткі пад дубам у спальніку. Карэн..е яго было мне замест падушкі *(В. Казько)*. 6. Ён помніў што ў гру..е ніхто ў пілотцы апрача Валодзі не хадзіў *(У. Федасеенка)*. 7. Мы зірнулі на мільгануўшую гарушку і нічога не разгледзелі акрамя зу..чатага лесу на ёй *(С. Давідовіч)*. 8. Яна замест а..казу ткнула пальцам у паперу на дрэве *(К. Чорны)*.

- Растлумачце напісанне ***не, ні*** са словамі.

**95.** Запішыце сказы, ужыўшы прапанаваныя словы ў дужках з прыназоўнікам ***апрача, побач з, у параўнанні з, за выключэннем, уключаючы*** або ***замест***. Расстаўце патрэбныя знакі прыпынку і растлумачце іх пастаноўку.

1. Да свята *(падрыхтоўка канцэрта)* вырашылі арганізаваць выстаўку малюнкаў. 2. Дзеці працавалі *(дарослыя)*. 3. *(Яблыні ран-*



Правообладатель Национальный институт образования

*ніх сартоў)* у садзе раслі грушы і слівы. 4. *(Карціны)* у пакоях былі кветкі. 5. Увесь студзень *(некалькі дзён)* быў халодным. 6. У хаце *(бабуля)* нікога не было.

**96.** Складзіце сказы з адасобленымі дапаўненнямі, выкарыстоўваючы прапанаваныя пары слоў і прыназоўнікі са значэннем выключэння, уключэння або замяшчэння.

Узор: *рабіна — чарнаплодная (рабіна). Рабіна, апроч чарнаплоднай, мае аранжава-чырвоныя плады.*

Студэнты — першакурснікі, наша сям'я — я, прадмет — матэматыка, члены каманды — пераможцы, птушкі — салавей.

**97.** Прачытайце. Спішыце сказы, расстаўце, дзе патрэбна, знакі прыпынку і растлумачце іх пастаноўку.

1. Моцна спалі ўсе акрамя Брагінскага *(І. Шамякін)*. 2. І апроч аднаго стала нічога больш не было *(К. Чорны)*. 3. Акрамя вахценнага[м] на судне не было відаць нікога *(У. Краўчанка)*. 4. Але нікога акрамя Надзі я не бачыў *(З. Прыгодзіч)*. 5. Так атрымалася што з Беларусі нікога не было акрамя нас з мужам *(Л. Арабей)*. 6. Усе мае сябры за выключэннем двух чалавек кожнае лета адпачываюць на гэтым возеры. 7. Але акрамя рыпу соснаў пад слабым ветрам і далёкага шуму машын ён нічога не пачуў... *(Ю. Станкевіч)*. 8. Гэтай вадзе не відаць было канца-краю апрача той палоскі лесу на даляглядзе[сл] *(Я. Маўр)*.

- Падкрэсліце займеннікі, вызначце іх разрад.

### Знакі прыпынку пры ўдакладняльных членах сказа

У сказах могуць ужывацца словы, якія ўдакладняюць, канкрэтызуюць, узмацняюць сэнс папярэдніх слоў, звужаючы або абмяжоўваючы іх. Гэтыя словы называюцца ўдакладняльнымі членамі сказа, на пісьме яны адасабляюцца. Удакладняльнымі членамі сказа часцей бываюць акалічнасці месца і часу: ***А там, далей,*** *лесу кудзерка відна* (Я. Колас); *Не выцер ён* [*салдат*] ***тады, у сорак пятым,*** *слязу скупую на сваёй шчацэ, не змыў зямлю акопную ў рацэ* (М. Маляўка); ***Над абрывам, каля крамянага нізкага дуба,*** *устаў над вудамі наш дзядок* (Я. Брыль).



Правообладатель Национальный институт образования

Радзей удакладняльнымі бываюць іншыя члены сказа: *У пачатку **апошняй, чацвёртай,** чвэрці ў нашай школе адбыліся перамены* (І. Навуменка).

Канкрэтызуючы папярэдняе слова, удакладняльныя члены могуць размяшчацца адзін за адным: ***Там, недзе далёка, за вялікімі абшарамі палёў,** цяпер вось, светлаю раніцою, грэюцца на сонцы нізкія хаты* (К. Чорны).

Коскамі выдзяляюцца ўдакладняльныя спалучэнні, якія пачынаюцца словамі ***асабліва, нават, пераважна, у тым ліку, у прыватнасці, напрыклад*** і іншыя, што надаюць удакладненню сэнсавае адценне выдзяляльнасці, узмацняльнасці: *Мірскі замак — прыгожы палацава-паркавы ансамбль з каменным абнясеннем і пяццю вежамі, **у тым ліку адной уязной*** (*З часопіса* «Беларусь»).

Коска не ставіцца перад спалучэннямі са словамі ***асабліва, нават, пераважна***, калі яны не маюць удакладняльнага значэння (выконваюць ролю часціц): *Не было чутна **нават ні гуку**.*

**98.** Прачытайце. Спішыце сказы, расстаўляючы знакі прыпынку ў адпаведнасці з пунктуацыйнымі нормамі. Патлумачце пунктуацыйнае афармленне сказаў.

1. З Жукаўшчыны з горкі па пяску было лёгка і мякка ступаць і я не агледзеўся як ужо быў у Бярэзаўцы ля моста праз крыніцу[л] *(І. Пташнікаў)*. 2. На кірмашы заўсёды было шмат людзей асабліва ў нядзелю *(К. Стаселька)*. 3. Цяпер Анэта стаяла ўжо на сваім двары пры плоце *(А. Жук)*. 4. Перада мною вышынёй у некалькі метраў высіцца збудаванне пераважна з асін і альхоўніку *(М. Бусько)*. 5. Малады высокі дуб з густою шапкай галля і лісця стаяў на беразе Дняпра на невялікім лугавым узгорку[сл] *(І. Шамякін)*. 6. Пад вечар таго ж дня ўжо на змярканні стаў пашумліваць вецер *(Я. Колас)*. 7. Перш-наперш ніяк не чакаў я Саханюка ў госці асабліва ў будны дзень *(Я. Колас)*.

**99.** Прачытайце сказы. Спішыце, расстаўляючы прапушчаныя знакі прыпынку. Растлумачце іх пастаноўку.

1. Там на Палессі карані і таленту і лёсу... *(І. Капыловіч)*. 2. Побач[м] ляжаў яго Віцеў гармонік *(Т. Купрэвіч)*. 3. Таня патэлефанавала праз некалькі дзён у суботу *(Д. Пятровіч)*. 4. У самай вышыні над галавою самотна кружляла невядомая птушка *(Г. Пярун)*. 5. Я даўно



Правообладатель Национальный институт образования

з юнацтва пішу *(Н. Касцючэнка)*. 6. Вярба асабліва яе вецце шырока выкарыстоўвалася ў народным побыце *(І. Швед)*. 7. А той другі нічога не адказаў яму́ *(М. Стральцоў)*. 8. На голых дрэвах замест лісця паклалі шэрань маразы *(Я. Колас)*. 9. Я нават[м] адрас яе помню... *(І. Пташнікаў)*.

**100.** Прачытайце тэкст. Падбярыце да яго загаловак у адпаведнасці з тэмай.

Пра ўшанаванне друкаванага слова і любоў да кніжнай мудрасці гаварылі яшчэ Ефрасіння Полацкая і Кірыла Тураўскі. Археалагічныя знаходкі сцвярджаюць: нашы продкі ўмелі чытаць і пісаць з самых даўніх часоў. **Настаўнікі знаёмілі вучняў з таямніцамі слова праз тэксты рэлігійных кніг найперш — Псалтыра і Новага Запавета. Аднак крыху больш за 400 гадоў таму 24 ліпеня 1618 года ў мястэчку Еўе (зараз на тэрыторыі Літвы) была надрукавана асаблівая кніга праобраз цяперашняга падручніка для самых маленькіх вучняў.** «Буквар языка словенска» стаў першым у свеце выданнем з такой назвай.



Ён быў напісаны на царкоўнаславянскай мове, але аўтары выпадкова ці наўмысна дадалі ў кнігу значную частку беларусізмаў. У больш позніх выданнях сустракаюцца нават асобныя тэксты на тагачаснай беларускай мове.

**Першая частка «Буквара» змяшчае ў сабе азбуку царкоўнаславянскі алфавіт і склады, па якіх вучылі аб'ядноўваць літары. Замест слоў «мама мыла раму» дзеці пачатку XVII стагоддзя чыталі пералікі запаветаў хрысціянскіх дабрадзействаў а таксама грахоў каб ведаць як рабіць не трэба.** Такім чынам, выданне адначасова выконвала не толькі адукацыйную, але і выхаваўчую функцыю.

На першым «Буквары» не пазначаны яго аўтары. Дакладна вядома толькі, што падрыхтаваны ён вандроўнымі манахамі віленскага манастыра. Адным з магчымых укладальнікаў даследчыкі лічаць Мялеція Сматрыцкага. **Мялецій Сматрыцкі выпусціў «Граматыку» лагічны працяг «Буквара».** Другім найбольш верагодным аўтарам можна лічыць Лявонція Карповіча — кіраўніка манастыра, а таксама друкарні і школы пры ім. **Гэта быў актыўны асветнік і прапаведнік добра абазначаны ў кніжнай і выдавецкай справе.**



Правообладатель Национальный институт образования

Абодва гэтыя асветнікі цудоўна ведалі грэчаскія, лацінскія і польскія традыцыі выдання кніг. **Яны выкарысталі найлепшыя моманты еўрапейскай адукацыі звязаўшы іх з мясцовымі рэаліямі сваёй мовай і духоўна-выхаваўчай практыкай.**

Адзін з экзэмпляраў арыгінала «Буквара» захоўваецца ў Лондане ў бібліятэцы Мідл Тэмпл.

Арыгінал «Буквара» мае звычайную драўляную вокладку, якая раней была абцягнута скурай. **На тытульным аркушы бачны герб Агінскіх патронаў выдавецкай справы.** Наступная старонка — малітва, без якой у тыя часы не пачыналася ніякая добрая справа.

Далей чытач знаёміцца з алфавітам. Для спецыялістаў ён добра зразумелы, а вось звычайнаму сучаснаму чалавеку было б цяжкавата разабрацца з тагачаснымі літарамі. Літары надрукаваны як у прамым, так і ў адваротным парадку. Цікавая асаблівасць звязана з літарай «г»: іх дзве. Такім чынам вучань адразу раздзяляў [г] выбухны і [г] фрыкатыўны, характэрныя для беларускай мовы. **Прычым у ранейшых выданнях падобнае раздзяленне амаль не сустракаецца а тут у падручніку пададзена як норма.**



*Мялецій Сматрыцкі*

Друкары стараліся зрабіць кнігу яшчэ і прыгожай. Яны выкарыстоўвалі шрыфты розных памераў, літы наборны арнамент, гравюры, буквіцы, канцоўкі і застаўкі. **Некаторыя элементы выкананы ў стылістыцы блізкай да афармлення кніг Францыска Скарыны.**

**Нягледзячы на шматтыражнасць і частыя перавыданні «Буквара» да нашага часу захавалася пара экзэмпляраў.** Экзэмпляр у Лондане захаваўся толькі таму, што быў набыты калекцыянерам і некалькі стагоддзяў праляжаў у архівах без ужытку *(Паводле Р. Юргель)*.

Спішыце выдзеленыя сказы, расстаўляючы, дзе патрэбна, знакі прыпынку. У якіх з гэтых сказаў ёсць удакладняльныя члены?

- Выпішыце 5 слоў, у якіх адбываецца асіміляцыя зычных па мяккасці.

Раскрыйце значэнне слова *архіў*. У якім значэнні ўжыта ў тэксце слова *патрон*?



Правообладатель Национальный институт образования

**101.** Прачытайце фразеалагізмы. Што іх аб'ядноўвае? Устанавіце адпаведнасць паміж фразеалагізмамі і іх значэннямі.

| | |
|---|---|
| 1) на ёту | а) ад пачатку да канца; цалкам |
| 2) літара ў літару | б) канчаткова высвятляць усё, не пакідаючы нічога недагаворанага, даводзячы ўсё да лагічнага канца |
| 3) альфа і амега | в) нямнога, ледзь-ледзь |
| 4) ні на ёту | г) правучыць, пакараць каго-небудзь |
| 5) ад а да я (ад альфы да амегі) | д) абсалютна дакладна, без адхіленняў |
| 6) прапісаць іжыцу | е) ніколькі, зусім (не саступаць, не пераацэньваць і пад.) |
| 7) ставіць кропкі над «і» | ж) самае галоўнае, сутнасць чагосьці |

**102.** Прачытайце азначэнні да слова *мова*, пададзеныя ў «Слоўніку эпітэтаў беларускай мовы» Ніны Гаўрош. Пры неабходнасці высветліце іх значэнне па тлумачальным слоўніку.




*Мова.* Сродак грамадскіх узаемаадносін; спосаб выражэння думак, пачуццяў.

1. Пра родную беларускую мову: *(адвечна)*новая, адвечная, адзначаная ўзнёслай прастатою (аўт.), багатая, баравая (аўт.), бя..концая, *(вечна)*жывая, вобразная, вогн..трывалая, вольная, выс..кародная, вялікая, гаваркая, гарачая, гаючая, глыбін..ая, гнуткая, гордая, гучная, дарагая, дз..восная, жывучая (аўт.), дзіўная, жыватворная, жыватворчая, жывая, жытнёвая (аўт.), звонкая, ільня..ая (аўт.), іскрыстая, кроўная, крыштальная, крэўная, лаканічная, ласкавая, любімая, магутная, ма..чына, м..лагучная, мілая, мя..кая, найбагацейшая, найчысцейшая, н..вычэрпная, н..паўторная, н..ўміручая, н..зводная (аўт.), няспыннаплы..ная (аўт.), *(па)*народнаму н..вычэрпна багатая (аўт.), паэтычная, песенная, праўдзівая, п..вучая, раздольна-велічная (аўт.).

2. Пра ўяўную мову навакольнага асярод..я (мову прыроды): гутарлівая, даверлівая, задумлівая, звонкая, н..ўміручая, п..вучая, родная, стройная, шапатлівая, самотная, сумная.

- Запішыце словы з прапушчанымі літарамі, растлумачце іх напісанне.

**103.** Выкарыстоўваючы матэрыял папярэдняга практыкавання, раскажыце пра беларускую мову: пра яе адметнасць, пра якасці, якія вам падабаюцца або вас здзіўляюць. Ужывайце сказы з аднароднымі і адасобленымі членамі.



Правообладатель Национальный институт образования

**104.** Складзіце паводле схем сказы з адасобленымі членамі пра ролю нацыянальнай мовы ў жыцці народа. Запішыце сказы.

1. ______ , ~~~~~~ , … .
2. ______ ====== – – – – , ~~~~~~ , … .
3. –·–·–·– , ______ ====== … .
4. ______ ====== , –·–·–·– , … .
5. –·–·–·– , –·–·–·– , ______ ====== … .
6. ______ , – – – , ====== … .

**105.** Прачытайце развагі Максіма Танка пра незвычайныя прыродныя здольнасці мастака Язэпа Драздовіча. Што вы ведаеце пра гэтых асоб, пра іх уклад у беларускую культуру? Выпішыце сказы з адасобленымі членамі, вызначце іх стылістычную ролю ў тэксце. Растлумачце пастаноўку знакаў прыпынку. Вызначце выказнікі ў сказах.

Язэп Драздовіч быў самабытным мастаком і цікавым чалавекам.

Усё жыццё яго прайшло ў вандроўках, пошуках[сл] хлеба і не спазнанай нікім ісціны. Нельга не дзівіцца, колькі ён паспеў зрабіць у сваім[ф] жыцці, беспрытульным, падарожным.

З яго палотнаў ва ўсёй красе задуменных бароў, сялянскіх сядзіб, затанулых у збажыне, паўстае яго малая радзіма — Дзісеншчына (*М. Танк*).

Карыстаючыся дадатковай літаратурай або інтэрнэт-рэсурсамі, падрыхтуйце паведамленне пра літаратурную спадчыну Максіма Танка.

**106.** Ускладніце прапанаваныя сказы аднароднымі або адасобленымі членамі сказа, каб атрымаліся разгорнутыя азначэнні сінтаксічных тэрмінаў.

1. Словазлучэнне — гэта спалучэнне слоў…
2. Неразвітым называецца сказ…
3. Дзейнік — гэта галоўны член сказа…
4. Выказнік — гэта галоўны член сказа…
5. Аднароднымі называюцца члены сказа…
6. Зваротак — гэта слова або спалучэнне слоў…
7. Пабочнымі называюцца канструкцыі…
8. Адасобленымі называюцца члены сказа…

**107.** Прачытайце тэкст. Зрабіце вывад пра значнасць падобных мерапрыемстваў дзеля папулярызацыі айчынных выданняў, нашай краіны як міжнароднай пляцоўкі для камунікацыі, знаёмства, сяброўства. З пяці сказаў (на выбар)



Правообладатель Национальный институт образования

выпішыце граматычныя асновы, ускладніце іх аднароднымі або адасобленымі членамі, растлумачце пастаноўку знакаў прыпынку.

У з о р: Кніга па-ранейшаму ў пашане. *Граматычная аснова: кніга ў пашане.* Кніга, *нацыянальная, самабытная,* шануецца прадстаўнікамі розных пакаленняў. Кнігі, *прачытаныя ў маленстве і юнацтве*, застаюцца ў памяці на многія гады. Свет змяняецца, аднак «жывая» кніга, *выдадзеная друкарскім спосабам*, і сёння ў пашане. У маёй бібліятэцы і сёння ёсць месца *для набытых у кнігарні* выданняў.

### Гэты дзівосны кніжны свет

Кніга па-ранейшаму ў пашане. Ёй не пагражае знікненне, што прадказваюць папяровым варыянтам газет. Яна запатрабавана самымі living рознымі людзьмі: ад шаноўных па ўзросце да пакалення юных чытачоў. Гэты аптымістычны вывад пацвердзіла Мінская міжнародная кніжная выстаўка-кірмаш, якая ўжо больш за чвэрць стагоддзя традыцыйна праходзіць у беларускай сталіцы ў першыя дні лютага.

2021-ы — год 30-годдзя стварэння Садружнасці Незалежных Дзяржаў. Гэта акалічнасць паслужыла ініцыятывай абвясціць цэнтральным экспанентам* XXVIII кніжнай выстаўкі менавіта СНД. Галоўны экспанент прадвызначыў дэвіз мерапрыемства: «Кніга аб’ядноўвае людзей і краіны». Цэнтральную экспазіцыю* сімвалічна афармілі ў стылі адзінага агульнага дома, які, натуральна, складаецца з пакояў. Гасцёўня, напрыклад, знаёміла з выданнямі, якія сталі ўладальнікамі Гран-пры Міжнароднага *конкурсу* «Мастацтва кнігі».




Адзін з пакояў цэнтральнай экспазіцыі выстаўкі — гэта кабінет пісьменніка. Арганізатары прадставілі лепшыя кнігі ўсіх 11 краін СНД *па гісторыі, культуры, мастацтве*. Тут жа праходзілі цікавыя сустрэчы пісьменнікаў з наведвальнікамі выстаўкі.

Госці выстаўкі мелі выдатную магчымасць сустрэцца з аўтарамі, даведацца пра творчы працэс стварэння кніг. На гэтай жа пляцоўцы *прайшоў* адбор праектаў для прыярытэтнага выдання дзяржаўнымі выдавецтвамі работ, якія перамаглі ў літаратурным стартапе LitUp, старт якога быў абвешчаны ў студзені. LitUp прапаноўваў паспрабаваць свае літаратурныя магчымасці, запаліць сваю творчую зорку падчас выстаўкі.

Штогод Мінская міжнародная кніжная выстаўка-кірмаш збірае *дзясяткі* краін. Арганізатары змаглі правесці шматлікія мерапрыемствы з дапамогай анлайн-фарматаў. Трансляцыя дыскусійных пляцовак



Правообладатель Национальный институт образования

вялася на YouTube-канале, дзе можна было адрасаваць пытанні непасрэдна ўдзельнікам мерапрыемстваў.

На цэнтральнай сцэне выстаўкі па традыцыі прайшлі прэзентацыі найбольш значных кніжных праектаў, узнагароджанне пераможцаў Нацыянальнага конкурсу «Мастацтва кнігі», а таксама пераможцаў Міжнароднага конкурсу маладых літаратараў «Першацвет».

Можна сцвярджаць, што на Мінскай міжнароднай выстаўцы кожны знайшоў «сваю» кнігу — па ўзросце і інтарэсах *(Паводле А. Піменава)*.

Якую «сваю» кнігу вы хацелі б знайсці на гэтай кніжнай выстаўцы? Якія мерапрыемствы выстаўкі вам захацелася наведаць? Ці згодны вы з выказваннем: «Скажы, якія кнігі стаяць на тваёй паліцы, — і я раскажу, які ты»? Якім кнігам — папяровым або электронным — вы аддаяце перавагу? Чаму? Як часта вы заходзіце ў кнігарню? З якой мэтай?

Растлумачце правапіс выдзеленых слоў.

Падрыхтуйце эсэ на тэму «Кніга ў маім жыцці».

**108.** Выканайце інтэрактыўнае заданне «Сказы з адасобленымі членамі».

## § 8. Правілы пабудовы сказаў са звароткамі, знакі прыпынку

§ 0–8

Практ. 1–7

Мэта сказаў са звароткамі — засяродзіць увагу слухачоў (чытачоў) на прадмеце паведамлення, перадаць загад, просьбу, пажаданне таго, хто гаворыць. Называючы адрасата, зваротак разам з іншымі членамі сказа ўдзельнічае ў камунікатыўнай функцыі маўлення.

Выбар пэўнай формы звароткa прама або ўскосна адлюстроўвае адносіны да субяседніка, абумоўленыя ўзроставымі, сацыяльнымі, асабістымі кантактамі, а таксама эмацыянальным станам таго, хто гаворыць, узроўнем яго маўленчай культуры.

Асноўная сфера ўжывання сказаў са звароткамі:

а) вуснае або пісьмовае дыялагічнае маўленне:

— *Добрага дня, сейбіты!* — *раздаўся голас Андрэя Сцяпанавіча.*

— *Добры дзень, брыгадзір!* — *дружна пачулася ў адказ;*

б) мова аратарскіх выступленняў: *Шаноўныя настаўнікі, дазвольце павіншаваць вас з прафесійным святам*;

в) маўленне дзелавога характару: *Калегі, пачынаем пасяджэнне кафедры;*



Правообладатель Национальный институт образования

г) мова прыватнай і афіцыйнай перапіскі, дзе зваротак з'яўляецца формулай, з якой пачынаецца пісьмо: *Дарагія мае сямейнікі, нарэшце з'явілася хвілінка напісаць вам*;

д) мова паэтычных твораў: *Ах, восень, восень, ты пад сонцам неапісальнай пекнаты* (П. Броўка).

**109.** Прачытайце. З апорай на тэкст дапішыце наступны сказ: *Стылістычныя асаблівасці сказаў са зваротками заключаюцца ў тым, што ... .*

Зваротак часцей за ўсё ўжываецца, каб звярнуць увагу чытача ці слухача. У стылістычным плане розныя віды зваротка з'яўляюцца адным з найбольш выразных граматычных сродкаў мовы. У *афіцыйным стылі* яго выкарыстанне з'яўляецца лагічным, бо дазваляе дакладна абазначыць адрасата. У *гутарковым стылі* зваротак — адзін з абавязковых элементаў, які дае магчымасць выразна праілюстраваць адносіны суразмоўнікаў або стаўленне аўтара да адрасата.

У *мастацкім творы*, асабліва ў вершы, звароткі з'яўляюцца элементам рытарычных зваротаў. Пры іх дапамозе выражаецца безліч чалавечых пачуццяў — пяшчота, любоў, расчараванне[сл], ухваленне, захапленне і г. д. У мастацкім і публіцыстычным маўленні развітыя звароткі становяцца сродкам ацэначнай характарыстыкі персанажаў і стылізацыі іх мовы: *Зямелька мая, мая родная, запала ж ты ў душу* (В. Шахаб).

- Растлумачце правапіс канчаткаў назоўнікаў у родным склоне.
- Выпішыце з тэксту простыя ўскладненыя сказы і зрабіце іх сінтаксічны разбор.
- Выпішыце словы, што адпавядаюць правілу «Правапіс канчаткаў назоўнікаў у форме меснага склону адзіночнага ліку».

**110.** Ці згодны вы з думкай, што наша ўспрыманне мастацкага тэксту залежыць ад ступені яго разумення? Прачытайце верш-прысвячэнне А. Багамолавай «Максіму Багдановічу». Растлумачце, чаму аўтар ужывае розныя формы звароту да паэта. Якім чынам эмацыянальны настрой верша падтрымліваецца паўторамі, знакамі прыпынку? Што вы ведаеце пра зборнік «Вянок» паэта?




Добрай раніцы табе, Максімка!
Добры дзень табе, Максім!
Вечар добры табе, Максіме!
125 гадоў ты побач з намі ўсімі.



Правообладатель Национальный институт образования

І жывеш ты ў вершах,
І ніхто не ведае,
які верш твой лепшы.
...Гэта ж трэба было так, гэта ж трэба
*без сварак і звадак*
ляцець да неба!
Гэта ж трэба было так казаць
*Пра родныя нівы і родныя хаты...*
*І пра пяскі далёкае егіпецкай зямлі...*
І так садзіць не ў Беларусі
*Васількі* заўзята,
Каб праз гады яны і прарасталі, і цвілі!..
Гэта ж трэба было так,
Гэта ж трэба...

Якую ролю адыгрываюць паэтычныя радкі, набраныя курсівам?

Паразважайце, якія моўныя сродкі дапамагаюць стварыць эстэтычна вартасныя вобразы.

● Выпішыце з тэксту сказ з рознымі відамі сувязі. Пабудуйце яго схему.

**111.** Разгледзьце схемы сказаў са звароткамі. Раскажыце пра пастаноўку знакаў прыпынку ў сказах са звароткамі.

1. З! ... !
2. ... , з, ... .
3. ... , з?
4. Эх, з, ... .
5. Эх ты, з, ... .
6. О з, ... !

Зваროткі разам са словамі, якія да іх адносяцца, выдзяляюцца коскамі незалежна ад таго, якое месца займаюць у сказе: ***Мама,*** *заставайся маладою, запаветнай песняю зямною...* (Г. Дашкевіч); *Шумі,* ***сасна,*** *пад ветрам рэзкім, твой шум — жыццё чужой душы* (Р. Баравікова); *Вы выйшлі ўдалеч,* ***маладыя,*** *вам доўга крочыць праз гады* (П. Броўка); *Абудзіся,* ***зямелькі гаючая сіла!*** (А. Канапелька).

Калі зваротак раздзяляецца на часткі іншымі словамі, то кожная з частак выдзяляецца коскамі: *Не плач жа,* ***бярозка,*** *не лі свае слёзы,* ***красуня...*** (А. Куляшоў); ***Сонейка,*** *як ты свеціш,* ***яснае!***



Правообладатель Национальный институт образования

Калі звароткі стаяць у пачатку або ў канцы сказа і вымаўляюцца з клічнай інтанацыяй, пасля іх ставіцца клічнік: ***Дзеці!*** *Даражыце блаславеннем бацькоў, яно найдаражэйшая спадчына* (У. Ліпскі); ***Беларуская мова!*** *Ты ў сэрцах моладзі* (З часопіса«Маладосць»); *Ты ў працы мяне, беларуса, натхняеш,* ***маё беларускае слова — крышталь!*** (П. Пруднікаў).

Выклічнікі пры зваротках аддзяляюцца коскамі, калі яны не маюць падкрэсленай клічнай інтанацыі: ***Э, мой хлопчыку,*** *каб замак мог, як людзі, гаварыць!* (Я. Колас); ***Эх, Іван, Іван!*** *Самага галоўнага ты так і не разгадаў* (І. Навуменка); ***Эх, матулечка,*** *не трэба сумаваць.*

***Заўвага 1.*** Выклічнікі перад асабовымі займеннікамі коскамі не аддзяляюцца: ***Эх ты,*** *жыццё, жыццё людское!* (Я. Колас).

***Заўвага 2.*** Не аддзяляецца коскай ад зваротка часціца ***о***: ***О Беларусь,*** *мая калыска, жыццё маё, прытулак мой! З гарачаю любоўю нізка схіляюся перад табой* (П. Глебка).

Пасля выклічніка пры зваротку ставіцца клічнік, калі выклічнік вымаўляецца з адпаведнай інтанацыяй: ***Ах! Мікіта!*** *Які ты малайчына, што адведаў хворага!*

**112.** Прачытайце верш. Вызначце яго асноўную думку. Назавіце звароткі. Чым яны выражаны? Растлумачце пастаноўку знакаў прыпынку пры зваротках.

### Роднаму слову

Я хачу, каб ты жыло, маё харошае,
трапяткое, мужнае і сціплае...
Ведаю, што не куплю цябе за грошы я,
шапаткое, мудрае і мілае...

Я хачу, каб выспела ты, гожае,
у душы маёй прывабнай песняю,
каб мелодыя плыла прыгожая
і гаіла далеч думкай весняю.

*З. Калкоўская.*

**113.** Прачытайце сказы. Спішыце, расстаўляючы прапушчаныя знакі прыпынку. Растлумачце іх пастаноўку.

1. Эх зіма Палютавала? *(Г. Пашкоў).* 2. Дабранач табе Белавежская[ф] пушча і вежа каменная[сл] і ўвесь родны край *(Л. Валасюк).*



Правообладатель Национальный институт образования

3. Суседка мая́ У акно зазірнула зноў лета *(В. Дэбіш)*. 4. Шчасця мы Радзіма дарагая не шукаем за мяжой *(М. Маляўка)*. 5. Летуценніца-вясна паглядзі мне ў вочы!.. *(І. Карэнда)*. 6. Дарагі Іване Дзён колькі як збіраюся напісаць табе *(Я. Скрыган)*. 7. Мілае сонца табе я здзівілася[сн] *(Н. Маеўская)*. 8. Да сустрэчы да новай сустрэчы наша маці-зямля Беларусь! *(С. Валодзька)*. 9. Ну браткі вось гэта служба дык служба *(Ядвігін Ш.)*. 10. Эх луг шырокі Як жывы ты праменнем сонейка заліты *(Я. Колас)*. 11. О мая Урсула ты аднойчы паспачувала адзінокай дзікай грушы ў полі *(Г. Марчук)*. 12. Кувай зязюля мілая кувай не за сябе прашу — за родны край *(М. Маляўка)*. 13. Маміна слова ласка твая без меж. Толькі ты мяне на зямлі трымаеш і да мамы мяне павядзеш... *(Р. Барадулін)*. 14. Зямля маіх бацькоў табе я прысягаю, тут кожны каласок з любоўю абдымаю *(А.Ралькевіч)*. 15. О Беларусь Мяне ты ўзрасціла *(А. Грачанікаў)*. 16. Спявай івалга загойвай нашы душэўныя раны *(Г. Марчук)*.

**114.** Спішыце прыказкі, расстаўляючы, дзе патрэбна, знакі прыпынку.

1. Дружба дружба цяжкая твая служба! 2. Не журыся тата будзе й наша свята. 3. Будзь сынок тату сынком, а тата — да смерці табе тата. 4. Гадуй маці дзеці будзеш шчасце меці. 5. Не бядуй сынок што кепска паслаўся, абы добра выспаўся. 6. Вазьмі Даніла што нам няміла. 7. Паглядзі сава якая сама.

Растлумачце сэнс прыказак.

**115.** Складзіце сказы са звароткамі па схемах на адну з тэм: «Беражыце прыроду», «Захоўвайце правілы дарожнага руху», «Захоўвайце правілы паводзін на вадзе».

1. З! ... ! 2. ... , з, ... ! 3. ... , з!

**116.** Напішыце сачыненне на тэму «Мой запавет нашчадкам», выкарыстоўваючы сказы са звароткамі.

**117.** Прачытайце ўрывак з пісьма Рыгора Барадуліна да сваёй маці.

**Дарагая любая мамачка!**

Даўно не пісаў табе, даўно не пытаў, як кукуе адна мая зязюлька баравая, шэрая.



Правообладатель Национальный институт образования

**Родная мамачка хацеў каб Новы год прайшоў дужа добра але не заўсёды тое бывае, што хочаш... Прабач мая дарагая залатая, палавіна серабра, калі што не так сказаў калі што не так зрабіў.** Забегаўся, замітусіўся. **Даруй дарагая Акуліна Андрэеўна за ўсё дрэннае за ўсё непрыемнае што ты бачыла ад мяне...**

Рукі твае, галаву тваю цалую.

Рыгорка.

Назавіце сказы са звароткамі. Звярніце ўвагу на словы, якімі паэт называе сваю маці.

Спішыце выдзеленыя сказы, расстаўляючы, дзе патрэбна, знакі прыпынку. Растлумачце іх пастаноўку.

Напішыце пісьмо сябру, бацькам, сваякам. Выкарыстайце звароткі.

**118.** Прачытайце. Пісьмова адкажыце на пытанне: *Якія экспрэсіўныя сродкі сінтаксічнага ўзроўню дапамагаюць асэнсаваць змест тэксту, яго эстэтычнае ўспрыманне*?

Экспрэсіўныя сродкі сінтаксічнага ўзроўню разнастайныя і па структуры, і па функцыі. Гэта і *шматпрыназоўнікавасць*, і *аднародныя члены сказа, градацыя, назоўны ўяўлення*, і *парцэляцыя*, *рытарычнае пытанне* і іншыя. Увогуле *экспрэсіўны сінтаксіс* вызначаецца багаццем *стылістычных фігур*, якія ўкладзены ў арыгінальную форму, ствараюць эстэтычна вартасныя вобразы *(В. Гуліцкая)*.




Растлумачце змест выдзеленых сінтаксічных тэрмінаў з дапамогай інтэрнэт-рэсурсаў або выдання: Энцыклапедыя для школьнікаў і студэнтаў: у 12 т. Том 7. Беларуская мова / рэдкал. : У. У. Андрыевіч (гал. рэд.) [і інш.] — Мінск : Беларуская Энцыклапедыя імя П. Броўкі, 2017. — 496 с.

**119.** Якія звароткі выкарыстоўваем мы ў сваім маўленні? Бывае, што надакучліва-трафарэтныя *зайчык мой, коцік мой, лісічка мая...* А вось мовазнаўца І. Саматыя назвала зваротак «самым яркім этыкетным знакам». Чаму? Адкажыце на пытанне пасля прачытання наступнага тэксту.

Наша мова створана для пяшчоты, якая з веку ў век, з пакалення ў пакаленне перадавалася ў вібрацыях гукаў, мяккасці, мілагучнасці **выразаў**. І нездарма замілаваннем напоўнены самыя цёплыя словы, якімі мы **ласкава** называем блізкіх: *татка, матулечка, бабулька, дзядок, браточак, сястрыца*.



Правообладатель Национальный институт образования

Нават[м] звычайныя звароты да чужых людзей **беларусы** ператваралі ў прыклад найвышэйшай пашаны. Нашы землякі **здаўна** любілі ўжываць словы з памяншальна-ласкальнымі суфіксамі, якія здольныя рабіць цуд, яднаючы розных людзей: *браток ты мой, даражэнькі, сябровачка, суседачка, спадарынька*. Гэтыя выразы прыйшлі ў беларускую літаратуру — скарбніцу ласкавых слоў.

Асабліва дапаможа гэта слоўнае багацце закаханым[м]. Калі пачытаць лепшых беларускіх паэтаў, то пяшчота стане часткай душы, якая назапасіць ласкавых, прыгожых слоў на кожны новы дзень. Як называць ЯЕ? *Князёўна, паннaчка, ясачка, ласачка, красуня, бярозка, ластаўка легкакрылая, зорачка спагадная, сонейка яснае, шыпшына, кветачка, лілея, гаспадынька*… Ці хаця б працытаваць У. Караткевіча: «Ты — нечаканая радасць. Ты — ночы ласкавай крок».

Знойдуцца словы **і** для ЯГО: *міленькі, лю́бы, каханы, галубочак мой, анёл ясны, саколік, князюхна, ясакар, ясны пан, уладар, волат, гаспадар, галава*...

Нашы продкі далікатна вызначалі пачуцці, таму **і** не задаволіліся адным словам *люблю*, а стварылі сваё, адмысловае *кахаю*. Любіць можна ўсіх, а вось кахаць *дзяўчыну, хлапчыну, сваю палавіну*.

Дарыце ім радасць прыемных слоў штодня, **і** вы зразумееце, якую чароўную сілу мае ласкавае слова, калі яно сказана на роднай мове![сн]

Назавіце сказы з адасобленымі членамі. Растлумачце знакі прыпынку ў іх. У словах, пазначаных тлустым шрыфтам, вызначце націск.

- Вызначце слова ***і*** як часціну мовы ў апошніх сказах.
- Назавіце сказы з простым дзеясловым, састаўным дзеясловым і састаўным іменным тыпам выказніка.

§ 0–8

## § 9. Правілы пабудовы сказаў з пабочнымі і ўстаўнымі канструкцыямі, знакі прыпынку

Практ. 8–15

Сказы з пабочнымі словамі маюць разнастайнае прызначэнне. Яны могуць указваць на пэўнасць або няпэўнасць паведамлення, даваць яму эмацыянальную ацэнку, характарызаваць стыль, экспрэсію маўлення, указваць на суадносіны паміж часткамі выказвання.

Пабочныя канструкцыі (словы, словазлучэнні, сказы) стылістычна разнародныя, яны шырока распаўсюджаны ў кніжных



Правообладатель Национальный институт образования

і гутарковым стылях. У мастацкай літаратуры канструкцыі выкарыстоўваюцца як выразны сродак для стварэння маўленчых характарыстык персанажаў. Навуковаму і афіцыйнаму стылям уласцівы пабочныя словы, словазлучэнні і сказы, якія выражаюць лагічныя сувязі і адносіны паміж кампанентамі выказвання, указваюць на паслядоўнасць выкладу думак.

Злоўжываць сказамі з пабочнымі словамі не трэба. Ужытыя недарэчы, яны могуць выклікаць наступныя памылкі:

- няправільны выбар пабочнага слова: *Дзяўчынкі з надзеяй ўглядаліся ў цемру:* ***напэўна,*** *з'явіцца знаёмая фігура;*
- выкарыстанне лішніх пабочных слоў: ***Можа быць,*** *яны ведалі, што іх любяць і чакаюць дома;*
- ужыванне пабочных слоў (словазлучэнняў), якія ствараюць двухсэнсоўнасць выказвання: ***Па словах рыбакоў,*** *ноччу быў шторм, а цяпер спакойна;*
- выкарыстанне пабочнага сказа як самастойнага: *Кнігі — крыніца ведаў.* ***Як лічаць многія.***

**120.** Прачытайце прыклады па́рамі. Выпішыце сказы з пабочнымі словамі, расстаўляючы, дзе трэба, коскі. Ахарактарызуйце значэнні, якія надаюць сказам пабочныя словы.

1. **Здавалася** яна [вёска] прырасла навек да зямлі *(І. Пташнікаў)*. І ён, хлапчук, суцішваў свой крок, праходзячы каля ратушы, якая **здавалася** яму прыстанішчам вечнасці *(А. Лойка)*. 2. **Сапраўды** ў лесе было ціха і глуха *(К. Чорны)*. Ва ўсёй постаці старога зубра было **сапраўды** нешта дзікае, лясное, першабытнае *(В. Вольскі)*. 3. З гэтай горкі **відаць** уся вёска. На дварэ ранак **відаць** багаты сонцам і росамі *(П. Пестрак)*. 4. Усё **здаецца** добрым, радасным *(І. Мележ)*. **Здаецца** проста на вачах збудаваўся, вырас горад *(І. Мележ)*. 5. Сустрэча запланавана была на вечар **аднак** надвор'е, на жаль, унесла свае папраўкі ў план *(Я. Брыль)*. Пагодлівых дзён і начэй было **аднак** больш, чым дажджлівых і хмарных *(Я. Брыль)*.

- Выпішыце слова, якое адпавядае правілу «Правапіс суфіксаў дзеясловаў ***-ва- (-ава-, -ява-)***». Запішыце 7-10 прыкладаў, суадносных з гэтай арфаграмай.
- Вызначце тып складаных сказаў у практыкаванні.


Растлумачце розніцу паміж выразамі *на дварэ* і *на двары*.



Правообладатель Национальный институт образования

**121.** Устаўце ў наступныя сказы пабочныя словы, якія выражаюць розныя адносіны таго, хто гаворыць, да зместу выказвання. Карыстайцеся інфармацыяй, прыведзенай у схеме «Сэнсавыя (семантычныя) разрады пабочных слоў». Растлумачце, як змяняецца значэнне сказаў пры гэтым.

1. Дамашняе заданне нескладанае.
2. Паход у тэатр будзе цікавы.
3. Экзамен здалі добра.

| | |
|---|---|
| Значэнне ўпэўненасці | *безумоўна, несумненна, канечне, без сумнення, вядома, бясспрэчна, сапраўды, на самай справе, зразумела* |
| Значэнне няўпэўненасці, меркавання | *можа, напэўна, здаецца, мабыць, можа быць, відаць, магчыма, думаецца, мяркую, верагодна, хутчэй за ўсё, калі я не памыляюся* |
| Крыніца, аўтарства выказвання | *па-мойму, па-твойму, па словах, на думку, паводле меркавання, паводле выказвання, па звестках, на мой погляд, на наш погляд, па нашых падліках, з пункту гледжання, як вядома, як прынята лічыць, як кажуць, як лічаць* |
| Эмацыянальныя адносіны да фактаў рэчаіснасці | *на шчасце, на няшчасце, на жаль, на дзіва, як на злосць, як на бяду, сорамна прызнацца, дзіўная справа, нічога не скажаш, апроч жартаў* |
| Імкненне наладзіць кантакт з субяседнікам | *калі ласка, паслухайце, чэснае слова, бачыце, паверце, уявіце, можаце сабе ўявіць, згадзіцеся, зрабіце ласку, прабачце, абяцаю, прашу вас, прызнаюся, трэба прызнацца, па сутнасці* |

**122.** Уявіце наступную сітуацыю: вам трэба малодшаму брату (сястры) даказаць, што пісьменнасць чалавека — вынік уласнай сістэматычнай працы. З дапамогай пабочных слоў, што падкрэсліваюць лагічныя адносіны паміж часткамі (гл. даведку), стварыце адпаведнае выказванне. Можна выкарыстаць наступныя парады.

1. Трэба ўважліва слухаць тлумачэнне правіла на ўроку.

2. Варта імкнуцца зразумець змест правіла, яго логіку, скарыстаныя тэрміны.


Правообладатель Национальный институт образования

3. Трэба прыводзіць прыклады на вывучанае правіла, звяртаць увагу на правапіс і граматыку.

4. Неабходна паўтараць, запамінаць правіла.

5. Пажадана змест правіла ўзнаўляць з дапамогай схемы, скарочанага запісу.

Для даведкі: *па-першае, па-другое, па-трэцяе, значыць, нарэшце, напрыклад, у прыватнасці, між іншым, дарэчы, заўважым, падкрэслім, да таго ж, акрамя таго, аднак, наадварот, такім чынам, адным словам, падводзячы вынікі, наогул, як я ўжо сказаў (сказала).*

**123.** Дапоўніце тэкст.

Пабочныя словы, словазлучэнні, сказы выдзяляюцца ... .

Калі пабочныя словы ідуць адно за адным, то яны ... .

Калі пабочнае слова стаіць перад адасобленым членам сказа, то ... .

Калі пабочнае слова стаіць пасля злучніка, які звязвае члены сказа або часткі складанага сказа, то ... .

Злучнік ***а*** не аддзяляецца ад пабочных канструкцый, калі ... .

Узмацняльная часціца ***і*** перад пабочнымі канструкцыямі ... .

Устаўныя канструкцыі на пісьме ... .

**124.** Прачытайце тэкст. Замест шматкроп’я ўстаўце пабочныя словы (карыстайцеся даведкай). Якія адносіны да зместу выказвання выражаюць пабочныя словы? Спішыце тэкст, устаўляючы ў словы патрэбныя літары і ставячы, дзе патрэбна, знакі прыпынку.

Камп’ют..р усё больш уваходзіць у наша жыццё. Відавочна што цесныя «кантакты» з ім могуць быць *(не)*б..спечнымі для здароўя калі не прытрымлівацца ..лементарных правіл. ... памяшканне дзе знаходзіцца камп’ют..р павінна быць прасторным з пастаянным абнаўленнем паветра а мінімальная пло..ча для манітора павінна складаць 9-10 кв. метраў. ... адлегласць ад вачэй да манітор.. не павінна быць меншай за 50 см, аптымальна адлегласць выц..гнутай рукі. ... нельга працаваць за камп’ют..рам у цёмным або *(паў)*цёмным памяшканні. Рабоча.. месца таксама павінна а..павядаць пэўным патрабаванн..м. ... мышка павінна знаходзіцца на адным узроўн.. з клаві..турай а клаві..тура крыху вышэй за ўзров..нь сцёгнаў інакш стом..цца рукі. ... запале́нчыя і дыстрафічныя захворванні суставаў праф..сійная хвароба камп’ют..ршчыкаў. ... трэба пам..таць камп’ют..р



Правообладатель Национальный институт образования

моцная крыніца электрамагнітнага поля таму пасля кожных 45-50 хвілін працы варта рабіць 10-хвілінны п..рапынак і праветр..ваць памяшканне *(З часопіса «Беларусь»).*

Для даведкі: *па-другое, між іншым, па-першае, акрамя таго, да таго ж, у прыватнасці.*

● Выпішыце складаны сказ з рознымі відамі сувязі. Пабудуйце яго схему.

Пабочныя словы, словазлучэнні, сказы вымаўляюцца паніжаным тонам і больш хуткім тэмпам, выдзяляюцца невялікімі інтанацыйнымі паўзамі, а на пісьме — коскамі.

Коскамі выдзяляюцца пабочныя словы, словазлучэнні, сказы, якія стаяць у сярэдзіне або ў пачатку сказа і перадаюць эмацыянальную ацэнку фактаў рэчаіснасці, пачуццёвую рэакцыю на факты, пра якія гаворыцца ў сказе, паказваюць на крыніцу паведамлення, прыналежнасць выказанай думкі, выражаюць адносіны таго, хто гаворыць, да слухача і да т. п.: *Вялікае, **кажуць**, добра бачыцца на адлегласці* (М. Калачынскі); *Я, **скажу шчыра**, спалохаўся* (А. Асіпенка).

***Заўвага.*** Ад пабочных слоў неабходна адрозніваць словы, якія ўжываюцца ў ролі часціцы або прыслоўя. Яны коскамі не выдзяляюцца: ***Можа** пайсці на секцыю па валейболе? Усталявалася цёплае надвор'е, ужо **напэўна** прыляцяць буслы.* Параўн.: ***Ці** пайсці на секцыю па валейболе? Усталявалася цёплае надвор'е, ужо **дакладна** прыляцяць буслы.*

Коскай раздзяляюцца пабочныя словы, словазлучэнні і сказы, калі яны ідуць адно за адным: ***Само сабой, канечне,** паехалі яны ў лес* (Я. Колас); ***Адным словам, на нашу агульную думку,** усе мы ўчатырох былі добрымі хлопцамі* (І. Навуменка).

Пабочныя словы, словазлучэнні і сказы аддзяляюцца коскамі ад папярэдніх злучнікаў, якія звязваюць члены сказа або часткі складанага сказа: *Сосны вымкнуць угару, як свечкі, сонца вершаліны ім прыпаліць, **і, здаецца,** так стаяць ім вечнасць — толькі б перад бураю ўстаялі!* (А. Зэкаў).

Калі злучнік ***а*** ўтварае адно цэлае з наступнай пабочнай канструкцыяй (словам, словазлучэннем, сказам), то ён не аддзяляецца ад гэтай канструкцыі коскай: ***а можа, а магчыма, а значыцца, а між іншым, а па-другое***: *Іншыя гарады*



Правообладатель Национальный институт образования

*складваліся, раслі дзясяткамі,* ***а можа,*** *і сотнямі год* (Т. Хадкевіч); *Па-першае, трэба забяспечыць людзей усім неабходным інвентаром,* ***а па-другое,*** *арганізаваць дастаўку ў поле гарачай ежы.* Параўн.: *Не год,* ***а, магчыма,*** *два прайшло з нашай апошняй сустрэчы.*

К о с к а й  н е  а д д з я л я е ц ц а ад пабочных канструкцый узмацняльная часціца ***і***: ***І сапраўды,*** *гэта не кепская думка!* (Я. Колас).

В ы д з я л я ю ц ц а  п р а ц я ж н і к а м і або б я р у ц ц а ў д у ж к і ўстаўныя канструкцыі, якія служаць у якасці тлумачэнняў, заўваг, дадатковых звестак, удакладненняў да асноўнага сказа: *Я першы раз быў у горадзе, і Мазыр —* ***хоць гэта горад і не надта вялікі*** *— зрабіў на мяне надзвычайнае ўражанне* (І. Навуменка); *Асвейскае возера* ***(пасля Нарачы яно — другое па велічыні)*** *кожнаму вандроўніку запомніцца самым буйным вострававам Беларусі* (У. Ягоўдзік).

***Заўвага.*** Перад закрывальнай дужкай пасля ўстаўной канструкцыі ставяцца знакі прыпынку, якія патрабуюцца кантэкстам (клічнік, пытальнік або шматкроп'е): *Ніколі не спадзявайся, што мае ногі яшчэ здольны на такі марафон* ***(з Гродна да Мастоў — 63 км!)*** (А. Карпюк); *Прыемнае адчуванне з'яўляецца* ***(ці няпраўда?),*** *калі закончыш усе справы своечасова.*

Калі ўстаўная канструкцыя, якая выдзяляецца працяжнікамі, знаходзіцца паміж часткамі, дзе павінна ставіцца коска, або калі ў канцы ўстаўной канструкцыі ёсць гэты знак прыпынку, то коска спалучаецца з працяжнікам і ставіцца перад другім працяжнікам: *У кнігах, што прынёс бібліятэкар —* ***іх было дзесяць,*** *— мы спадзяваліся знайсці патрэбную для даклада інфармацыю.*

**125.** Прачытайце сказы, захоўваючы правільную інтанацыю. Спішыце, раскрываючы дужкі, устаўляючы прапушчаныя літары і ставячы патрэбныя знакі прыпынку.

1. Ды *(н..)*калі смутак мой згубіцца ў змроку канец мае ўсё ў гэтым грэшным жыцці *(В. Дэбіш)*. 2. Ён падтрымліваў мае прапановы а значыць і клас падтрымліваў іх *(Э. Луканскі)*. 3. Назва Міёры ці гістарычны варыянт Мёры *(н..)*звычайная і нават экзатычная для Беларусі *(А. Яфімаў)*. 4. Калі забрала сястра да сябе маці гэта здарылася амаль адразу пасля таго як ён паступіў ва ўніверсітэт у Ленінградзе бываць у вёсцы яму *(н..)*выпадала *(У. Гаўрыловіч)*.



Правообладатель Национальный институт образования

5. Можа павячэраеце? *(І. Гурскі)*. 6. «Шэрым» ён называў Свідэрскага *(па)*першае за тое што той звычайна апранаўся *(н..)*ярка *(па)*другое паўсюль імкнуўся трымацца *(н..)*прыкметна *(па)*трэцяе *(н..)*колі *(н..)*чога пра сябе *(н..)*распавядаў і *(па)*чацвёртае па аналогіі з імем Сяргей *(Я. Конеў)*. 7. Лес атрасаў з сябе счарнеласць[ф] святлеў і здаецца на вачах дужэў харашэў напаўняўся галасамі сваіх насельнікаў *(У. Ліпскі)*. 8. Размова аднак *(н..)*клеілася *(З. Прыгодзіч)*.

**126.** Прачытайце тэкст. Чаму свята апошняга званка чакаюць не толькі выпускнікі? Што выражаюць пабочныя словы ў тэксце? Спішыце, раскрываючы дужкі. Пастаўце, дзе трэба, знакі прыпынку і растлумачце іх пастаноўку.

### Свята апошняга званка

Кожны навучальны год у школе завяршаецца гэтым традыцыйным урачыстым мерапрыемствам. І хоць «званок» гэты *(па)*сапраўднаму апошні толькі для выпускнікоў з *(не)*цярпеннем чакаюць свята апошняга званка ўсе вучні.[сн] Бо наперадзе іх чакае лета і самыя доўгія школьныя канікулы.

Праўда саміх выпускнікоў чакаюць ужо *(не)*канікулы а першыя ў жыцці экзамены...

На свяце апошняга званка заўжды шмат кветак. І вельмі шмат гасцей.

І канечне самы кранальны момант свята — гэта калі для выпускнікоў гучыць іх самы апошні школьны званок. А адбываецца гэта такім чынам: самы рослы вучань выпускнога класа садзіць сабе на плячо каго*(сьці)* з *(перша)*класнікаў і так яны разам праходзяць уздоўж шарэнгі вучняў. А *(перша)*класнік у гэты час з усяе сілы трасе над галавой маленькім званочкам...

Праўда бываюць гады калі сярод вучняў выпускнога класа няма больш*(менш)* рослых. І тады маленькага *(перша)*класніка са званочкам проста вядуць за руку...

Але званочак усё роўна звініць. І гэтак жа весела і звонка ён будзе звінець праз тры месяцы першага верасня...

Значыць школьнае жыццё будзе працягвацца далей *(Г. Аўласенка)*.

**127.** Напішыце замалёўку аб святах у вашай школе на тэму «Традыцыі нашай школы» («Свята, якое мне запомнілася», «Памятная дата»), ужываючы сказы з пабочнымі і ўстаўнымі канструкцыямі.



Правообладатель Национальный институт образования

**128.** Прачытайце ўспаміны І. Шамякіна пра І. Мележа. Якім уяўляецца вам І. Мележ? Запішыце тэкст, устаўляючы на месцы пропускаў пабочныя або ўстаўныя канструкцыі з дужак. Што перадаюць пабочныя і ўстаўныя канструкцыі ў тэксце? Пракаменціруйце пунктуацыйнае афармленне ўтвораных сказаў.

У рабоце ... у нас з Мележам часам узнікалі канфлікты, большасць з якіх мы вырашалі самі ці з дапамогай калег (і я лічу гэта зусім натуральна). Мы па-рознаму ставіліся да тых ці іншых праблем, твораў, людзей. Здаралася, што тое, што я лічыў сур'ёзным, Іван Паўлавіч такім не лічыў, ці наадварот. ... ён больш скептычна ставіўся да нашага кіраўнічага тлуму, да шматлікіх пасяджэнняў, пастаноў, якія наўрад ці памагалі творчасці (увогуле). І ён ... ... меў рацыю (як я пераконваюся цяпер; можа позна).

**129.** Прачытайце тэкст. Вызначце яго асноўную думку.

### Няскораная Цытадэль

У Музеі абароны Брэсцкай крэпасці захоўваецца копія карціны польскага мастака Марціна Залескага. Яна дае ўяўленне аб тым, як выглядала гэта збудаванне ў яго першапачатковым выглядзе ў 1840 годзе. **Цяпер Брэсцкая крэпасць бясспрэчна прыцягвае ўвагу як помнік ваеннай гісторыі дзе перакрыжоўваліся інтарэсы многіх еўрапейскіх дзяржаў і дазваляе меркаваць пра развіццё ваеннага дойлідства сярэдзіны XIX стагоддзя.**

**Пабудаваная на месцы старажытнага Бярэсця ў далейшым — Брэст-Літоўска крэпасць была адкрыта 26 красавіка 1842 года.** Узвядзенне ў 1878—1888 гадах ліній фартоў зрабіла крэпасць важным стратэгічным вузлом на заходніх межах Расійскай імперыі. Мадэрнізаваў фарты ў пачатку мінулага стагоддзя ваенны інжынер Дзмітрый Карбышаў. Ядро крэпасці складалася з Цытадэлі, або Цэнтральнага ўмацавання, і трох іншых умацаванняў — Кобрынскага, Цярэспальскага і Валынскага. На тэрыторыі крэпасці размяшчаліся 14 фартоў, 5 абарончых казарм, 21 прамежкавы ахоўны пункт з кальцавой лініяй абароны ў 45 кіламетраў. Не ўсе ўмацаванні і масты захаваліся да нашых дзён. Адлік страт крэпасць вядзе з Першай сусветнай вайны. У жніўні 1914 года Вярхоўнае камандаванне рускай арміі прыняло рашэнне аб эвакуацыі ваеннаслужачых і іх сем'яў, маёмасці, зброі, боепрыпасаў. Асобныя абаронныя збудаванні былі ўзарваны. Істотныя разбурэнні прыпадаюць на перыяд жорсткіх баёў пачатку Вялікай Айчыннай вайны. К таму часу крэпасць страціла



Правообладатель Национальный институт образования



сваё значэнне як ваенна-абаронны аб'ект, на яе тэрыторыі знаходзілася каля васьмі тысяч чалавек. На выпадак вайны прадугледжваўся выхад асабовага складу і тэхнікі, для прыкрыцця павінны былі заставацца стралковы батальён і артылерыйскі дывізіён*.

І тым не менш 22 чэрвеня 1941 года чырвонаармейскія казармы і складскія памяшканні ператварыліся ў магутны пункт супраціўлення. Па выбоінах у сценах, абпаленай цэгле, чорным ад агню ствале дрэва, што знаходзіцца ў музеі, можна ўявіць, якой сілы абстрэл абрынуўся на абаронцаў крэпасці. Не вытрымлівалі камяні. **Казематы іх налічвалася каля пяцісот былі добра прыстасаваны для вядзення бою. Аднак не ўсе казематы а таўшчыня іх вонкавых сцен дасягала двух метраў захаваліся.**

У 1952 годзе ў каземаце паўночна-заходняй часткі Цытадэлі быў знойдзены надпіс «Я паміраю, але не здаюся! Бывай, Радзіма. 20/VII — 41 г.».

**Людзі якім даводзілася бываць у Брэсцкай крэпасці і сэрцам дакрануцца да гераічнага мінулага безумоўна праходзілі праз Холмскія і Цярэспальскія вароты.** Холмскія вароты лічацца сімваламі крэпасці і Брэста *(Паводле А. Капачовай)*.

Спішыце выдзеленыя сказы, расстаўляючы, дзе патрэбна, знакі прыпынку. Да якой лексікі паводле сферы ўжывання адносяцца словы *форт, казарма, казематы, батальён, дывізіён*? Раскрыйце іх значэнні.

Карыстаючыся дадатковай літаратурай або інтэрнэт-рэсурсамі, падрыхтуйце паведамленне пра гераічную абарону Брэсцкай крэпасці або пра Дзмітрыя Карбышава.

**130.** Прачытайце памятку «Як правільна пераказваць тэкст сцісла», запішыце яе па-беларуску. Ужывайце пры гэтым пабочныя словы, словазлучэнні, што ўказваюць на паслядоўнасць думак і сувязь паміж імі.

**Памятка**

Чтобы пересказать текст сжато, необходимо сделать следующее:

1. Определить:

а) какова главная мысль текста;



Правообладатель Национальный институт образования

б) сколько частей (микротем) содержится в тексте;

в) какова главная мысль каждой части;

г) какая информация текста является основной, какая — второстепенной.

2. Сократить текст за счёт исключения второстепенной информации *(Л. М. Рыбченкова)*.

**131.** Вызначце, да якога стылю належыць наступны тэкст. Дакажыце сваё меркаванне, выкарыстоўваючы пабочныя словы.

У друку, у вусных выказваннях нярэдка сустракаюцца памылкі, звязаныя з ужываннем прыметнікаў, суадносных са словам *кветка*. Трэба памятаць, што *кветачны* — прыгатаваны з кветак: *кветачны адэкалон*, *кветачны чай. Кветкавы* — які мае адносіны да кветкі, прызначаны для кветак: *кветкавы кіёск*, *кветкавы дыван*, *кветкавы магазін*, *кветкавая выстаўка*. Пра луг, усеяны кветкамі, мы гаворым *квяцісты. Квяцісты* — гэта яшчэ і з узорам у кветкі, яркі, каляровы: *квяцісты дыван, квяцістая сукенка. Квяцістай* (вядома, у пераносным сэнсе) можна назваць і афіцыйную прамову — залішне напышлівую, насычаную метафарамі і рытарычнымі пытаннямі.

Слова *кветка* ўваходзіць у склад вялікай колькасці ўстойлівых спалучэнняў слоў. *Кветкі з чужых палёў!* — абурана скажа даследчык літаратуры, калі заўважыць у творы, які збіраецца рэцэнзаваць, запазычаныя ў іншых аўтараў матывы, думкі, нават вобразы і сінтаксічныя канструкцыі. Калі хочуць падкрэсліць, што нейкі непрыемны выпадак толькі пачатак непрыемнасцей, то кажуць: *гэта яшчэ толькі кветачкі!* У педагагічнай літаратуры можна сустрэць устойлівы выраз *цвісці павінны ўсе кветкі*. Гэта азначае, што кожнае дзіця мае здольнасці, закладзеныя прыродай *(М. Сянкевіч)*.

- Выпішыце з тэксту просты ўскладнены сказ. Зрабіце яго сінтаксічны разбор.

**132.** Складзіце і запішыце сказы па наступных схемах (пс — пабочныя словы):

[Пс, ...]. [..., пс, ...]. [..., пс].

**133.** Выканайце інтэрактыўнае заданне «Знакі прыпынку ў сказах з пабочнымі словамі, словазлучэннямі і сказамі, устаўнымі канструкцыямі».



Правообладатель Национальный институт образования

# § 10. Правілы пабудовы сказаў з параўнальнымі зваротамі, знакі прыпынку

§ 0–10

**134.** Прачытайце табліцу. Раскажыце пра пастаноўку знакаў прыпынку ў сказах з параўнальнымі зваротамі, дапоўніўшы прыкладамі.

| **Параўнальныя звароты** | |
|---|---|
| **Выдзяляюцца коскамі:** | |
| у пачатку сказа | |
| у сярэдзіне сказа | |
| у канцы сказа | |
| **Не выдзяляюцца коскамі:** | |
| *больш як (менш чым, не часцей як, усё роўна як)* + параўнальны зварот | |
| устойлівыя выразы *як мага, як след* | |
| параўнальны зварот = іменная частка выказніка | |
| *не, зусім, амаль* + параўнальны зварот | |
| параўнальны зварот = ‘у якасці’ | |

Выдзяляюцца коскамі параўнальныя звароты, якія пачынаюцца злучнікамі ***як, бы, як бы, нібы, нібыта, быццам, як быццам, што, як і, чым***: *Ад шчасця сэрца скача, **як дзіця**, ад бед яно, **як млын**, шуміць начамі, варочае цяжкімі камянямі, падлічваючы горычы жыцця* (А. Куляшоў); *Перад вачыма падлеткаў, **нібы невядомы**, уставаў іх родны край* (У. Караткевіч); *У песень, **як і ў людзей**, свая доля і свой лёс* (А. Бачыла).

Коска не ставіцца пры параўнальных зваротах перад злучнікамі ***як*** і ***чым*** у спалучэннях ***больш як (не больш як), больш чым (не больш чым), менш як (не менш як), менш чым (не менш чым), не бліжэй як, не далей як, не часцей як, не радзей як, не іначай як, усё роўна як*** і інш., якія выражаюць абмежаванне ў прасторы, часе, колькасці, калі яны сэнсава і інтанацыйна не выдзяляюцца: ***Больш як паўстагоддзя*** *нястом-*



Правообладатель Национальный институт образования

*на мысліў, тварыў неспакойны, мудры, здавалася, невычэрпны талент паэта...* (І. Мележ); ***Менш як два тыдні*** *заставалася да выпускных экзаменаў*.

Не выдзяляюцца коскамі:

- устойлівыя выразы: *як мага, як след, відна як днём, гол як сакол, маўчаць як рыба, ведаць як свае пяць пальцаў* і інш.;
- параўнальныя звароты, якія з'яўляюцца іменнай часткай выказніка: *Святло гэтых зор* ***нібы тайны*** (Л. Галубовіч);
- параўнальныя звароты, перад якімі ёсць часціца ***не*** або прыслоўі ***зусім***, ***амаль***: *Да дырэктара прадпрыемства Васіля Пятровіча адносіліся з павагай: ён быў чалавекам патрабавальным, але заўсёды размаўляў з рабочымі* ***не як з падначаленымі***; *На святце гумару ўсе дарослыя паводзілі сябе* ***зусім як дзеці***;
- звароты з ***як***, калі яны ўжываюцца са значэннем 'у якасці' або са значэннем тоеснасці*: *Усе ведалі Алега* ***як добрага рабочага***; *Быў дзень* ***як дзень***.

**135.** Прачытайце верш. Да якога віду лірыкі ён адносіцца? Якія моўныя сродкі дапамагаюць перадаць пачуццё пяшчоты? Назавіце адасобленыя члены сказа і параўнальныя звароты, растлумачце пастаноўку знакаў прыпынку пры іх.

У электрычцы люднай, пры акне,
З дзяўчынай ехаў ён — і тым уразіў,
Што сон яе ў руках трымаў, як вазу,
Не бачыў ні суседзяў, ні мяне.
У вокны барабаніў дождж мацней,
Вагон рыпеў, падрыгваў час ад часу,
А хлопец не аслабіў рук ні разу,
Замёр і сам, як у чароўным сне.

На ўвесь састаў, відаць, вагон адзіны
Ускалыхнуў пяшчотныя ўспаміны.
Глядзелі мы на шчасце маладых,
Пра свой узрост забыўшы на хвілінку,—
І ціха, каб не патрывожыць іх,
Сыходзіў кожны на сваім прыпынку.

*М. Маляўка.*



Правообладатель Национальный институт образования

**136.** Прачытайце верш. Што вы ведаеце пра Рагнеду? Праз якія вобразныя сродкі выяўляецца стаўленне аўтара да Рагнеды? Спішыце верш, расстаўляючы прапушчаныя знакі прыпынку. Патлумачце іх пастаноўку.

**Рагнеда**

Ты прыходзіш з мінулых вякоў
Як багіня
зямная кабета.
Я імя тваё звонам падкоў
Высякаю
што іскры
Рагнеда.
Вобраз твой
як абраз
намалю,
Што,
здаецца,
падораны Богам.
Ты сышла на святую зямлю
Нашай памяці
зорнай дарогай.
Толькі ўбачу пагляд твой здалёк,
Як адразу знікае туга ўся.
Мо ў цябе я,
нібы матылёк
У сінечу нябёс,
закахаўся.
Зноўку іскры з-пад конскіх падкоў
Нібы знічкі
ляцяць над планетай,
Каб прыйшла ты з мінулых вякоў
Як маё ратаванне
Рагнеда.

*У. Мазго.*

**137.** Прачытайце сказы. Спішыце, захоўваючы пунктуацыйныя і арфаграфічныя нормы. Растлумачце пастаноўку знакаў прыпынку і напісанне слоў з устаўленымі літарамі.

1. Прырода прыбралася як мала..іца *(С. Давідовіч)*. 2. Аказа..ся ў да..гах як у ша..ках *(І. Капыловіч)*. 3. Здавалася адбываецца ўсё



Правообладатель Национальный институт образования

нібыта ў сне *(Г. Пярун)*. 4. Мінула здаецца больш як па..года пасля гэтага выпа..ку пад старою бярозай *(М. Паслядовіч)*. 5. Там сяро..лясной драбязы стаяла і цешылася сабой як княгіня а..сыпаная[с] брыльянтамі ці караламі зала..істымі шышкамі высозная разлапістая яліна *(В. Макарэвіч)*. 6. Як на драж..ах раслі на агаро..е кабачкі і гарбузы *(А. Камароўскі)*. 7. Усе ведаюць Міхаіла Іванавіча як чалавека пунктуальнага. 8. Вада ў Кругане нібы тонкае шкло *(Л. Валасюк)*. 9. Пачалі лю..і жыць як лю..і *(А. Козел)*. 10. Лета маё праля..ела нібыта страла *(Н. Маеўская)*. 11. Менш чым за хвіліну яны пашпурлялі ў выкапаны дол мяхі ды рыштунак *(Я. Конеў)*. 12. Цягнецца дзі..я да кветкі шыпшыны прыгожай і яснай нібы тое сонца *(Г. Навасельцава)*. 13. І тут быццам кіпнем абдало! *(А. Наварыч)*. 14. Больш як дваццаць пар дапытлівых вачэй гля..ела на птушку *(А. Вольскі)*.

**138.** Прачытайце, звярніце ўвагу на выдзеленыя словы. Якой формай назоўнікаў (назоўнікаў і прыметнікаў) могуць выражацца параўнанні? Перабудуйце прапанаваныя сказы ў сказы з параўнальнымі зваротамі. Запішыце. Якія з варыянтаў параўнання больш паэтычны?

Паміж алешніку **змяёю**[ф]
Крыніца чорнай паласою
На свет зірнула, лёд прабіла,
Ў старых карчах загаманіла.
*Я. Колас.*

Здалёк відна
Зямля бацькоў,
Матуль,
Дзе песня б’ецца
**Перапёлкай шэрай.**
*Р. Барадулін.*

Зялёны луг, як скінуць вокам,
**Абрусам пышным** і **шырокім**
Абапал Нёмна рассцілаўся[с].
*Я. Колас.*

**139.** Прачытайце тэкст. Вызначце яго стыль. Якая пара года апісваецца ў тэксце? Падбярыце да тэксту загаловак у адпаведнасці з тэмай.

Яшчэ ўчора ўся зямля была ўслана лісцем **markerрознакаляровым** чароўным як сама **восень**. А сёння гэты пярэсты дыван быццам пасівеў: на ім ляжаў **лебядзіным** пухам снег які як ні дзіўна зусім не хацеў раставаць. І **з-пад** гэтага бялюткага чыстага снегу было бачна дзівоснае лісцвяное покрыва — восень нібы апранула паверх свайго звычайнага ўбору белы — убор нявесты. Вочы яе схаваліся пад



Правообладатель Национальный институт образования

танюсенькім вэлюмам туманоў якія лёгкай дымкаю на гарызонце злучалі неба з зямлёю *(Паводле Д. Пятровіча)*.

Назавіце параўнанні. Чым яны выражаны?
Спішыце тэкст, расстаўляючы прапушчаныя знакі прыпынку.
● Растлумачце напісанне выдзеленых слоў.
Раскрыйце значэнні слоў *пярэсты, вэлюм*.

**140.** Напішыце невялікае сачыненне-апісанне пра любімую пару года або роднага чалавека, выкарыстоўваючы параўнальныя звароты.

§ 0–11

## § 11. Правілы пабудовы складаназлучаных сказаў, знакі прыпынку

**141.** Прачытайце прапанаваныя азначэнні. Суаднясіце іх з адпаведнымі тэрмінамі.

а) ... — сказ, у якім сэнсава-граматычныя часткі аб'яднаны ў сэнсавае, інтанацыйнае цэлае з дапамогай злучальных злучнікаў;

б) ... — сказ, які складаецца з дзвюх або больш частак, аб'яднаных у сэнсавае, інтанацыйнае і структурна-граматычнае адзінства;

в) ... — сказ, у якім адна састаўная частка падпарадкоўваецца другой з дапамогай падпарадкавальнага злучніка або злучальнага слова;

г) ... — сказ, у якім часткі аб'яднаны ў адно цэлае сэнсава і інтанацыйна (без злучнікаў і злучальных слоў);

д) ... — сказ, які складаецца з трох і больш частак, аб'яднаных рознымі відамі сувязі: злучальнай, падпарадкавальнай, бяззлучнікавай.

**142.** Прачытайце. Перадайце змест кожнага абзаца з дапамогай складаназлучаных сказаў.

Як вядома, простыя сказы больш характэрныя для гутарковага маўлення, складаныя часцей ужываюцца ў кніжнай мове. Гэта зразумела: кніжная мова адлюстроўвае складаныя, рознабаковыя сувязі прадметаў і з'яў у іх прычынна-выніковай залежнасці. Ва ўсіх стылях складаныя сказы выкарыстоўваюцца па-рознаму. Так, доказна-лагічны характар выкладу ў *навуковым тэксце* патрабуе складаназалежных сказаў з дадзенымі часткамі ўмовы і прычыны, а таксама



Правообладатель Национальный институт образования

з даданымі азначальнымі часткамі — для азначэння паняццяў і ілюстравання з'яў. У *мастацкім стылі* пераважаюць складаназалежныя сказы з даданымі часткамі часу і даданымі азначальнымі.

Выбар аўтарам таго ці іншага тыпу сказа — складанага ці простага, складаназалежнага ці складаназлучанага, злучнікавага ці бяззлучнікавага — вызначаецца ў першую чаргу сэнсавымі і стылістычнымі асаблівасцямі кантэксту.

Памылкі ў пабудове складаных сказаў могуць быць звязаны з парушэннем парадку слоў у аднародных даданых частках: у іх павінен захоўвацца прамы ці адваротны парадак. Няўдалым можна лічыць такі сказ: *Міхал падышоў да акна і ўбачыў казачнае відовішча, дзе снегавая роўнядзь зіхацела пад промнямі зімовага сонца, дзе дрэвы застылі пад цяжкім інеем і задумліва спыніла свой ход рака*. У трэцяй аднароднай частцы варта выкарыстаць прамы парадак слоў: *рака задумліва спыніла свой ход*.

Распаўсюджаныя памылкі ў пабудове складаных сказаў звязаны з тым, што ў якасці аднародных спалучаюцца член сказа і даданая частка: *Міхась быў зачараваны тым, якія змены адбыліся ў прыродзе і зімовай прыгажосцю*. **Правільна:** *Міхась быў зачараваны зменамі, якія адбыліся ў прыродзе, і зімовай прыгажосцю*. Або: *Міхась быў зачараваны тым, якія змены адбыліся ў прыродзе і як прыгожа стала навокал* (В. Кузьміч).

Пісьмова адкажыце на пытанні:
1. Чаму складаныя сказы часцей ужываюцца ў кніжнай мове?
2. Ад чаго залежыць выбар аўтарам тыпу сказа?
3. Якія тыповыя памылкі сустракаюцца пры ўжыванні складаных сказаў?

Практ. 142–1

**143.** Дайце вусную характарыстыку сказам, растлумачце пастаноўку знакаў прыпынку ў іх. Вызначце сэнсавыя адносіны паміж часткамі складаназлучаных сказаў.

1. Чароды на зялёных берагах апошняю гадуюцца травою, і слівы[ф] сыта луснулі ў баках, аб'еўшыся і сонцам, і зямлёю. 2. Цэлы век вісіць вясёлка над краінай мокрай гэтай, і глядзяць спакойна коні на нябесны дзіўны мост. 3. Толькі я перапоўнены сумам, зросся я з гэтай весняй зямлёй не птушыным сэрцам бяздумным, а трывожнай людской душой. 4. Цягнікі заспявалі, заплакалі, дым змяшалі з парай[м] лагчын, па мастах над вадою адтакалі[сл], іскры кінулі ў зорную сінь[сл]. 5. І сівела, звінела ад кропель рака, і ў гарачым святле плылі сінія



Правообладатель Национальный институт образования

песенькі жаўрука над карычневай песняй раллі. 6. Даўнія вежы суровыя з сухім палыном[м] і ўзлётам, сатканыя з нашай любові, са скалаў, тугі і журботы. 7. Адышло ты, каханне, у сівыя палі, і пагаслі, выцвілі фарбы зямлі, як стары сялянскі ручнік. 8. Сёння выпаў, як кветкі акацыі, сакавіцкі апошні снег. 9. Усе шляхі прыводзяць не да Рыма, а да родных вербаў і бяроз *(У. Караткевіч)*.

- Зрабіце сінтаксічны разбор аднаго простага ўскладненага сказа.

Ці згодны вы з жыццёвым падагульненнем паэта, выказаным у апошнім сказе? Чаму?

Выпішыце вобразнае азначэнне вясёлкі з другога сказа, растлумачце яго сэнс. Як называюцца падобныя выразы ў мовазнаўчай навуцы?

Практ. 143–1–143–4

**144.** Прачытайце табліцу. З апорай на інфармацыю, змешчаную ў ёй, раскажыце пра пастаноўку знакаў прыпынку ў складаназлучаных сказах. На кожны пункт правіла запішыце прыклады з практыкавання 146.

| Знакі прыпынку | Умовы выбару знакаў прыпынку | Прыклады |
|---|---|---|
| Коска | Перад злучальнымі злучнікамі, што звязваюць часткі сказа | |
| Кропка з коскай | Адна з частак або ўсе часткі развітыя, маюць свае знакі прыпынку | |
| Працяжнік | Другая частка паказвае на вынік або хуткую змену падзей | |
| **Коска не ставіцца:**<br>• калі ёсць агульнае слова (агульны член сказа, пабочнае слова, часціца);<br>• часткі з'яўляюцца назыўнымі сказамі;<br>• часткі з'яўляюцца безасабовымі сказамі | | |

Часткі складаназлучаных сказаў аддзяляюцца коскай, кропкай з коскай, працяжнікам.

Коска ставіцца паміж часткамі складаназлучаных сказаў, якія аб'яднаны адзіночнымі злучнікамі:

- спалучальнымі ***і, ды*** (у значэнні ***'і'***), ***дый*** (***ды і***): *Чалавек — складаная істота,* ***і*** *яго нялёгка зразумець* (Л. Галубовіч). [ ], *і* [ ]; *У камінку гудзе вятрыска,* ***і*** *бор за вокнамі шуміць* (Р. Баравікова). [ ], *і* [ ];



Правообладатель Национальный институт образования

- супраціўнымі ***а, але, ды*** (у значэнні ***'але'***), ***ж (жа), аж, аднак, затое, толькі***: *Чорны яшчэ толькі пачынаў,* ***а*** *крытыка ўжо ахрысціла яго «беларускім Дастаеўскім»* (М. Тычына). [ ], *а* [ ]; *У печцы трашчалі дровы,* ***але*** *настылы за зіму пакоік награваўся марудна* (І. Навуменка). [ ], *але* [ ]; *А навокал белая цішыня,* ***толькі*** *дрэвы патрэскваюць ад марозу* (Л.Валасюк). [ ], *толькі* [ ]; *Залева* пакрысе слабела,* ***затое*** *вецер штохвіліны пераменяўся* (Я. Конеў). [ ], *затое* [ ];
- размеркавальнымі ***або (альбо), ці***: *Бягуць дні вельмі хутка,* ***або*** *неўтаймавана ляцяць гады.* [ ], *або* [ ].

***Заўвага.*** Коска не ставіцца паміж часткамі складаназлучанага сказа, якія звязаны адзіночнымі злучнікамі ***і, ды*** (у значэнні ***'і'***), ***або, ці***, калі:

- у сказе ёсць агульны член, агульная часціца або пабочнае слова, якія адносяцца як да першай, так і да другой часткі: ***Вясной*** *светлы сок прарывае бяросту* ***і*** *рэкі сплаўляюць у мора свой панцыр* (П. Панчанка). [ ] *і* [ ]; ***Толькі*** *вецер гудзеў* ***ды*** *гнуліся дрэвы да долу.* [ ] *ды* [ ]; ***Сапраўды,*** *прапанаванае заданне было нескладанае* ***і*** *выканалі яго ўсе вучні.* [ ] *і* [ ];
- часткі з'яўляюцца безасабовымі, няпэўна-асабовымі або назыўнымі сказамі: *Светла* ***ды*** *марозна.* [ ] *ды* [ ]; *Аб'явілі пасадку* ***і*** *падалі трап.* [ ] *і* [ ]; *Яркае сонца* ***ці*** *дождж.* [ ] *ці* [ ];
- часткі маюць форму пытальных, пабуджальных або клічных сказаў: *Прадукцыя гэтага прадпрыемства карыстаецца попытам і людзі з ахвотай набываюць тавары новай маркі?* [ ] *і* [ ]? *Колькі прыгажосці* ***і*** *колькі экспрэсіі!* [ ] *і* [ ]!

Коска не ставіцца, калі дзейнік у другой частцы выражаны займеннікам *сам*: *Валянцін добра ведае гэты горад* ***і*** *сам можа быць нашым гідам.* [ ] *і* [ ].

Коска ставіцца паміж часткамі складаназлучаных сказаў, якія аб'яднаны паўторнымі злучнікамі ***і — і, ні — ні, то — то, не то — не то, або (альбо) — або (альбо), ці — ці, ці то — ці то***: ***І*** *лугавая птушка кліча,* ***і*** *ад травы салодкі пах змывае горкі пыл з аблічча і застывае на губах* (Р. Баравікова). *І* [ ], *і* [ ]; ***І*** *звоны гучаць,* ***і*** *гром шырыцца,* ***і*** *цішыня ляжыць* (К. Чорны). *І* [ ], *і* [ ], *і* [ ]. ***Ні*** *колас на ніве не ўскалыхнецца,*



Правообладатель Национальный институт образования

***ні*** *ліст на дрэве не ўзварухнецца* (М. Багдановіч). *Ні* [ ], *ні* [ ]; ***То*** *ўспыхнуць яркія фарбы пад промнямі сонца,* ***то*** *зашарэе за акном* (Т. Стадольнік). *То* [ ], *то* [ ]; ***Ці*** *ён забыўся на яе словы,* ***ці*** *нейкія думкі адцягвалі ад песні* (М. Лынькоў). *Ці* [ ], *ці* [ ]; ***Ці то*** *дождж секане, нібы шротам, па твары,* ***ці то*** *спёка абпаліць знарок усяго* (В. Максімовіч). *Ці то* [ ], *ці то* [ ].

К р о п к а з к о с к а й с т а в і ц ц а паміж часткамі складаназлучанага сказа, якія звязваюцца паміж сабой:

- злучнікамі ***але, толькі, аднак*** і іншымі, калі гэтыя часткі разгорнутыя і (або) маюць свае знакі прыпынку: *Вада ў крыніцы пульсавала, званіла, як званочак;* ***аднак*** *людзі не заўважалі яе.* [ ]; *аднак* [ ];
- злучнікам ***а***, калі састаўныя часткі разгорнутыя і маюць свае знакі прыпынку: *Вясна пачалася рана;* ***а*** *пад канец мая ўжо красавалі, пераліваючыся рознымі фарбамі, кветкі позняга лета.* [ ]; *а* [ ];
- злучнікамі ***і, ды*** (у значэнні ***'і'***), калі яны аб'ядноўваюць дзве састаўныя часткі, якія без гэтых злучнікаў былі б самастойнымі сказамі, раздзеленымі кропкай: *Вільготнымі грудамі жаўцела пры дарозе гліна;* ***і*** *гэта яна навеяла Пілату надзвычайны настрой* (К. Чорны). [ ]; *і* [ ]; *Неўпрыкмет распусціліся коцікі, збіраючы вакол сябе пчол;* ***ды*** *навокал стаяў прыемны водар.* [ ]; *ды* [ ].

Паміж часткамі складаназлучанага сказа с т а в і ц ц а п р а ц я ж н і к, калі:

- у другой частцы падкрэсліваецца вынік у адносінах да першай: *А будзе хлеб —* ***і*** *будуць песні* (Л. Галубовіч). [ ] — *і* [ ]; *Сонца шчыруе —* ***і*** *лета цвіце* (В. Ярац). [ ] — *і* [ ];
- у сказе перадаецца нечаканасць, хуткая змена з'яў або падзей: *Адна хвіліна —* ***і*** *машына чакала ля пад'езда.* [ ] — *і* [ ]; *Момант —* ***і*** *Сцёпкава постаць знікае з Аленчыных вачэй* (Я. Колас). [ ] — *і* [ ];
- у сказе перадаецца супрацьпастаўленне: *Мікіта ў чарговы раз праглядаў матэрыял —* ***і*** *яму зноў і зноў не падабалася* (А. Беланожка). [ ] — *і* [ ].



Правообладатель Национальный институт образования

**145.** Разгледзьце табліцу 1 у дадатку. Зрабіце вывад аб інтанацыйным афармленні складаназлучаных сказаў, паміж часткамі якіх ставіцца коска, кропка з коскай, працяжнік, звярнуўшы ўвагу на сэнсавыя адносіны паміж часткамі.

**146.** Прачытайце складаназлучаныя сказы. Спішыце, ставячы знакі прыпынку і ўстаўляючы прапушчаныя літары. Якія сказы могуць мець варыянты пунктуацыйнага афармлення? Чаму?

1. Згасае светлы дзень няўхільна і ноч сплывае ў іншы свет *(В. Вабішчэвіч)*. 2. Перад ім праплывалі далёкія макаўкі лес.. а бліжнія травы ды кусты каціліся насустрач зялёнымі хвалямі *(М. Бусько)*. 3. Пастаяла хмара над галавою і раптам шугануў магутны лівень *(Г. Васілеўская)*. 4. І не трывожыў потым шолах лісця і не палохаў ветр.. стук *(М. Маляўка)*. 5. Месячык то выныраў з-за лё..кіх аблокаў то хаваўся за іх і тады лё..кая смуга ахутвала навакол..е *(М. Даніленка)*. 6. Тут над вёскай яшчэ панавала цемра а над лесам неба паступова святлела набывала блакітны колер *(В. Саковіч)*. 7. Уздоўж разбуранага ганк.. вакол сцен вясёла цвілі сінія і жоўтыя касачы і ў горад мы а..праўляліся з шыкоўным букетам лета (*К. Камейша*). 8. Яшчэ з вясны на дрэве ён [лісток] засох ды вецер не занёс яго ў пясок *(У. Карызна)*. 9. У кустах спявалі пераклікаліся[с] птушкі а ў возер.. яно цьмяна блішчала ў цемр.. гуляючы плёскала рыба *(А. Якімовіч)*. 10. Шукаеш хараства і яго няма... *(М. Зарэцкі)*. 11. Рэ..кі моцны ўзмах рукі і мяч гулка па́дае па той бок сеткі *(З. Прыгодзіч)*. 12. Быў ужо позні час абед.. але за сталом яшчэ сядзелі два знаёмыя перакла..чыку афіцэры *(У. Федасеенка)*. 13. На двар.. неўпрыкмет пачало вечарэць а хутка і ў пакой упаўзла цемра *(Я. Галубовіч)*.

У адпаведнасці з якімі нормамі вы ўставілі прапушчаныя літары?

**147.** Спішыце прыказкі, расстаўляючы, дзе патрэбна, знакі прыпынку.

1. Пяць пальцаў на руцэ і ўсіх шкада. 2. Добрая слава ў кошыку ляжыць а благая па дарожцы бяжыць. 3. Дзіця забаўляецца а матцы сэрца разрываецца. 4. У гультая і страха цячэ і печ не пячэ. 5. Добрае доўга помніцца а кепскае ніколі не забудзеш. 6. З кута ў кут і вечар тут. 7. Лес чуе а поле бачыць.

Растлумачце сэнс прыказак.



Правообладатель Национальный институт образования

**148.** Утварыце з двух простых сказаў пад лічбамі 1, 2, 3, 4 складаназлучаныя сказы. Бяззлучнікавыя складаныя сказы (пад лічбамі 5, 6) перабудуйце ў складаназлучаныя.

Сказы запішыце, афармляючы іх у адпаведнасці з пунктуацыйнымі нормамі. Вызначце сэнсавыя адносіны паміж часткамі складаназлучаных сказаў.

1. Выпаў першы снег. У гэты дзень дзяўчаты вырашылі набыць канькі. 2. Прыгожая і незабыўная маладосць. З гадамі прыходзіць да чалавека мудрасць. 3. Пабудавалі новы дом. У хуткім часе мы збіраемся пераехаць на новую кватэру. 4. Рыхтуючыся да заняткаў, Наталля наведала бібліятэку. Дзяўчына атрымала выдатную адзнаку. 5. Раскашавала бабіна лета — ва ўсіх людзей быў добры настрой. 6. Дзмітрый папрасіў брата дапамагчы рашыць складаную задачу па фізіцы — брат згадзіўся.

**149.** Дапішыце складаназлучаныя сказы. Растлумачце пастаноўку знакаў прыпынку ў іх.

1. Пасля заканчэння школы кожны выбірае свой шлях...
2. Дождж ліў некалькі дзён...
3. Славіку падарылі цікавую кнігу...
4. Загучала прыемная мелодыя...
5. Гадзіннік паказваў недакладны час...
6. Пакойчык быў утульны...

**150.** Складзіце і запішыце складаназлучаныя сказы аб сваіх планах пасля заканчэння школы па наступных схемах:

1. [ ], *і* [ ].
2. [ ], *ды* (*‘але’*) [ ].
3. [ ] *і* [ ].
4. [ ], *ці* [ ].
5. [ ]; *а* [ ].
6. [ ] — *і* [ ].

Сфармулюйце пунктуацыйныя правілы, карыстаючыся якімі афармлялі складаназлучаныя сказы.

Паразважайце над праблемай выбару прафесіі. Раскажыце, якія перавагі і складанасці будучай прафесіі вы бачыце. Свае думкі запішыце, выкарыстаўшы складаназлучаныя сказы.



Правообладатель Национальный институт образования

**151.** Прачытайце тэкст. Вызначце яго тып, асноўную думку. Што вы ведаеце пра ўюноў?

### Уюн на буксіры

**Невялікая плаціна перагарадзіла рэчку і на вадазліве ляжалі змацаваныя скобамі шпалы. Вада пакрывала плаціну менш чым на паўметра але плынь была даволі моцнай.** Гэта адчувалася па кусціку нейкай зялёнай травы, які прырос да шпалы.

**Не прыкмеціўшы акрамя кусціка нічога цікавага я збіраўся пайсці як раптам на воднай дарожцы мільгануў уюн. Няйначай зазяваўся і яго падхапіў паток. Уюн аднак імгненна павярнуўся супраць цячэння і з усёй сілы заюрыў хвастом.** Ён павольна набліжаўся да краю плаціны, але неўзабаве стаміўся і, прысмактаўшыся да шпалы, замёр. Потым уюн паспрабаваў пераадолець плаціну яшчэ раз. **Тугі струмень зноў падхапіў яго і ён ледзь паспеў утрымацца на тым жа месцы.**



Прайшло некалькі хвілін. Для новага рыўка ўюну, відаць, не хапала сіл. Тут мне трапіў на вочы гладкі, доўгі, на палец таўшчыні прут. Я ўзяў яго і пачаў асцярожна набліжаць да ўюна…

Кажуць, той, хто топіцца, за саломіну схопіцца. Так і ўюн. **Крыху счакаўшы ён прысмактаўся да прута і я асцярожна «павёў» яго супраць цячэння.** Неўзабаве ўюн апынуўся па другі бок плаціны. Ён адразу пайшоў на глыбіню і нават не зірнуў на свайго памочніка. Ды я і не чакаў удзячнасці: гэта ж не казачная залатая рыбка, а звычайны ўюн *(Паводле П. Саковіча)*.

З выдзеленых сказаў выпішыце складаназлучаныя, расстаўляючы, дзе патрэбна, знакі прыпынку.

Назавіце сказы, ускладненыя пабочнымі словамі.

• Растлумачце выпадкі правапісу слоў, што адпавядаюць правілу «Правапіс ***не*** з рознымі часцінамі мовы».

Раскрыйце значэнні слоў *буксір, плаціна*.

Растлумачце сэнс ужытай у тэксце прыказкі.

Ці даводзілася вам выратоўваць звяроў, птушак? Падрыхтуйце паведамленне пра такі выпадак.



Правообладатель Национальный институт образования

**152.** Спішыце складаназлучаныя сказы, расстаўляючы, дзе трэба, знакі прыпынку.

1. Гаркавы смак жывіцы на губах і сонца спелае над галавой павісла *(П. Панчанка)*. 2. Сляды гарачыні яшчэ на тварах носім ды паплылі ўжо дні ў залатую восень *(П. Панчанка)*. 3. Няспынна ідзе наперад жыццё і няспынна чароўна мяняецца воблік роднага краю *(К. Кірэенка)*. 4. Дзень ніяк не хацеў саступаць месца вечару і неба доўга заставалася ясным і светлым *(Я. Колас)*. 5. На палетках каласіцца маладое жыта і сінім морам разліваецца густы лён *(І. Грамовіч)*. 6. То дождж вадаспадам сцякае то снег да асфальту прымёрз *(П. Панчанка)*. 7. Над зямлёй быццам навісаў цяжар і павевы ветру насычаныя пахамі ***расцвіўшай*** грэчкі і свежаскошанага сена былі густыя цягучыя *(Т. Хадкевіч)*. 8. Было бяскрайняе зорнае неба а пад ім — спакойная і цёплая вада *(Я. Брыль)*. 9. Узыдзіце на адкрытую пляцоўку Нацыянальнай бібліятэкі і вам разгорнецца велічная панарама горада. 10. Над вадой ля берага ціха спіць асока ды лаза зялёная жаліцца-шуміць *(М. Багдановіч)*. 11. Вечарэе і пахне кветкамі *(М. Лынькоў)*. 12. Струменіць Нёман срэбраводны ў сваіх прыўдалых берагах а ў лозах ветрык вее ўзгодны і ходзіць шум па чаратах *(Я. Колас)*. 13. Ёсць ворагі і ёсць сябры *(А. Куляшоў)*. 14. Ніхто не зможа вычарпаць крыніцы а ёй самой ніколі не спыніцца *(С. Грахоўскі)*. 15. Хто раскрые мудрасць жыцця і хто дасць адказы на ўсе пытанні? 16. Вільготны змрок спаўзае на лугі і гасне захаду журботная ўсмешка *(Я. Колас)*. 17. Над галавой зіхацелі асеннія зоркі і свяціў месячык-поўня *(І. Шамякін)*.

Пракаменціруйце ўжыванне ў сучаснай літаратурнай мове выдзеленага слова.

§ 11–1

§ 0–12

Практ. 0–153

Практ. 1–153

## § 12. Правілы пабудовы складаназалежных сказаў, знакі прыпынку

### Знакі прыпынку ў складаназалежных сказах з адной даданай часткай

**153.** На аснове табліцы раскажыце, як адрозніць падпарадкавальныя злучнікі і злучальныя словы. Дапоўніце інфармацыю пра ролю злучнікаў як сродку сувязі частак складаназалежных сказаў, улічваючы, што злучнікі — *нязменныя словы, якія не маюць назыўной функцыі і не з'яўляюцца членамі сказа.*



Правообладатель Национальный институт образования

| Адрозненне падпарадкавальных злучнікаў ад злучальных слоў | | |
|---|---|---|
| **Злучальныя словы** | | **Падпарадкавальныя злучнікі** |
| **Адносныя займеннікі:** *хто, што, які, чый, колькі* | **Займеннікавыя прыслоўі:** *дзе, куды, адкуль, чаму, навошта, як, калі* | *што, як, калі, каб, нібы, таму што, раз, хоць, пакуль, абы, бо* |
| Злучальнае слова з’яўляецца членам сказа | | Злучнік як службовая часціна мовы не можа быць … |
| Злучальнае слова можна замяніць паўназначным словам | | Замена злучніка … словам немагчыма. Яго можна замяніць іншым злучнікам або ўвогуле … |
| Да злучальнага слова можна паставіць пытанне | | Да злучніка нельга паставіць … |
| Злучальнае слова, як правіла, мае лагічны націск | | Злучнік не выдзяляецца … |

Практ. 153–1

**154.** Прачытайце сказы з твораў У. Караткевіча. Выпішыце спачатку сказы, у якіх часткі звязаны злучальным словам, потым — злучнікам. Падкрэсліце граматычныя асновы частак, растлумачце пастаноўку знакаў прыпынку.

Практ. 153–2

1. На паўстанках, засыпаных лісцем бярозавым, дзе з пагардай цягнік двойчы ў дзень праляціць, у простай хаце, пускаючы горкія слёзы, у калысцы будучы Колас ляжыць. 2. Здзіўлена гляджу на рукі, з якіх сышлі мазалі́. 3. Зямля глядзіць азёрамі-вачыма на ясны свет, што стыне ў красе. 4. Штосьці часцей і часцей сню я, што з табою ўдваіх[м] едзем між дрэваў начных да сваякоў. 5. За старым, закінутым млынам, дзе зараслы заліў ракі, скачуць жоравы на лугавіне — танканогія шляхцюкі. 6. Спачывае зямля пад гусцеючым[м] ценем[м], мірна нюхае горкі пах травяны, як ара́ты, што звесіў рукі з каленяў і бяздумна сядзіць у канцы баразны. 7. Глянь, як свет забыты чакае святла і цеплыні, даўно забытых. 8. На той частцы, што яшчэ заставалася над вадою, спяшаліся дацвісці гусіныя лапкі і жоўты падбел. 9. Градабой быў такі, што цэлыя кавалкі лёду падалі на беднае жыта. 10. Я сумую па радзіме, па яе лугах і нівах, па трыпутніку, што гладзіў ногі збітыя мае.

Практ. 154–1–154–3

Назавіце часткі сказаў, ускладненыя адасобленымі членамі.

Якія радкі пісьменніка здзівілі вас, якія — сугучныя вашаму настрою і адчуванням?

Ці даўно вы трымалі ў руках зборнік вершаў любімага паэта?



Правообладатель Национальный институт образования

**155.** Разгледзьце схемы складаназалежных сказаў. Раскажыце пра пастаноўку знакаў прыпынку ў іх.

1. [ ], (*што* ...).   2. (Калі ...), [ ].   3. [ , (*якi* ... ), ].

У складаназалежных сказах паміж галоўнай і даданай часткамі ставіцца коска, калі даданая частка стаіць перад галоўнай або пасля яе: ***Хоць тысячы цудоўных небасхілаў я перасек і ўбачу шмат другіх,*** *пра небасхілы бацькаўшчыны мілай не мог нідзе я думаць без тугі* (П. Панчанка).

н я г л е д з я ч ы  н а  ш т о?

(Хоць ...), [ ];

*Алешнік вельмі часта мяшаўся з лазняком,* ***што рос моцнымі дружнымі купамі, уздымаючы ў лясны прыцемак шызыя кучары* пераплеценага галля*** (І. Мележ).

я к і м?

[ ], (*што* ...).

Калі даданая частка стаіць у сярэдзіне галоўнай, яна выдзяляецца коскамі з абодвух бакоў: *Калісьці на тых абшарах,* ***дзе сёння стаіць мястэчка Жыровічы,*** *рос векавечны лес* (У. Ягоўдзік).

я к і х?

[ , (*дзе* ...), ];

*Чалавек,* ***які адарваў сябе ад прыроды,*** *мне чамусьці нагадвае палявую кветку, пастаўленую ў душны і цесны пакой* (З. Прыгодзіч).

я к і?

[ , (*які* ...), ].

Калі даданая частка стаіць перад галоўнай і звязваецца з ёй пры дапамозе састаўных падпарадкавальных злучнікаў (***перш чым, затым што, пасля таго як, для таго каб, па меры таго***



Правообладатель Национальный институт образования

***як, да таго часу пакуль, з прычыны таго што, нягледзячы на тое што, дзякуючы таму што, у сувязі з тым што*** і інш.), то коска ставіцца паміж дадзенай часткай і галоўнай (злучнік не разрываецца): ***Для таго каб*** *праца давала плённыя вынікі, трэба прывучаць да сталых і сур'ёзных адносін да яе з малых гадоў* (Я. Колас).

з якой мэтай?

(*Для таго каб* ...), [ ].

***Заўвага.*** Калі дадзеная частка сказа стаіць пасля галоўнай, коска ставіцца або перад другой часткай састаўнога падпарадкавальнага злучніка, або перад гэтым злучнікам у поўным яго складзе ў залежнасці ад сэнсу. Параўн.: *Трэба прывучаць да сталых і сур'ёзных адносін да працы з малых гадоў,* ***для таго каб*** *яна давала плённыя вынікі.*

з якой мэтай?

[ ], (*для таго каб* ...).

*Трэба прывучаць да сталых і сур'ёзных адносін да працы з малых гадоў для таго,* ***каб*** *яна давала плённыя вынікі.*

для чаго?

[ ], (*каб* ...).

У некаторых сказах злучнік або злучальнае слова знаходзяцца не ў пачатку, а ў сярэдзіне дадзенай часткі, тады коска ставіцца перад тым словам, з якога пачынаецца дадзеная частка: *А вас не цікавіла, аб* ***чым*** *думае рыбак, седзячы на беразе ракі?* (Г. Марчук).

што?

[ ], (*аб чым* ...)?

*Пальчыкі рэдкага дажджу гарэзліва абмацваюць шыбу акна, перад* ***якім*** *я працую, седзячы за вясковым сталом* (Я. Брыль).

якога?

[ ], (*перад якім* ...).



Правообладатель Национальный институт образования

Дадзеная частка, выражаная адным злучальным словам, у пазіцыі пасля галоўнай коскай не аддзяляецца: *Сяргей пайшоў і не сказаў* ***куды***.

чаго?

[ ˣ ] (*куды*).

Коскамі не выдзяляюцца ўстойлівыя выразы, якія суадносяцца з дадзенымі часткамі складаназалежных сказаў: *Але Саўка* ***як ні ў чым не бывала*** *падышоў да Максіма, прывітаўся* (Я. Колас).

**156.** Разгледзьце табліцу 2 у дадатку. Зрабіце вывад аб інтанаванні складаназалежных сказаў, звярнуўшы ўвагу на месца дададзенай часткі ў адносінах да галоўнай. Прывядзіце прыклады і пракаменціруйце адносіны паміж часткамі складаназалежных сказаў.

**157.** Прачытайце складаназалежныя сказы. Спішыце, расстаўляючы прапушчаныя знакі прыпынку і раскрываючы дужкі. Растлумачце пастаноўку знакаў прыпынку і напісанне слоў.

1. Н*(е/і)* любіць старая калі ся*(д/дз)*яць без справы *(Г. Марчук)*. 2. Каб сэрцу твайму хоць крыху паля*(г/х)*чэла апошнюю кроплю крыві я а*(д/дд)*ам *(І. Карэнда)*. 3. Тут куды н*(е/і)* зірні паўсюль узгоркі ды нізіны *(М. Бусько)*. 4. Небасхіл[сл] ра*(с/ш)*чысціўся быццам яго падмялі *(М. Даніленка)*. 5. Чароўныя вочкі-зорачкі ад погляду якіх на душы рабілася спакойна і *(т/ц)*ёпла зіха*(т/ц)*елі нейкім мяккім с*(ь/?)*вятлом *(Г. Атрошчанка)*. 6. Нягледзячы на *(т/ц)*ёплае летняе надвор*(ь/')*е лю*(д/дз)*і ведалі што н*(е/і)* за гарамі восен*(ь/?)*скія халодныя дажджы і с*(ь/?)*пяшаліся атрымаць асалоду ад кожнага жнівен*(ь/?)*скага дня *(Д. Пятровіч)*. 7. На небе з*(ь/')*явіліся чорныя хмары з якіх раптоўна пасыпаўся па*(т/ц)*еркамі град *(С. Наркевіч)*.

**158.** Спішыце, устаўляючы прапушчаныя ў словах літары і расстаўляючы неабходныя знакі прыпынку. Растлумачце напісанне слоў з устаўленымі літарамі.

1. Максім зняў пінжак і выціраючы з твар.. пот зірнуў на стромкую таполю якая расла каля будынк.. станцыі *(Я. Галубовіч)*. 2. Пачынаецца кожны дзень з той зары што загляне ўаконца *(П. Макаль)*. 3. На асфальце як на шкле танчаць кроплі *(М. Кандратаў)*. 4. Пра



Правообладатель Национальный институт образования

важную падзею ў культурным жыц..і горад.. да якой заставалася меней як месяц напісала мясцовая газета *(І. Карэнда)*. 5. Пасля абед.. калі ў навакол..і ўсё жывое заціхала прыходзіла адчуван..е вечнага спако.. *(Л. Валасюк)*. 6. У ла..чыне пад шатамі альхоўніку нібы ў ка..цы струменіць гаманкая рачулка *(М. Бусько)*. 7. Лета са свайго куфр.. выкідала дзіўныя дзянёчкі ўперамежку з цёплымі дажджамі кроплі якога дзіравілі тоўсты слой пыл.. альбо танчылі перад людзьмі *(С. Наркевіч)*.

**159.** Прачытайце тэкст. Падбярыце загаловак у адпаведнасці з асноўнай думкай.

У фондах Нацыянальнага мастацкага музея Беларусі нямала прадметаў мастацтва якія маюць не толькі еўрапейскую але і сусветную каштоўнасць. У большай ступені гэта творы жывапісу, работы як айчынных мастакоў так і прадстаўнікоў іншых краін чые карціны ў свой час былі набыты музеем.



Для беларускага мастацтва імя Язэпа Драздовіча ўнікальнае і сімвалічнае.

Сучаснікі параўноўвалі Драздовіча з Леанарда да Вінчы па ўніверсальнасці яго інтарэсаў і захапленняў. Драздовіч вывучаў гісторыю, археалогію, этнаграфію Беларусі. Ён займаўся скульптурай, графікай, жывапісам, літаратурай, выкладáў.

У 1930-я гады Язэп Драздовіч ствараў свае касмічныя серыі. Дбайна вывучаў астранамічную літаратуру ў бібліятэцы Віленскага ўніверсітэта і распрацоўваў свае тэорыі ўзаемадзеяння планет і праекты лятаючых касмічных апаратаў і ракет.

У той час лічылі што ўсе планеты заселены. Сваю задачу як мастака Драздовіч бачыў у тым каб падрабязна расказаць пра жыццё на іншых планетах. У музейнай экспазіцыі прадстаўлены дзве яго жывапісныя работы з серыі «Жыццё на Сатурне». Мастак стварае пейзажы ў якіх падрабязна паказваецца свет убачаны ва ўяўных касмічных падарожжах. Архітэктура, прырода, геаграфічныя асаблівасці на іншых планетах, адлюстраваныя аўтарам, шмат у чым нагадваюць зямныя пейзажы. У вугле карціны мастак абавязкова ставіў знак ці сімвал планеты, на адвароце дэталёва апісваў само месца.



Правообладатель Национальный институт образования

Сёння для даследчыкаў работы Язэпа Драздовіча гэта ўнікальны прыклад навуковай фантастыкі якая існавала ў беларускім мастацтве. Гэта прыклад таго як творчая асоба здольна выкарыстоўваць атрыманыя веды *(З часопіса «Беларусь»)*.

Выпішыце складаназалежныя сказы, расстаўляючы, дзе патрэбна, знакі прыпынку.

- Назавіце словы іншамоўнага паходжання, ужытыя ў тэксце.

Раскрыйце значэнне слова *ўніверсальны*. У якім значэнні ўжыта ў тэксце слова *фонды*?

Карыстаючыся дадатковай літаратурай або інтэрнэт-рэсурсамі, падрыхтуйце паведамленне пра Язэпа Драздовіча.

**160.** Спішыце прыказкі, расстаўляючы, дзе патрэбна, знакі прыпынку.

1. Не чыні другому таго што табе не міла. 2. Там дзе згода заўсёды добрая прыгода. 3. Хто не сее ў таго не расце. 4. Навошта той клад калі ў дзетках лад. 5. Чалавек пакуль у бядзе не пабудзе не знае дабра. 6. Куды вецер вее туды голле гнецца. 7. Калі не можаш памагчы то лепей памаўчы.

Растлумачце сэнс прыказак.

§ 1–12

Практ. 0–161

## Знакі прыпынку ў складаназалежных сказах з некалькімі даданымі часткамі

**161.** На аснове інфармацыі табліцы раскажыце пра віды сувязі паміж часткамі складаназалежнага сказа з некалькімі даданымі.

1. **Сузалежнае падпарадкаванне** — падпарадкаванне, пры якім усе даданыя часткі паясняюць галоўную.

Сузалежныя даданыя часткі **аднародныя,** калі ў аднолькавых адносінах паясняюць адно і тое ж слова ў галоўнай частцы або аднародныя члены сказа: *Мой беларускі народ у сваёй шматвяковай гісторыі і добразычлівых суседзяў, якіх прыемна паклікаць за гасцінны стол, і ворагаў, з якімі прыходзілася скрыжоўваць мячы* (А. Булыка).

якіх? якіх?

[... суседзяў, (*якіх* ...), ... ворагаў], (*з якімі* ...).

Даданыя часткі **неаднародныя,** калі ў розных адносінах паясняюць слова з галоўнай часткі або розныя словы галоўнай часткі: *Моладзь, якая сёння*



Правообладатель Национальный институт образования

*вучыцца ў розных установах адукацыі, павінна разумець, што ў яе руках будучае нашай краіны* (З газеты).




***Заўвага.*** Калі сузалежныя даданыя часткі звязаны спалучальнымі злучнікамі, то коскі паміж імі ставяцца, **як і пры аднародных членах сказа**: *Дзяўчына ўспамінала* ***і*** *як яны пазнаёміліся,* ***і*** *як яны не маглі нагаварыцца,* ***і*** *як яна першы раз пачула «кахаю». Люблю мой сад у маёвым ранку, як тоне ён у расістай мгле, як ліпа шэпчацца пры ганку* ***і*** *як зязюлька «ку-ку» шле* (Цётка).

2. **Паслядоўнае падпарадкаванне** — падпарадкаванне, пры якім даданыя часткі ўтвараюць ланцужок: першая адносіцца да галоўнай часткі, другая — да першай дададнай і г. д.: *Аляксей любіў лес, як можа любіць яго толькі чалавек, які, можна сказаць, вырас у лесе і адчувае сябе ў ім як дома* (І. Мележ).




3. **Змешанае падпарадкаванне** — падпарадкаванне, пры якім даданыя часткі адначасова звязваюцца сузалежным і паслядоўным падпарадкаваннем: *Я за тых пада́м свой голас, хто працуе чэсна, дбайна, хто кладзе трудоў нямала, каб жыццё закрасавала* (Я. Колас).




Практ. 161–1

**162.** Прачытайце тэкст, вызначце яго асноўную думку. Вусна ўзнавіце прапушчаныя знакі прыпынку. Выпішыце складаназалежныя сказы, пабудуйце іх схемы.

Край дзе чалавек жыў у шчаслівую пару свае маладосці дзе ў размовах і забавах ён сустракаў сапраўдную шчырасць і даверлівасць душы зычлівых і добрых сяброў у памяці паўстае ў найпрыгажэйшых колерах. Там здаецца яшчэ не скончыўся той залаты век калі чалавек не разумеў што такое нядоля і пакуты. Рэчкі там з малака і мёду. Хто ж з краёў далёкіх не сумуе па сваіх ваколіцах? Там нашы жаданні і думкі жывуць туды хацеў бы ляцець я на крылах!.. *(Паводле Я. Баршчэўскага).*



Правообладатель Национальный институт образования

**163.** Разгледзьце схемы складаназалежных сказаў з некалькімі даданымі часткамі. Раскажыце пра пастаноўку знакаў прыпынку паміж часткамі складаназалежных сказаў з некалькімі даданымі часткамі.

1. [ ], (*што* …), (*бо* …), (*як* …).

2. [ ], (*якія* …), (*якія* …) *і* (*якія* …).

3. [ ], (*што* …), *і* (*што* …), *і* (*што* …).

Коскай раздзяляюцца даданыя часткі, якія адносяцца да адной галоўнай або да папярэдняй даданай часткі: *Раніцою, **калі** гарачае летняе сонца добра ўбярэцца ў сілу, вы бачыце, **як** на травах яшчэ зіхацяць празрыстыя краплінкі расы* (А. Бачыла).

калі? што?

[ , (*калі* …), …], (*як* …).

Калі аднародныя даданыя часткі звязваюцца пры дапамозе адзіночных злучнікаў ***і***, ***ды*** (у значэнні ‘*і*’), ***або***, ***ці***, то паміж імі коска не ставіцца: *Праз пяць гадоў я зноў наведаў Вусце, прытулак дум, абраны мой куток, **дзе** высіцца Вусцянскі мой грудок **і** вецер лёгенька гайдаецца на кусце* (Я. Колас).

якія?
якія?

[ ], (*дзе* …) *і* (…).

*Люблю зямлю, **дзе** ёсць дзіцячая казка, **дзе** ёсць дзяцінства і ёсць маладосць* (А. Вярцінскі).

якую?
якую?
якую?

[ ], (*дзе* …), (*дзе* …) *і* (…).



Правообладатель Национальный институт образования

*Заўсёды трэба помніць, **што** жыццё — доўгі шлях з чараваннем радасцей і расчараванняў **і што** ў цябе хопіць сіл для пераадолення любых перашкод на гэтым шляху.*




Коскай раздзяляюцца аднародныя даданыя часткі складаназалежнага сказа, калі яны звязаны супраціўным злучнікам або паўторным злучнікам **і**: *Па словах майго сябра, вучыцца трэба ўсяму, **каб** стаць адукаваным чалавекам, **і каб** свабодна арыентавацца ў сучасным свеце, **і каб** больш ведаць самога сябе.*




Калі ў складаназалежным сказе з некалькімі даданымі часткамі побач стаяць два падпарадкавальныя злучнікі (ці злучнік і злучальнае слова), а другая частка падпарадкавальнага злучніка (***то***, ***дык***) адсутнічае, то паміж імі ставіцца коска: *Вучням паведамілі, **што**, **калі** яны прымуць удзел у канцэрце, могуць атрымаць дыплом першай ступені.*




***Заўвага.*** Коскай не раздзяляюцца падпарадкавальныя злучнікі, калі ёсць другая частка падпарадкавальнага злучніка (***дык***, ***то***). Параўн.: *Вучням паведамілі, **што калі** яны прымуць удзел у канцэрце, **то** могуць атрымаць дыплом першай ступені.*






Правообладатель Национальный институт образования

Кропкай з коскай могуць раздзяляцца разгорнутыя даданыя часткі складаназалежнага сказа, падпарадкаваныя адной і той жа частцы, пры адсутнасці паміж імі злучальнага злучніка, асабліва калі ў сярэдзіне гэтых даданых частак ёсць свае даданыя: *Быў гэткі вечар веснавы, **што** чуць было здалёк, **як** люстра возера ў цішы разбіў мой паплавок; **як**, зачапіўшыся ў бары за верхавіны дрэў, зары нягаснучай прамень над Нараччу звінеў; **як** ападалі кроплі рос на травы, на лісты; **як** сцежкай па імхах лясных падкрадвалася ты, **каб** нечакана вочы мне далонямі закрыць* (М. Танк).




**164.** Прачытайце тэкст. Да якога стылю ён належыць? Чым вызначаецца народны каляндар беларусаў? Назавіце складаназалежныя сказы, сэнсавыя адносіны паміж іх часткамі. Растлумачце пастаноўку знакаў прыпынку паміж часткамі складаназалежных сказаў.

У беларусаў спрадвеку вёўся свой каляндар. У ім з пакалення ў пакаленне занатоўваўся, перадаваўся светапогляд[c] нашага народа, яго невычэрпная фантазія, глыбокае веданне прыроды і любоў да яе. **Нашы продкі заўсёды імкнуліся зразумець хаос*, каб упарадкаваць яго.** Таму беларускі народны каляндар — гэта міфапаэтычнае ўяўленне пра час, ён упарадкоўвае, выбудоўвае ў пэўную паслядоўнасць функцыі нацыянальнага космасу. Ён сакральны*, як і паасобныя беларускія каляндарныя святы, што фіксуюць пэўны час.

**У сваю чаргу, кожнае каляндарнае свята мае сваіх дзейных асоб, і яны ў народных уяўленнях таксама набываюць рысы святасці.** Гэтымі дзейнымі асобамі раней маглі быць пэўныя боствы або легендарныя продкі, якія, як лічылася ў старажытнасці, уплывалі на жыццё людзей і да якіх звярталіся па дапамогу. Так паступова развіваўся культ святых, што ляжыць у аснове народнага календара *(З часопіса «Маладосць»).*

Складзіце схемы выдзеленых сказаў.



Правообладатель Национальный институт образования

**165.** Прачытайце тэкст. Вызначце яго тэму і стыль. Якую назву можна даць тэксту? Чаму Святы Мікалай лічыцца ў беларусаў найбольш паважаным? Выпішыце, расстаўляючы патрэбныя знакі прыпынку, спачатку складаназлучаныя сказы, потым — складаназалежныя. Пракаменціруйце пунктуацыйнае афармленне выпісаных сказаў.

Мы ўжо прызвычаіліся да сучаснай казкі пра тое што Святы Мікалай жыве ў снежнай Лапландыі якая знаходзіцца на поўначы Еўропы. Прыгожая казка. Але мала хто з нас ведае што парэшткі* Святога Мікалая захоўваюцца ў паўднёвым горадзе на беразе Адрыятыкі дзе растуць пальмы і дзе снег выпадае зрэдку. А за святочным навагоднім персанажам хаваецца жыццё рэальнага чалавека Мікалая Мірлікійскага які жыў у IV ст. н. э. у старажытным горадзе Міры Лікійскія. Культ Святога Мікалая якога яшчэ клічуць Мікалаем Цудатворцам або Мікалаем Угоднікам стаў адным з самых шанаваных на тэрыторыі Усходняй Рымскай імперыі потым Візантыі дзе ён лічыўся абаронцам вернікаў ад няверуючых. Адсюль культ святога перайшоў на старажытнарускія землі і Святы Мікалай зрабіўся любімым святым праваслаўнай царквы.

Хрысціянскія паданні сведчаць пра тое што Святы Мікалай зрабіў шмат добрых спраў. Аднак у гісторыю сусветнай культуры ён увайшоў перш за ўсё сваім знакамітым учынкам. Святы Мікалай непрыкметна падкінуў грошы ў хату дзе жыла бедная сям'я каб уратаваць яе ад галоднай смерці.

Святы Мікалай адзін з найбольш паважаных хрысціянскіх святых таксама і ў нашай краіне. Як жа ён патрапіў да нас? Пасля прыняцця хрысціянства адным з заменнікаў боства падземнага свету жывёлагадоўлі і багацця апекуна аграрнымі справамі Вялеса на нашых землях зрабіўся Мікалай Мірлікійскі празваны ў народзе Святым Міколам. Лічылася што ён спрыяе земляробам звязаны з зямнымі водамі апякуецца жывёламі пчалярствам. Згодна з беларускім культам ушанавання Святога Мікалая ён па сваёй значнасці набліжаецца да ўшанавання самога Бога.

Свята ў гонар Міколы праваслаўныя адзначаюць 22 мая і 19 снежня а каталікі — 6 снежня.

У паданнях пра цуды Святога Мікалая распаўсюджаных па ўсім свеце цвёрда гучыць думка вельмі важная для ўсіх нас. Дабро павінна здзяйсняцца не за ўзнагароды не для задавальнення асабістага самалюбства а з сапраўднай любові да блізкіх і лепш за ўсё здзяйсняць яго самому застаючыся непрыкметным і невядомым (*З часопіса «Маладосць»*).



Правообладатель Национальный институт образования

**166.** Прачытайце народныя прыкметы, звязаныя са святкаваннем дзён у гонар Святога Мікалая. Спішыце, расстаўляючы, дзе патрэбна, знакі прыпынку.

1. Колькі адзін Мікола дасць снегу столькі другі дасць травы. 2. Мікола 22 мая правае лета Мікола 19 снежня правая зіма. 3. Прыйшоў Мікола сей не пытай ні ў кога. 4. Прыпасай сена да Міколы не бойся зімы ніколі. 5. Юрый з цяплом а Мікола з кармом.

На аснове даведачнай літаратуры напішыце сачыненне-мініяцюру аб народных святах на тэму «Маё любімае народнае свята» («Свята беларускага народнага календара», «Святы вясновага (летняга, зімовага, восеньскага) цыкла», «Сямейная абраднасць беларусаў»), ужываючы складаназлучаныя і складаназалежныя сказы.

**167.** Прачытайце сказы. Спішыце, расстаўляючы знакі прыпынку і ўстаўляючы прапушчаныя літары. Пракаменціруйце пунктуацыйнае афармленне запісаных сказаў і напісанне ўстаўленых літар.

1. Не дай сабе права забыць той куток дзе зведаў пя..чоту матулі дзе першы зрабіў у жыцці сваім крок і голас твой людзі пачулі *(М. Болсун)*. 2. Паставіўшы на мурава..ую прыступку сумку ён пайшоў аглядаць сваю сядзібу якая хоць і парасла травою і зел..ем але ўсё роўна мела прыстойны выгляд *(Л. Валасюк)*. 3. Над ім кружыўся цэлы рой разгнева..ых вос якіх ён незнарок патрывожыў і ад якіх адбіваўся цяпер *(В. Макарэвіч)*. 4. Спрэчку якая вось-вось зноў магла ўспыхнуць як полымя на леташнім сушняку перапыніла Наталачка[сн] *(М. Даніленка)*. 5. Мужчыны прымоўклі ўздыхнулі. Відаць кожны прыгадаў тую веснюю і ..часлівую пару калі ты малады і сонца свеціць табе найярчэй чым каму і зоркі ўночы зіхацяць як брыл..янты і ўсё ў цябе яшчэ наперадзе... *(Ю. Зарэцкая)*. 6. А малочна-белыя аблокі нагадвалі вялікія шматкі ваты прышпіле..ыя так блі..ка да зямлі што калі забрацца на дах высокага будынка то абавя..кова схопіш п..ц..рнёй нябесны кавалак *(А. Камісарава)*. 7. У Нацыянальнай бібл..тэцы Беларусі як і ва ўсіх бібл..тэках свету найбольш старыя каштоўныя і рэ..кія выдан..і і рукапісы вылучаны з агульнага фонду ў асобны збор бо вымагаюць адмысловых умоў захаван..я і бяспекі *(Т. Рошчына)*. 8. У жыцці відаць заўсёды існуе нейкая залежнасць паміж тым што было і што ёсць *(У. Федасеенка)*.

- Выпішыце дзеепрыметнік, разбярыце слова па саставе.



Правообладатель Национальный институт образования

**168.** Утварыце з двух простых сказаў пад лічбамі 1, 2, 3, 4 складаназалежныя сказы. Бяззлучнікавыя складаныя сказы (пад лічбамі 5, 6) перабудуйце ў складаназалежныя. Сказы запішыце ў адпаведнасці з пунктуацыйнымі нормамі. Вызначце сэнсавыя адносіны паміж часткамі складаназалежных сказаў. Патлумачце пастаноўку знакаў прыпынку ў складаназалежных сказах.

1. З захапленнем перачытваю твор Я. Коласа «На ростанях». У трылогіі паказаны яркія характары і маляўнічыя палескія мясціны. 2. Брат вельмі добра валодае камп'ютарам. Праца брата звязана са сферай інфармацыйных тэхналогій. 3. Даўно хачу набыць тлумачальны слоўнік. У тлумачальным слоўніку можна знайсці значэнне любога слова. 4. Маша аддае многа часу на вывучэнне біялогіі і хіміі. Дзяўчына з дзяцінства марыць аб прафесіі ўрача. 5. Прыйдзе лета — наступіць гарачая пара для працаўнікоў сельскай гаспадаркі. 6. Сяргей быў удзячны сястры: яна дапамагла выбраць цудоўны падарунак для маці.

**169.** Дапішыце складаназалежныя сказы. Пракаменціруйце іх пунктуацыйнае афармленне.

1. Гэты дзень мне запомніцца на ўсё жыццё...
2. На школьнае свята ў гонар Дня Перамогі былі запрошаны ветэраны...
3. Заўсёды трэба думаць не толькі пра сябе, але і пра іншых...
4. Каб паспяхова здаць экзамены...
5. Ведаць правілы пунктуацыі неабходна...
6. Калі Надзея заўважыла знаёмых...

**170.** Складзіце складаназалежныя сказы па наступных схемах і запішыце:




Сфармулюйце правілы пастаноўкі знакаў прыпынку ў складаназалежных сказах, выкарыстоўваючы для прыкладаў запісаныя сказы.

Зрабіце поўны сінтаксічны разбор аднаго складаназалежнага сказа.



Правообладатель Национальный институт образования

**171.** Прачытайце тэкст. Вызначце тэму і асноўную думку тэксту. Падбярыце загаловак.

У кожнага чалавека апроч вялікай Бацькаўшчыны — краіны з якой звязана яго жыццё ёсць і малая радзіма — месца паселішча дзе ён нарадзіўся. У старадаўнія часы людзі атаясамлівалі сябе перш за ўсё з вёскай мястэчкам дзе яны нарадзіліся адкуль паходзіла іх сям'я. Захоўваючы памяць пра сваіх продкаў, пра свой род на некалькі пакаленняў у мінулым, яны імкнуліся пакінуць нашчадкам і гісторыю свайго роднага кутка. А калі вобразы тых ці іншых падзей раствараліся ў прыцемках далёкіх часоў, то абавязкова спрабавалі самастойна **тлумачыць** тую або іншую з'яву. Так з'яўляліся легенды пра паходжанне розных населеных пунктаў *(Паводле І. Аўласенкі)*.

Выпішыце складаназалежныя сказы з некалькімі даданымі часткамі, расстаўляючы, дзе патрэбна, знакі прыпынку. Пракаменціруйце пастаноўку знакаў прыпынку.

Назавіце кантэкстуальныя антонімы.

Практ. 171–1

**172.** Прачытайце, вызначце тэму і асноўную думку тэксту. Падбярыце загаловак.

Міхась вельмі любіў сваіх бацькоў. Нават ненадоўга ад'язджаючы кудысь ён заўсёды тэлефанаваў маці хаця сустракаліся яны не так часта як хацелася б. Як і любы дарослы чалавек, ён амаль не меў вольнага часу, выходзіў з дому яшчэ на ранку, а вяртаўся позна, калі ўсе спалі. У ягонай душы з года ў год расло адчуванне што жыццё нясецца стралою што яно хутка робіць дзяцей дарослымі а дарослых — старымі. А людзі ў гэтай гонцы нічога не заўважаюць: няма часу прыпыніцца, перавесці дух, азірнуцца назад. Міхась добра памятаў сваіх бацькоў, калі ім было па трыццаць гадоў. І цяпер ён здзіўляецца што ім ужо па шэсцьдзясят што гады так хутка праляцелі. Але яму самому амаль сорак, расце сын, а на галаве яго бацькі ўжо ляжыць, не растаючы, снег... Міхасю вельмі хацелася б спыніць гэты бязлітасны час, але... *(Паводле Д. Пятровіча)*.

Выпішыце складаназалежныя сказы з некалькімі даданымі часткамі, расстаўляючы, дзе патрэбна, знакі прыпынку.

- Выпішыце з тэксту лічэбнікі, праскланяйце іх.

Растлумачце выраз *перавесці дух*.

§ 12–1

**173.** Напішыце невялікае сачыненне-разважанне «Любоў да бацькоў (Бацькаўшчыны)».



Правообладатель Национальный институт образования

# § 13. Правілы пабудовы бяззлучнікавых складаных сказаў, знакі прыпынку

§ 0–13

**174.** Сэнсавыя адносіны паміж часткамі ў складаным бяззлучнікавым сказе абумоўліваюць выбар знака прыпынку. Праілюструйце сэнсавыя адносіны паміж часткамі, выпісаўшы з прапанаваных сказаў адпаведныя. Пракаменціруйце пастаноўку знакаў прыпынку ў сказах.

| Знак прыпынку ў складаным бяззлучнікавым сказе | Сэнсавыя адносіны паміж часткамі |
|---|---|
| Коска, кропка з коскай | Пералічэнне, адначасовасць або паслядоўнасць дзеянняў |
| Двукроп'е | Прычына, тлумачэнне, дапаўненне, абагульненне |
| Працяжнік | Супастаўленне, супрацьпастаўленне, вынік, абагульненне, параўнанне |

Узор каментарыя: *Над густа-сінім возерам чарот з прыходам восені шуміць тужліва; здаволена гумно на поўны рот глытае дар багатай, спелай нівы* (У. Караткевіч). Складаны бяззлучнікавы сказ, складаецца з дзвюх частак. Першая частка — *Над густа-сінім возерам чарот з прыходам восені шуміць тужліва.* Граматычная аснова — *чарот шуміць*. Другая частка — *здаволена гумно на поўны рот глытае дар багатай, спелай нівы.* Граматычная аснова — *гумно глытае*.

Часткі сказа называюць з'явы, якія адбываюцца адначасова (паміж імі можна ўставіць злучнік *і*). Паміж часткамі ставіцца кропка з коскай, паколькі часткі развітыя, не маюць цеснай сэнсавай сувязі паміж сабой, другая частка мае свой знак прыпынку — коску паміж аднароднымі азначэннямі.

1. Ноч свяціла агнямі і зорамі: нарадзіўся Янка Купала. 2. Ты — мая лясная казка ў красе доўгачаканай, ты — мая святая песня. 3. Месяц заснуў на коміне хаты, кінуў адбіткі на люстра вады; дрэвы густыя ў бліскучых ла́тах, як вартавыя, вартуюць сады. 4. Ноч прыйшла да зямлі на спатканне, захад скончыў агнём палыхаць, дубы ў малочным тумане веліканамі ціха стаяць. 5. Свет вакол чакае святла і цеплыні: чакае дуб скарэлы на пагорку, чакаюць хаты сонечных прамянёў, чакаюць вішні белых пакрывалаў. 6. Зямля гудзе, як цёплы вулей, знікаюць крыўды, боль і зло. 7. Зноў бранзавеюць шышкі на ялінах, зноў восень на бярэзніках ляжыць. 8. У вяршыні самых гонкіх дрэў маланка з неба б'е — у вяршыні маленькіх і ніцых



Правообладатель Национальный институт образования

дрэў маланка ніколі не б'е. 9. Уздыхае ветрык, спадае ліст, асцярожнае сонца з голых асін выпаўзае на ціхі сінічы свіст *(У. Караткевіч)*.

● На аснове сказаў падбярыце матэрыял для арфаграфічнай дыктоўкі на правіла «Правапіс галосных ***е, ё, я***». Дапоўніце выпісаныя словы прыкладамі на захаванне пачатковай літары ***я*** ў корані слоў, на правапіс ***я*** ў паслянаціскных складах.

**175.** Выкарыстаўшы граматычныя асновы сказаў з папярэдняга практыкавання (3-4 на выбар), пабудуйце па тры бяззлучнікавыя сказы, каб у першым выпадку паміж часткамі трэба было паставіць коску, у другім — двукроп'е, у трэцім — працяжнік.

Узор: *Знікаюць крыўды, боль і зло...*
*Знікаюць крыўды, боль і зло, свет напаўняюць людскасць і дабрыня.*
*Знікаюць крыўды, боль і зло: людзі пачалі прыслухоўвацца адзін да аднаго.*
*Знікаюць крыўды, боль і зло — свет прачнуўся і памаладзеў.*

**176.** Запішыце сказы, выправіўшы сінтаксічныя памылкі, дапушчаныя ў складаных сказах. Растлумачце прычыны парушэнняў сінтаксічных норм.

1. Сёння ідзе не толькі дождж, але і, відаць, будзе навальніца. 2. Газіфікацыю аддаленых[сл] вёсак трэба завяршыць, якая пачалася яшчэ ў 70-я гады мінулага стагоддзя. 3. Гісторыя не толькі ўплывае на літаратуру, але і літаратура ўплывае на гісторыю. 4. Набягалі то невялікія хмаркі, то зноў з'яўлялася сонца. 5. На жаль, часам мы або забываем пра сяброў, або сябры забываюць пра нас. 6. Слова — вялікая сіла, таму што слова можа аб'яднаць людзей і раз'яднаць. 7. Жыццё героя — гэта гісторыя чалавека, моцнага духам і які годна выступае ад імя свайго пакалення. 8. Аб гэтым вы можаце прачытаць у матэрыялах нашага карэспандэнта, які з'явіцца ў суботнім выпуску газеты. 9. Галоўнае, чаго чакалі ад маладога інжынера, — гэта рэканструкцыю прадпрыемства. 10. Вершы прасякнуты шчырай павагай да селяніна, у якіх расказваецца пра цяжкую, але такую неабходную вясковую працу. 11. Гутарковы стыль мае свае асаблівасці, куды адносяцца непаўната выказвання, ужыванне выклічнікаў, варыянтнасць у вымаўленні. 12. Мы спыніліся на Ушаччыне, дзе шмат азёр і вада ў якіх вельмі чыстая *(З вучнёўскіх работ)*.

● Запішыце асабовыя назоўнікі, ужытыя ў сказах. Вызначце іх склон. Растлумачце правапіс канчаткаў.



Правообладатель Национальный институт образования

Паміж часткамі бяззлучнікавага складанага сказа ставяцца коска, кропка з коскай, двукроп'е, працяжнік.

Коскай раздзяляюцца раўназначныя, аднатыпныя часткі бяззлучнікавага складанага сказа, у якіх паведамляецца пра падзеі і з'явы, што адбываюцца адначасова або паслядоўна, і якія па сэнсе цесна звязаны паміж сабой: *Жыццё — самы адказны экзамен, яго ніяк не абмінеш* (Ю. Свірка). [ ], [ ]; *Бралася вясна, цяплела, па злізаных сонцам ледзяных каляінах беглі ручаі* (А. Кудравец). [ ], [ ], [ ].

Кропка з коскай ставіцца паміж адносна незалежнымі часткамі бяззлучнікавага складанага сказа, калі яны разгорнутыя і (або) маюць свае знакі прыпынку: *Духмянасцю лета дыхне і жоўтаю поўняй начною; маланкі гарачы свой гнеў астудзяць вадой дажджавою* (В. Ярац). [ ]; [ ]; *Іх* [*рукі маці*] *цалавала зямля сваімі пясчанымі вуснамі і каласамі; неба спякотай, вятрамі, дажджамі іх цалавала* (М. Танк). [ ]; [ ].

Кропкай з коскай раздзяляюцца групы адносна незалежных састаўных частак бяззлучнікавага складанага сказа: *Рака кірунак здольна павярнуць, вярнуцца можа, круг зрабіўшы, вецер; сады, вясной адцвіўшы, зацвітуць, на ноч зайшоўшы, сонца зноў засвеціць* (А. Бачыла). [ ], [ ]; [ ], [ ]; *Ёсць на свеце роднае мястэчка, там штогод бываюць кірмашы; міма школы маленькая рэчка без мяне адна плыве ў цішы* (А. Куляшоў). [ ], [ ]; [ ].

Паміж часткамі бяззлучнікавага складанага сказа ставіцца двукроп'е, калі:

- у другой частцы (або ў некалькіх наступных) раскрываецца змест, даецца паясненне таго, пра што гаворыцца ў першай частцы: *І неспадзявана адбылося незвычайнае: ціхая, нявідная, у жніўеньскім росквіце рабіна заружавела, зазырчэла яркім, кідкім хараством, гарачым полымем агністых гронак* (І. Мележ). [ ]: [ ]; *Стаяла прадвесне на дварэ: быў сакавік* (М. Стральцоў). [ ]: [ ]; *Раніца была цудоўная: неба без аблачынкі, зіхацелі мокрыя газоны, успыхвалі блікамі вокны* (І. Клімянкоў). [ ]: [ ], [ ], [ ];
- у другой частцы (або ў некалькіх наступных) указваецца прычына таго, пра што гаворыцца ў першай: *Магчыма, не ўбачымся болей: выпадак — наш гаспадар* (А. Вярцінскі). [ ]: [ ];



Правообладатель Национальный институт образования

*Чаканне было доўгім: Алена затрымлівалася на дзве гадзіны.* [ ]: [ ];

- першая частка заканчваецца дзеясловамі *бачыць, глядзець, разглядзецца, чуць, адчуць, адчуваць, заўважыць, зразумець, разумець, ведаць, верыць, казаць* і інш. (або іх можна ўставіць): *Я думаў: гэта сон прысніўся мне* (М. Танк). [ ]: [ ]; *Неўзабаве, расплюшчыўшы вочы, Міхась павярнуў галаву налева: доўгі хвост цягніка, як вусень, цягнецца ўперадзе* (Д. Пятровіч). [ ]: [ ];
- першая частка з'яўляецца абагульняльнай у адносінах да наступных: *Звыклыя гукі напоўнілі лясныя гушчары: у галлі заварушылася сонная птаха, піскнуў заяц, бязгучна мільгануў кажан* (М. Лынькоў). [ ]: [ ], [ ], [ ].

Працяжнік ставіцца паміж часткамі бяззлучнікавага складанага сказа, калі:

- у першай з іх указваецца на ўмову або час дзеяння, пра што паведамляецца ў другой: *Ветразь ёсць — плыві!* (А. Вярцінскі). [ ] — [ ]!; *Хай пойдзе суткі цёплы дождж — папараць зазелянее, пусціцца ў рост і дагоніць маладыя сасняк* (І. Пташнікаў). [ ] — [ ];
- у другой частцы паказваецца вынік або робіцца вывад з таго, пра што паведамляецца ў першай: *Зайграла музыка — дзяўчаты павесялелі.* [ ] — [ ];
- змест частак супрацьпастаўляецца або супастаўляецца: *Пойдзе рэха направа — не прабіцца праз травы* (К. Кірэенка). [ ] — [ ]; *Удачы не было — была ўзнагарода за цярплівасць* (М. Стральцоў). [ ] — [ ];
- у сказе гаворыцца пра хуткую змену падзей або ў другой частцы паказваецца неадпаведнасць, нечаканы вынік таго, пра што паведамляецца ў першай: *Бусел узмахнуў крыламі — праз хвіліну ў небе была толькі белая кропка.* [ ] — [ ];
- апошняя частка ў адносінах да папярэдніх з'яўляецца абагульняльнай: *Дол засланы шышкамі, цвіце сунічнік, брусьнічнік, перагукваюцца птушкі, звіняць камары — усё тут знаёмае...* (І. Навуменка). [ ], [ ], [ ], [ ] — [ ]...;
- другая частка з'яўляецца параўнаннем у адносінах да першай: *Дзяўчына ідзе — лебедзь плыве.* [ ] — [ ].



Правообладатель Национальный институт образования

**177.** Разгледзьце табліцу 3 у дадатку. Раскажыце аб інтанацыйным афармленні бяззлучнікавых складаных сказаў, паміж часткамі якіх ставіцца коска, кропка з коскай, двукроп'е, працяжнік. Звярніце ўвагу на сэнсавыя адносіны паміж часткамі.

**178.** Прачытайце тэкст. Вызначце яго стыль. Чаму, на вашу думку, у тэкстах такога стылю выкарыстоўваецца вялікая колькасць бяззлучнікавых складаных сказаў? Назавіце іх. Якія сэнсавыя адносіны выражаюцца паміж часткамі складаназалежных і бяззлучнікавых складаных сказаў з тэксту? З якой інтанацыяй вымаўляюцца бяззлучнікавыя складаныя сказы? Растлумачце пастаноўку знакаў прыпынку паміж часткамі названых сказаў.

### Луўр

Луўр — агромністы музейны комплекс з будынкаў, спалучаных між сабой; даўжыня іх фасадаў складае 14,5 км. **Яшчэ раней у розных альбомах даводзілася бачыць шкляную піраміду, што стаіць ва ўнутраным двары Луўра, на музейнай плошчы.** Заўжды дзівілася: навошта сярод збудаванняў рэнесансу і класіцызму архітэктура іншага стылю? Піраміда прыгожая, але тут яна не да месца!

**Тлумачэнне аказалася надзвычай простае: праз такое архітэктурнае прыстасаванне няспынны натоўп турыстаў праходзіць у славуты музей, спускаецца па адным з эскалатараў.** З чатырох моў — англійскай, французскай, іспанскай, нямецкай — турыст выбірае мову схемы, дзе згадваецца інфармацыя пра тое, якія шэдэўры на якім паверсе знаходзяцца. І нарэшце выбірае адзін з чатырох напрамкаў — захад, усход, поўнач, поўдзень.

Экспазіцыя размешчана на чатырох паверхах: спачатку ідзе так званы «мінус першы», пасля ідуць цокальны, першы і другі. Кожны паверх адпавядае пэўнаму гістарычнаму перыяду. Пры ўваходзе —





Правообладатель Национальный институт образования

незлічоная колькасць друкаванай прадукцыі на розных мовах рознага фармату і рознай ступені грунтоўнасці. З вокладак ці не ўсіх выданняў загадкава ўсміхаецца Джаконда... Знакамітая карціна Леанарда да Вінчы — знак, сімвал. Мастацкі брэнд менавіта Луўра *(Паводле Т. Мушынскай)*.

- Складзіце схемы выдзеленых сказаў.

Раскрыйце значэнні слоў *эскалатар, цокальны*.

Карыстаючыся дадатковай літаратурай або інтэрнэт-рэсурсамі, падрыхтуйце паведамленне пра Луўр або вядомы экспанат, які знаходзіцца ў Луўры.

**179.** Прачытайце. Спішыце сказы, расстаўляючы знакі прыпынку ў адпаведнасці з пунктуацыйнымі нормамі. Патлумачце пастаноўку знакаў прыпынку.

1. Не памыляўся маладым не быў *(М. Чарняўскі)*. 2. Іду па Нямізе. Нямігі няма глыбока ў бетоне булькоча рачулка *(С. Грахоўскі)*. 3. Свет зіхаціць вясноваю красой да слёз кранае росная былінка! *(У. Карызна)*. 4. Вучоныя падлічылі на тэрыторыі Беларусі агульныя запасы падземнай[с] прэснай вады складаюць 16-18 мільярдаў кубічных метраў *(У. Ягоўдзік)*. 5. Так і ў жыцці бягуць часіны ліхія добрыя хвіліны адна змяняецца другою *(Я. Колас)*. 6. Жыве зямля сваім жыццём бясконцым шумяць лясы цвітуць сады наўсцяж *(Л. Галубовіч)*.

**180.** Прачытайце сказы. Спішыце, расстаўляючы знакі прыпынку паводле пунктуацыйных норм і раскрываючы дужкі. Пракаменціруйце пастаноўку знакаў прыпынку і напісанне слоў.

1. Неба *(не)*чакана зрабілася насупленым[с] сталі зацягваць яго *(цёмна)*шэрыя аблачыны *(М. Бусько)*. 2. Ён зірнуў на гадзі*(н/нн)*ік палова восьмай *(Г. Пярун)*. 3. Вечарам на траве выпала раса. У мален*(ь/?)*кіх кропел*(ь/?)*ках віл*(ь/?)*гаці зіхацелі промні сонца яно ўжо асела на верхавінах хвой *(У. Гаўрыловіч)*. 4. Воз*(ь/?)*меш у рукі паленца з*(ь/?)*верху белай празрыстай лупінкай цягнецца бяроста *(К. Камейша)*. 5. Яўгенія з*(ь/?)*дзівілася гэтаму звычайна дачка *(не)*ахвотна ішла да чужых людзей *(М. Даніленка)*. 6. Грэла сонца цяплела паветра прылятали кнігаўкі *(Л. Валасюк)*. 7. Сказала зробіць *(І. Карэнда)*. 8. Прыгледз*(ь/?)*цеся да навако*(л/лл)*я кожная травінка кожная мурашачка маюць сваё прызначэ*(н/нн)*е і свой век *(Л. Арабей)*. 9. На траўцы збіраецца ў буйныя кроплі раса цераз верх запаўняюцца лугавыя плёсы туманам *(У. Федасеенка)*.



Правообладатель Национальный институт образования

**181.** Прачытайце. Спішыце сказы, раскрываючы дужкі. Пастаўце знакі прыпынку. Пракаменціруйце пастаноўку знакаў прыпынку і напісанне слоў.

1. Сонца ўжо садзілася доўгія цені ўпалі ад будынка *(М. Даніленка)*. 2. У Мінск прыехалі а 17-й гадзіне. Пазваніў на работу ўжо нікога не было *(У. Дамашэвіч)*. 3. Люты лютаваў мяла мяцеліца дзень і ноч сыпаў снег *(Г. Васілеўская)*. 4. *(Па)*абапал сцяжыны цвілі кветкі над імі гудзелі пчолы лятались матылі *(Я. Галубовіч)*. 5. Катку жарты мышцы смерць *(Прыказка)*. 6. Але ўсё ў гэтым жыцці цячэ ўсё мяняецца *(Ю. Зарэцкая)*. 7. Мусіць толькі тады Ларыса Іванаўна і зразумела *(н..)*лёгкі груз узваліла яна на свае плечы *(М. Даніленка)*. 8. З даліны *(н..)*згледзіш *(н..)*чога ўгору *(н..)*стомна імкні *(У. Мароз)*. 9. Услала пажоўклае лісце дарогі буслам ужо Афрыка цёплая сніцца *(П. Панчанка)*. 10. Потым радасна ўсміхаючыся прыслухалася ў двары ўсё яшчэ раздаваліся глухія ўдары сякеры ён калоў дровы *(Я. Каршукоў)*. 11. А жыта ў той час радзіла шчодра ў чалавечы рост наліваліся каласы *(У. Ягоўдзік)*.

**182.** Ад прапанаваных простых, складаназлучаных і складаназалежных сказаў утварыце і запішыце бяззлучнікавыя складаныя сказы.

1. Праляцеў месяц. Скончыўся адпачынак. 2. Не давалі спакою нейкія турботы. Юрасю не сядзелася на месцы. 3. Цэлыя суткі ішоў снег — і дрэвы апрануліся ў прыгожае белае футра. 4. Закончыўся рабочы дзень — і ўсе заспяшаліся дадому. 5. Калі паглядзіш на некаторыя палотны Н. Шчаснай з розных ракурсаў, то ўбачыш некалькі розных карцін у адной. 6. Сцяпан Антонавіч адмяніў сустрэчу з сябрам, бо ад калег ён чакаў важнага званка.

Зачытайце ўтвораныя сказы з адпаведнай інтанацыяй. Сфармулюйце правілы, якімі карысталіся пры пунктуацыйным афармленні сказаў.

**183.** Прачытайце бяззлучнікавыя складаныя сказы. На што паказваюць знакі прыпынку ў іх? Перабудуйце бяззлучнікавыя складаныя сказы ў складаназлучаныя і складаназалежныя. Што дапамагло вызначыць сэнсавыя адносіны для ўтварэння складаназлучаных і складаназалежных сказаў?

1. Сонца падымалася вышэй — пад яго цёплымі промнямі выпаралася раса. 2. Возера вызвалілася ад ільду — вада зазіхацела серабрыстым люстэркам. 3. Заплюшчыш вочы — адразу паўстаюць родныя мясціны. 4. Рашаць пытанне падвозу прадуктаў у вёску трэба было



Правообладатель Национальный институт образования

тэрмінова: магазін знаходзіўся ад яе за пяць кіламетраў. 5. Заключны канцэрт перанеслі на месяц пазней: яго ўдзельнікі збіраліся як мага лепш падрыхтавацца да святкавання юбілею школы. 6. З суседзямі трэба жыць у згодзе: часам толькі яны могуць дапамагчы ў бядзе.

**184.** Складзіце бяззлучнікавыя складаныя сказы на тэму «Свет маіх захапленняў» па наступных схемах:

1. [ ], [ ].
2. [ ]: [ ].
3. [ ] — [ ].
4. [ ], [ ] — [ ].

Сфармулюйце пунктуацыйныя правілы, па якіх аформлены сказы.

**185.** Прачытайце тэкст. Падбярыце загаловак у адпаведнасці з тэмай.

Ужо ў XIV—XV стагоддзях у Вялікім Княстве Літоўскім практычна ўсе прадстаўнікі феадалаў і шляхты неслі вайсковую службу.

Калі краіне пагражалі ворагі (а іх у тыя часы было нямала), тагачасныя законы Вялікага Княства Літоўскага абавязвалі кожнага мужчыну, які дасягнуў 16-гадовага ўзросту, нягледзячы на яго паходжанне, браць удзел у вайсковым паходзе. Але толькі шляхта лічыла сваім прафесійным прыярытэтам вайсковую службу амаль кожны шляхціц быў воінам. Рыцарскім *ідэалам* была добрая фізічная падрыхтоўка адпаведнае выхаванне атрымлівалі шляхецкія дзеці. Нават дзеці вялікіх князёў ужо ў 12 гадоў неслі службу ў войску. З такога ранняга ўзросту і да сталага веку беларускія шляхціцы павінны былі дасканала валодаць *кап’ём*, шабляй і двухручным мячом, умець ездзіць верхам, страляць з лука на поўным скаку. Для іх ладзілася нешта накшталт сучасных летніх вайсковых збораў. Шляхціцы практыкаваліся ў начных ска́чках па перасечанай мясцовасці на адлегласць да 20 кіламетраў, у пераправах разам з *коньмі* праз рэкі.

Такім чынам, шляхціц мусіў заўсёды быць гатовым абараніць гонар сваёй краіны ён не меў маральнага права адмовіцца выканаць гэта Богам асвечанае прызначэнне (*Паводле І. Клімковіч*).

Выпішыце бяззлучнікавыя складаныя сказы, расстаўляючы прапушчаныя знакі прыпынку.

● Растлумачце напісанне выдзеленых слоў.

Раскрыйце значэнні слоў *прыярытэт, ідэал*.



Правообладатель Национальный институт образования

**186.** Устанавіце адпаведнасць паміж фразеалагізмамі і іх значэннямі.

| | |
|---|---|
| 1) рыцар без страху і дакору | а) адкрыта, не тоячыся |
| 2) рыцар журботнага вобраза | б) слабавольны чалавек |
| 3) рыцар на час | в) з перамогай, пераможцам (з'явіцца) |
| 4) рыцар ночы | г) наіўны, бясплённы летуценнік |
| 5) з адкрытым забралам | д) смелы, велікадушны чалавек |
| 6) са шчытом | е) злосны вораг прагрэсу; цемрашал |

**187.** Карыстаючыся дадатковай літаратурай або інтэрнэт-рэсурсамі, падрыхтуйце паведамленне пра гістарычныя рэканструкцыі рыцарскіх турніраў.

**188.** Аформіце адзін і той жа бяззлучнікавы складаны сказ рознымі знакамі прыпынку паводле схем:

Прыходзіць вясна разліваюцца рэкі (*А. Вярцінскі*).

1. [ ], [ ].
2. [ ] — [ ].

Я нічога не адказаў мой настрой сапсаваўся (*А. Карпюк*).

1. [ ], [ ].
2. [ ]: [ ].
3. [ ] — [ ].

Параўнайце сказы з варыянтнымі знакамі прыпынку. Якія сэнсавыя і інтанацыйныя адрозненні вы заўважылі?

**189.** Напішыце эсэ на тэму «Праблема вольнага часу ў нашы дні», ужываючы бяззлучнікавыя складаныя сказы.

**190.** З прапанаваных варыянтаў выберыце правільныя. Растлумачце памылковасць астатніх.

1. У складаны сказ уваходзяць дзве і больш частак.
2. Паміж часткамі складанага сказа існуе злучальная, падпарадкавальная і бяззлучнікавая сувязь.
3. Часткі складанага сказа звязваюцца злучальнымі і падпарадкавальнымі злучнікамі, злучальнымі словамі і інтанацыяй.
4. Складаныя сказы бываюць злучнікавымі і з рознымі відамі сувязі.



Правообладатель Национальный институт образования

5. У залежнасці ад віду сувязі складаныя сказы бываюць злучнікавыя і складаназалежныя.

6. Сродкамі выражэння адносін паміж часткамі складаназлучанага сказа з'яўляюцца злучальныя злучнікі і інтанацыя.

7. Злучальныя словы не з'яўляюцца членамі сказа.

8. Злучнікі з'яўляюцца членамі сказа.

9. Часткі ў складаназлучаным сказе звязваюцца пры дапамозе злучальных слоў.

§ 13–1

§ 0–14

Практ. 0–191–5–191

## § 14. Правілы пабудовы складаных сказаў з рознымі відамі сувязі частак, знакі прыпынку

**191.** Прачытайце тэкст. Вызначце яго тэму і асноўную думку.

Калі творыцца незвычайны цуд прыроды, калі сонца з маленькай няяркай кацёлачкі вырастае ў вялікае кола, а потым выліваецца ў акіян святла, то ў гэтым акіяне пачынаюць перамаўляцца самыя яркія колеры і адценні боскага хараства, і звычайныя вочы ад яго тут жа слепнуць і многага, вельмі многага не здольны бачыць. Сапраўдны мастак мае шчасце пазбегнуць гэтай слепаты і ўбачыць нават больш, чым можа ўзнагародзіць яго прырода. Але ўбачыць — гэта адно, трэба перадаць яго і мне, аслепламу. Каб мы абодва не страцілі таго хараства! *(Паводле К. Камейшы)*.

Назавіце складаны сказ з рознымі відамі сувязі частак. Растлумачце пастаноўку знакаў прыпынку ў ім.

Дапоўніце сказ.

У складаных сказах з рознымі відамі сувязі знакі прыпынку ставяцца паводле правіл пастаноўкі знакаў прыпынку ў … .

Знакі прыпынку ў складаных сказах з рознымі відамі сувязі частак (у залежнасці ад відаў сувязі паміж састаўнымі часткамі) ставяцца ў адпаведнасці з правіламі пастаноўкі знакаў прыпынку ў складаназлучаных, складаназалежных і бяззлучнікавых складаных сказах: *Зацяжныя дажджы з лістападамі: уздыхнеш — **і** ў акне вітражы* (С. Панізнік). [ ]: [ ] — і [ ]; *Шуміць авёс, звініць ячмень, **і** верыш ты ахвотна, **што** каласы цалюткі дзень красуюць бесклапотна* (А. Куляшоў).



Правообладатель Национальный институт образования

у што?

[ ], [ ], *і* [ ], (*што* ...).

Калі ў складаным сказе з рознымі відамі сувязі частак побач знаходзяцца злучальны і падпарадкавальны злучнікі, то паміж злучнікамі ставіцца коска пры адсутнасці другой часткі падпарадкавальнага злучніка: *Андрэй быў у гэтым горадзе ўпершыню, **але, калі** сустрэчныя запыталі пра вуліцу Прыгожую, ён адразу паказаў патрэбны напрамак.*

калі?

[ ], *але*, (*калі* ...), [ ].

***Заўвага 1.*** Пры наяўнасці другой часткі падпарадкавальнага злучніка паміж злучальным і падпарадкавальным злучнікамі коска не ставіцца. Параўн.: *Андрэй быў у гэтым горадзе ўпершыню, **але калі** сустрэчныя запыталі пра вуліцу Прыгожую, **то** ён адразу паказаў патрэбны напрамак.*

калі?

[ ], *але* (*калі* ...), [*то* ...].

***Заўвага 2.*** Коска ў складаным сказе з рознымі відамі сувязі частак не ставіцца перад злучнікамі ***і, ды*** (у значэнні *'і'*), ***або, ці***, што звязваюць дзве галоўныя часткі, да якіх адносіцца агульная даданая частка: ***Калі** наступае глыбокая восень, над зямлёй нізка сцелецца туман **або** імжыць дробны дождж* (К. Чорны).

калі? у які час?

калі? у які час?

(*калі* ...), [ ] *або* [ ].

**192.** Прачытайце ўспаміны пісьменнікаў пра І. Мележа. Назавіце складаныя сказы з рознымі відамі сувязі частак. У тэксце І растлумачце пастаноўку знакаў прыпынку паміж часткамі складаназалежнага сказа і ў складаных сказах з рознымі відамі сувязі частак. З тэксту ІІ выпішыце выдзеленыя сказы, афармляючы



Правообладатель Национальный институт образования

іх у адпаведнасці з пунктуацыйнымі нормамі. Пракаменціруйце пунктуацыйнае афармленне выпісаных сказаў.

**I.** Ён [Мележ] якраз многа і ахвотна гаварыў пра ненапісанае, пра тое, што думае пісаць, расказваў і сюжэт, і схему развіцця характараў...

Калі я чытаў няскончаныя раздзелы і рабочыя запісы — «з творчай лабараторыі» — да рамана «Завеі. Снежань», да другой яго часткі, якія засталіся пасля смерці пісьменніка, то прыгадваў: шмат што з таго, што занатавана Мележам на палях — куды павярнуць сюжэт, як раскрыць сітуацыю, якім чынам развіваць характар героя, — я чуў з яго вусных расказаў. І што асабліва здзіўляе: многія задумкі трэцяй кнігі, якая засталася недапісанай, чуў я даўно, можа, дзясятак гадоў назад, калі Іван Паўлавіч працаваў яшчэ над «Подыхам навальніцы» *(І. Шамякін)*.

**II.** Затое мне знаёмы быў клопат з назвамі твораў. І ўдзень і ўночы; і ў сне і наяве. Беспярэстанку яны варушацца і кіпяць у галаве. То паяўляюцца і знікаюць, то перайначваюцца, кожны раз набываючы іншую акрасу.

У Мележа іх было некалькі[м] спіскаў. «Палеская хроніка» яшчэ была толькі задумана, а назвы ўжо прыдумляліся. **Адна з першых была «Людзі на балоце» прызнаюся яна мне не вельмі падабалася не хацелася каб эмацыянальна людзей заценьвала балота якое ў маёй біяграфіі[ф] вельмі ж далося ў знакі.** Потым ішлі назвы з характарыстыкаю Палесся: «Туманы над багнаю», «Навальніца над полем». У розным спалучэнні вар'іраваліся словы з такімі сімваламі, як «бераг», «асака», «раска», «завеі». Напрыклад, «За асакою бераг». Безліч розных прымернікаў. Як відаць, назвы рабіліся з запасам на ўвесь цыкл «Хронікі», бо «Подыхам навальніцы» назваўся потым другі том, «Завеі» дасталіся трэцяму[м], праўда, з дадаткам адзнакі часу: «Завеі. Снежань».

Першы том аставаўся без канчатковай назвы да самай апошняй хвіліны. Толькі перад здачаю рамана ў набор, пасля пакутлівых ваганняў Мележ напісаў на тытульнай старонцы: «Людзі на балоце». **І раптам лёгка ўздыхнуў супакоіўшы сябе філасофскаю пігулкаю* што калі будзе добрая кніга то да назвы адразу прывыкнецца** *(Я. Скрыган)*.

**193.** Прачытайце сказы. Спішыце, устаўляючы прапушчаныя літары і расстаўляючы, дзе патрэбна, знакі прыпынку. Патлумачце пунктуацыйнае афармленне запісаных сказаў і напісанне слоў з устаўленымі літарамі.



Правообладатель Национальный институт образования

1. Сн..гі ад..шлі і сплылі ледаходы[сл] з..млю ажывіла пара веснавая *(М. Дукса)*. 2. Яшчэ с..юдзянела зорнымі начамі яшчэ белыя сн..гі дымілі над чорнымі асфальтавымі дарогамі ды ўсё час..ей накачвала на чалавека радасць і павес..лелымі вачыма гля..еў ён вакол сябе і позірк сам падымаўся ўгару да высокіх лё..кіх аблачын між якіх сл..піла вочы белае сонца *(В. Гігевіч)*. 3. Час..ей сонца п..чэ некалькі гадзін запар а потым у лічаныя хвіліны пахмурнее і калі не пачынаецца дождж дык вецер ужо не дае забыцца на хуткае набліжэн..е восені[сн] *(А. Камісарава)*. 4. Як матылькі вакол кветак трапяталі лісточкі асінак ледзь чутна шапацелі маладыя бярозкі а высокія сосны нібы супакойвалі іх *(У. Федасеенка)*. 5. За дзень [Засінец] сходзіць два-тры разы на баравіны нацягае грыбоў столькі што жонка не можа даць ім рады яны сушацца і на сподзе печы і на чарэні* на нізках каля цёплага коміна *(І. Капыловіч)*. 6. Родным не стаў мне гора.. шчасце маё і радасць там дзе матулін падворак *(І. Карэнда)*. 7. Па ні..кіх размытых паводкай берагах затока зарасла сінімі касачамі з вады вытыркаліся жо..тыя збаночкі і красаваліся белыя лілііі *(У. Гніламедаў)*. 8. Ішла ноч зоры мі..целі ў сінім небе а калі выплываў з-за воблака месяц яны бляднелі *(Б. Мікуліч)*.

**194.** Прачытайце. Зрабіце пераклад тэксту на беларускую мову, расстаўце, дзе неабходна, знакі прыпынку. Назавіце складаныя сказы з рознымі відамі сувязі частак. Запішыце 3 складаныя сказы гэтага тыпу, ужыўшы фразеалагізм *на сёмым небе*.

В современной разговорной речи нередко можно встретить выражение «быть на седьмом небе» означающее крайнюю степень восторга счастья радости и никто из нас вероятно не задумывается над его первоначальным смыслом. Точно так же употребляя привычное с детства слово «небеса» мало кто обращает внимание на то что оно представляет собой форму множественного числа от слова «небо». Никому не приходит в голову удивиться почему небо вдруг представляется множественным. Между тем вопрос этот вовсе не праздный в далёком прошлом названное выражение понималось не в переносном смысле как сейчас а совершенно буквально. Люди верили в то что существует несколько лежащих одно над другим небес язык же сохранил для нас эти свидетельства *(В. Евсюков)*.

Падбярыце назву да беларускамоўнага тэксту.



Правообладатель Национальный институт образования

**195.** Прачытайце выказванне Я. Сіпакова пра жыццё.

Жыццё — гэта ланцуг горных хрыбтоў. Ты, узбіраючыся на самую высокую гару, думаеш: хрыбет апошні; а на самай справе гэта ўсяго толькі адзін з многіх і многіх, што вырастуць перад табою неўзабаве.

Выкажыце сваю думку наконт сэнсу жыцця.
Растлумачце пастаноўку знакаў прыпынку.
Пабудуйце сказы аб сэнсе жыцця па схемах:




**196.** Прачытайце тэкст, вызначце яго асноўную думку. Патлумачце пастаноўку знакаў прыпынку.

Робячы чалавеку зло, мы вінаватыя перад ім да таго часу, пакуль ён пра гэта памятае, але адчуваем сябе вінаватымі, пакуль памятаем пра гэты ўчынак самі. **Зло — грэх, але калі перад Богам мы замольваем свае грахі малітвамі, то на зямным судзе памяць — адзіны суддзя і адзіная мера віны.** Прычыніце чалавеку боль, а потым двойчы зрабіце яму дабро — ён даруе вам, але, пакуль будзе памятаць пра прычынены боль, вы будзеце перад ім вінаватыя *(А. Бадак)*.

Пабудуйце схему выдзеленага сказа.
Напішыце сачыненне-разважанне на тэму «Маё жыццё — маё сумленне», ужываючы складаныя сказы з рознымі відамі сувязі частак.

**197.** Прачытайце тэкст. Падбярыце загаловак у адпаведнасці з тэмай.

Калі вы *пачуеце* што нехта паедзе смажыць шашлык не верце шашлык не смажыцца а запякаецца. Менавіта ў гэтым адрозненне прыгатавання шашлыка ад іншых спосабаў апрацоўкі мяса. Чалавек які спрабаваў зрабіць шашлык на *адкрытым* агні толькі знеслаўляўся мяса ці напалову згарала ці захаваўшы знешні выгляд заставалася сырым усярэдзіне. Жар вуглёў! Нічога іншага для радасці пікніка яшчэ не прыдумана. Можна запячы мяса ў фользе ў рукаве для *запякання* на скаварадзе але так выдатна як гэта было б на шампурах на мангале з дымком не атрымаецца. Можа, гэта пайшло са старажытных часоў. Але гэта — між іншым.

Добрае мяса не патрабуе нічога, акрамя добрых *вуглёў*. Можна выкарыстоўваць марынады, якія лёгка засвойваюцца (напрыклад, гранатавы сок або кіслае малако). А для тлустага мяса некаторыя



Правообладатель Национальный институт образования

разбаўляюць воцат з простай вадой. Цыбулі не шкадуйце чым яе будзе больш тым смачнейшы будзе шашлык. Некаторыя гурманы для надзвычайнага паху дабаўляюць ажгон, або індыйскі кмен. Пры жаданні можна пакласці свежую зеляніну. Пакіньце мяса з прыправамі не на гадзіну ці дзве, а на двое-трое сутак, каб духмяны сок ператварыў будучы шашлык у шэдэўр, пасля якога, як кажуць, пальчыкі абліжаш *(Паводле А. Камароўскага)*.

Выпішыце складаныя сказы з рознымі відамі сувязі частак, расстаўляючы, дзе трэба, знакі прыпынку.

- Растлумачце напісанне выдзеленых слоў.
- Назавіце прыслоўе і прыметнік, ужытыя ў форме вышэйшай ступені параўнання.

Раскрыйце значэнні слоў *пікнік, шашлык, мангал, гурман*. Карыстаючыся слоўнікамі, высветліце іх паходжанне.

Практ. 197–1

**198.** Выканайце інтэрактыўнае заданне «Знакі прыпынку паміж часткамі складаных сказаў з рознымі відамі сувязі».

Практ. 197–2

## § 15. Знакі прыпынку ў канструкцыях з чужой мовай

**199.** Прачытайце. Якім спосабам перададзена чужая мова? Назавіце іншы спосаб перадачы чужой мовы. Пабудуйце схемы канструкцый з простай мовай, выкарыстоўваючы літары **П (п)** для абазначэння простай мовы, **А (а)** — для абазначэння слоў аўтара.

§ 14–1

§ 0–15

**I.** 1. Сястра глянула на Галіну Адамаўну. Той хацелася крыкнуць: «Не трэба! Не выходзь!» *(І. Шамякін)*. 2. «Чаму і завошта?» — пыталася яна [Сцепаніда] ў сябе, не знаходзячы, аднак, адказу, і думкі яе ішлі далей, у глыб пражытага *(В. Быкаў)*. 3. «Мама, купі мне гэтую кніжку!» — амаль патрабуе малая *(В. Шніп)*. 4. «Дарога, вандроўка — самае лепшае лякарства ад усякіх напасцей», — зазначае сам сабе Лабановіч і сам сабе ціха ўсміхаецца *(Я. Колас)*. 5. «Стой, брат! — прыпыніў я самога сябе. — Аглух ты сёння, ці што?» *(Я. Брыль)*. 6. «Я рад, пан Савіч, што вы разумееце, — узрадаваўся Грот. — Не, мы не жорсткія. Мы мяккія і добрыя» *(І. Шамякін)*. 7. «Бывай жа, родная засень і родная хата, — думае ён, — і ты, маці, не глядзі так трывожна ўслед» *(М. Стральцоў)*.

**II.** 1. Аляксандр падаў руку:

— Добры дзень!



Правообладатель Национальный институт образования

2. — Мама, дзе наш тата?— запытала Слава *(К. Чорны)*.

3. — Так, так... — смяецца Валя і радасна махае рукою *(В. Супрунчук)*.

4. — Гэта забабоны, — махнуў рукой Косця *(У. Гніламедаў)*.

5. — Куды ж вы так спяшаецеся? — сказала Вольга Сцяпанаўна. — Жонкі вас чакаюць ці дзеці плачуць? *(Я. Колас)*.

6. — Бачыце, які прыгожы сёння дзень! — ухваляючы ранішняе сонейка, добры настрой і добрую дзяўчыну, гаварыў хлопец. — І білет вы купілі, пэўна, шчаслівы! *(І. Тулупава)*.

7. — Гэта мой апошні тут вечар, — казала сама сабе Ядвіся. — І я не ўбачу яго! *(Я. Колас)*.

8. — І цяпер, дзядуля, там, за Нёманам, у пушчы, — зазначыў хлопец, — лясы напоўнены птушыным і звярыным жыццём... *(М. Бусько)*.

Чым адрозніваецца афармленне канструкцый з простай мовай пад лічбай І і пад лічбай ІІ?

Сфармулюйце правілы пунктуацыйнага афармлення канструкцый з простай мовай.

**Простая мова** на пісьме перадаецца л і н е й н ы м (у радок) або н е л і н е й н ы м (каскадным) спосабам.

У канструкцыях з простай мовай знакі прыпынку ставяцца ў залежнасці ад спосабу перадачы і месца слоў аўтара, якія ўводзяць простую мову.

- Калі простая мова запісваецца ў радок, то яна бярэцца ў двукоссе: *Званы Хатыні, мемарыял у Брэсцкай крэпасці-героі нагадваюць жывым людзям: «Людзі! Помніце! Не дапусціце новай бойні!»* (У. Ліпскі).

У двукоссе бярэцца нявыказаная простая мова, пры якой у складзе слоў аўтара ёсць дзеяслоў ***думаць*** (***падумаць***) або іншыя словы, спалучэнні слоў і сказы са значэннем думкі, разважання і да т. п.: *Нерухомы чалавек усё глядзеў на Алеся і* ***ацэньваў:*** *«Да чаго падобны на прадзеда, на Акіма...»* (У. Караткевіч).

- Перад простай мовай, якая пачынаецца з абзаца, ставіцца працяжнік:

*Матулін ганак рыпка скажа:*
— *Дома!* (М. Мятліцкі).



Правообладатель Национальный институт образования

● Калі словы аўтара стаяць перад простай мовай, то пасля іх ставіцца двукроп'е: *І гавару я: «Слова, ты гучы! І хай маўчаць гарматы і мячы!»* (А. Вярцінскі).

*Ганна памарудзіла трохі, потым спытала:*

*— Ну, а як вы, цётка Матруна?* (І. Чыгрынаў).

● Калі словы аўтара ідуць за простай мовай, то ў адпаведнасці з інтанацыяй у канцы простай мовы ставіцца пытальнік, клічнік, шматкроп'е або коска (на месцы кропкі), а пасля іх — працяжнік. Словы аўтара пішуцца з малой літары:

*— Вярніся, неслух! — пачуў ён дзедаў загад, але і не падумаў спыніцца* (І. Мележ).

*«Самота мая незямная...» — не першы так раз я кажу...* (В. Шніп).

*— Ідуць, — шапнуў стары* (Я. Брыль).

● Калі словы аўтара перарываюць простую мову, падзяляючы яе на дзве часткі, то перад словамі аўтара ў залежнасці ад інтанацыі першай часткі простай мовы ставіцца пытальнік, клічнік, шматкроп'е або коска, затым — працяжнік, а пасля слоў аўтара — кропка і працяжнік (калі першая частка простай мовы з'яўляецца закончаным сказам) або коска і працяжнік (калі першая частка простай мовы не з'яўляецца закончаным сказам): *«Што мы стаім?— схамянулася Каця. — Ехаць трэба»* (В. Хомчанка).

*— Ну то заходзьце, — сказала бабуля, сустракаючы нас у двары ля парога, — заходзьце ў хату, разам і павячэраем* (Л. Валасюк).

● Калі ў словах аўтара ўжываюцца два дзеясловы са значэннем маўлення, адзін з якіх адносіцца да першай часткі простай мовы, а другі — да другой, то пасля слоў аўтара ставіцца двукроп'е і працяжнік: *«Ведаеш, мама, каго я прывяла? — весела сказала дачка і таемна прашаптала: — Гэта той самы госць, якога мы ўсе калісьці ратавалі ад немцаў»* (Я. Маўр).

*— Тут усе свае, заводскія, — заспакоіў ён* [*Ваня*] *мяне і амаль загадаў: — Расказвай, што здарылася!* (М. Горцаў).

● Калі ў складзе слоў аўтара, што стаяць перад простай мовай, адсутнічаюць дзеясловы са значэннем маўлення, думкі або блізкія да іх па значэнні, то ў канцы слоў аўтара ставіцца кропка:

*Маці дазволіла яму паехаць у горад, у госці да цёткі Алены. «Няхай сын сходзіць у музей, у цырк, паглядзіць, што новага ў сталіцы»* (П. Кавалёў).



Правообладатель Национальный институт образования

*Бабуля павесіла кош на плот, вымыла рукі ў вядры, што стаяла каля калодзежа, паглядзела на неба.*

*— Моцная, відаць, будзе навальніца, з грымотамі і градам* (М. Дубоўскі).

● З абзацнага водступу ставіцца працяжнік перад кожнай рэплікай пры афармленні простай мовы ў форме дыялогу:

*— Як там Алесь? — спытаў дзед.*

*— Падняўся ўжо ад грушы на сцежку. Ідзе сюды,— змрочна сказаў Павал* (У. Караткевіч).

● Калі некалькі рэплік запісваюцца ў радок без указання, каму яны належаць, то паміж імі ставіцца працяжнік і кожная з іх бярэцца ў двукоссе: *«Што ты гаворыш, сынок? Хто нам яе* [*хату*] *пабудуе?» — «Я пабудую»* (Л. Екель).

**200.** Прачытайце вершы, вызначце іх асноўную думку. Растлумачце пастаноўку знакаў прыпынку ў канструкцыях з простай мовай. Складзіце схемы канструкцый з простай мовай.

Я помню, як ты юны, закаханы
Мне прызначаў над Прыпяццю спатканне.
Казаў: «Што будзе з намі — невядома,
Я ад'язджаю[ф] з бацькавага дому,
Давай пасадзім дрэўцы для ўспаміну,
Я пасаджу дубок, а ты — рабіну».
Паехаў ты, і пасля бур-навалаў
Рабінка маладзенькая завяла.[сн]
Дубок трывожна пахіліў галінкі,
Нібы пытаўся: «Што з табой, дзяўчынка?»
Рабіначку на досвітку крамяным
Дубок паіў расой, а я — слязамі.
Гарнуў дубочак лю́бую да сэрца,
І на світанні акрыяла дрэўца.
Рабіначка закрасавала ўранні,
Каб век не гасла, каб жыло каханне...
Ты — мужны дуб, а я — твая рабіна,
Шумім лісцём у згодзе лебядзінай.

*Г. Дашкевіч.*



Правообладатель Национальный институт образования

Паглядамі сустрэліся на хвілю:
«Ну як жыццё?» — «Змагаемся паціху...»
Зноў — хто куды. Нат не пагаварылі.
Адно руку пацiснулі на ўздыху.

«Бывай, бывай!..» — «Мо ўсё ж — да пабачэння?..»
Дасць Бог, яшчэ звядуць нас пуцявіны
І мы з табой папросім прабачэння
За несустрэч балючыя хвіліны.

*М. Шабовіч.*

**201.** Запішыце ў адпаведнасці з пунктуацыйнымі нормамі народныя выслоўі пра надвор'е, прыроду.

1. Авёс кажа Кінь мяне ў гразь, то будзеш князь. 2. Восень кажа Ураджу а вясна кажа Яшчэ пагляджу. 3. Мароз казаў І ў маі тры дні маю. 4. Піліпаўскі лёд кажа Хоць трашчу, але не пушчу. 5. Юрый сказаў Жыта ўраджу а Мікола Пачакай, пагляджу.

**202.** Прачытайце тэкст, вызначце яго асноўную думку. Чаму ручнік называюць дарогай у неба? Што вы ведаеце пра сімволіку ўзораў ручніка? У якіх абрадах беларусаў і з якой мэтай выкарыстоўваецца ручнік? Спішыце тэкст, расстаўляючы прапушчаныя знакі прыпынку, і растлумачце іх пастаноўку.

## Дарога ў неба

Неглюбскія ручнікі ўсё роўна што слуцкія паясы. З адной толькі розніцай: апошнія захаваліся фрагментарна*, першыя — ва ўсёй красе наіўнай даўніны.

Еду ў Ветку з надзеяй на знакаміты музей. На шырокай лесвіцы музея мяне сустракае Ларыса Раманава, вядучы навуковы супрацоўнік[сл], і зазначае

У Неглюбцы гавораць што ручнік — гэта дарога ў неба. Варта толькі паглядзець на арнамент. Знатакі сцвярджаюць што ў ім зашыфравана мова зносін з вышэйшымі сіламі.

На «музейным» аўтамабілі слізгочам па ўезджанай снежнай дарозе ў аграгарадок Неглюбку.

Ручнікі, вытканыя па мясцовых традыцыях, напоўнены арнаментальнымі знакамі самым старажытным з якіх некалькі тысяч гадоў ма́я спадарожніца Ларыса Раманава дастае з сумкі старажытнае палатно якое вязе «расшыфроўваць» у Неглюбку Як бярвенне было



Правообладатель Национальный институт образования

асноўным будаўнічым матэрыялам хаты так і ручнікі з’яўляліся своеасаблівым будаўнічым матэрыялам унутранай прасторы хаты і духоўнай прасторы сям’і.

Сапраўдных майстрых захавальніц вясковага рамяства ў Неглюбцы яшчэ можна адшукаць. Соф’я Астапенка сустракае нас ля варот.

Праходзьце. Кросны яшчэ не ставіла. Але сяду з дня на дзень. Душа просіць шчыра прызнаецца яна.

А ў пакоі погляд адразу гіпнатызуе сапраўднае чырвоны кут з іконай прыбранай ручнікамі. І сярод іх неглюбскі з тысячы адрозніш.

З маці яго ткалі, калі мне гадоў 12 было. Выцвіў трошкі берагу.

Ахвотна нам выкладвае сваё багацце дзецям і ўнукам наткала.

Я ўжо мала чаго памятаю з матчыных слоў якія знакі ды аб чым хавае пад хустку сівыя пасмы гэта ўжо пажылая жанчына Але без абраза і ручнікоў дом для мяне безабаронны атрымліваецца пусты. А ручнік дзетка жывы гэта ж дарога да неба і вяртанне з яго *(Паводле В. Дралюк)*.

**203.** Прачытайце тэкст. Падбярыце загаловак у адпаведнасці з асноўнай думкай.

Праз пэўны час на бераг выйшлі юныя вандроўнікі. Хлопцы пазадзіралі галовы, разглядваючы дрэвы ў лесе. Нізкая тапол я, на якой уладкавалася адзінокая варона, іх не зацікавіла, куды больш усхвалявалі іх вершаліны елак і соснаў. Першым агучыў сваю трывогу Віктар

У мяне благое прадчуванне.

У мяне таксама прамовіў Мірон.

Вы пра што ўстрывожылася Юлька.

Здаецца, мы высадзіліся на *востраве* змрочна сказаў Віктар.

З чаго ты ўзяў ускіпела сястра.

*Прыгледзься* да старых хвой указаў на дрэвы Мірон З поўначы іх кроны пакрыты мохам. А з паўднёвага боку — чыстыя.

Для Юлькі ўсе дрэвы ў лесе былі аднолькавыя.

І што гэта азначае пацiснула яна плячыма.

Што мы апíсалі круг.

Ты ўпэўнены гатова была расплакацца Юлька.

Дрэвы не падманваюць. Калі мы выйшлі з месца начлегу, мох рос на хвоях з паўднёвага боку. А цяпер — з паўночнага.



Правообладатель Национальный институт образования

Значыць, мы вернемся туды, дзе начавалі жахнулася Юлька.

Але паныла сказаў Мірон.

Не хачу туды вяртацца заверашчала Юлька Мне там не падабаецца! Прыдумайце што-небудзь!

Сонца мінула зеніт. Сціх вецер, і ад балота хмарай падняліся камары, якія закружыліся над галовамі падлеткаў, палезлі ў нос, у *вочы*, у валасы. Юныя падарожнікі наламалі галінак з кустоў і, адмахваючыся імі, таропка пабрылі па беразе.

З поўначы нас аддзяляе ад вёскі разліў Прыпяці *ўголас* разважаў Віктар З поўдня — балота. Мусіць, трэба высветліць: можна яго *прайсці* або не? Што ты думаеш на гэты конт, Мірон? Што рабіць? *(Паводле Я. Конева)*.

Як вы думаеце, што адказаў Мірон?

Запішыце канструкцыі з простай мовай у адпаведнасці з пунктуацыйнымі нормамі.

- Растлумачце напісанне выдзеленых слоў.

Раскрыйце значэнне слова *зеніт*.

**204.** Прачытайце тэкст. Перакладзіце яго на беларускую мову.

### Важнейший ориентир

В безоблачную погоду *сориентироваться* на местности поможет *солнце*. Ровно в полдень оно указывает направление точно на юг в любом месяце года. До этого времени солнце находится в юго-восточном секторе небосвода, а после — в юго-западном. В день осеннего равноденствия солнце восходит на востоке точно в 7 часов, а заходит на западе в 19 часов. В 10 часов оно указывает направление на юго-восток, а в 16 находится в юго-западном секторе небосвода *(По А. Русаленко)*.

- Растлумачце напісанне выдзеленых слоў у перакладзе на беларускую мову.

Выкарыстоўваючы матэрыялы гэтага і папярэдняга практыкаванняў, дадатковую літаратуру, падрыхтуйце паведамленне пра арыенціры на мясцовасці.

**205.** Прачытайце. Аформіце канструкцыі з простай мовай у адпаведнасці з пунктуацыйнымі нормамі лінейным спосабам.

1. Сынаў адказ быў заўсёдным і лаканічным / Неяк пражыву! *(Ю. Зарэцкая)*. 2. Дзік! / міжволі падумалася хлопцу / Хутчэй за ўсё, дзік! *(Г. Аўласенка)*. 3. Не пашчасціла сёння. Так бывае. Але надзея ёсць, а без яе не варта на раку выбірацца / разважаў рыбак



Правообладатель Национальный институт образования

*(М. Бусько)*. 4. Ну нашто табе / скажуць мне гэтак / у чужое жытло заглядаць? *(М. Кулеш)*. 5. Усім патрэбна ўвага. І бярозе таксама / падумалася жанчыне *(У. Цішуроў)*. 6. Раскажыце цікавае пра партызан / папрасіла дзяўчына. 7. А цяпер я думаю / Як жа добра і правільна, нават бездакорна ўсё склалася. Якое яно мудрае, жыццё... *(Т. Шымко)*. 8. Старажытны мудрэц павучае / Што заўсёды ў руху, тое вечнае *(У. Ліпскі)*. 9. Напэўна, нядаўна маланка пацэліла, падпаліла / падумаў Базыль *(А. Якімовіч)*.

**206.** Прачытайце тэкст. Дайце яму загаловак у адпаведнасці з асноўнай думкай. Афарміце канструкцыі з простай мовай згодна з пунктуацыйнымі нормамі лінейным спосабам.

Паснедаць Сцяпану Ануфрыевічу, як меркаваў, не ўдалося. Толькі ён пераступіў парог хаты, як мілагучна заспяваў «Паланэз Агінскага» мабільнік. Хто б там мог быць Сцяпан Ануфрыевіч не без хвалявання паднёс да вуха тэлефон. Павіталіся. Ты дзе, сынку Амаль дома я баця. Тры кіламетры якіх не даехаў да цябе. Слізка, машыну занесла, і я ўляцеў у кювет. Але ты не хвалюйся, усё добра. І са мной, і з машынай. Снег свежы, мяккі. Толькі выбрацца сам не магу... Сеў моцна. Схадзі, баця, папрасі Віцю Бародкіна, хай выцягне сваім «Беларусам». Адным словам, ты мяне зразумеў. Чакаю А чаго ты надумаўся так рана, ды ў такое надвор'е Снегу ж намяло — свету белага не бачна. Неслух ты, Ануфрый! Чаго-чаго? Ды за табой жа еду.

Сцяпан Ануфрыевіч адарваў мабільнік ад вуха, прабурчэў сам сабе За мной ён едзе. Ну, і што ты яму, сыну, скажаш? Даў жа ад варот паварот, а ён, бачце, усё роўна, сваю лінію гне. Баіцца, што замерзну я тут адзін... Я ж і кажу: неслух... *(Паводле В. Ткачова)*.

Чаму Сцяпан Ануфрыевіч называе сына неслухам?
Раскрыйце значэнні слоў *паланэз, кювет*.
Карыстаючыся дадатковай літаратурай, падрыхтуйце паведамленне пра Міхала Клеафаса Агінскага.

**207.** Прачытайце. Афарміце канструкцыі з простай мовай у адпаведнасці з пунктуацыйнымі нормамі нелінейным спосабам.

1. Больш нічога не гавары, хопіць... / папрасіла я *(Г. Васілеўская)*. 2. Ведаю я Маню Праневіч, але вучуся на іншым факультэце / прамовіла дзяўчына і дадала / Гэта толькі на кафедры могуць сказаць, у якой аўдыторыі яна цяпер *(Р. Баравікова)*. 3. Надыходзіць зіма... / прамовіў юнак, звяртаючыся немаведама да каго / Чарговы год пады-



Правообладатель Национальный институт образования

ходзіць да лагічнага завяршэння *(С. Мацін)*. 4. Аліна павярнулася да Тані / Таня, ты запомніла адрас, па якім адвозіла чамадан *(А. Беланожка)*. 5. Лаўрэн Ігнатавіч / спытала незнаёмка / Я са школы мастацтваў. Мы паўгадзіны назад размаўлялі па тэлефоне *(І. Карэнда)*. 6. Я таксама рады / запэўніў Забаронак / Надзвычай рады. І за сябе, і за вас *(І. Клімянкоў)*. 7. Што за віна / папытаўся Сярожа *(В. Гардзей)*. 8. Заплакала маці. Ён абняў яе за плечы / Мама, не плач... Я ўсё зразумеў... *(Д. Пятровіч)*. 9. Ах, якое сёння неба зорнае / усклікнуў Валодзя *(Л. Левановіч)*. 10. Ах, час, час / задуменна вымавіла я, калі разглядала свае дзіцячыя рэчы / Як павольна ты цягнешся ў дзяцінстве і хутка ляціш у дарослым жыцці *(Т. Дземідовіч)*. 11. Ноччу будзе мароз / запэўніў Сяргей Сталетнік, выйшаўшы разам з усімі *(У. Гніламедаў)*. 12. Яшчэ пяць хвілін — і паварочваем назад / умольна зірнула на брата Юля і крыкнула / Бачу наперадзе лес *(Я. Конеў)*.

**208.** Прачытайце тэкст. Прозвішчы яшчэ якіх беларускіх спартсменаў занесены ў Кнігу рэкордаў Гінеса? Запішыце дыялог, дапісваючы словы аўтара і расстаўляючы знакі прыпынку.

Аднойчы беларускі фехтавальшчык, алімпійскі чэмпіён і прызёр, дзесяціразовы чэмпіён свету Аляксандр Раманькоў папрасіў прадаўшчыцу кнігарні даць яму паглядзець Кнігу рэкордаў Гінеса. Але атрымаў адмову

Кнігу трэба распячатваць яна ж упакавана ў плёнку

Там напісана пра мяне

Так я і паверыла

Сапраўды

Добра. Але калі вас там не акажацца вы купіце кнігу

На тым і вырашылі. Упакоўку дарагога выдання распячаталі. І якое ж было здзіўленне прадаўшчыцы, калі са старонкі кнігі на яе глядзеў гэты самы дзіўны пакупнік... *(А. Ванковіч)*.

**209.** Пабудуйце паводле прапанаваных схем канструкцыі з простай мовай на тэму «Нечаканая сустрэча».

1. «П?» — а. 2. «П, — а, — п». 3. А: «П!» 4. «П! — а: — П».

§ 15–1

Выкарыстоўваючы канструкцыі з простай мовай, напішыце сачыненне-апавяданне на адну з тэм: «Экскурсія ў Нацыянальную бібліятэку Беларусі», «Экскурсія ў Нацыянальны мастацкі музей Рэспублікі Беларусь» і да т. п.



Правообладатель Национальный институт образования

## § 16. Ужыванне складаных сінтаксічных канструкцый у тэкстах розных тыпаў, стыляў і жанраў

**210.** Прачытайце тэкст, вызначце і аргументуйце яго стыль і тып. Прапануйце свае назвы да тэксту. Растлумачце знакі прыпынку ў сказах з аднароднымі членамі. Складзіце сказы, каб у іх з дапамогай аднародных членаў раскрываўся характар ба́цькі і дачкі. Запішыце сказы.

### У рытме жніва

Падчас жніва розныя СМІ Беларусі праяўляюць павышаную цікавасць да таго, як праходзіць уборачная кампанія. На старонках цэнтральных газет, адпаведных сайтаў змяшчаюцца фотаздымкі перадавікоў-механізатараў. На жніве працуюць і сямейныя экіпажы, бацькі́ з сынамі і дочкамі, мужы з жонкамі.



Сямейны экіпаж з Берастравіцкага раёна Гродзенскай вобласці, у якім разам з ба́цькам працуе дачка-студэнтка, намалаціў больш за тысячу тон збожжа. Віншаванні прымаў вопытны камбайнер Аляксандр Максімік і яго памочніца — 20-гадовая дачка Алена. Для механізатара гэта ўжо дваццатая ўборачная, для яго дачкі — першая. Алена на канікулах, скончыла трэці курс філфака Гродзенскага ўніверсітэта імя Янкі Купалы.

— Я з дзяцінства прыходзіла да бацькі ў поле — паглядзець, як ён працуе. А ў гэтым годзе нава́жылася папрацаваць разам з ім. На першым часе было цяжка, — распавядае дзяўчына. — Абавязкаў нямала: падмяніць бацьку, павесіць або зняць жняярку, абслужыць камбайн.

Алена прызнаецца, што вельмі стамлялася. *Затое прыйшло разуменне, што хлеб ніколі не бывае лёгкім.* Грошы, заробленыя на жніве, яна плануе патраціць на вяселле. Урачыстасць, дарэчы, запланавана на верасень.

Высока ацэньвае дапамогу дачкі і бацька:

— З родным чалавекам заўсёды лягчэй працаваць. Разумеем адно аднаго з паўслова. Ды і дачка актыўная, працавітая, руплівая. Ураджай добры. Бывала, што за дзень намалочвалі па 100 тон. Таму і настрой выдатны. *І сэрца радуецца за ўраджай. Будзем з хлебам!* (З часопіса «Беларусь»).



Правообладатель Национальный институт образования

Як выдзеленыя сказы раскрываюць характар герояў жніва?
Як вы ставіцеся да такой формы правядзення студэнцкіх канікул?
Уявіце, што на сустрэчу з вашымі аднакласнікамі прыйшла Алена Максімік — студэнтка і памочнік камбайнера. Сфармулюйце пытанні, якія вы задалі б Алене. Выкарыстайце сказы з аднароднымі членамі.
- Растлумачце пастаноўку працяжніка ў другім абзацы тэксту.

Распрацуйце слоўнікавы артыкул да слова *кампанія* (для тлумачальнага слоўніка).

**211.** Перакладзіце пабочныя словы і словазлучэнні на беларускую мову. Запішыце толькі тыя, якія характэрныя для навуковага стылю. Растлумачце, з якой мэтай яны ўжываюцца.

Естественно, как правило, кстати, очевидно, возможно, разумеется, во-первых, к сожалению, на мой взгляд, само собой, таким образом, с одной стороны, вероятно, как мне кажется, я убеждён, в шутку говорят, надеюсь, к счастью, на беду, в частности, вы не поверите, между нами говоря, бесспорно, по мнению экспертов, с точки зрения, то есть, иными словами, итак.

З трыма-чатырма беларускамоўнымі пабочнымі словамі складзіце сказы, уласцівыя навуковаму стылю.

**212.** Прачытайце. Ахарактарызуйце сінтаксічныя асаблівасці верша. Якія сінтаксічныя сродкі экспрэсіі выкарыстала паэтэса Еўдакія Лось? Прапануйце свой варыянт загалоўка твора.

Радзіма пачынаецца з двароў,
Дзе журавель тырчыць, нібыта дрэўка.
Радзіма пачынаецца з вятроў,
Што паказалі першую запеўку...
Радзіма пачынаецца з вайны,
Што чвэрць народа некалі скасіла...
Яна — з тае ўсвядомленай цаны,
Што сам дасі лісточку дзівасіла...
Хвалююся. І ведаю, чаго —
Хачу, каб помніў суайчыннік[сл] кожны:
Радзіма пачынаецца з таго,
Што не набыць, а страціць можна.

Растлумачце пастаноўку знакаў прыпынку ў тэксце.
Прадоўжыце думку: «Для мяне Радзіма пачынаецца...».



Правообладатель Национальный институт образования

**213.** Прачытайце. Перадайце змест тэксту, выкарыстоўваючы розныя тыпы складаных сказаў.

У мастацкім стылі выкарыстоўваецца ўсё багацце сінтаксісу беларускай мовы: простыя і складаныя сказы (усе тыпы) з апавядальнай, пытальнай, клічнай і пабуджальнай інтанацыяй; аднародныя члены сказа, зваротак, экспрэсіўнае вылучэнне членаў сказа і інш. Выбар таго ці іншага тыпу сказа вызначаецца кантэкстам, сітуацыяй, асаблівасцямі стылю пісьменніка. Так, дыялогам уласцівы ***няпоўныя сказы***: *Там рака глыбокая, і ў ёй — шчупакі* (І. Пташнікаў) або ***сказы з умоўчваннем*** — незакончаныя канструкцыі для ўзмацнення экспрэсіі: *Бывала, у нас там, дома, у гэтую пару...* (К. Чорны). ***Безасабовыя сказы*** ўжывальныя пры апісанні з'яў прыроды, псіхічнага або фізічнага стану чалавека ці жывой істоты: *У той год з вясны вельмі дажджыла* (Я. Колас). З дапамогай ***назыўных сказаў*** ствараюцца малюнкі прыроды, апісваюцца абстаноўка, прадметы, з'явы, якія ўспрымаюцца наглядна, рэальна: *Раніца. Шэрае, нізкае неба* (Я. Брыль). Выкарыстоўваюцца ***пытальныя***, ***пабуджальныя і клічныя сказы*** як экспрэсіўна-стылістычныя сродкі мовы, што выражаюць эмоцыі чалавека: захапленне, радасць, шкадаванне, смутак, абурэнне, здзіўленне і інш.: *З чым жа, маці азёр беларускіх, мог я ў песні цябе параўнаць?* (П. Прыходзька). **Інверсія** надае выказванню дадатковыя сэнсавыя і экспрэсіўныя адценні: акцэнт прыпадае на той член сказа, які стаіць у пачатку ці ў канцы канструкцыі: *Над вадою слаўся туманок, рэдкі, празрысты, які знікае адразу, як толькі прагляне сонца* (А. Жук).

*Паводле А. Пісарэнкі.*

Адкажыце на пытанні:

1. Якімі ўмовамі вызначаецца выбар пэўнага тыпу сказа ў мастацкім стылі?
2. Якія сказы характэрны для дыялогу? Чаму?
3. Якая роля безасабовых і назыўных сказаў у мастацкім стылі?

● Выпішыце з тэксту складаны сказ з рознымі відамі сувязі частак. Пабудуйце яго схему.

**214.** Прачытайце тэкст. Раскажыце пра сэнсава-стылістычныя магчымасці складаных сказаў. Сфармулюйце і запішыце пытанні да тэксту. Вусна адкажыце на іх.

Усе тыпы складаных сказаў (злучнікавых і бяззлучнікавых) шырока выкарыстоўваюцца ва ўсіх стылях маўлення:

1. З дапамогай складаных сказаў афармляюцца тэксты розных тыпаў і жанраў.



Правообладатель Национальный институт образования

2. Са складаных сказаў арганізуюцца маналагічныя і дыялагічныя тэксты.

3. Складаныя сказы з'яўляюцца сродкам перадачы лагічнай, навуковай інфармацыі. Яны здольны выражаць багаты свет чалавечых пачуццяў і перажыванняў, натуральнасць, дынамізм і жывасць гутарковага маўлення, дакладнасць і адназначнасць афіцыйнай дакументацыі.

4. Складаныя сказы выражаюць спалучальныя, супастаўляльныя, размеркавальныя, прычынна-выніковыя, аб'ектныя, часавыя, прасторавыя і іншыя адносіны ў маўленні.

5. Складаныя сказы выступаюць асновай пабудовы прыказак, афарыстычных выслоўяў *(Паводле М. Круталевіча)*.

**215.** Прачытайце тэкст, вызначце яго стыль і тып. Падбярыце і абгрунтуйце назву тэксту. Выпішыце з тэксту складаны сказ з рознымі відамі сувязі частак.

На сённяшні дзень беларуская мова адыгрывае істотную ролю ў жыцці беларускага грамадства. Разам з тым перспектывы яе далейшага развіцця і функцыянавання ў грамадстве ў многім будуць залежаць ад наступных момантаў:

а) пашырэнне беларускай мовы як рэальнага сродку зносін у найбольш важных сферах грамадскага ўжытку, што будзе садзейнічаць яе прэстыжнасці. Трэба адзначыць наступнае: наспеў час стварэння агульнадзяржаўнай праграмы мер, якія будуць скіраваны на ўмацаванне дзяржаўнага статусу беларускай мовы;

б) стварэнне асновы для пашырэння беларускай мовы ў актыўным ужытку. Для гэтага ёсць перадумовы: не ўсе карыстаюцца беларускай мовай у сваёй паўсядзённай дзейнасці, аднак кожны, хто жыве на тэрыторыі сучаснай Беларусі, фактычна штодзённа атрымлівае тую ці іншую інфармацыю на беларускай мове;

в) дасягненне разумнага кампрамісу паміж прыхільнікамі розных поглядаў на шляхі развіцця беларускай мовы: толькі намаганнямі ўсяго грамадства можна дасягнуць зрухаў, якія будуць мець пазітыўны характар для развіцця духоўнай культуры соцыуму;

г) фарміраванне ў грамадстве мажарытарных* адносін да беларускай мовы як дзяржаўнай мовы краіны.

Сучаснае становішча беларускай мовы ў грамадстве, яе высокія адаптацыйныя магчымасці, заканадаўчы статус даюць падставы для стры́манага аптымізму: у XXI стагоддзі беларуская мова застанецца



Правообладатель Национальный институт образования

сродкам камунікацыі, які дазволіць захаваць ёй адметнае месца ў моўным ландшафце Еўропы *(Л. Леванцэвіч)*.

Чаму аўтар называе сваё бачанне праблемы «стрыманым аптымізмам»? На аснове тэксту стварыце выказванне «Якім я бачу будучыню беларускай мовы». Пастарайцеся выкарыстаць наступную лексіку: *істотная роля, перспектывы развіцця, рэальны сродак зносін, актыўны ўжытак, разумны кампраміс, заканадаўчы статус, мажарытарныя адносіны да мовы, духоўная культура соцыуму, пазітыўны характар, моўны ландшафт Еўропы.*

**216.** Прадэманструйце багацце складаназалежных сказаў у залежнасці ад таго, якія адносіны паміж галоўнай і даданай часткай падкрэсліваюцца: азначальныя, дапаўняльныя, акалічнасныя (месца, часу, умовы, прычыны, спосабу дзеяння, мэты, уступальныя). Запішыце сказы, вызначце від даданай часткі.

*Мне хацелася б прачытаць свой любімы верш* (які.., у якім.., што напісаў.., нягледзячы на тое.., пры ўмове.., калі.., з якой мэтай.., як... і г. д.).

**217.** З дапамогай розных тыпаў складаных сказаў раскажыце пра ўласныя правілы паводзін у грамадскім транспарце (у сур'ёзнай або жартаўлівай форме) з выкарыстаннем прапанаваных мадэлей. Прыдумайце назву да малюнка, якая перадавала б вашы адносіны да падобнай сітуацыі.



У грамадскім транспарце я паводжу сябе як...
Еду і бачу малое дзіця, якое плача: я...
Калі я еду ў перапоўненым аўтобусе...
Калі я бачу забытыя кімсьці рэчы...
Калі я сяджу, а побач са мной стаіць жанчына...
Калі нехта ў транспарце вельмі гучна размаўляе...

**218.** Прачытайце. Выпішыце радкі, якія перадаюць асноўную думку верша. Наколькі блізкія вам адносіны У. Караткевіча да роднага краю? Якія пачуцці, думкі выклікае гэты верш у вас?

Дагарэў за брамай небакрай,
Месяц паміж воблачкаў плыве.
Выйду зноў, як у мінулы май,
Басаног прайдуся па траве.
Дымная, сцюдзёная раса,
Цёмныя ў траве ад ног сляды.
А такога рослага аўса
Я не бачыў доўгія гады.



Правообладатель Национальный институт образования

Бач, хмызы спляліся, як павець,
Светлякі мігцяць, гараць святлей.
Перад тым, як звонка ў лозах пець,
Прачышчае горла салавей.
Лашчыцца трава да босых ног,
З дальніх паплаваў плыве ракой
Ледзь прыкметны сумны халадок —
Подых юні ўзыходзячай маёй.
Ціха цмокае ў сне рака,
О, як добра, як прыгожа жыць!
Раска, як русалчына луска,
На вадзе ад месяца гарыць.
А вакол травіцы — росны рай
І бярозак белая сям'я.
Мой чароўны беларускі край,
Бацькаўшчына светлая мая!

Якая роля складаных сказаў у стварэнні пейзажнай замалёўкі, пры перадачы разважанняў, пачуццяў паэта?

Выпішыце складаныя сказы з тэксту, вызначце іх тып, складзіце схемы.

Выпішыце з тэксту просты сказ, зрабіце яго сінтаксічны разбор.

**219.** Прачытайце тэкст. Сфармулюйце яго тэму. У якой ступені яна актуальная для Беларусі? Чаму кожная краіна стараецца прываблівацъ турыстаў? Прапануйце свой варыянт вырашэння гэтай праблемы.

### Брэнд для Беларусі

Беларусь адкрытая свету. Мы хочам, каб да нас прыязджалі, каб пра нас гаварылі, каб сюды вярталіся. Як гэтага дамагчыся? Спецыялісты прапануюць ствараць і папулярызаваць брэнды Беларусі, якія раскажуць пра яе замежнікам.

Заўважана: выбіраючы маршрут для *падарожжа*, турысты часта задаюць у пошукавіках не канкрэтную краіну, а вядучыя атракцыі*, напрыклад, актыўны адпачынак, лепшыя пляжы, старажытная архітэктура і г. д.

У Беларусі ёсць што паглядзець: цудоўная прырода, багатая культурная *спадчына*, развітая спартыўная інфраструктура. Аднак усё гэта павінна быць *аб'яднана* нейкім адным паняццем або слоганам.

Стварэнне брэнда — малая частка вялікай работы ў плане развіцця турыстычнага *патоку*. Важна выбраць правільны шлях для яго



Правообладатель Национальный институт образования

папулярызацыі. І стандартныя метады ў гэтым выпадку не *падыдуць*. Білборды, плакаты ў аэрапорце і нават рэклама *па тэлебачанні* — усё гэта мінулы век. Краіны з вялікім патокам турыстаў займаюцца ў першую чаргу анлайн-маркетынгам, выкарыстоўваючы папулярныя платформы.

Зрэшты, пэўнымі поспехамі беларусы могуць пахваліцца. У нас паспяхова дзейнічае свой аналаг booking.com — партал VETLIVA, які дае магчымасць не толькі даведацца пра нашу краіну, але і браніраваць турыстычныя паслугі ў любы час і з любога пункта свету.

Вялікая роля ў папулярызацыі брэнда сёння належыць таксама сацыяльным сеткам. Многія краіны для папулярызацыі *нацыянальнага* брэнда звяртаюцца да знакамітых людзей. Дарэчы, у нас ёсць добры прыклад — брэндзіраванне самалёта «Белавія» беларускай *кампаніяй* Wargaming, якая з‘яўляецца *распрацоўшчыкам* сусветна вядомай гульні World of Tanks *(Паводле Л. Мінаковай)*.

Назавіце сказы з пабочнымі словамі.
Зрабіце вусны сінтаксічны разбор простых ускладненых сказаў.
Пабудуйце схемы складаных сказаў з тэксту.
Растлумачце пастаноўку працяжніка ў чацвёртым абзацы тэксту.
Вызначце марфалагічную ролю слова ***і*** ў тэксце.
Назавіце правілы, паводле якіх напісаны выдзеленыя словы.
Растлумачце сэнс лагатыпа партала *Vetliva*.

**220.** Прачытайце тэкст, падбярыце яму назву. Раскажыце пра значнасць свята Дня Незалежнасці для нашай краіны, для кожнага беларуса.

Ёсць шмат добрых традыцый. Напрыклад, паважаць старэйшых, ведаць гісторыю, ганарыцца сучаснасцю. Свята, якое мы адзначаем у ліпені, увасабляе і гэтыя каштоўнасці.[сн] Трэцяга ліпеня — Дзень Незалежнасці Рэспублікі Беларусь. І хай гэта свята вельмі маладое, але яно сімвалічнае і грунтоўнае, бо Незалежнасць і Суверэннасць — святыя паняцці.

Так, у нас багатая гісторыя — з больш чым тысячагадовым Полацкам, са знакамітымі вы́хадцамі з тутэйшых* земляў, якія ў былыя часы сталі вядомыя ўсёй Еўропе і свету. І мы ганарымся гэтым. Але нездарма адным з вытокаў свята стала вызваленне беларускай сталіцы



Правообладатель Национальный институт образования

ад фашыстаў у гады Вялікай Айчыннай вайны. Гэта была гераічная перамога над нацысцкай чумой з вялікай ахвярнасцю ў імя свабоды.

Жывым увасабленнем свята з'яўляюцца і сівы ветэран, які заўсёды будзе ў сімвалічным страі пераможцаў той вайны, і малады воін, які сёння стаіць на варце Айчыны. Гэта і паспяховы студэнт, і кваліфікаваны спецыяліст, і аўтарытэтны настаўнік. Усе беларусы, каму дарагая Радзіма *(Паводле В. Харкова)*.

Вызначце складаныя сказы, раскажыце пра іх будову, назавіце іх агульныя прыметы.

Растлумачце правапіс вялікай літары ў тэксце.

Вызначце сінтаксічную ролю ***і*** ў тэксце.

**221.** Выканайце тэставую работу «Сінтаксічныя нормы».

**222.** Прачытайце. На аснове тэксту падрыхтуйце невялікае паведамленне на тэму «Асаблівасці сінтаксісу навуковых тэкстаў».

Выказнік у навуковай мове часта бывае простым дзеяслоўным або састаўным іменным з асноўным кампанентам назоўнікам (асабліва ў азначэннях): *Матэрыяльныя рэсурсы — гэта сродкі вытворчасці, якія ўключаюць сродкі працы і прадметы працы.* У навуковым маўленні назіраецца так званае расшчапленне[c] выказніка, калі замест аднаго дзеяслова з канкрэтным лексічным значэннем ужываюцца назоўнік таго ж кораня і дзеяслоў з аслабленым лесічным значэннем: *Даследчыкі прааналізавалі — даследчыкі зрабілі аналіз; праграма падлічвае — праграма выконвае падлікі*...

У навуковых тэкстах распаўсюджаны няпэўна-асабовыя сказы: *Назіранні праводзяць штогод. Дадзеныя паказчыкі лічацца аптымальнымі.*

Сказы з аднароднымі членамі ў навуковых тэкстах ужываюцца для сістэматызацыі або пры класіфікацыі з'яў, прадметаў: *Выкарыстаны разнастайныя метады даследавання: апісальны, супастаўляльны, параўнальны, статыстычны і інш.*

Складаныя сказы ў навуковай мове сустракаюцца часцей, чым простыя, больш ужывальнымі з'яўляюцца складаназалежныя сказы, што адпавядае патрабаванням доказна-лагічнага навуковага выкладу: *Трэба сказаць, што...; Варта падкрэсліць, што...; Неабходна адзначыць, што...* .



Правообладатель Национальный институт образования

Для сферы навуковых зносін уласцівы асаблівыя формы звароту: *Шаноўныя калегі, Паважанае спадарства, Высокі сход, Ганаровыя госці* і да т. п.

Традыцыйным для навуковага маўленчага этыкету з'яўляецца ўжыванне формы *мы* замест аўтарскага *я*: *Мы лічым, што... Як было прадэманстравана намі раней...* (В. Астрэйка).

Перадайце змест тэксту іншым спосабам (з дапамогай плана, тэзісаў, ключавых слоў або табліцы). Раскажыце пра перавагі кожнага са спосабаў падачы інфармацыі.

● З улікам прыведзенай інфармацыі прааналізуйце сінтаксічныя асаблівасці тэксту, выбранага вамі з вучэбнага дапаможніка для 11-га класа (па біялогіі, геаграфіі і г. д.).

**223.** З улікам наступнай схемы раскажыце правілы рэспіраторнага этыкету, аформіўшы іх з дапамогай розных тыпаў складаных сказаў.




Не хочаце захварэць: ... .
Каб не захварэць, трэба ... .
... — і вы ніколі не захварэеце.
Заўсёды трэба памятаць: ... .
Хто не хоча хварэць, павінен ... .

**224.** Прачытайце тэкст. Сфармулюйце і запішыце пытанні да тэксту, адказы на якія раскрываюць асаблівасці афіцыйнага стылю.

Афіцыйны стыль — сістэма моўных сродкаў, якія выкарыстоўваюцца ў заканадаўчай, юрыдычнай, дыпламатычнай сферах дзей-



Правообладатель Национальный институт образования

насці. Афіцыйны стыль маўлення найбольш стандартызаваны і ўніфікаваны.

Для афіцыйнага стылю характэрны адметныя тэматычныя групы. Гэта назвы асоб паводле іх функцыі ў афіцыйных зносінах *(абанент, адказчык, сведка)*; назвы дакументаў *(заява, загад, інструкцыя)*; канцылярызмы *(наяўнасць, аднаразовая дапамога, згодна з пастановай)*.

У гэтым стылі не дапускаецца ўжыванне эмацыянальных, ацэначных і гутарковых слоў. У сувязі з прынятай паслядоўнасцю і дакладнасцю развіцця думкі ў афіцыйных тэкстах ужываюцца складаныя сказы, у прыватнасці складаназалежныя *(Т. Старасценка)*.

Прывядзіце прыклады стандартызаванасці і ўніфікаванасці тэкстаў афіцыйнага стылю.

**225.** Прачытайце. З дапамогай інтэрнэт-рэсурсаў удакладніце інфармацыю пра колькасць носьбітаў топ-5 сусветных моў на сённяшні дзень. Перадайце змест тэксту з дапамогай лінейнай дыяграмы. Якому спосабу перадачы інфармацыі (вербальнаму/невербальнаму) вы аддаяце перавагу? Чаму?

Мова набывае статус сусветнай, калі на ёй гавораць не менш за 200 мільёнаў чалавек. Паводле даных 2018 года, першых пяць месцаў займаюць: кітайская (больш за мільярд носьбітаў), англійская (больш за 400 мільёнаў), іспанская (больш за 300 мільёнаў), хіндзі (каля 300 мільёнаў), руская (больш за 250 мільёнаў) мовы *(Паводле Р. Бунеева)*.

Выпішыце складаназалежны сказ, пабудуйце яго схему.

**226.** Уважліва прачытайце тэкст, падбярыце яму назву. Вызначце тэму і асноўную думку тэксту. Растлумачце лексічнае значэнне выдзеленых у тэксце слоў. Падрыхтуйцеся да падрабязнага пераказу: падзяліце тэкст на сэнсавыя часткі, складзіце план пераказу. Перакажыце тэкст па плане. Пры гэтым захоўвайце тып зыходнага тэксту, яго кампазіцыйныя, жанравыя і моўныя асаблівасці.

У тэксце размова ідзе ад 1-й асобы адзіночнага ліку (я). Пры пераказе асобу апавядальніка замяняйце словамі *мастак, жывапісец, творца, аўтар, майстар, падарожнік, вандроўнік, ён.*

У творчасці кожнага мастака абавязкова знойдзецца тэма, якая яго хвалюе больш за іншыя і да якой ён звяртаецца неаднойчы. Для мяне такою невычэрпнаю крыніцаю натхнення з’яўляецца творчасць Якуба Коласа. Дзясяткі маіх карцін, прысвечаных паэме «Новая зямля», трылогіі «На ростанях», ствараліся доўга і няпроста — на працягу 20 гадоў.



Правообладатель Национальный институт образования




Першае маё знаёмства з творамі паэта адбылося ў школе — гэта былі вершы, урыўкі з паэмы «Новая зямля». Моцнае жаданне стаць мастаком яшчэ з маленства падштурхоўвала шмат маляваць, асабліва **краявіды**, у якіх захапляла патаемнае жыццё прыроды. Можа, таму так лёгка «клаліся на душу» паэтычныя радкі пейзажнай лірыкі Якуба Коласа.

Кожнае лета я праводзіў на Кобрыншчыне, дзе жыла мая бабуля. Вёска знаходзіцца на маляўнічым беразе Мухаўца. Там было многа старых хат, яшчэ можна было на святы бачыць бабулек у прыгожых палескіх **строях**, чуць песні, якія запа́лі ў душу назаўсёды. Я рабіў **этнаграфічныя** замалёўкі. Усё, што нагадвала пра **даўніну**, мяне вельмі хвалявала. Я адкрываў сваё Палессе, адкрываў радзіму маю і маіх родных.

Там жа, у вёсцы, і прыйшло захапленне трылогіяй «На ростанях», асабліва яе першай часткай «У палескай глушы». Паводле гэтага твора я напісаў нямала карцін, сярод якіх «Люсінскае наваколле», «Ядвіся».

Пра паэму «Новая зямля», якую я прачытаў ужо ў старшых класах школы, **мушу** сказаць асобна. Гэты твор зрабіў моцны ўплыў на ўсю маю творчасць. Пазней, пасля першага курса мастацкага інстытута, я цвёрда вырашыў напісаць многа-многа карцін, прысвечаных гэтай паэме. З таго часу я пачаў мэтанакіравана вандраваць па сваім Палессі. Цэлымі месяцамі жыў і маляваў у самых розных кутках Брэстчыны і Гомельшчыны, вышукваў **адгалоскі** даўніны. Многа маляваў бабулек у строях, сівых дзядоў, сялянскія **інтэр'еры**. Я меркаваў, што ўсё гэта спатрэбіцца, калі буду працаваць над карцінамі, прысвечанымі творчасці Якуба Коласа. Тады ж выканаў шэраг **кампазіцый** паводле твораў паэта, у якіх імкнуўся перадаць тую атмасферу, якой «дыхалі» героі твораў Якуба Коласа.

Летам **распачаў** працу, якая доўжылася тры з паловаю гады. За гэты час была створана мастацкая серыя з 23 карцін пад агульнаю назваю «Радзіма Якуба Коласа». Каб кожны дзень бачыць Нёман, пераехаў жыць на многія месяцы ў Смольню. Кожны прыезд у гэтыя чароўныя мясціны — нібыта вяртанне да нечага роднага, добра знаёмага яшчэ з дзяцінства. Ходзіш навакольнымі сцяжынкамі — і ў душы нарастае адчуванне: тут хадзіў сам пясняр. Тут, на беразе Нёмана,


Правообладатель Национальный институт образования

нараджаліся неўміручыя радкі Коласавай паэзіі, тут марыў ён пра лепшую долю Бацькаўшчыны.

Я мару пра тое, каб такія ж светлыя, высокія пачуцці, такое ж хваляванне ахоплівала і тых, хто будзе ўглядацца, разглядаць **свет** маіх карцін. Каб у кожнага, як і пасля прачытання Коласавых радкоў, з'яўлялася жаданне вярнуцца на свой родны бераг, мацнела адчуванне сваёй еднасці з родным кутом, з малой Радзімай, з роднаю Беларуссю *(У. Сулкоўскі)*.

***Звярніце ўвагу!***

Слова *Радзіма* ў тэксце У. Сулкоўскага напісана з вялікай літары на аснове наступнага правіла: «Калі агульныя назоўнікі набываюць значэнне ўласнай назвы і выкарыстоўваюцца як стылістычны сродак з мэтай падкрэсліць асаблівыя адносіны да чаго-небудзь, то яны пішуцца з вялікай літары: Радзіма, Айчына, Бацькаўшчына, Чалавек».

Выпішыце назвы карцін мастака У. Сулкоўскага.

- Растлумачце правапіс наступных слоў і словазлучэнняў: *краявід, пейзаж, звяртаўся неаднойчы, коласаўская тэма, Коласава паэзія, коласаўскія мясціны, Коласавы радкі, Палессе, палескія строі*.

**227.** Прачытайце, вызначце тып і стыль тэксту. Паразважайце, чым тлумачыцца багацце розных тыпаў сказаў, выкарыстаных аўтарам.

З вобразамі ракі, вады спрадвеку звязвалі людзі свае ўяўленні пра чалавечае жыццё, пра няўмольнасць часу і яго хуткаплыннасць[сл]. Рака была элементам традыцыйнай мадэлі свету, вада з'яўлялася асновай, стрыжнем светабудовы старажытнага чалавека. У славянскай міфалогіі рэкі адухаўляліся, паэты прысвячалі ім казкі, легенды, песні.

І вялікія, і малыя рэкі натхнялі не адно пакаленне беларускіх майстроў слова, былí іх вернымі сябрамі, да якіх яны звярталіся ў хвіліны радасці і смутку, адкуль чэрпаліся сілы і натхненне, дзе знаходзіліся матывы для роздуму.

Не толькі паэты, творцы маюць права на свой вобраз ракі. У кожнага чалавека, які бачыў хоць бы чатыры нашы вялікія ракі, нараджаюцца свае асацыяцыі. «Для мяне, напрыклад, Нёман і Дняпро — найперш рэкі-абаронцы Беларусі. Дзвіна і Прыпяць — вялікія працаўніцы», — піша археолаг Ніна Здановіч.



Правообладатель Национальный институт образования

Нёман па праву з'яўляецца адным з цэнтральных аб'ектаў этнапрасторы нашай Радзімы, і беларуская нёманіяда* налічвае[с] шмат цікавых старонак, прысвечаных гэтай знакавай для ўсіх беларусаў рацэ *(Т. Шаршнёва)*.

Растлумачце пастаноўку знакаў прыпынку ў тэксце.

- Выпішыце з тэксту розныя тыпы складаных сказаў (складаназлучаны, бяззлучнікавы, складаназалежны з адной і некалькімі даданымі часткамі), зрабіце іх сінтаксічны разбор.
- Зрабіце марфемны, словаўтваральны і марфалагічны разбор ужытага ў тэксце дзеепрыметніка.

**228.** Прачытайце. Ці згодны вы з пазіцыяй аўтара адносна таго, што *душою мовы з'яўляецца сінтаксіс*? Ці можа, на вашу думку, душа мовы праяўляцца праз лексіку, фразеалогію, інтанацыю, правапіс?

Даследчыкі мовы трапна заўважылі: сінтаксіс — душа мовы.[сн] Якраз у ім выяўляецца адметнасць спосабаў і сродкаў перадачы думкі, волевыяўлення і пачуцця. Глыбока авалодаць чужою мовай нельга без спасціжэння[сл] яе сінтаксічнага ладу, пры павярхоўным засваенні найбольш хібаў* якраз у сінтаксісе *(П. Сцяцко)*.

Стварыце выказванне ў форме сціслага разважання, якое пачынаецца словамі: *Душа мовы* — ... . Прасачыце, каб выказванне захавала схему: тэзіс — доказ (доказы) — вывады (высновы).

**229.** Прачытайце тэкст, акрэсліце яго стыль. Вызначаючы стыль, разважайце па схеме: гэты тэкст не адносіцца да навуковага стылю, паколькі...; тэкст не належыць да мастацкага стылю, бо ў ім...; стыль тэксту нельга кваліфікаваць як афіцыйны, таму што...; стыль гэтага тэксту — ..., доказам служаць наступныя лексічныя, марфалагічныя і сінтаксічныя асаблівасці...

### Праехаць з ветрыкам. На веласіпедзе

Эксперты падлічылі, што ў сучасных гарадах і прамысловых цэнтрах доля аўтатранспарту ў забруджванні навакольнага асяроддзя складае 70 %. Гэта адна з самых сур'ёзных экалагічных праблем, якія суправаджаюць урбанізацыю*. Сярод варыянтаў рашэння праблемы — стварэнне ўмоў для развіцця велаunion руху. Веласіпед у сучасным «зялёным» горадзе — гэта мабільнасць, бяспека, здаровы лад жыцця і чыстае паветра. *Прыемна, што ўсё большая колькасць жыхароў Беларусі ў апошнія гады свядома выбіраюць новы від транспарту.*



Правообладатель Национальный институт образования

Прадстаўнікі праекта «Зялёныя гарады» лічаць, што адно з неадкладных мерапрыемстваў — гэта развіццё веласіпеднай інфраструктуры ў гарадах і пасёлках. На жаль, са сродкаў перамяшчэння на першым месцы — аўтамабіль. Тым не менш па ініцыятыве дзяржаўтаінспекцыі пры МУС Беларусі была зацверджана Канцэпцыя развіцця веласіпеднага руху ў краіне. Згодна з пазіцыяй аўтараў канцэпцыі піраміда сучасных гарадскіх прыярытэтаў павінна мець наступны выгляд (гл. малюнак).



*Піраміда гарадскіх прыярытэтаў*

Дзякуючы[м] праекту «Зялёныя гарады» актыўна абнаўляюцца веласіпедныя палосы: раўняюцца шурпатасці, паляпшаецца пакрыццё, ліквідуюцца бар'еры. Праектам прадугледжваецца таксама будаўніцтва спецыяльных пешаходных і веладарожак. Тым больш што тэндэнцыя росту долі паездак на веласіпедах расце *(У. Міхайлаў)*.



Пракаменціруйце піраміду гарадскіх прыярытэтаў. Наколькі яна рэальная на сённяшні дзень?

Растлумачце пастаноўку працяжнікаў у першым абзацы тэксту.

Назавіце і ахарактарызуйце абрэвіятуры, ужытыя ў тэксце.

Патлумачце, чаму ў выдзеленым сказе выказнік мае форму множнага ліку пры дзейніку.

Ці з'яўляецеся вы прыхільнікам велаpуху? Чаму? Што вы ведаеце аб праекце Green Cities?

Складзіце і запішыце невялікі тэкст на спартыўную тэму (напрыклад, «Я выбіраю веласіпед як транспартны сродак», «Фехтаванне — спорт будучага пакалення» і інш.) для рознай аўдыторыі, выкарыстоўваючы ў ім звароткі. Тэкст можа быць адрасаваны: а) сябру; б) бацькам; в) настаўнікам. Раскажыце, як звароткі характарызуюць адрасата і адрасанта.

Правообладатель Национальный институт образования

# Падагульненне і сістэматызацыя вывучанага

## § 17. Маўленчыя зносіны і маўленчы этыкет. Нормы сучаснай беларускай мовы; памылкі, выкліканыя іх парушэннем

**230.** Вы любіце фантазіраваць, прыдумваць розныя сітуацыі, гісторыі? Тады ўявіце пачуцці, якія перажывае ялінка пасля навагодніх свят. Зялёныя прыгажуні — зіхоткія, стройныя — застаюцца адзінокімі і непатрэбнымі, калі свята міна́е. Прачытайце верш і асэнсуйце яго філасофскую сутнасць. Чаму гэты верш раскрывае найперш не драму ялінкі, а яе высакародства і гонар?

Спішыце верш, расстаўце прапушчаныя знакі прыпынку і растлумачце іх.

**Ялінка**

Ялінку выкінулі за адрыну*
Яна ляжыць ва ўладзе ціхіх дум.
На голкі жоўтыя пушысты сіні
Злятае снег і навявае сум.
Цяплілі ўчора свечкі ёй вітыя
А сёння аддалі́ яе снягам...
Блішчаць дажджу віточкі залатыя
Забытыя на голках тут і там.
Ляжаць вядома нудна за адрынай
Бо сумны свет праз снежную імжу.
Адное засталіся ўспаміны
Віточкі залацістага дажджу.
Але яна свядома ганарыцца[c]
І доляй і чарговасцю падзей
Хай жоўтая хай ападае гліца
Яна жыве яшчэ ў душы дзяцей.

*У. Караткевіч.*

Якія арфаграфічныя правілы можна праілюстраваць словамі гэтага верша? Узнавіце змест гэтых правіл.



Правообладатель Национальный институт образования

**231.** Запішыце верш у адпаведнасці з арфаграфічнымі і пунктуацыйнымі нормамі. Растлумачце сэнс назвы верша. Якія сродкі выразнасці выкарыстаны аўтарам?

### Дубовы ліст

Стаяць дубровы ў жнівен..скай красе
Л..цяць у вырай жураўлі і гусі
Дубовы ліст у жылках і ў расе
Мне нагадаў абрысы Беларусі.
Яго мая крана..цца рука
А ён нібыта выкава..ы з броні
І жылка кожная дубовага лістка
Злілася з жылкамі[ф] маёй далоні.

*С. Грахоўскі.*

Разбярыце па саставе зваротныя дзеясловы.

**232.** У бібліятэцы або з дапамогай інтэрнэт-рэсурсаў пазнаёмцеся з выданнем: Арашонкава, Г. У., Лемцюгова, В. П. Кіраванне ў беларускай і рускай мовах : слоўнік-даведнік / Г. У. Арашонкава, В. П. Лемцюгова. — Мінск : Вышэйшая школа, 1991. — 303 с.




Прачытайце пра структуру названага даведніка. Раскажыце, у якіх выпадках варта карыстацца падобным слоўнікам. Выпішыце з тэксту прыклады. Складзіце сказы з трыма-чатырма беларускамоўнымі словазлучэннямі.

У слоўнік-даведнік уключаны дзеясловы, назоўнікі і прыметнікі:

1) якія патрабуюць ад залежнага слова склонавых форм, розных у беларускай і рускай мовах, напрыклад: *з нагоды свята — по случаю праздника; іншым разам — в другой раз; мець рацыю — быть правым*;

2) пры якіх можа парушацца нарматыўная спалучальнасць з залежным словам па аналогіі з падобнымі канструкцыямі або пад уплывам дыялектных канструкцый, канструкцый з іншай мовы, напрыклад: *характэрны для каго-чаго (не каму-чаму!); уласцівы каму-чаму (не для каго-чаго!)*;

3) сінтаксічная спалучальнасць якіх залежыць ад значэння (адцення значэння) галоўнага слова, напрыклад: *даследаванне чаго* (навуковае вывучэнне) і *даследаванне аб чым* (навуковая работа); *здольны да чаго* (які мае схільнасць да чаго-небудзь) і *здольны на што* (які гатовы зрабіць што-небудзь);



Правообладатель Национальный институт образования

4) варыянтныя канструкцыі, якія адрозніваюцца частотнасцю ўжывання або стылістычна *(Г. Арашонкава, В. Лемцюгова)*.

**233.** Утварыце і запішыце словазлучэнні. Пры неабходнасці звяртайцеся да слоўніка-даведніка «Кіраванне ў беларускай і рускай мовах».

Кпіць ... *(сябар, малы)*, расказаць ... *(выпадак, падарожжа)*, багаты ... *(падзеі, грошы)*, любавацца ... *(кветка, дзяўчына)*, не выракацца[л] ... *(мова, Бацькаўшчына)*, сквапны ... *(слава, улада)*, кансультавацца ... *(урач, праблема)*, даглядаць ... *(дзеці, бацькі)*.

**234.** Выправіце сказы, у якіх дапушчаны памылкі, растлумачце іх прычыны.

1. Мая маці працуе загадчыкам лабараторыі. 2. Не бядуй ты аб ім. 3. Міхась быў меншы мяне ростам. 4. Нечакана ён захварэў грыпам. 5. За ўсё, што вы зрабілі для мяне, я вас вельмі дзякую. 6. Па сыне не плач ты, матуля. 7. Урокі ён не вывучыў з-за ляноты. 8. Алёна пабегла за суседам-доктарам. 9. Горад ведаю добра, больш года вучыўся там. 10. Задуменна стаялі пры дарозе два старых дубы. 11. Дачушка мая, я ж за шчасцем цябе адпраўляла. 12. Сяброўка толькі пасмяялася над маім страхам. 13. Выраcту — жанюся на суседцы. 14. Пішы мне па гэтаму адрасу, не забывай аба мне. 15. Я спазніўся на ваш урок з-за свайго брата. 16. Некалькі раз у дзень я званю бацькам.

Практ. 234–1–234–3

**235.** Прачытайце сказы. Спішыце, ставячы знакі прыпынку ў адпаведнасці з пунктуацыйнымі нормамі. Растлумачце іх пастаноўку.

1. Ліст расой пасярэбраны[м] прытулю да шчакі *(Х. Гурыновіч)*. 2. Усе гады пражытыя тут здаваліся ёй цяпер суцэльным шчасцем *(Г. Васілеўская)*. 3. Мне шасцігадоваму падабаліся такія абавязкі *(У. Сцяпан)*. 4. На сяле ён паявіўся гады праз два пасля вайны з рыжым чубам і з вечна гатовымі на вясёлую ўсмешку вачыма *(Я. Скрыган)*. 5. Праз два акны ў другой сцяне віднелася блакітнае глыбокае неба яснае[ф] і ўрачыстае *(І. Клімянкоў)*. 6. Хата дзядзькі Міколы была другая з краю вёскі.[сн] Нізкая крытая пабурэлым шыферам яна збоку нагадвала вялізную лодку перавернутую ўверх дном *(А. Камароўскі)*. 7. Андрэй высокі статны з першым[м] дарослым разрадам ірвануў са старту ў агульным натоўпе *(А. Камароўскі)*. 8. Першым ішоў Рыгор. Высокі даўганогі ён няглeдзячы на гарачыню ступаў размерана шырока *(А. Якімовіч)*.



Правообладатель Национальный институт образования

**236.** Спішыце сказы, расстаўляючы, дзе патрэбна, знакі прыпынку. Устаўце прапушчаныя літары, раскрыйце дужкі. Растлумачце напісанні.

1. Можна за..сці да с..броўкі Гэлі жонкі сваяка Глеба Іванавіча *(Г. Марчук)*. 2. *(Н..)*як да нас у двор за..шла суседка цётка Адарка *(Н. Касцючэнка)*. 3. *(Перша)*пачаткова ў праграму Алімпійскіх гульняў уваходзіў толькі адзін від спаборніцтваў стадыядром або бег на дыстанцыю роўную аднаму стадыю *(А. Ванковіч)*. 4. З ёй іх прасторнай хатай звязана ..этулькі ўспамінаў *(У. Гаўрыловіч)*. 5. А ён падлетак бег *(на)*сустрач каб хутчэй атрымаць *(доўга)*чаканы[сл] падарунак *(Т. Купрэвіч)*. 6. Было ў яго некалькі сяброў маладых настаўнікаў[сн] *(А. Козел)*. 7. Ран..яй вясной зацвітае яшч.. адна расліна сон-трава *(Г. Мятліцкая)*.

**237.** Спішыце сказы, афармляючы іх паводле пунктуацыйных норм і ўстаўляючы прапушчаныя літары. Пракаменціруйце пунктуацыйнае афармленне сказаў і напісанне прапушчаных літар.

1. На бера..е сярод зрыжэлай травы разваліўся ружовы ад промняў сонца валун *(М. Бусько)*. 2. Там за туманамі лета маё дагарае *(А. Клемянок)*. 3. Я слухаў[м] іх як кажуць з разяўле..ым ротам запамінаў кожнае слова асабліва Нёманскага *(В. Хомчанка)*. 4. Трымае тут на спа..чы..ай сядзібе да каранёў сваіх любоў *(М. Маляўка)*. 5. Вось яе іс..іну я і шукаю *(Л. Арабей)*. 6. Гас..ей сабралася чалавек пятнаццаць пераважна саслужыўцы гаспадара *(В. Хомчанка)*. 7. Любіў Мар'ян паха..іць па са..е і ў будні ..ень асабліва позняй восен..ю *(В. Казько)*. 8. Але ён разумеў і іншае ніхто з іх у тым ліку і капітан не даруе сабе калі не даведаецца што здарылася з таварышамі *(У. Шыцік)*. 9. Усе дзяўчаты нават Ірына былі рады бачыць гас..ей.

**238.** Прачытайце тэкст, падбярыце яму назву. Выпішыце па два сказы з аднароднымі і адасобленымі членамі. Растлумачце пастаноўку знакаў прыпынку ў іх.

Шэдэўры сусветнай мастацкай культуры, створаныя сотні і нават тысячы гадоў таму, шматразова падпадалі пад разбуральнае ўздзеянне прыродных сіл і чалавека. Напрыклад, з сямі старажытных цудаў свету да нашых дзён захаваўся толькі адзін — піраміда Хеопса. Многія тварэнні прайшлі выпрабаванне часам, аднак без належнай абароны яны таксама могуць знікнуць. Найважнейшую



Правообладатель Национальный институт образования

ролю ў захаванні культурнай спадчыны чалавецтва адыгрывае міжнародная арганізацыя ЮНЕСКА (UNESCO — The United Nations Educational, Scientific and Cultural Organization). У перакладзе з англійскай мовы абрэвіятура расшыфроўваецца як Арганізацыя Аб'яднаных Нацый па пытаннях адукацыі, навукі і культуры.

Сёння членамі арганізацыі з'яўляюцца 195 дзяржаў, у іх ліку — Рэспубліка Беларусь. Больш за 70 гадоў ЮНЕСКА спрыяе плённаму супрацоўніцтву розных краін і народаў у галіне культуры, навукі і адукацыі, актыўна займаецца абаронай славутых помнікаў гісторыі і мастацтва.

У нашы дні ў Спісе сусветнай спадчыны налічваецца больш за тысячу аб'ектаў, аб'яўленых зонамі культуры. Канвенцыю аб ахове сусветнай культурнай і прыроднай спадчыны падпісалі ўсе краіны — удзельнікі ЮНЕСКА. Кожны з членаў міжнароднай арганізацыі абавязаны не толькі захоўваць, але пры неабходнасці і ўзнаўляць гэтыя ўнікальныя аб'екты. Беларусь далучылася да канвенцыі ў 1988 годзе. У нашай краіне знаходзяцца чатыры аб'екты са Спіса сусветнай спадчыны: тры культурныя (Мірскі замак, Нясвіжскі палацава-замкавы комплекс, геадэзічная дуга Струвэ) і адзін прыродны — Нацыянальны парк «Белавежская пушча» *(Паводле Д. Кашавара)*.

- Знайдзіце словазлучэнні, што выяўляюць спецыфіку дапасавання і кіравання ў беларускай мове.
- Выпішыце з тэксту складаназлучаны сказ, зрабіце яго сінтаксічны разбор.

Падрыхтуйце паведамленне (прэзентацыю) пра адзін з унікальных аб'ектаў Беларусі са Спіса сусветнай спадчыны.

**239.** Прачытайце ўрывак з верша Я. Коласа «Мая зямля» (1943 г.). Як звароткі дапамагаюць выяўленню асноўнай думкі? Спішыце, расстаўляючы знакі прыпынку ў адпаведнасці з пунктуацыйнымі нормамі. Пракаменціруйце пунктуацыйнае афармленне сказаў са звароткамі.

Зямля мая Разлучаны з табою
Табой дышу табою я жыву.
Прад вамі ж воіны байцы-героі
Я ў радасці схіляю галаву.

Зямля мая краіна непакоры
Ты голас мой пачуй у шуме гроз:


Правообладатель Национальный институт образования

З табою я дзялю пакуты гора, —
З дзяцінства я з тваім злучыў свой лёс.

Дык вер жа вер зямля мая матуля
Наш ясны дзень не змеркнуў не пагас
І далі сінь зноў ласкай нас атуліць
І прыйдзе нам збавення светлы час.

Зямля мая Прызнаюся я шчыра
Малю свой лёс я толькі аб адным —
Сабрацца зноў у радасны свой вырай
Каб слодыч мар адчуць нутром зямным.

Злучыцца зноў з табой мая матуля
Абняць цябе шчакой прыльнуць да ран
Да свежых ран што свет ускалыхнулі
І сведкай стаць як прошласці курган.

Практ. 239–1

**240.** Прачытайце тэкст, вызначце яго стыль і тып. Вусна перакладзіце на беларускую мову. Якую думку сцвярджае аўтар — акадэмік Д. Ліхачоў? Наколькі яна актуальная для вас, для нашага грамадства? Прадоўжыце разважанне, выказаўшы згоду або нязгоду з пазіцыяй аўтара. Падбярыце і запішыце не менш за тры доказы для аргументацыі ўласных меркаванняў у форме складаназалежных сказаў. Сфармулюйце вывады.

Вернейший способ узнать человека — его моральный облик, его характер — прислушаться к тому, как он говорит.

...А ведь бывает и так, что человек не говорит, а «плюётся» словами. Для каждого расхожего понятия у него не обычные слова, а жаргонные выражения. Когда такой человек с его «словами-плевками» говорит, он хочет показать, что ему всё нипочем, что он выше, сильнее всех обстоятельств, умнее всех окружающих, над всем смеётся, ничего не боится.

А на самом деле он потому и называет своими циничными выражениями те или иные предметы, людей, действия, что он трус, робок и неуверен в себе. Посмотрите, послушайте, о чём такой «храбрец» и «мудрец» цинично отзывается, в каких случаях он обычно слова заменяет «словами-плевками». Вы сразу заметите, что его страшит, от чего он ждёт неприятностей себе, что не в его власти...

Растлумачце, чаму некаторыя словы ў тэксце ўзяты ў двукоссе.



Правообладатель Национальный институт образования

**241.** Прачытайце верш, вызначце яго асноўную думку. Якія моўныя сродкі дапамагаюць яе выяўленню? Спішыце, расстаўляючы знакі прыпынку ў адпаведнасці з пунктуацыйнымі нормамі, і патлумачце іх пастаноўку. Назавіце словы, ужытыя ў ненарматыўным варыянце. Парушэннем якіх норм яны з'яўляюцца? З якой мэтай аўтар іх выкарыстаў?

Дзень добры свята вабнасці самой
Калі ўсяго сямнаццаць за спіною!
На жаль сягоння гэты парк не мой
Як не маё і лета выпускное.

І можа быць нібы на дзівака
Ў мой бок глядзяць гарэзлівыя феі
І думаюць чаго я заблукаў
На маладой бярозавай алеі.

І ў свой нататнік чыркаю радкі
Акідваючы позіркам зайздросна
Ўвесь гэты парк святочна-гаманкі
Нібы свае прыгадваючы вёсны...

Ну што ж, пара ўжо мусібыць дамоў.
Што любавацца не сваёй вясною?!
На жаль сягоння гэты парк не мой
Як не маё і лета выпускное...

*М. Шабовіч.*

**242.** Прачытайце тэкст. Падбярыце да яго загаловак у адпаведнасці з тэмай.

Якое гэта дзіва — зорнае неба жнівеньскай ноччу! Зоркі ззяюць на ўсю спрадвечную моц. Пазіраеш угору і міжволі згадваеш філосафа Канта, які казаў, што яго найбольш здзіўляюць дзве рэчы: зорнае неба і чалавечая душа.

**... вясковаму чалавеку няма калі ў жніўні любавацца зоркамі жніво забірае час і думкі.** Гарадскі жыхар не можа ўбачыць усю веліч зорнага неба з-за высозных дамоў, бляску ліхтароў. Хіба што людзі на адпачынку могуць любавацца нябесным купалам.

**... і я не заўсёды маю час любавацца зоркамі але ў той вечар у мяне быў асаблівы настрой пашанцавала змалаціць азімую пшаніцу і грэчку.** Паспрыяла нябесная канцылярыя: выбліснуў сонечны дзянёк.



Правообладатель Национальный институт образования

Парадаваў і ўраджай: важкія буйныя каласы хіліліся долу. Аднак грэчка вырасла слабаватая, летась была лепшая, але год на год не прыходзіцца.

Ціхім вечарам я доўга ўзіраўся ў неба. Палярная зорка, нібы сярэбраны цвік, блішчэла на сваім месцы. **Вялікі Воз ... , Малы Воз ... паварочваліся вакол Палярнай зоркі як і мільёны гадоў таму.** Блішчаста-дымным ручніком апаясваў нябесны купал Млечны Шлях *(Паводле Л. Левановіча)*.




Запішыце выдзеленыя сказы, устаўляючы прапушчаныя словы і расстаўляючы, дзе трэба, знакі прыпынку. Растлумачце пастаноўку знакаў прыпынку.

Для даведкі: *прызнаца, праўда, Малая Мядзведзіца, гэта Вялікая Мядзведзіца.*

- Пракаменціруйце напісанне слоў з вялікай літары.

Растлумачце выраз *нябесная канцылярыя*.

Карыстаючыся дадатковай літаратурай або інтэрнэт-рэсурсамі, падрыхтуйце паведамленне пра назву якога-небудзь сузор'я (якой-небудзь зоркі) або пра філосафа Канта.

**243.** Прааналізуйце характар заданняў ЦТ па сінтаксісе за мінулыя гады. Якія заданні выклікалі ў вас цяжкасці?

1. Адзначце словазлучэнні, якія адпавядаюць нормам беларускай літаратурнай мовы:

а) *тры рэкі*;

б) *вышэйшы клёна*;

в) *прабачыць суседцы*;

г) *захварэць на грып*.

2. Адзначце складаназлучаны сказ, паміж часткамі якога трэба ставіць знак прыпынку:

а) *Пасля напружанага дня на луг прыйшоў спакой і ў поле завітала цішыня.*

б) *Прыйшла зіма і ночы ўжо паўзуць, а не крочаць.*

в) *Хмурна і маўкліва.*

г) *Зранку ў гародчыку мітусіліся матылькі і бомкалі чмялі.*



Правообладатель Национальный институт образования

3. Адзначце бяззлучнікавы складаны сказ, у якім трэба паставіць працяжнік:

а) *Прагрыміць у верасні гром будзе цёплая восень.*
б) *Працу трэба любіць у ёй найбольшы смак жыцця.*
в) *Вядома ўсім без мінулага няма будучыні.*
г) *Мне сёння не заснуць мяце, гудзе завея за акном.*

(З матэрыялаў ЦТ).

**244.** Расказваючы пра жыццё, творчасць людзей або звяртаючыся да ўласных вытокаў, мы з пяшчотай узгадваем свае родныя мясціны, называючы іх *малой радзімай*. Васіль Жуковіч пярэчыць гэтаму ўстойліваму выразу. Пракаменціруйце пазіцыю паэта.

Спішыце тэкст, пастаўце знакі прыпынку. Вусна вызначце тып сказаў.

### Радзіма малой не бывае

Існуюць малы́ пералесак пясок
Малыя палянка і поле…
А край дзе ступіў ты найпершы свой крок
малым не бывае ніколі.
Існуюць мала́я трава і лаза́
Крыніцы вузенькае ложа.
А край дзе ты першае слова сказаў
Малым называцца[c] не можа.
Радзіма… У ёй да сканчэння вякоў
Прастору душа набывае.
Магчыма бывае малая любоў
Святыні малой не бывае.

Растлумачце выкарыстанне формы множнага ліку выказніка ў першай і другой страфе верша. Прывядзіце сказы-прыклады на ўжыванне выказніка ў адзіночным і множным ліку пры дзейніку, выражаным колькасна-іменным словазлучэннем.

Зрабіце сінтаксічны разбор сказаў з састаўным іменным выказнікам.

**245.** Раскажыце, чаму беларус Ігнат Дамейка стаў нацыянальным героем Чылі. Акрэсліце ролю складаных сказаў у тэксце. Растлумачце пастаноўку знакаў прыпынку ў іх.

Ігнат Дамейка (31.07.1802 — 23.01.1889) — адзін з самых знакамітых у свеце беларусаў, аўтар 130 навуковых работ, нацыянальны герой Чылі, сусветна прызнаны вучоны-мінеролаг, які шмат гадоў быў рэктарам Чылійскага ўніверсітэта.



Правообладатель Национальный институт образования

Ігнат Дамейка нарадзіўся ў Беларусі. Яго бацька і дзядзькі былі культурныя людзі, яны хацелі, каб хлопчык атрымаў добрую адукацыю. У 1816 годзе, калі Ігнату было толькі 14 гадоў, ён паступіў на факультэт фізічных і матэматычных навук Віленскага ўніверсітэта. Па заканчэнні малады чалавек абараніў дысертацыю і атрымаў ступень магістра.

З 1832 года малады вучоны жыве ў Парыжы, ён вучыцца ў Сарбонскім універсітэце, вывучае хімію і геалагічныя навукі ў Парыжскай горнай школе. Пасля заканчэння вучобы яго запрашаюць працаваць па спецыяльнасці ў Чылі, дзе ён у 1867—1883 гадах быў рэктарам Чылійскага ўніверсітэта. Дамейка вывучаў вулканы, знайшоў вялікія запасы медзі і серабра, арганізаваў здабычу золата і салетры, пісаў навуковыя трактаты, якія публікавалі ў парыжскіх навуковых часопісах.




У Еўропе і Амерыцы маецца шмат помнікаў, мемарыяльных знакаў і шыльдаў, на якіх напісана імя вялікага беларуса. У яго гонар у Чылі быў выпушчаны медаль і ўзведзены помнік у Сант'яга.

Растлумачце напісанне слоў з вялікай літары.

На аснове тэксту падбярыце матэрыял для арфаграфічнай дыктоўкі на тэму «Правапіс спалучэнняў галосных у запазычаных словах».

Выпішыце складаназлучаны, складаназалежны і бяззлучнікавы складаны сказы, пабудуйце іх схемы.

Падрыхтуйце паведамленне пра вядомых вучоных-беларусаў.

**246.** Прачытайце тэкст. Выпішыце складаназлучаныя сказы са спалучальнымі і супраціўнымі злучнікамі, падкрэсліце граматычныя асновы. Расстаўце знакі прыпынку і растлумачце іх пастаноўку.

Над гаем над велізарным *абшарам* блакіту вісела даль і ў ёй была дзіўная *гармонія далікатных* тонаў і таемных мар.

Лес быццам маўчаў аднак сярод яго цішыні ўгадваліся таямнічыя цені.

Даль то прыцягвала да сябе сваёй недасягальнаю таемнасцю то далей адплывала назад хаваючыся за лесам. Яна жадала раніц душы *самотных* людзей а яны шукалі ў ёй развязкі балючага сэрца.

Даль гаварыла яе мовай была песня без слоў ды толькі чуткае вуха магло ўлавіць яе пераруйныя спевы.



Правообладатель Национальный институт образования

Колькі *багата* жыцця ў гэтай далі ў часе сонечнага дня калі яна прасвечваецца чыстая нібы раса на чароце. Прамені сонейка прасвечваюць даль і лес ажывае ў вясёлых *зыках* і ад растопленай сасновай смалы кружыцца галава *(З. Бядуля)*.

Назоўнікі *цень, даль, гармонія, таемнасць, песня, жыццё* запішыце ў форме творнага склону. Растлумачце правапіс іх канчаткаў.

Запішыце сінонімы да выдзеленых слоў.

**247.** Спішыце. Расстаўце знакі прыпынку. Аргументуйце іх пастаноўку. Вызначце від даданых частак.

1. Прырода толькі дорыць дзівы бо дзіва ёсць яна сама *(П. Броўка)*. 2. Толькі ў сэрцы і можна адчуць колькі багацця даў табе край *(К. Кірэенка)*. 3. Елачцы зялёнай сёння сняцца сны быццам вее з бору водарам лясным *(Я. Пушча)*. 4. Раптам **ірвануў** вецер і перайшоў у такую буру што зямля закурылася пылам *(Я. Колас)*. 5. Калі яны выйшлі на вуліцу было цёмна хоць на небе і высыпалі буйныя белыя зоркі *(А. Кудравец)*. 6. Мы ні на хвіліну не пахіснуліся ў сваёй вялікай веры хоць права жыць у шчасці на зямлі і здабываў народ нялёгкай мерай *(К. Кірэенка)*. 7. Памяць чалавечая падобна на скарбніцу ў якой можа захавацца толькі здольнае вытрымаць буры часу і не страціць сваёй цікавасці *(Р. Сабаленка)*. 8. Тут і рэчка відаць лес і белыя хмаркі-гускі што плаваюць па бязмежнай прасторы сініх нябёс *(Я. Колас)*. 9. Прыемна было хадзіць па новых мясцінах углядацца ў малюнкі што трапляюцца ў падарожжы і разважаць з самім сабою аб розных падзеях і праявах на свеце *(Я. Колас)*. 10. Калі ж вечарам рабіна сок зары крамяны п'е жнівень песнямі дажынак заліваецца пяе *(К. Кірэенка)*. 11. Я ўвайшоў у дом дзе жыў тварыў паэт дзе прагучаў яго калісьці верш *(М. Танк)*. 12. Уначы калі спяць і палеткі і травы ціха сосны шумяць пра геройства і славу *(А. Бачыла)*. 13. Вось і промень першы залаціцца каб твой сон юнацкі[сл] абагрэць *(П. Панчанка)*.

- Выпішыце адзін дзеяслоў і ўтварыце ўсе магчымыя формы загаднага ладу.
- Растлумачце правапіс часціц ***не*** і ***ні*** ў тэксце.
- Якія фанетычныя асаблівасці адлюстраваны ў выдзеленым слове? Назавіце асноўныя фанетычныя адметнасці беларускай мовы.

**248.** Сфармулюйце заданні, скіраваныя на паўтарэнне лексікі, складу слова, словаўтварэння і марфалогіі. Выканайце іх.



Правообладатель Национальный институт образования

**249.** Прачытайце твор. Паразважайце, чаму не кожны «спытае» і «знае» дарогу, якая вядзе да храма. Раскажыце пра асаблівасці пабудовы трыялета. Якія прыклады вершаў-трыялетаў іншых аўтараў можаце прывесці? Якімі крыніцамі для адказу на апошняе пытанне вы будзеце карыстацца?

Спішыце верш, расстаўце знакі прыпынку і растлумачце іх пастаноўку.

**Дарога**
(трыялет)

Дарогу што к храму вядзе
Далёка не кожны спытае
Далёка не кожны і знае
Дарогу што к храму вядзе.
Вось праўда людская святая
Пакуль не адбыцца бядзе
Дарогу што к храму вядзе
Далёка не кожны спытае.

*У. Паўлаў.*

Вызначце структуру сказаў, запішыце верш у выглядзе графічных схем.

**250.** Назавіце парушэнні пунктуацыйных норм у сказах. Запішыце сказы ў адпаведнасці з пунктуацыйнымі нормамі.

1. Лета, калі яно цёплае не праходзіць, а пралятае. 2. Нашы продкі ўмелі працаваць, умелі і весяліцца, у святочны дзень. 3. Масленіца — свята заканчэння зімы, яно адзначалася ў канцы лютага, ці ў пачатку сакавіка. 4. Чэрвеньскае сонца, настоенае на водары скошанай травы нясцерпна пякло. 5. Поле прытаілася ў чаканні, а хмара набліжалася і цямнела і час ад часу блакітныя ніці маланкі пранізвалі яе *(Т. Хадкевіч)*. 6. А сонца скрозь сеючы іскры[ф] на свеце, мне песню іскрыла нябесным святлом, а вецер, што ў полі рве дзёрны і сеці даў волю і крылы лунаці арлом *(Я. Купала)*. 7. Жыве тады лес пярэстазвонкім жыццём і ў тым жыцці зялёным сонечным чуваць гармонія шчасця, гармонія светлае радасці *(М. Зарэцкі)*. 8. З гнёздаў мы даўно павыляталі ды не развучыліся глядзець, як па спелым полі, па атаве дождж грыбны на дыбачках ідзе *(П. Панчанка)*. 9. На дварэ была зіма, ляжаў малады снег, ад яго на свеце было светла, і ціха, і гэтак жа нязвыкла ціха стала ў хаце *(А. Кудравец)*. 10. На рабіне скачуць шустрыя сініцы, пад дажджом намоклі клёны і дубы, наліліся сокам спелыя брусніцы і каля дарогі выраслі грыбы *(С. Грахоўскі)*. 11. Праз


Правообладатель Национальный институт образования

творчасць Уладзіміра Караткевіча, ёсць шанец расказаць свету пра Беларусь і беларусаў *(К. Ладуцька)*. 12. Свет, даўно абжыты чалавекам, здаецца, простым, ды зразумелым, а на самай справе — складаны, загадкавы *(В. Карамазаў)*.

Выпішыце дзеепрыметнік і дзеепрыслоўе, графічна пакажыце іх утварэнне.

**251.** Прачытайце тэкст. Выпішыце радкі, якія перадаюць асноўную думку верша.

### Песня вякоў

Як пачую матуліну песню,
Сэрца радасцю поўніцца зноў.[сн]
І пявучая мова ўваскрэсне,
І раскажа пра шчасце, любоў.[сн]
Так, як кветкі ўпрыгожылі луг,
Так і песнямі славіцца мова.
І ляцяць тыя словы, плывуць
Над маёю старонкай нанова.
З веку ў век наша песня жыве
І лунае ў родным прасторы,
Акрыляе душу і нясе
Нашу спадчыну — родную мову.
Хай красуе яна, хай звініць[ф]
І прыносіць душы асалоду.
Зберажом яе ўнукам сваім,
Гэта песня вякоў, твайго роду!

*Л. Вырко.*

Растлумачце пастаноўку знакаў прыпынку ў тэксце.
Якія беларускамоўныя песні вы любіце спяваць (слухаць)?

Правообладатель Национальный институт образования

*Табліца 1*

## Інтанаванне складаназлучаных сказаў

| Адносіны паміж часткамі складаназлучанага сказа | | Знак прыпынку | Інтанацыя, з якой чытаюцца складаназлучаныя сказы |
|---|---|---|---|
| спалучальныя | адначасовасці, паслядоўнасці, прычынна-выніковыя | **коска** | Часткі складаназлучанага сказа чытаюцца без пералічальнай інтанацыі, калі іх толькі дзве і яны звязаны адзіночнымі злучнікамі ***і, ды* (*‘і’*)**: першая частка чытаецца з павышэннем голасу, другая — з паніжэннем. Паміж часткамі робіцца невялікая паўза.<br>*Стаяла ноч,* \| *і ляцелі ноччу над горадам жураві* (М. Стральцоў). |
| | | | Калі ў складаназлучаным сказе ёсць агульны даданы член сказа, які адносіцца і да першай, і да другой часткі, то ён выдзяляецца лагічным націскам. Першая частка сказа чытаецца з павышэннем голасу, другая — з паніжэннем. Паміж часткамі робіцца невялікая паўза (на пісьме коска не ставіцца).<br>***Зноў*** *ад нас жураві адлятаюць* \| *і лісцё ападае ў траву...* (В. Шніп). |
| | | | Часткі складаназлучанага сказа чытаюцца з пералічальнай інтанацыяй, калі іх дзве і яны звязаны паўторнымі злучнікамі ***і — і, ды — ды* (*‘і’ — ‘і’*)**: к канцу першай часткі голас злёгку павышаецца, другая частка чытаецца з паступовым павышэннем голасу і заканчваецца яго паніжэннем пасля слова з лагічным націскам. Паміж часткамі робіцца невялікая паўза.<br>*І дарослыя радаваліся хуткаму адпачынку,* \| *і* ***дзеці*** *чакалі летніх канікул.* |



Правообладатель Национальный институт образования

| Адносіны паміж часткамі складаназлучанага сказа | Знак прыпынку | Інтанацыя, з якой чытаюцца складаназлучаныя сказы |
|---|---|---|
| | | Часткі складаназлучанага сказа чытаюцца з пералічальнай інтанацыяй, калі іх больш за дзве і яны звязаны паўторнымі злучнікамі ***і — і, ды — ды* (*‘і’ — ‘і’*)**: к канцу кожнай часткі, акрамя апошняй, голас злёгку павышаецца. Апошняя частка чытаецца з паніжэннем голасу пасля слова з лагічным націскам. Паміж часткамі робяцца невялікія паўзы.<br>*Зязюлі варожаць,* \| *і кнігаўкі жаляцца,* \| *і **глушаць** усіх салаўі...* (П. Панчанка). |
| | **кропка з коскай** | Калі ў складаназлучаным сказе толькі дзве часткі, якія звязаны адзіночнымі злучнікамі ***і, ды* (*‘і’*)**, то першая частка чытаецца з нязначным паніжэннем голасу пасля слова з лагічным націскам, другая — з рэзкім паніжэннем. Паміж часткамі робіцца больш працяглая паўза, чым пры чытанні складаназлучанага сказа, часткі якога раздзелены коскай.<br>*Праз некаторы час мяне **зноў** пачала клікаць дарога;* \|\| *і ўзнікала **жаданне** ісці наперад,* \| *да новых вышынь.* |
| | | Калі ў складаназлучаным сказе больш за дзве часткі, якія звязаны паўторнымі злучнікамі ***і — і, ды — ды* (*‘і’ — ‘і’*)**, то часткі сказа чытаюцца з нязначным паніжэннем голасу пасля слова з лагічным націскам, акрамя апошняй, якая заканчваецца рэзкім паніжэннем голасу. Паміж часткамі робяцца больш працяглыя паўзы, чым пры чытанні складаназлучанага сказа, часткі якога раздзелены коскай.<br>*Працаваў Ігар ужо **месяц** на будоўлі дома;* \|\| *і **маці** была рада;* \|\| *і ён **сам** атрымліваў ад працы задавальненне.* |



Правообладатель Национальный институт образования

| | | | |
|---|---|---|---|
| | прычынна-выніковыя | **працяжнік** | Першая частка складаназлучанага сказа чытаецца з рэзкім нарастаннем павышэння голасу, другая — з паніжэннем голасу. Паміж часткамі робіцца працяглая паўза. Інтанацыя на мяжы частак напружаная.<br>*Скраніся* — \|\| *і важкай хадой наступнае ў паход кранецца* (А. Куляшоў). |
| супраціўныя | супастаўляльныя, супрацьпастаўляльныя | **коска** | Першая частка складаназлучанага сказа чытаецца з нязначным паніжэннем голасу пасля слова з лагічным націскам, другая — з рэзкім паніжэннем. Паміж часткамі робіцца невялікая паўза.<br>*Стаю* ***на ростанях*** *былых,* \| *а* ***з паднябесся*** *самотным жаўранкам звініць і плача май* (А. Куляшоў). |
| | | **кропка з коскай** | Першая частка складаназлучанага сказа чытаецца з нязначным паніжэннем голасу пасля слова з лагічным націскам, другая — з рэзкім паніжэннем. Паміж часткамі робіцца больш працяглая паўза, чым пры чытанні складаназлучанага сказа, часткі якога раздзелены коскай.<br>*Лета* ***не радавала*** *цёплым надвор'ем;* \|\| *але людзі працавалі* ***старанна*** *і сабралі багаты ўраджай.* |
| | | **працяжнік** | Першая частка складаназлучанага сказа чытаецца з павышэннем голасу, другая — з паніжэннем. Паміж часткамі робіцца працяглая паўза.<br>*Дзяўчына адчыніла дзверы ў кабінет* — \|\| *і Галіны Іванаўны сярод прысутных не было.* |



Правообладатель Национальный институт образования

| Адносіны паміж часткамі складаназлучанага сказа | | Знак прыпынку | Інтанацыя, з якой чытаюцца складаназлучаныя сказы |
|---|---|---|---|
| размеркавальныя | пералічэнне, чаргаванне, узаемавыключэнне з'яў, падзей | **коска** | Часткі складаназлучанага сказа чытаюцца без пералічальнай інтанацыі, калі іх толькі дзве і яны звязаны адзіночнымі злучнікамі ***ці, або***: першая частка чытаецца з павышэннем голасу, другая — з паніжэннем. Паміж часткамі робіцца невялікая паўза.<br>*Будзе адліга, \| або зноў ударыць маразы.* |
| | | | Часткі складаназлучанага сказа чытаюцца з пералічальнай інтанацыяй, калі іх дзве і яны звязаны паўторнымі злучнікамі ***ці — ці, або — або, то — то, ці то — ці то, не то — не то***: к канцу першай часткі голас злёгку павышаецца, другая частка чытаецца з паступовым павышэннем голасу і заканчваецца яго паніжэннем пасля слова з лагічным націскам. Паміж часткамі робіцца невялікая паўза.<br>*То свяціла ясным сонцам вера, \| то **нявер'е** кідала ў адчай* (П. Панчанка). |
| | | | Часткі складаназлучанага сказа чытаюцца з пералічальнай інтанацыяй, калі іх больш за дзве і яны звязаны паўторнымі злучнікамі ***ці — ці, або — або, то — то, ці то — ці то***: к канцу кожнай часткі, акрамя апошняй, інтанацыя злёгку павышаецца. Апошняя частка чытаецца з паніжэннем голасу пасля слова з лагічным націскам. Паміж часткамі робяцца невялікія паўзы.<br>*То горача, \| то холадна, \| то сонца выгляне, \| то **пойдзе** дождж.* |

Правообладатель Национальный институт образования

*Табліца 2*

## Інтанаванне складаназалежных сказаў

| Адносіны паміж часткамі складаназалежнага сказа | Знак прыпынку | Інтанацыя, з якой чытаюцца складаназалежныя сказы |
|---|---|---|
| азначальныя;<br>дапаўняльныя;<br>акалічнасныя (месца, часу, умовы, прычыны, мэты, уступальныя, параўнальныя, спосабу дзеяння, меры і ступені) | **коска** | Першая частка складаназалежнага сказа (галоўная або даданая) чытаецца з павышэннем голасу, другая — з паніжэннем. На мяжы галоўнай і даданай частак робіцца невялікая паўза.<br><br>*Прыходзіла вясна,* \| *каб абудзіць прыроду да новага жыцця* (С. Сапоненка).<br><br>*Калі рана ўстанеш,* \| *то і многа зробіш* (Прыказка). |
| | | Калі даданая частка складаназалежнага сказа стаіць у сярэдзіне галоўнай, то яна выдзяляецца паўзамі з абодвух бакоў. Галоўная частка чытаецца з павышэннем голасу да пачатку даданай, даданая частка — з павышэннем голасу ў канцы. Галоўная частка пасля даданай чытаецца з паніжэннем голасу.<br><br>*Над ускрайкам лесу,* \| *дзе пачыналіся жоўтыя пяскі,* \| *зазвінела песня ляснога жаваранка* (Я. Колас). |
| | | Калі даданая частка складаназалежнага сказа стаіць пасля першага слова галоўнай часткі, якое паясняе, то яна не аддзяляецца паўзай і чытаецца з павышэннем голасу. Галоўная частка пасля даданай чытаецца з паніжэннем голасу.<br><br>*Вечарам, калі ён заставаўся адзін,* \| *апаноўвалі розныя думкі* (Я. Колас). |



Правообладатель Национальный институт образования

| Адносіны паміж часткамі складаназалежнага сказа | Знак прыпынку | Інтанацыя, з якой чытаюцца складаназалежныя сказы |
|---|---|---|
| | | Калі дададная частка складаназалежнага сказа стаіць пасля члена сказа галоўнай часткі, выражанага дзеепрыметнікам або дзеепрыслоўем, то яна не аддзяляецца паўзай.<br>*Марыя Сяргееўна расчулілася,* \| *пачуўшы, як былыя выпускнікі віншавалі яе з Днём настаўніка.* |



Правообладатель Национальный институт образования

*Табліца 3*

## Інтанаванне бяззлучнікавых складаных сказаў

| Адносіны паміж часткамі бяззлучнікавага складанага сказа | | Знак прыпынку | Інтанацыя, з якой чытаюцца бяззлучнікавыя складаныя сказы |
|---|---|---|---|
| аднатыпныя часткі | спалучальныя (адначасовасці, паслядоўнасці) | **коска** | Часткі бяззлучнікавага складанага сказа чытаюцца з пералічальнай інтанацыяй.<br>Калі ў бяззлучнікавым складаным сказе толькі дзве часткі, то першая з іх чытаецца з павышэннем голасу, другая — з паніжэннем пасля слова з лагічным націскам. Паміж часткамі робіцца невялікая паўза.<br>*Майскі дзень,* \| ***паветра** пахне бэзам* (Л. Галубовіч). |
| | | | Калі ў бяззлучнікавым складаным сказе больш за дзве часткі, то голас злёгку павышаецца ў канцы кожнай часткі, акрамя апошняй, якая заканчваецца паніжэннем голасу пасля слова з лагічным націскам. Паміж часткамі робяцца невялікія паўзы.<br>*Адступала ноч,* \| *пачыналася раніца,* \| *не сціхаў салаўіны пошчак,* \| *ад зямлі ішлі цёплыя хвалі,* \| ***пахла** чаромхай...* (А. Федарэнка). |
| | | **кропка з коскай** | Бяззлучнікавы складаны сказ, часткі якога раздзелены кропкай з коскай, чытаецца спакойным тонам і ў запаволеным тэмпе. Першая частка сказа чытаецца з нязначным паніжэннем голасу пасля слова з лагічным націскам, другая — з рэзкім паніжэннем. |



Правообладатель Национальный институт образования

| Адносіны паміж часткамі бяззлучнікавага складанага сказа | | Знак прыпынку | Інтанацыя, з якой чытаюцца бяззлучнікавыя складаныя сказы |
|---|---|---|---|
| | | | Паміж часткамі робіцца больш працяглая паўза, чым пры чытанні бяззлучнікавага складанага сказа, часткі якога раздзелены коскай.<br>*Паміж* ***яблынямі*** *тырчалі пачарнелыя кусты бульбоўніку;* \|\| *у* ***барознах*** *трапляліся яблыкі* (М. Стральцоў). |
| | | | Калі ў бяззлучнікавым складаным сказе больш за дзве часткі, то яны чытаюцца з нязначным паніжэннем голасу пасля слова з лагічным націскам, акрамя апошняй, якая заканчваецца рэзкім паніжэннем голасу.<br>***Ноччу*** *мароз скоўваў падталіны з лужамі;* \|\| *з* ***усходу*** *дзьмуў калючы вецер;* \|\| ***днём*** *высокае ўжо сонца заганяла холад у руіны дамоў* (А. Асіпенка). |
| | супастаўляльныя, супрацьпастаўляльныя | **працяжнік** | Першая частка бяззлучнікавага складанага сказа чытаецца з моцным павышэннем голасу ў канцы, другая — з моцным паніжэннем. Паміж часткамі робіцца працяглая паўза.<br>*Продкі газет не чыталі —* \|\| *продкі чыталі па зорках* (А. Пісьмянкоў). |



Правообладатель Национальный институт образования

| | | | |
|---|---|---|---|
| разнатыпныя часткі | прычынныя | **двукроп’е** | Першая частка бяззлучнікавага складанага сказа чытаецца з лёгкім паніжэннем голасу пасля слова з лагічным націскам, другая частка чытаецца з паніжэннем голасу пасля слова з лагічным націскам. Паміж часткамі робіцца працяглая паўза.<br>***Вясне*** *так хочацца прысесці на сакавітую траву:* \|\| ***каштанаў*** *факельнае шэсце ёй закружыла галаву* (П. Панчанка). |
| | выніковыя | **працяжнік** | Абедзве часткі бяззлучнікавага складанага сказа чытаюцца з паніжэннем голасу пасля слова з лагічным націскам. Паміж часткамі робіцца працяглая паўза.<br>***Ужо*** *дзесяць гадзін вечара* — \|\| ***пара*** *класціся спаць.* |
| | умовы, часавыя | **працяжнік** | Першая частка бяззлучнікавага складанага сказа чытаецца з моцным павышэннем голасу ў канцы, другая — з моцным паніжэннем. Паміж часткамі робіцца працяглая паўза.<br>*І толькі скрані валуны* — \|\| *калоссе зашэпча пра дзіва...* (П. Панчанка). |
| | паясняльныя | **двукроп’е** | Першая частка бяззлучнікавага складанага сказа чытаецца з паніжэннем голасу і доўгай паўзай у канцы, што папярэджвае пра наяўнасць другой часткі, у якой знаходзіцца паясненне. Другая частка чытаецца з паніжэннем голасу.<br>***Адчулі*** *вербы:* \|\| ***сохне*** *лісце* (Ю. Свірка). |



Правообладатель Национальный институт образования

# Тлумачальны слоўнік

**Адры́на**, -ы, *мн.* -ы, -рын, *ж.* Халодная будыніна для захоўвання кармоў, інвентару і пад. ; пуня.

**Арка́да**, -ы, *ДМ* -дзе, *ж.* Некалькі арак аднолькавай велічыні і формы, якія апіраюцца на слупы або калоны.

**Атра́кцыя**, -і, *ж.* Прывабнасць, прыцягненне.

**Брэнд**, -а, *м.* Фабрычная марка, гандлёвы знак, якія маюць высокі давер, рэпутацыю сярод карыстальнікаў.

**Го́ні**, -ей *(уст.)*. 1. Адрэзак паласы ворнай зямлі. 2. *перан.* Ніва, зямля *(паэт.)*.

**Дывізіён, -**а, *м.* 1. Воінскае падраздзяленне ў артылерыйскіх, ракетных часцях. 2. Злучэнне ваенных караблёў аднаго класа.

**Зага́на**, -ы, *мн.* -ы, -ган, *ж.* 1. Недахоп, які выклікае асуджэнне, ганебная ўласцівасць 2. Фізічны недахоп.

**Зале́ва**, -ы, *ж. (абл.)*. Заліўны дождж, лівень.

**Капа́**, -ы, *мн.* копы. Сена, снапы, складзеныя конусам.

**Ке́мны**, -ая, -ае. Кемлівы, здагадлівы, які хутка разумее, засвойвае.

**Крамя́ны**, -ая, -ае. 1. Свежы, сакавіты. 2. Поўны сіл і здароўя (пра чалавека).

**Кудзе́ля**, -і, *ж.* Валакно лёну, канапель, апрацаванае для прыгатавання пражы.

**Ку́чары**, -аў *(разм.)*. Кучаравыя або завітыя валасы. *Тут:* у пераносным значэнні.

**Мажарыта́рны**, -ая, -ае. *Тут:* якога больш.

**Нёманія́да**, -ы, *ж.* Серыя твораў літаратуры і мастацтва, прысвечаных Нёману.

**Нумізма́тыка**, -і, *ж.* 1. Раздзел навукі, які вывучае гісторыю старажытных манет, грашовых зліткаў і медалёў. 2. Калекцыяніраванне старажытных манет і медалёў. // *прым.* **нумізматычны**, -ая, -ае.

**Падда́кваць**, -аю, аеш, -ае, незак. *(разм.)*. Выказваць згоду з чыёй-небудзь думкай, разважаннем, звычайна паўтараючы слова «так» і пад.

**Пакрысе́**, *прысл.* 1. Патроху, невялікімі долямі. 2. Паступова, не адразу.

**Парэ́шткі**, -аў. Цела нябожчыка або тое, што засталося ад яго цела; прах.

**Пігу́лка**, -і, *ж.* Пілюля, таблетка.

**Прыва́тны**, -ая, -ае. 1. Які з'яўляецца асобнай часткай чаго-небудзь, не агульны, не тыповы. 2. Асабісты, не грамадскі, не дзяржаўны.

**Сакрамента́льны** (сакральны), -ая, -ае *(кніжн.)*. 1. Звязаны з рэлігійным абрадам, рытуальны. 2. *перан.* Які замацаваўся ў традыцыі, стаў звычайным.

**Тапані́мія**, -і, *ж.* Сукупнасць тапонімаў (уласных назваў якога-н. геаграфічнага аб'екта — населенага пункта, ракі, возера і да т. п.) якой-н. мясцовасці, краіны. // *прым.* **тапанімічны**, -ая, -ае.



Правообладатель Национальный институт образования

**То́еснасць,** -і, *ж.* Поўнае падабенства, супадзенне. // *прым.* **тоесны,** -ая, -ае.

**Тутэ́йшы**, -ая, -ае. Які родам з гэтай мясцовасці, жыве на гэтай зямлі, не прыезджы.

**Урбаніза́цыя**, -і, *ж.* 1. Гістарычны працэс, звязаны з канцэнтрацыяй насельніцтва, эканамічнага і культурнага жыцця ў буйных гарадах. 2. Пашырэнне рыс, асаблівасцей, уласцівых гораду, на вясковае жыццё.

**Фрагмента́рна,** *прысл.* Няпоўна, урывачна.

**Хао́с,** -у, *м.* 1. У старажытнагрэчаскай міфалогіі: стыхія, што існавала да ўзнікнення свету, зямлі і жыцця на ёй. 2. *перан.* Беспарадак, неразбярыха; блытаніна.

**Хі́ба**, -ы, *мн.* -ы, -аў, *ж.* 1. Памылка, промах, недахоп. 2. Пра фізічны недахоп.

**Хрэ́сьбіны,** -бін. Хрысціянскі абрад хрышчэння, а таксама пачастунак пасля гэтага абраду. // *прым.* **хрэ́сьбінны,** -ая, -ае.

**Чарэ́нь,** і, *мн.* -і, -ей, *ж.* 1. Верхняя знешняя частка печы, ляжанка. 2. Гарызантальная паверхня ўнутры печы, под. // *прым.* **чарэневы**, -ая, ае.

**Чы́ннасць**, -і, *ж.* Дзейснасць, актыўнасць.

**Шканды́баць,** -ю, -еш, -е. Накульгаваючы, ісці.

**Экспазі́цыя**, -і, *ж.* Размяшчэнне экспанатаў у пэўным парадку для агляду.

**Экспане́нт**, -а, *м.* Асоба або арганізацыя, якая выстаўляе штосьці для агляду, паказвае на выстаўцы.

Правообладатель Национальный институт образования

# Спіс выкарыстаных крыніц


*Аўласенка, Г.* Вясковая школа : думкі ўголас / Г. Аўласенка // Маладосць. — 2007. — № 6. — С. 124—133.

Беларуская мова : складаны сказ без складанасці : дапам. для вучняў / М. І. Новік, С. Ф. Бут-Гусаім, В. М. Касцючык. — Мінск : Нацыянальны інстытут адукацыі, 2012.

Беларускія прыказкі, прымаўкі, фразеалагізмы / склад. Ф. М. Янкоўскі. — Мінск : Навука і тэхніка, 2002.

*Валочка, Г. М.* Беларуская мова. 10—11 класы. Практыкум па арфаграфіі і пунктуацыі : дапам. для вучняў / Г. М. Валочка, В. У. Зелянко, І. Л. Бурак. — Мінск : Нацыянальны інстытут адукацыі ; Аверсэв, 2012.

*Ванковіч, А.* Мінулае і будучыня / А. Ванковіч // Беларусь. — 2008. — № 7. — С. 46—47.

*Гаўрош, Н. В.* Афарыстычныя выслоўі беларускіх пісьменнікаў / Н. В. Гаўрош, Н. М. Нямковіч. — Мінск : Вышэйшая школа, 2011.

*Дашкевіч, Г.* Верасніца / Г. Дашкевіч. — Мінск : Мастацкая літаратура, 1997. — 140 с.

*Дучыц, Л.* Міфалагічныя штудыі / Л. Дучыц, І. Клімковіч // Маладосць. — 2009. — № 1. — С. 139—144.

*Караткевіч, У.* Аповесці. Вершы / У. Караткевіч. — Мінск : Мастацкая літаратура, 2000.

Кароткая граматыка беларускай мовы : у 2 ч. / навук. рэд. А. А. Лукашанец. — Мінск : Беларуская навука, 2009.

*Леванцэвіч, Л. В.* Гісторыя беларускай літаратурнай мовы : вучэб. дапам. / Л. В. Леванцэвіч. — Брэст : БрДУ імя А. С. Пушкіна, 2020.

*Лепешаў, І. Я.* Культура маўлення : вучэб. дапам. / І. Я. Лепешаў. — Гродна : ГрДУ імя Я. Купалы, 2007.

*Навуменка, І. Я.* Выбраныя творы : у 2 т. / І. Я. Навуменка. — Мінск : Мастацкая літаратура, 1995. — Т. 1 : Апавяданні, аповесці. — 478 с.

*Саматыя, І. М.* Гэты няпросты просты сказ : вуч.-метад. комплекс / І. М. Саматыя, В. С. Палтаржыцкая. — Мінск : Нацыянальны інстытут адукацыі, 2019.

*Сіпакоў, Я.* Зялёны лісток на планеце Зямля / Я. Сіпакоў. — Мінск : Харвест, 2006. — 287 с.

*Скрыган, Я.* Выбраныя творы / Я. Скрыган. — Мінск : Беларускі кнігазбор, 2005.

*Рамза, Т. Р.* Сучасная беларуская мова. Сінтаксіс : вучэб. дапам. / Т. Р. Рамза. — Мінск : БДУ, 2020.

Энцыклапедыя для школьнікаў і студэнтаў : у 12 т. — Мінск : Беларуская Энцыклапедыя імя П. Броўкі, 2017. — Т. 7 : Беларуская мова / пад агул. рэд. Д. В. Дзятко.




Правообладатель Национальный институт образования

# Змест


**АГУЛЬНЫЯ ЗВЕСТКІ АБ МОВЕ**

§ 1. Мова і маўленне. Веданне мовы і валоданне мовай ............ 3

**СТЫЛІСТЫКА**

§ 2. Функцыянальныя стылі маўлення. Стылеўтваральныя моўныя сродкі ............ 7

**СІНТАКСІЧНЫЯ І ПУНКТУАЦЫЙНЫЯ НОРМЫ**

§ 3. Нормы дапасавання і кіравання ў беларускай мове ............ 17

§ 4. Правілы сувязі выказніка і дзейніка, выражанага спалучэннем слоў ............ 27

§ 5. Правілы пабудовы сказаў з аднароднымі членамі, знакі прыпынку ............ 35

§ 6. Правілы ўжывання дзеепрыслоўных і дзеепрыметнікавых зваротаў ............ 49

§ 7. Правілы пабудовы сказаў з адасобленымі членамі, знакі прыпынку ............ 57

§ 8. Правілы пабудовы сказаў са звароткамі, знакі прыпынку ... 78

§ 9. Правілы пабудовы сказаў з пабочнымі і ўстаўнымі канструкцыямі, знакі прыпынку ............ 84

§ 10. Правілы пабудовы сказаў з параўнальнымі зваротамі, знакі прыпынку ............ 94

§ 11. Правілы пабудовы складаназлучаных сказаў, знакі прыпынку 98

§ 12. Правілы пабудовы складаназалежных сказаў, знакі прыпынку ............ 106

§ 13. Правілы пабудовы бяззлучнікавых складаных сказаў, знакі прыпынку ............ 121

§ 14. Правілы пабудовы складаных сказаў з рознымі відамі сувязі частак, знакі прыпынку ............ 130

§ 15. Знакі прыпынку ў канструкцыях з чужой мовай ............ 135

§ 16. Ужыванне складаных сінтаксічных канструкцый у тэкстах розных тыпаў, стыляў і жанраў ............ 144

**ПАДАГУЛЬНЕННЕ І СІСТЭМАТЫЗАЦЫЯ ВЫВУЧАНАГА**

§ 17. Маўленчыя зносіны і маўленчы этыкет. Нормы сучаснай беларускай мовы; памылкі, выкліканыя іх парушэннем ... 158

*Дадатак* ............ 171

*Тлумачальны слоўнік* ............ 180

*Спіс выкарыстаных крыніц* ............ 182




Правообладатель Национальный институт образования

(Назва ўстановы адукацыі)

| Навучальны год | Імя і прозвішча вучня | Стан вучэбнага дапаможніка пры атрыманні | Адзнака вучню за карыстанне вучэбным дапаможнікам |
|---|---|---|---|
| 20 / | | | |
| 20 / | | | |
| 20 / | | | |
| 20 / | | | |
| 20 / | | | |
| 20 / | | | |


Вучэбнае выданне

**Валочка** Ганна Міхайлаўна
**Васюковіч** Людміла Сяргееўна
**Зелянко** Вольга Уладзіміраўна і інш.

**БЕЛАРУСКАЯ МОВА**

Вучэбны дапаможнік для 11 класа
ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі
з беларускай і рускай мовамі навучання
(з электронным дадаткам для павышанага ўзроўню)

Нач. рэдакцыйна-выдавецкага аддзела *С. П. Маляўка*
Рэдактар *Л. Ф. Лeўкіна*
Вокладка мастака *З. П. Болцікавай*
Мастакі *Г. А. Ламанава, А. М. Брыкет*
Мастацкі рэдактар *З. П. Болцікава*
Камп'ютарная вёрстка *А. М. Брыкет*
Карэктары *Н. В. Федарэнка, Н. В. Філіповіч, Д. Р. Лосік*

Падпісана да друку 21.07.2021. Фармат 70 × 90 $^{1}/_{16}$. Папера афсетная. Друк афсетны.
Ум. друк. арк. 13,45. Ул.-выд. арк. 10,8 + 23,0 эл. дадат. Тыраж 128 390 экз. Заказ

Навукова-метадычная ўстанова «Нацыянальны інстытут адукацыі» Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь. Пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі выдаўца, вытворцы, распаўсюджвальніка друкаваных выданняў № 1/263 ад 02.04.2014. Вул. Караля, 16, 220004, г. Мінск

Адкрытае акцыянернае таварыства «Паліграфкамбінат імя Я. Коласа».
Пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі выдаўца, вытворцы, распаўсюджвальніка друкаваных выданняў № 2/3 ад 10.09.2018. Вул. Каржанеўскага, 20, 220024, г. Мінск


Правообладатель Национальный институт образования